РАЗ — ШКІЛЕТ, І ДВА — ШКІЛЕТ

Франц Сіўко

18+

Франц Сіўко

РАЗ — ШКІЛЕТ, І ДВА — ШКІЛЕТ

Аповесці

Мінск
“Галіяфы”
2019

УДК 821.161.3-31
ББК 84(4Беи)-44
С34

Сіўко, Ф.
С34 Раз — шкілет, і два — шкілет : аповесці / Франц Сіўко. — Мінск : Галіяфы, 2019. — 344 с.
ISBN 978-985-7209-23-1.

Праз асэнсаванне калізій і ўчынкаў мінулага да ўсведамлення ўласнай экзістэнцыйнай сутнасці ў дні сённяшнім — так можна вызначыць лейтматыў змешчаных у гэтым зборніку чатырох аповесцей. Аб'яднаныя агульным месцам дзеяння, займальнасцю фабулы і наяўнасцю дэтэктыўнай інтрыгі, усе яны вылучаюцца дасканаласцю моўнага складніка, вынаходлівасцю ў пабудове сюжэта, адметнасцю аўтарскага падыходу да выкарыстання сродкаў мастацкага адлюстравання падзей і характараў.

УДК 821.161.3-31
ББК 84(4Беи)-44

ISBN 978-985-7209-23-1

© Сіўко Ф., 2019
© Афармленне. ПВУП "Галіяфы", 2019

ШУЛА — МЕГАПОЛІС

Аповесць

Працэдура надгляду нудотная і доўгая; здаецца, яна ніколі не скончыцца.

Мы сядзім у салоне аўто ля будана з акенцам, за якім мудруе пры экране камп'ютара разамлелы ад спёкі мытнік, назіраем, як мітусяцца ўгары, пад дахам ангара, занятыя кармленнем птушанят ластаўкі. Птушак шмат, не менш за два дзясяткі, і яны без супынку нагадваюць пра сваю прысутнасць похаплівым шорганнем крылаў ды свежымі плямамі фекаліяў на доле. Вывадак асмялелых — ніхто іх тут не чапае — зялёных яшчарак акупаваў лапік зарослае трыпутнікам сцежкі наўзбоч будана, грэецца ў промнях цяжкога, бы распалены кавалак жалеззя, ліпеньскага сонца.

Мытнікі выходзяць на двор, перагукваюцца адзін з адным паўз разнасцежаныя дзверы, ды таўсматая постаць прыбіральшчыцы мільгне раз-пораз перад вачамі і знікне за рогам скрыні для смецця.

Шпацыраваць па пляцы пры будане не забаронена, але ніводзін з нас вылазіць з салона не жадае: занадта горача.

Мытня. Пік лета. Поўдзень.

У памяшканнях, відаць па ўсім, ідзе рамонт. Гэта надае дзеянням памежнікаў адценне несур'ёзнасці, нават камічнасці. Асабліва калі чарговы раз ляпаюць дзверы і замест доўгачаканага службоўца з паперамі з'яўляецца ў праёме ўсё тая ж цётка-прыбіральшчыца са швабраю ў руцэ. Выбух нашага нервовага смеху, што суправаджае яе з'яўленне, разносіцца рэхам па будынку, тоне ў падстрэшшы.

І вось зноў ціха. Ні гуку, ні подыху ветру, толькі бачна, як у вузкім пераходзе паміж службовымі пакоямі лянівa сваволіць з папяровым друзам — то ўздыме яго ўгору, то зноў апусціць на дол — слабы скразнячок.

У салоне цеснавата, і гэта найбольшая нязручнасць. Варта аднаму з нас варухнуцца, як тае ж хвіліны пачынаюць варушыцца астатнія. Не менш даймае гарачыня. Ледзь прыхінешся плячыма да спінкі сядзення — і яны тут жа вільгатнеюць, робяцца ліпкімі, бы суквецці смолкі ў букеце кіроўцы над бардачком.

Нас пяцёра, усе, казаў той, пры целе. А хто-ніхто, як, напрыклад, кіраўнік нашай дэлегацыі Зяменя — мы едзем у латвійскі Т. на ўрачыстасці з нагоды юбілею горада-пабраціма, — і апрануты, нягледзячы на спёку, далёка не па-летняму. Асабліва непрыемна адчуваць дотык чужога ўспацелага цела, ад якога тваё ўласнае ўвобміг напружваецца, выдае хвалю дрыжыкаў.

Не грэбуюць мажлівасцю падпсаваць вандроўнікам настрой і камары. Месца хмызістае, аўто стаіць у цяні, і крывасмокі жывасілам лезуць у яго, ціснуцца пад каў-

нер, у рукавы кашулі, у калашыны штаноў. Дык адно і пільнуйся, каб не спляміць вопраткі кропляю ўласнае крыві, заспеўшы нахабу на месцы злачынства ды квэцнуўшы па ім як след даланёю.

— Вось, а яшчэ шкадавалі, што шорты не апранулі, — кажа Зяменя і млява ўсміхаецца. — Паглядзеў бы я на вашы скрываўленыя лыткі…

Мытнік за шкляною перагародкаю нарэшце адрывае вочы ад экрана камп'ютара, абводзіць нас па чарзе ўніклівым паглядам, што неяк зусім не пасуе да яго пакамечанага, бы з бадуна, твару. Аддае Зяменю пашпарты з дэкларацыямі, дакранаецца рукою да чырвона-бела-чырвонага паска на грудзіне:

— Шчаслівай дарогі!

— Ужо? — быццам не верачы, што ўсё скончылася, кажа кіроўца і зачыняе дзверкі машыны.

Аўто памалу вырульвае на шашу і адразу ж (мы ўжо спазняемся: а пятнаццатай першая імпрэза, а нам яшчэ ехаць да Т. ды ехаць) набірае хуткасць. Багажнік чорнай "бээмвэшкі", што імчыць перад намі, чамусьці незачынены, з яго вытыркаецца, целяпаецца на ветры ашмётак цэлафаніны.

Мясціны знаёмыя мне з дзяцінства, з часоў, калі мяжы тут і блізка не было, і я з цікавасцю ўзіраюся ў краявіды, не бачаныя без малога пятнаццаць год, ад паховінаў дзядзькі Міхала, матчынага брата.

Калісьці бухмата-ўраджайныя, а зараз спрэс зарослыя дзікім лубінам і цімафееўкай палі ўсцяж дарогі пераліваюцца морам фарбаў-адценняў. Гравійкі, адна з якіх вядзе акурат да кута па той бок ракі, дзе я нарадзіўся, вузкімі віхлястымі атожылкамі разбягаюцца ад шашы ва ўсе бакі, хаваюцца пад шатамі старадрэвінаў.

— Эўропа! — наўмысна “пад тарашкевіцу” выгукае Зяменя і яшчэ больш моршчыць і без таго пасечаны зморшчынамі лоб. Ён ад раніцы, ад тае хвіліны, як ад’ехалі з дому, раз-пораз заводзіць гаворку наконт не так даўняга ўступу суседзяў у Еўразвяз, і кепскі яго настрой, узмоцнены ўтомным чаканнем на мытні ды нашаю маўкліва-зацятаю няўвагаю да ягоных глыбакадумных высноваў, усё горшае і горшае. — От і няхай! Не хацелі з намі ў хаўрусе быць, то няхай ведаюць… Саюз ім воўкам, бач ты, смярдзеў… Ну дык і хай жа во цяпер з *гэнымі* паспрабуюць! Яшчэ пашкадуюць, паглядзіце, зноў у сябры да нас папросяцца!

Першае пасля мяжы паселішча вымыкаецца з-за павароту нечакана, я ледзь-ледзь паспяваю ўгледзець на ўказальніку знаёмы назоў: Murovanka. І ён, гэты назоў, — ці не адзінае, здаецца, што не змянілася ад даўнейшых часоў, бо сама вёска зусім не нагадвае тую, якую я памятаю. Так бывае, калі неспадзеўна спаткаешся дзе-небудзь у незнаёмым месцы з колішнім знаёмцам, а год прамінула столькі ад вашае апошняе сустрэчы, што не адразу і сцяміш, ці то чалавек перад табою, ці то ўсяго толькі ягоны прывід.

Кіроўца суцішвае хуткасць, аўто памалу цягнецца ўздоўж хат.

Хаты не менш, калі не больш недагледжаныя, як па той бок мяжы. Пакрыўленыя платы абапал панадворкаў, запалыя аканіцы з няпэўнага колеру лішвой, пашэрханыя сцены. Пасярод вёскі ўзвышаецца чарнее на месцы хаты рымара Ванагіса комін з паўразбуранай печчу — усё, што засталося ад жытла пасля таго, як яго разабралі. Разабралі, хутчэй за ўсё, на дровы, пра што сведчаць колькі ўрослых у траву

на спажыву непагадзі спарахнелых бэлек уперамешку з гурбаю дошак-шалёвак.

Комін, ды печ, ды пара паўздзічэлых прысадзістых яблынь — усё, што нагадвае некалі спраўную сядзібу з добрым тузінам вулляў пад ліпняком і плоймаю нарыхтовак для хамутоў-падсядзёлкаў на дзядзінчыку перад клеццю. Ды яшчэ не зарослая дарэшты сцежка, што вядзе да азярка, на краі якога ніцее пасярод паўвыспы з маладзенькага альхоўя купка вішняў з абдзёртымі камлямі. Таго самага, у якім мы з сябруком Тонікам аднойчы пакупаліся па дарозе з крамы ды і падчапілі нейкую трасцу і потым доўга, ці не з месяц цягаліся да фельчара ў спадзеве як найхутчэй пазбавіцца каслівых плямаў пад пахамі і на спінах.

— От і няхай, — кажа Зяменя і задаволена ляпае сябе далонямі па каленях. — І няхай жа ж…

Рудое кацяня са збадзянаю на спіне поўсцю вылазіць з рымаравага падпечка, пужліва азіраецца наўкола, соладка пацягваецца. Другое, крыху большае і больш жвавае, высоўвае пысу з акантаванага дошчачкамі лазу, выкульваецца ў траву следам за першым, паважнаю спарудай застывае побач.

Кіроўца сігналіць, і абодва каты, напалоханыя знячэўным гукам, уздымаюць хвасты, порстка шмыгаюць зноў у падпечак. Усё адбываецца так хутка, што нагадвае змену кадраў пры перамотцы касеты: адно імгненне, адзін узмах хваста, былі — і няма.

Я азіраюся ў надзеі, што каты, можа, зноў вылезуць са схову, але дарэмна. Падпечак хаваецца ў засені парэчніку, паволі сплывае з вачэй разам з комінам. Я сілюся ўявіць яго чэрава, і яшчэ адзін малюнак, цяпер ужо больш як саракагадовае даўніны — мне ледзь споўнілася тады восем — усплывае ў маёй памяці.

Усплывае амаль імгненна: што-што, а гэтае месца ў вясковай хаце, падпечак, я памятаю добра. Так добра, што нават, здаецца мне, і зараз, седзячы пры шыбіне найсучаснейшага аўто, чую яго спецыфічны, рэзкаваты пах. Пах пер'я ды акамянелых, шорсткіх навобмацак курыных — не фекаліяў ці экскрэментаў, такіх вучоных словаў мы, мурзатыя спадкаемцы найпатомнейшых сялянаў, не ведалі, — калткоў…

Дзень і на палову яшчэ не паспеў перакуліць, а ў кухні ўжо цемнавата, бы ўвечары. Вецер без супынку раве на дварэ, то грукнецца ў дзверы сяней, то шпурне ў акно жменю крупак-градзінаў, то пужне кароткім злым ударам па сцяне, ад якога ўся хата скаланецца, а бэлькі пад шпалераю зойдуцца роспачлівым енкам. А то раптам зусім сціхне, быццам знарок замрэ, каб даць хвіліну-другую Ларысцы павохкаць, мне — тое вохканне як лепей пачуць.

Вохканне — пра адно і тое ж, не вохканне, а заезджаная кружэлка. Толькі Ларыска растуліць вусны, а я ўжо ведаю, што з тых вузенькіх, падфарбаваных матчыным алоўкам шчэлачак-вуснаў вымкнецца:

— Ай, вой, і дзе ж гэта ён? Ну ж бадзяжка!

Што я чую яе з падпечка і праз тое раблюся сведкам яе перажыванняў, сястру, здаецца, ані не турбуе.

Ён — практыкант-"заўцехнік" Вася, студэнт ветінстытута, абаяльны шатэнчык з параю ранніх залысінаў на лобе і тампонам у левым вуху, які ён не вымае адтуль — хранічны атыт — амаль ад дня свайго прыезду.

Вася кватаруе ў бабулі майго дружбака Тоніка і штодня прыходзіць да нас, дакладней, да Ларыскі.

Сястра сустракае яго вясёлым смехам, яны зачыняюцца ў пакоі і сядзяць гэтак удваіх колькі гадзін. Чым яны там займаюцца, я не ведаю. Ды не пацеры, пэўна ж, адмаўляюць: смех, што даносіцца з пакоя, на такую сур'ёзную справу не паказвае. Вясёлы вэрхал за сцяною час ад часу змяняецца цішай, што ці то незнарок, ці то, наадварот, наўмысна супадае з аціханнем ветру на дварэ, і тады здаецца, што ў тым пакоі наогул нікога няма.

Вася — першы студэнт, які ашчаслівіў нашу глухамань сваім прыездам. І сямнаццацігадовая Ларыска, якая дагэтуль студэнтаў ніколі не бачыла, штодня ад раніцы чакае ягоных візітаў. А калі ён доўга не прыходзіць, нервуецца так, што пачынае рабіць розныя глупствы. Неабыякавага да сястры Тоніка ўсё гэта вельмі злуе.

Адзіны з дарослых, каму не даспадобы студэнтавы візіты, — наш бацька. Сам чалавек зацяты, ён лічыць практыканта занадта ўжо ўвішным у стасунках з людзьмі. "Далёка пойдзе", — кажа, і вырак той гучыць як найвышэйшая ступень асуджэння найгоршай з чалавечых заганаў.

Маці заступаецца за Васю, бо лічыць, што гэта — звычайная зайздрасць сталага чалавека да больш паспяховага маладога. І, бадай, мае рацыю: бацька сам калісьці, пры Польшчы, меў намер вучыцца на ветэрынара, і сям'я нібыта сабрала ўжо грошы на вучобу, як увадначас парушыліся ўсе тыя амбітныя планы прыходам Саветаў.

На дварэ сквар, у хаце паўпрыцемак, у падпечак урэшце прабіваецца, прасіціўшыся праз шчэлку ў пласце таўшчэзнай наледзі на шыбіне, хісткі сонечны прамень. Ён такі кволы, што я баюся дыхнуць: а раптам

ён знікне? Час ад часу прамень перамяняецца ў цьмяны пасак, і тады ўсё наўкола таксама ўвобміг цьмянее, вузее, але адначасна робіцца ад таго яшчэ больш утульным.

У падпечку цёпла, пахне сажаю і курынымі спражненнямі-калткамі. Уласна, дзеля іх, калткоў, я ў тое падпечча і палез. Надоечы чуў, як цётка Адальфіна, Тонікава матка, жалілася маёй, што аніяк не можа саўладаць са злыдушнаю звычкаю сына браць іх у рот, і вырашыў сам паспытаць тое "смачноцце" на зуб.

Усохлы, шэры, як агарак на кончыку бацькавай папяросіны, калток аддае серкаю. Гэтага дастаткова, каб спыніць даследзіны: маці ледзь не штодня перасцерагае мяне, баронь бог, не смактаць запалкі, бо "вунь адзін пасмактаў і атруціўся серкаю, сканаў".

Ці праўду яна кажа, ці не (можа, проста палохае), я не ведаю. Але страх сканаць у цёмным, прапахлым цвіллю і курынымі пёрамі падпечку перасільвае цікаўнасць. Канаць мне не хочацца. Я ўжо аднойчы бачыў, як канае чалавек, — відовішча не з прыемных. Да таго ж і бацька з маці вось-вось павінны вярнуцца з Т. з кірмашу, і што будзе, як заспеюць за гэткім саромным заняткам?

Сястра каторы раз за апошнія паўгадзіны высоўваецца са свайго пакоя, качынаю — нясклёпа! — хадою набліжаецца да печы. Дзве крывыя, як камлі арэшын-спарышоў у загуменні, нагі засланяюць і без таго скупы прамень, спыняюцца насупраць лаза.

— Ясі? Скажу маме. — Голас яе абыякавы і, як заўжды, насмешлівы. Камлі зрушваюцца з месца, павольна знікаюць, але праз колькі хвілін з'яўляюцца зноў.

— Сябрук твой, Тонічак, цягнецца, от ужо ўдвух курынага гаўна наясцёся!

Дзверы ляпаюць, уваходзіць Тонік. Ягоная грывастая галава ўсоўваецца ў лаз, і мне нічога не застаецца, як даць яму месца побач. Прызнавацца, чаму я ў падпечку, мне не хочацца, я ўтрапёна, аж да рэзі ўваччу, разглядаю патрушчаную шкарлупіну ад яйка, што нейкім цудам пазбегла курынае дзюбы і цяпер сіратліва боўтаецца ў куце на танюткай — і як дае рады ўтрымацца на ёй? — павуцініне.

— Каштаваў? — Тонікаў голас гучыць даверліва і разам з тым занадта гучна, каб яго не пачула сястра.

— Каштаваў, а як жа, — падае яна голас і здзекліва смяецца. — Але ж і смачна! Праўда?

— А ты адкуль ведаеш? — пераймаю я. — Ела?

— Вось яшчэ напрыдумляў! — Сястра абражана фыркае, цягнецца ў пакой.

— Тонюсь, Вася дома? — крычыць неўзабаве праз дзверы, і голас яе трымціць, як стомлены абрыдлым вісеннем праз усю зіму ліст на бэзіне пры акне.

— Дома! — крычыць у адказ Тонік і тут жа амаль, размораны цеплынёй, засынае.

Я мкнуся перапаўзці праз ягонае нерухомае цела, але няўдала. Тонік прачынаецца ад майго дотыку, чапляецца спрасонку за руку, прыцягвае да сябе. Целы нашы судакранаюцца, і я чую ягонае няроўнае — няйначай, прастуда, — перарывістае дыханне.

— Зэ-энік… — кажа ён і яшчэ мацней прытуляецца да мяне. Я разумею, што ён трызніць, і колькі хвілін ляжу нерухома побач.

Зэнік — малодшы Тонікаў брат, два гады таму ён памёр, не даўшы рады выкараскацца з нейкай рэдкай сардэчнай хваробы.

Я ляжу побач з Тонікам яшчэ колькі часу, а як толькі заўважаю, што ягонае цела мякчэе, паціху вызваляюся

з абдоймаў, сунуся па каляным, бы грудок пасля аблівахі, доле да лаза.

Мяне нясцерпна, да свербу ў грудзях, вабіць маціца над бацькоўскім ложкам за перабойкаю. Я прабіраюся ціхутка за перабойку, ускокваю на ложак, трапляючы раз-пораз даланёй у павуціну, шнару рукою па шчэлцы паміж маціцай і столлю.

Сетка ложка занадта тугая, так і спружыніць пад нагамі, пагражае скінуць мяне на падлогу. Ад хвалявання ды страху, што ўвойдзе ды заспее мяне тут, пры такой справе, сястра, цела маё ахопліваюць дрыжыкі. Як на тое, парушыніна адрываецца ад падстолля, гайдаецца, матляецца перад вачыма, замінае пошукам.

Гумкі на месцы, але ўжо іх не чатыры, як заўчора, а толькі тры. Знікненне адной мне незразумелае. Як незразумелае, папраўдзе, і прызначэнне тых гумак наогул. Я бяру адну, надрываю, як і мінулы раз, абгортку.

Тугое колка абапал гумкі нагадвае абручык матчыных пяльцаў, толькі шматкроць меншы. Сама гумка гладкая, з рудаватым адценнем. Мне чамусьці прыходзіць у голаў думка ўздзець яе на цвічок збоч маціцы. Але гумка такая далікатная, такая тонкая, што мне робіцца яе шкада. Я вымаю са шпалерыны голку, якою маці звычайна зашывае бэбахі, асцярожна праколваю гумку пасярэдзіне. Затым хуценька кладу яе на ранейшае месца на маціцы.

Голка выслізгвае з маіх рук, з глухім шорганнем падае ў пройміну між сцяною і ложкам. Я саскокваю на падлогу, сунуся да падпечка.

Мне крыху не па сабе, здаецца, што я зрабіў штосьці вельмі кепскае. Я хачу вярнуцца зноў да ложка, каб узяць папсаваную гумку, але згадка, што бацька,

мабыць, напярэдадні іх усе палічыў (з тыдзень таму я якраз выпадкова заспеў яго за гэткім заняткам), спыняе мяне.

Тонік усё яшчэ спіць, гэта мяне супакойвае. Да таго ж знадворку чуюцца крокі.

Практыкант Вася ўваходзіць у хату, дае "дзень добры". Ларыска выбягае на ягоны голас, удае ні то радасць, ні то здзіўленне, перарывіста, з прыдыхам хіхікае.

— Брат дома? — пытаецца Вася і праз хвіліну — мабыць, Ларыска паказала жэстам, дзе мы з Тонікам, — зазірае ў падпечак. — Паснулі, — кажа і сунецца следам за сястрою ў яе пакой.

Ціша, што ўсталёўваецца ў пакоі адразу ж, як толькі зачыняюцца за імі дзверы, здаецца мне падазронаю. Зрэшты, і ўчора, і заўчора было гэтаксама, але ж нічога благога там не здарылася. Абодва выйшлі з пакоя расчырванелыя, але задаволеныя, ні намёку на нейкае непаразуменне.

Я ўладкоўваюся на доле побач з Тонікам. І толькі пачынаю засынаць, як Вася выходзіць з пакоя сястры, накіроўваецца за перабойку.

Я чую, як рыпяць пад ягонымі нагамі маснічыны падлогі, праз хвілю-другую, угінаючыся, — спружыны ложка. Як ён сапе, шнарыць рукамі па падстоллі, як урэшце саскоквае з ложка і крадзецца зноў у Ларысчын пакой. Я кладуся побач з Тонікам і, злагоджаны цеплынёй, што зыходзіць ад сябравага цела, ды стомлены прыгодаю з гумкаю, імгненна засынаю.

Будзіць мяне голас бацькі. Я падымаю голаў і бачу пад сталом наўскос лаза яго валёнкі ў галёшах з разводамі ні то снегу, ні то солі на насах.

— О-от яны, гэтыя Саветы, — кажа ён і казыча даланёю нагу ніжэй калена. — Абы горш чалавеку зрабіць, абы горш…

Саветы — яго ўлюбёная тэма, я яшчэ не разумею, што гэта такое, ды і іншы клопат наўме: каб жа Ларыска не вымкнулася, не прагаварылася пра курыныя калты.

Лёгкая на ўспамін, сястра ўсоўвае голаў у лаз.

— Ну, выспаліся, калтаеды? — кажа і матляе перад нашымі з Тонікам спэцканымі сажаю насамі гасцінцам ад дзядзькі Міхала і цёткі Шуры — пакункам цукерак "Кароўка" і дыхтоўнаю кніжкай з выяваю нясветнае прыгажосці палаца на вокладцы.

— Пушкин… Ска-зки… сказ-ки, — чытае Тонік (я яшчэ не ўмею) і, прыўзняўшыся на жываце, выхоплівае кніжку з Ларысчыных рук.

— Штосьці практыканта вашага сёння не бачна, — кажа яна і хітра — ліска дый годзе — пасміхаецца.

Што смех той — дачасны, смех — прадвесце драмы, ні сама яна, ні хто з нас яшчэ не ведае.

Кепскую навіну прыносіць Вася. Кепскую — для Ларыскі, бо выгляд самога практыканта на няшчаснага не выдае. Наадварот, ён ужо думкамі, здаецца, увесь у сваім горадзе. Тэрмін практыкі скончыўся, заўтра ён, злёгку рассыцелы на вясковым харчы, ад'язджае.

Ларыска сядзіць моўчкі насупраць яго, але не плача: маці ў хаце, і паказваць свой адчай ніяк не выпадае. Яна сядзіць немаю зданню пры стале, слухае, як Вася апавядае пра гарадскія норавы. Слухае ды кусае ў роспачы вусны. І толькі калі Вася падымаецца, каб пайсці, не вытрымлівае, ускоквае з месца, кідаецца следам за ім на двор.

— Што гэта з дзеўкаю? — дзівіцца маці і хітае галавой. — Га?

Яна глядзіць на мяне, быццам чакае падказкі, што тут да чаго, але я маўчу. Мне шкада сястру, ды і таямніцу яе выдаваць не хочацца.

— Закахалася, можа? Дурнічка! Трэба нам гэткі… усходнік!

Усходнік для маці — ці не горш за лаянку, усходнікаў яна не любіць ад таго часу, як раскулачылі перад вайною, пры першых Саветах, і звезлі некуды за Урал яе бацьку, майго дзеда.

— Знайшла кавалера! Лоб, бы калена, і вушы тырчком… Нашы мальцы не горшыя. Ані.

Ларыска вяртаецца з двара, ідзе ў свой пакой. Яе плечы паныла ўздрыгваюць у такт крокам, а таўстыя, з плямамі ад прадаўніх фурункулаў лыткі выдаюць яшчэ больш крывымі, як звычайна.

Што з сястрою нешта не так, я здагадваюся, ды не больш за тое: маці маўчыць, маўчыць і сама Ларыска. Нават прыезд дзядзькі Міхала, які жыве ў Т. і заўжды прывозіць нам з сабою безліч цацак і ласункаў, гэтым разам ні ў кога не выклікае энтузіязму.

Дзядзька робіць на фабрыцы, дзе толькі што распачалі выпуск нейкіх штучных нітак, і любіць пахваліцца, як там, на той фабрыцы, усё гожа ўладкавана. У фабрычнай краме ўсяго-ўсяго, а ў сталоўцы нават каньяку можна хапіць дзеля гумору падчас абедзеннага перапынку або пасля змены. І ўсё танна, усё можна прыдбаць за капейкі. І наогул, калі верыць яму (а мы верым, канешне), усё ў Т. і яго ваколіцах лепей, як у нас. Смачнейшы хлеб, раўнейшыя дарогі, і соткі штогоду ніхто не перамервае, і быдла мож-

на на вёсцы гадаваць колькі заўгодна, мелася б толькі ў чалавека ахвота.

— Нават каньяку, бач ты, — з недаверам у голасе кажа маці і сунецца ў істопку па чарговую бутэльку гарэлкі.

Мужчыны выпіваюць, бацька ўздыхае, ідзе на двор дарабляць шула для лазні, што распачаў месяц таму і ўсё ніяк не давядзе да ладу, бо раптам усхапіўся маразяка і на дварэ зрабілася вельмі сцюдзёна.

Дзядзька дастае з кішэні жмут грошай, кладзе на стол.

— Колькі здолееш узяць у жменю, — усё тваё, Анэлька.

— Ай, не дурніся, братка! — адмахваецца маці. — Нябось скраў у Шуры…

— Ага, у Шуры скрадзеш! — кажа ён і сіллю ўпіхвае маці ў далонь колькі паперчын. — Не скраў, сястрыца, зарабіў, вось гэтымі рукамі. Так што бяры, не саромейся… Дасць Бог, калі-небудзь мяне выручыш.

Такая сцэна паўтараецца з прыезду ў прыезд і сканчваецца звычайна тым, што грошы застаюцца ў маці. Дзядзька — шчодры, і мы ўсе яго за гэта, вядома ж, любім.

Дзядзьку падабаецца роля настаўніка, ён вучыць нас з сястрою латышскім словам. І хоць набор іх у нашым лексіконе яшчэ зусім невялікі, як будзе "па-іхняму" певень, або крама, або малако, мы ўжо ведаем.

Гэтым разам урок, аднак, больш складаны, як звычайна.

— Kas jauns? — заклапочаны паныласцю на нашых тварах, кажа дзядзька і натыкаецца на сумны, з дамешкам дакору, пагляд маці.

— Кінь ты, Міхал, мудрагеліць, — адзываецца яна і кідае ў печ палена. — Кажы па-чалавечы.

— Што новага ў вас? — пераатлумачвае ён пытанне і абводзіць усіх нас па чарзе дапытлівым позіркам. — Чаму такія сумныя? Здарылася што?

Маці падхоплівае яго пад руку, шэпча штосьці ў вуха, цягне ў сені, адтуль — чуваць, як ляпаюць дзверы, — на двор.

Вяртаецца маці адна і не хутка, блізу праз паўгадзіны. Загадвае мне выйсці, а сама, ледзь паспяваю я ўзяцца за клямку дзверыны, падсаджваецца да Ларыскі. Пра што яны гамоняць, я не ведаю, хоць і здагадваюся, што вырашаецца нешта важнае.

Бацька мудруе на трасотніку з шулам, дзядзька Міхал сядзіць побач на гурбіне апалкаў і заўзята, ажно торгаюцца цягліцы пераносся, курыць. Убачыўшы мяне, мужчыны імгненна сціхаюць.

— А як усохне тваё шула, тады што? — кажа па невялікай паўзе дзядзька і дакранаецца да на траціну выдзеўбанай бэльчыны рукою. — Можа такое здарыцца?

— Канешне, можа, — адказвае бацька. — Асабліва, як шула і бэлькі сцяны не аднае пароды. Тады — дрэнь справа. Як ні круці, а чужое з чужым кепска зжываецца… То важна, каб бэлькі пасавалі ў вянцах да шула. Бэльчыну падгоніш як след да паза, і ніякая ўсушка тады не страшная. — Ён кідае сякеру, садзіцца побач з дзядзькам, таксама закурвае. — Шула — гэта ого, усёй будыніны трымач, без яго любое што да часу гахне…

Шула амаль гатовае, але вяртацца ў хату, дзе спеевыспявае штосьці нядобрае, ні адзін, ні другі не спяшаюцца. І я сунуся дамоў адзін.

Сястра ўжо не плача, толькі зрэдку, як маці адварочваецца, каб зірнуць у печ, паціху румзае.

Мужчыны ўваходзяць у хату, уладкоўваюцца ля стала.

— О, Т.! — кажа з пафасам, скрозь які прабіваецца ніякаватасць, дзядзька Міхал і па чарзе нам усім падміргвае. — Такі горад… самі паглядзіце!

Ён адшморгвае фіранку, узіраецца ў прыцемак за акном. Затым загадвае мне апрануцца, ідзе да дзвярэй.

— Куды гэта? — пытаецца маці.

— Пакажу хлопцу сёе-тое, — адказвае ён і вабіць мяне за сабою.

Тонік, які ўвесь гэты час, аказваецца, віжаваў за намі на двары з-за клеці, вымыкаецца са схову, далучаецца да нас.

Мы сядзім на руінах былога сядзібнага дома, глядзім, як міргаюць фарамі па зарэччы, на латвійскім баку, машыны. Сядзім доўга, не зважаючы на сцюжу. Сузіранне цуду, што дзеецца ўдалечыні, так захоплівае нас, што мы забываемся і на халадэчу, і на час.

Урэшце дзядзька падымаецца.

— Ну, хопіць… Вось падрасцяце, прыедзеце ў Т. вучыцца ці працаваць, пабачыце ўсё самі, — кажа і падчэплівае носам чаравіка аскепак кафлі, што застаўся ад збуранай не так даўно панскай печы. — Там жытка — не тое што тут. А чалавеку што трэба? Рыбіна дзе глыбей шукае, чалавек — дзе лепш, чулі такі выраз? Ад Інаркі вам, дарэчы, кавалеры, абодвум прывітанне, ад Рэні таксама.

Інарка — дачка дзядзькі Міхала і цёткі Шуры, мая стрыечная сястра. Рэня — Інарчына суседка, Міхалава і Шурына хрэсніца, яе мы з Тонікам дружна не-

далюбліваем за пагарду да нас ды за тое, што кпіць з нашай мовы. Абедзве прыязджалі да нас улетку і ўнеслі ў нашае ціхаплыннае вясковае існаванне тузін прыгодаў.

— Ну, хадзем ужо адсюль, а то матка абшукаецца, — кажа дзядзька і прастуе да хаты.

Ён ідзе прыгнуўшыся, быццам баіцца ўпасці, і ягоная прыбітая нейкім цяжкім одумам — ці не з-за Ларыскі — пастава на фоне высозных таполяў здаецца нам з Тонікам нават меншаю за нашы ўласныя.

Я азіраюся наастатак: прыгожае чорнае аўто весела — шчаслівае, кіруе ў Т. — міргае мне з зарэчча параю жоўтых, як кропачкі светлякоў, фараў, знікае па-за сумётамі.

У Т. з дзядзькам Міхалам едуць маці і Ларыска. Дзядзька замаўляе слова і за мяне, ды маці супраць: замалы, маўляў, няма чаго блытацца пад нагамі. Адзінае, на што яна згаджаецца, дык гэта на тое, каб я праводзіў тройцу разам з бацькам і Тонікам на падводзе пад цягнік.

Праводзіны маркотныя і занадта даўгія. Цягнік спазняецца, і мы па чарзе грэемся — амаль вясна, але мароз пад дваццаць градусаў — пры шчытку ў маленькім, вузкім, бы перадлазнік, пакойчыку касіркі. За краткамі пад шчытком порстка паходжваюць, па чарзе высоўваюць вонкі паўз загародку галовы шэры певень і белая курыца.

— Во дзе выгода вам была б, хлопцы, — кажа Ларыска, і твар яе, дагэтуль сумны і абыякавы, ненадоўга весялее. — От бы ўжо вы тут пад'елі…

Дзяцюк у кажуху ўваходзіць у пакойчык, кідае на падлогу бярэма дроў, скоса глядзіць на гаспадыню.

— Заўжды ў цябе тлум, Салюнька, — кажа незадаволеным голасам і прыхінаецца плячом да шчытка. — Любіш ты кумпанію, ох, любіш…

Касірка падымае голаў ад квіткоў, адорвае мужчыну даўгім паглядам.

— А ты ўжо не дачакаешся, — прамаўляе сцішана, і інтанацыя яе голасу здаецца мне вельмі падобнай да Ларысчынай, калі яна сустракала Васю.

Здалёку адзываецца гудком цягнік, маці стукае ў шыбіну, кліча нас на двор.

Ларыска зноў сумная, відаць па ўсім, вандроўка ёй не да душы.

Мы з Тонікам падаем ім валізы, трымаючыся падалей ад рэек, сунемся да падводы, дзе чакае бацька. Там жа, ля падводы, таўчэцца дзяцюк у кажуху. Ён па чарзе рукаецца з намі на развітанне, юрлівым ценем шмыгае ў пакой касіркі.

Вяртаюцца яны праз чатыры дні. Маці адразу ж укладвае Ларыску ў ложак і ўвесь час, што тая ляжыць, завіхаецца побач. Сястры кепска, маці кажа — прастудзілася. Але дзеля чаго тады ўсе гэтыя перавязкі, чаму бінты чырвоныя ад крыві? Стос бінтоў на шуфлядзе пры ложку шторазу заўважна танее, прытарнаваты пах лекаў пануе ў хаце. Тонік прыходзіць распытаць, што і як было ў Т., але маці тут жа, амаль з сяней, гоніць яго прэч.

— Няма чаго валэндацца, —- кажа і зашчэплівае дзверы на засоўку. — Гэта ж людзі: абы што трапіла на вочы ці ў вушы, так і панясуць па наваколлі. Каму чужое баліць…

Бацька тэпае па хаце са сціснутымі кулакамі, раз-пораз выходзіць у істопку пакурыць і разам паглядзець

сваю шулу, што падсыхае каторы дзень пад столлю над шчытком.

Я падыходжу да ложка, каб загаварыць з Ларыскаю, але яна мяне не пазнае.

— Бач, як растрэсла дзяўчыну ў цягніку, — кажа маці і гучна, наўзрыд, плача. — Т. гэты, паскудства…

Бацька кажа, што, мабыць, варта прывезці да хворай фельчара, і ўжо ўсцягвае на ногі валёнкі, каб ісці да фермы па каня, але запозна. Ларыска ўскідвае ўгору збялелую руку, пачынае трызніць. Што яна кажа, не зразумець. Голас яе слабее, слабее і ўрэшце зусім аціхае. Маці торкае ў далонь сястры запаленую свечку, кліча мяне да ложка. Але страх скоўвае мяне.

Я баюся зірнуць на Ларыску, баюся матчынага роспачлівага енку, баюся бацькавага цяжкога позірку. Баюся ўсяго, што гэтак неспадзявана ўварвалася ў нашае, дагэтуль такое ціхамірнае, жыццё.

Бацька абхоплівае мяне за плечы, але я вырываюся, кідаюся стрымгалоў да лаза ў падпечак.

Вымеценая разам са смеццем у падпечак голка (ці не тая самая!) вымыкаецца з кучы, балюча джаліць мяне ў пяту.

Бацька выходзіць з хаты і вельмі хутка вяртаецца ўдваіх з цёткаю Адальфінай. Следам за імі цягнецца, шоргае валёнкамі па падлозе Тонік. Я падаю яму знак, каб ішоў да мяне, і ён лезе ў падпечча.

Я чую, як бацька садзіцца на зэдаль ля стала, бачу насы ягоных валёнак, і мне робіцца не па сабе — акурат як тады, калі яны вярнуліся з маці з кірмашу, а я шнарыў перад тым па падстоллі ў пошуку гумак.

Маленькі, амаль бязважкі аскепак гліны зрываецца са столі падпечка мне на далонь, але я нават

не мануся яго скінуць. Доўга-доўга, аж пакуль ён не перамяняецца ў маіх змучаных глуздах у папсаваную, працятую голкаю гумку, гляджу на яго, павольна ўздымаю ўгору руку, вяртаю на ранейшае месца. Ён вісіць колькі хвілін на належным месцы і зноў, ледзь я паспяваю збольшага супакоіцца, падае на дол.

Імпрэза ў поўным разгары, у зале горача, як у лазні. Па манеры трымацца, па адрэпетавана-раскаванай — вольны свет, Т. нядаўна стаў яго часткаю — усмешцы жанчыны за трыбунаю ад першае хвіліны няцяжка здагадацца, што роля галоўнай, якую яна ці то самахоць, ці то паводле службовага абавязку (хутчэй за ўсё, апошняе) узяла на сябе, для яе звыклая і зусім не непрыемная. Ва ўсялякім разе яна так добра арыентуецца ў неабдымнай прасторы памяшкання, што, убачыўшы мой разгублены пагляд, якім я акідваю залу ў пошуку вольнага месца, тут жа паказвае мне яго ледзь улоўным жэстам у другім радзе, побач з групаю іншаземцаў, ці то кітайцаў, ці то карэйцаў.

Маладзён з азіяцкім разрэзам вачэй і слухаўкамі на цемі ветліва падкурчвае пад сябе ногі, дае мне прайсці. Другі гэтак жа ветліва прымае з вольнага сядзення тэчку з праспектамі, паважліва хітае галавой, штосьці кажа па-свойму.

Палова чацвертай, я, канешне ж, спазніўся. Зала прытомлена гудзе ў такт словам мэра, з фае даносіцца звон посуду: праз чвэрць гадзіны перапынак на каву. Наша гід Жана, маладзічка з блакітнымі вачыма і падазрона наскімі абрысамі твару, не вытручанымі дарэшты адукацыяй ды колькігадовым бліжнезамежніцтвам, адорвае мяне са свайго прыстаўнога крэсла ў праходзе прыязнаю ўсмешкай.

Мяркуючы па ўзнёсласці прамовы ды па доўгай стужцы хлапцоў і дзяўчат з букетамі, што па чарзе прэзентуюць тыя букеты людзям на першым радзе, ідзе ўшанаванне ветэранаў. Прамаўляецца ўсё па-латышску, слухавак не хапае, таму зразумець дакладна, што дзеецца на подыуме і побач з ім, немагчыма. Я нахіляюся да Жаны, каб запытацца, што да чаго.

— Пасля, — адказвае яна похапліва і зноў утароплівaецца вачамі ў сцэну.

Іншаземец здымае з галавы слухаўкі, падае мне. Я хачу адмовіцца ад дарунка, але не паспяваю: зала выбухае воплескамі, усе падымаюцца. Мой сусед разводзіць рукі ўбакі, расчараваны, мусіць, што не ўдалося паслужыць такому сімпатычнаму чалавеку, як я, сціскае маю руку ніжэй локця.

— Меня зовут Чжан Ду, — кажа, старанна вымаўляючы кожнае слова. — Можно — товарищ Ду.

Бэдж з надпісам “Харбін” понізу імя і прозвішча матляецца на ягоных грудзях, закаваных у шырспажывецкага крою пінжак, бесцырымонна шмаргае мяне кантам па шчацэ.

Я даганяю Жану, і мы ідзем упобачкі паўз абкладзеныя тэчкамі крэслы ў фае.

— Вы не павінны былі спазняцца, — кажа яна з дакорам у голасе і спыняецца ля аднаго са сталоў. — А то гэтак і ўсё прапусціце. Што вы хацелі запытацца там, у зале?

— Наконт імпрэзы. Гэта было ўшанаванне, так?

— Ушанаванне, канешне… Хіба нельга было зразумець? Я падумала…

— Што?

Яна схіляецца над сталом з намерам выбраць да кавы штосьці з печыва.

— Так, нічога… Вы маеце праграму дня? Калі не, то вось вам. — Яна корпаецца ў тэчцы, дастае паперчыну, торкае мне ў далонь. — Дарэчы, я ваша зямлячка.

— Я здагадаўся. Адкуль вы?

— Ого, адразу вам так і скажы! Па…

Трое мужчын працісквацца да стала, запаўняюць ужо ладна разбухлымі ад дармовае пачосткі целамі прастору між намі. Жана перахінаецца бокам паўз іх, ледзь чутна, бязгучна амаль шэпча:

— Пацярпіце. Дарэчы, вас шукалі… Вось як: толькі прыехалі, а ўжо вас шукаюць.

— Мяне? Шукаюць? Хто?

— Жанчына, і сімпатычная. Сказала, што прыйдзе яшчэ, каб пабачыцца. Нейкая Рэгіна.

Рэгіна?!

Фае зрушваецца з месца, высвечваючы срэбрам бутэлек з півам і мінеральнаю вадой, гэтак жа імкліва, як распачало рух, спыняецца, ссяроджваецца няўцямна-абыякаваю стрэмкаю прыпаміну ў чэраве маёй прытомленай спёкай і доўгім падарожжам істоты.

Дзень яшчэ ліпіць на тонкай павуціне апошніх жніўеньскіх прамянёў, а мы ўжо ў ложку. Мы — я і Рэгіна, за ложак нам — свежая кладня ў пуньцы.

Мне амаль сямнаццаць, Рэгіне — на паўдзясятка болей. Гэта надае нашым спатканням адценне нясветнае грахоўнасці. Прынамсі такімі лічыць іх (ці то ўдае, што лічыць) Рэгіна, а яе слова для мяне — што слова Бога.

Рэгіна — маё першае каханне, мой вядоўца ў свет таямніц дарослага жыцця. Ён, гэты свет, і прываблівае мяне, і адштурхоўвае адначасна, але першага —

болей, таму змаганне з яго не заўжды прывабнымі праявамі, падказвае мне інтуіцыя, не мае сэнсу. Таму я з імі надта і не змагаюся, а крочу назіркам усцяж выкрутасаў лёсу, плыву, бы спанталычаны фатальным збегам абставінаў матрос пасля таго, як патануў карабель, усё далей ды далей у няведамым — дзе ён, жаданы бераг? — кірунку.

На дварэ ціха, гэтаксама ціха і ў пуньцы — датуль, пакуль не адзавецца з-за сцяны (пунька — прыбудова-трысцен да хлява) хтось з быдла ці Рэгіна не пачынае шнарыць рукамі па сене.

— Што ты робіш?

— Асцюкі выбіраю, — адказвае яна і глядзіць на мяне з-пад рукі, і вочы яе загадкава паблісквaюць у паўцемры. — Мог бы дзеля нас і лепшага сена расстарацца. А так… абы-што, абы-што…

— Табе дагодзіш!

— А ты паспрабуй.

— Як?

— Казала ўжо: падвышай інтэлектуальны ўзровень. Чытаць, напрыклад, пачні. А то так і застанешся да скону вясковым невукам.

Яна дастае з-пад падушкі томік Велты Спаарэ, які паўсюль носіць з сабою, няйначай, дзеля дэманстрацыі нянаскага імя аўтаркі, бо кніжка даўно ўжо, здаецца, ёю прачытаная, усоўвае мне ў руку:

— Не Бог ведае якая цікавостка, канешне, але ж і не твой "Багроў".

Згадка пра "Багрова" — намёк на фаліянт "Дзіцячых гадоў Багрова-ўнука", які бібліятэкарка дала мне пачытаць у трэцім класе і якім на ўсе астатнія школьныя гады дарэшты адбіла ўва мне якую-кольвек ахвоту да чытання.

Я кладу кніжку воддаль, знарок, каб пазлаваць Рэгіну, прыпарушваю яе сенам. Рэгіна — стыхія са сцюдзёных, і, як ні дзіўна, мне найбольш памагаюць у стасунках з ёю менавіта перапады яе настрою, асабліва ж моманты, калі яна злуе. Покрыва няўлоўнасці нібы саслізгвае з яе ў такія хвіліны, вызваляе эмоцыі, агаляе патаемныя згібы натуры. І робіць іх уладальніцу не проста зразумелай, а нават у пэўнай ступені — безабароннай.

Але не гэта зараз мяне найболей займае, а тое, як сказаць пра нас.

Хваля рашучасці ўздымаецца ўва мне, гнаная надзеяй, дакочваецца да горла.

Цяпер або ніколі!

Я пасоўваюся шчытней да Рэгінінага разгарачанага параю ад сена ды жарсцю маіх няўмелых, хоць мне яшчэ і няўцям, што яны акурат такія, любошчаў.

— Выходзь за мяне, Рэня…

— Рэня? — кажа яна пагрозліва і тыцкае мяне тварам у сена. — Зноў ты за сваё? Я ж прасіла гэтак мяне не называць.

— Прабач… Рэгіна…

Вочы яе святлеюць, голас набрыньвае пяшчотаю.

— Выйсці за цябе? Выкінь з галавы. Які з цябе муж? Якая з мяне жонка? Як ты ўяўляеш нашае сужэнства? Ха-ха! Вось каб ведала, што гэтак уляпаюся, нізавошта не паехала б сюды… Нізавошта!

— Я кажу сур'ёзна, — прамаўляю я, і голас мой патанае ў залепленым ластаўчынымі гнёздамі прагалку паміж кроквамі страхі. Свет нібы перакульваецца ўва мне, робіцца каляным і шорсткім, як словы, што толькі што зляцелі з Рэгініных вуснаў. — Чаму? Чаму ты не хочаш?

— Таму што так трэба. Табе — вучобу пачынаць, мне — над дысертацыяй працаваць. Мала гэтага?

Яна пасоўваецца ўбок, я мкнуся ўтрымаць яе, і яе сцішана-задаволены смех поўніць пуньку.

— Перастань, я не збягаю. Перастань! — Рука яе паволі цягнецца да сумачкі ва ўзгалоўі, ляніва шнарыць па набітых парфумаю ды рознаю іншаю дзявоцкаю драбязою закутках. — Вось, прэзент…

— Можа, лепш так — без?… Ты ж ведаеш, што…

— Ага, я што — дурніца? І не думай!

Я адварочваюся, каб узброіцца "прэзентам". І не мінае і трох хвілін, як ужо мы з Рэгінаю адно, і шалёнае маё жаданне ўтрымаць яе, як і самому дарэшты належаць ёй, засціць мне глузды, ператварае ў ваяўнічапажадлівую, бессаромную жывёліну. Мне і боязна, я баюся паўтору заўчорашняе паразы, калі ўсё быццам бы гэтак жа спраўна пачыналася, а скончылася няўдачай. Але гэтым разам, здаецца, усё добра. Здаецца…

Не!

Прывід даўняе трагедыі з Ларыскай вытыркаецца з чэрава кладні, нясіліць цела, і я з жахам чую расчараваны голас Рэгіны:

— Ну, вось табе маеш… Зноў…

І хоць ні кроплі ў ім дакору ці папроку, адно толькі расчараванне, гэта мяне не ўсцешвае.

Я ўбіваюся тварам у сена, брыдкі сам сабе, спаўзаю з кладні.

Рэгіна хапае мяне за нагу, маніцца не пусціць, але мне гэта ўжо не абыходзіць.

Сена шашчыць пад маімі нагамі, і безвыходнае "ніколі, ніколі" чуецца мне ў тым шашчэнні і не адпускае нават тады, калі расчыняюцца, падхопленыя скразняком, дзверы пунькі і іншыя, знаёмыя адмалку

згукі прытомленай дзённымі турботамі вёскі абрынваюцца на мяне.

Ці кахае мяне Рэгіна? Гэта адзінае, што займае мяне цяпер, адзінае, на што хацеў бы я мець дакладны адказ. Мінулае, дзень сённяшні, будучыня — нішто не мае зараз для мяне гэткага значэння, як гэтае "ці кахае?" Тым больш што сёння яны з Інаркаю з'язджаюць у свой Т., і хто ведае, ці спаткаемся мы калі наогул.

Пах гарбаты даносіцца з разнасцежанага акна да прызбы, дзе я сяджу, шчаслівы Інарчын голас абвяшчае пачатак абеду. Не менш шчаслівы Тонікаў (сябрук праз тыдзень выпраўляецца следам за дзеўкамі ў Т. здаваць іспыты ў тэхнікум) адзываецца на яго, і толькі Рэгінінага — не чутно.

— Ты есці будзеш? — пытаецца Інарка і складвае вусны ў дакорлівую ўсмешку. — Хадзі.

Рэгіна сядзіць пры стале, прыхінуўшыся плячыма да сцяны, крэмсае відэльцам на талерцы бульбіну. Яе твар прыслонены ценем ад фіранкі, таму ён выдае амаль непранікальным.

— Стасік, вырашыў, урэшце, куды паедзеш паступаць? — пытаецца Тонік і тоўхае мяне даланёю ў бок. — Штосьці ж доўга цягамоцішся. Паехалі б удваіх у Т., весялей было б. І лягчэй. Праўда, Рэгіна?

— У Т. не вучаць на мастакоў, — адказвае яна холадна і пасоўвае ўбок талерку з рэштаю ежы. — Ты хіба не ведаеш?

— Конча на мастака паступаць? — не здаецца Тонік. — Мала іншых факультэтаў паўсюль? Убіў сабе штосьці ў голаў…

Я бачу, як напружваецца, а затым робіцца дарэшты непранікальным Рэгінін твар, употай наступаю

Тоніку на нагу. Я разумею: прысуд канчатковы і абскарджваць яго — марная справа.

Тонік запытальна-спагадліва глядзіць на мяне, але што мне з таго за наедак? Што да чыёйсьці, хай і найшчырай, спагады чалавеку, калі ўсё, чым той жыў дагэтуль, — тарчма, наперакасяк, і свет, учора яшчэ прыязна-ветлы, шырокі, раптоўна пажарстчэў, звузіўся, разбіўся на дробныя аскепкі?

— Ну, вось, здаецца, пад'ела, — кажа Рэгіна, і голас яе, паважліва-спакойны, абыякавы, крыху нібыта чымсьці незадаволены, пазбаўляе мяне апошняй ілюзіі.

Бацька ўязджае з падводаю на панадворак, прыкручвае лейчынай каня да аглоблі, ідзе ў хату.

Да прыходу цягніка на паўстанак зусім няшмат застаецца часу, і, каб не спазніцца, неўзабаве, дзесьці праз паўгадзіны, трэба пад яго выпраўляцца. Акурат гэтак яны, дзяўчаты і Тонік, і выпраўляюцца. Клічуць і мяне з сабою, але я адмаўляюся, застаюся памагаць бацькам парадкаваць у пуні прывезенае ўранні ад стожышча сена. Вядома, гэта адгаворка, але інакш я не магу.

Тонік садзіцца за фурмана. Я бачу, як уздрыгваюць наастатак Рэгініны павекі, і вось ужо нагружаная валізамі з няхітрымі вясковымі гасцінцамі падвода з'язджае з панадворка.

— Ну, не ўсё баляваць, трэба і рабіць сёе-тое, — кажа бацька і прастуе да пуні.

Мы з маці ўнізе, бацька — на кладні, і ён ледзьве паспявае пераймаць важкія зляжалыя пласты, якія я перакідваю яму віламі ў падстрэшша праз маціцу.

— Азвярэў ты, хлопец, ці што? — дзівіцца з майго неспадзеўнага працоўнага імпэту (зазвычай я — гультаяваты, як кажа маці — крыху "пры панку") і шпур-

ляе на дол пакінутую Рэгінаю кніжку аповедаў Велты Спаарэ.

Маці запытальна зіркае на мяне спадылба, уздыхае, кладзе кніжку на выступ падмурка пры лазе на гарышча хлява.

Тонкі, ледзьве ўлоўны водар Рэгініных духоў далятае да мяне ад кніжкі, перабіты пахам сена і пылу, чэзне ў вузкім праёме паміж кладнёй і сцяною пуні…

У фае гэтаксама горача, як і ў зале. Я прыхопліваю са стала бутэльку з мінеральнаю вадою, сунуся да выхаду ў дворык. Там таксама не сказаць каб надта прахалодна, да таго ж і поўна ўжо люду.

Пад крайнім ад ходніка парасонам тройца з нашае дэлегацыі частуецца півам у кампаніі імпазантнага мужчыны гадоў пяцідзесяці. Мужчына распавядае анекдот пра консула, што рызыкнуў займець больш шыкоўнае аўто, як у амбасадара, і праз тое пацярпеў. Яго шырокі чырвона-бурачковы твар свеціцца здароўем і непадробнаю шчырасцю, вочы ўзбуджана паблісквaюць.

— Пазнаёмцеся, гэта наш консул, — дачакаўшыся канца доўгага, як учорашняя стаянка на мытні, расповеду мужчыны, кажа Зяменя і падае мне кухаль з півам.

— Консул Папярэцкі, — ківае той і ўсміхаецца. — Рады яшчэ аднаму суайчынніку. Ведайце: калі ў вас узнікнуць тут якія-колечы праблемы, — я побач. Можа, маеце які асабісты клопат ці просьбу?

— Не, не маю, — няўзнак для сябе самога паддаючыся магнэзу агульнае плыні гаворкі і пераходзячы на расейскую мову, адказваю я.

Бадзёры вятрыска павявае з боку ракі, што цячэ ў колькіх метрах ад будынка мэрыі, ускалыхвае чыр-

вона-бела-чырвонае сцяжышча з жалобнаю стужкаю над нашымі галовамі.

— Што значыць гэтая стужка? — пытаецца Зяменя. — Колькі вёсак ды паселішчаў праехалі ад мяжы — усюды яна. Бы памёр хто…

Твар консула яшчэ больш ажыўляецца. Бачна, што пытанне яму даспадобы, што ён нават быццам чакаў яго.

— Чарговыя ўгодкі, як мы іх пакрыўдзілі, — кажа ён і дапівае піва. — Уяўляеце? Мы іх пакрыўдзілі, дай рады! Тут, дзе, можна сказаць, адвеку жывем, дзе цэлы мацярык з нас, больш за восемдзесят адсоткаў насельніцтва… Палітыка! — Ён хоча яшчэ штосьці дадаць да прамоўленага, але не паспявае, бо да нас падыходзіць рэферэнтка Ілга.

— Спадарыня мэр запрашае вас па ўрачыстасці да сябе ў кабінет для неафіцыйнае размовы, — кажа вабная латышачка і датыкаецца па чарзе да рукава кожнага з нас. — А пятай, як толькі ўсё скончыцца ў зале. Ваша гід вам нагадае.

Жана, якая дагэтуль непрыкметна стаяла дзесьці ўбаку, цяпер гэтак жа непрыкметна аказваецца побач, пацвярджае прамоўленае рэферэнткаю кіўком галавы.

Да канца перапынку застаецца пяць хвілін, і мы ўсе, апроч консула, які мусіць ад'ехаць кудысьці па сваіх справах, спяшаемся ў залу, дзе неўзабаве павінен пачацца (так дакляруе праграма) дакументальны фільм з гісторыі горада-пабраціма Т.

Памяшканне паспелі праветрыць, у зале калі не прахалодна, дык больш-менш свежа. Праўда, трывае гэткае даброцце нядоўга. Не мінае і чвэрці гадзіны ад пачатку фільма, як зноў запаноўвае гарачыня.

На шчасце, фільм кароткі, ад сілы на паўгадзіны. Фінал яго зала сустракае ўздыхам палёгкі. На сцэну зноў падымаецца мэр, жадае ўсім добрых уражанняў ад горада, нагадвае пра тое, што ўрачыстая вячэра адбудзецца а восьмай гадзіне ў банкетнай зале Цэнтра нацыянальных культур. Апошняе нам пераклумачвае Жана ўжо на выхадзе з памяшкання.

Абвестка нас усцешвае, на яе фоне нават перспектыва цягнуцца на прыём да мэра, што мае пачацца з хвіліны на хвіліну, ужо не здаецца такою змрочнай. Тым больш што і біць ногі шмат не даводзіцца: кабінет мэра месціцца паверхам вышэй, акурат над фае канферэнц-залы.

Мэр сустракае нас пры дзвярах. Ветлівая ўсмешка, зычлівы пагляд. Нягледзячы на спёку і напружаны рытм працы выглядае яна бадзёрай.

— Ну, вось, цяпер і на мове акупантаў можна паразмаўляць, — кажа і энергічным рухам плячэй страсае з сябе цяжар абрыдлае — так мне, прынамсі, падаецца — афіцыёзнасці.

Прыём у мэра доўжыцца каля гадзіны. Гаспадыня кабінета распавядае пра надзённыя клопаты горада, звязаныя з несупыннымі дажджамі і размыццём дарог, рамонт якіх штомесяц з'ядае львіную долю бюджэту, пра іншыя цяжкасці, якіх яны раней, да ўступу ў Еўразвяз, не ведалі, а вось зараз…

— Проста так, за прыгожыя вочы ніхто нічога не дае! — падводзіць яна рысу і з выглядам чалавека, што дарэшты выканаў свой службовы абавязак, апускаецца ў крэсла.

— Як вы? — Жана, якая дагэтуль ціхамірна падрэмвала пры канцы стала, прыязна глядзіць на мяне. — Не стаміліся?

— Крыху.

— Нічога, — кажа яна і адорвае мяне зычлівым паглядам шэра-зялёных, у аздобе густоўна падфарбаваных веек вачэй. — Адпачняце да вячэры ў гатэлі і будзеце як новы.

— А вы…

— Што я?

— Вы абяцалі сказаць наконт зямляцтва, — нагадваю я. — Адкуль вы паходзіце?

— А, гэта… — мармыча яна і пераводзіць пагляд на аднаго з нашае дэлегацыі. Той якраз пачаў гаману на тэму спорту, і мая кволенькая надзея на дыялог з Жанаю канчаткова чэзне ў плыні яго энергічнага, густа перасыпанага лічбамі статыстыкі аповеду.

Жамярына ўлятае ў акно, падхопленая струменем паветра з кандыцыянера збоч стала, мітусіцца па-над галовамі, садзіцца спартоўцу на шчаку.

Мэр выпроствае руку, з мацярынскаю ўсмешкаю на твары, што, мабыць, павінна апраўдаць фамільярнасць наступнае хвіліны, адным рухам тонкіх, бы сцябліны венерыных валасоў у вазоне насупраць, пальчыкаў адганяе назолу прэч. Выбух смеху, гаворка набывае яшчэ больш даверлівы, амаль прыяцельскі характар.

Ідылію парушае рыпенне дзвярэй. Мужчына ў чорнай камізэльцы ўваходзіць у пакой, падкрэслена сцішанаю хадой сунецца да вольнага месца. Па ўпэўненасці, з якою ён уладкоўваецца ў крэсле ўпобачкі з мэрам, няцяжка здагадацца, што ён тут не ўпершыню і пачуваецца даволі вольна.

— Віцэ-консул вашага консульства Калевіч, — кажа мэр і адорвае новага госця ўсмешкаю. — І я мушу перадаць вас у яго распараджэнне.

— Прыём у консула а палове пятай, у нас зусім няшмат часу, — кажа мужчына і абводзіць нас усіх па

чарзе праніклівым, чамусьці найдаўжэй затрымаўшы яго на мне, паглядам. — Машына пры ўваходзе, так што паспяшаемся. Колькі нас?

— З вамі пяцёра, — кажа Жана і першая ідзе да выхаду. — Гэта без мяне. А калі са мною, то шасцёра.

— З вамі ці без вас — у аўто змесцяцца толькі чацвёра, — кажа віцэ-консул і моршчыць у одуме высокі, як скляпенні калідора, што мы якраз мінаем, лоб. — То і вам, і яшчэ камусьці давядзецца застацца.

— Магу застацца я, — пагаджаецца спартовец. — Я не надта добра сябе адчуваю.

Віцэ-консул і Зяменя абменьваюцца шматзначнымі позіркамі.

— Не, — кажа па кароткім маўчанні Зяменя. — Так нельга. Консул цікавіцца спортам і будзе незадаволены вашаю адсутнасцю. А вось калі вас пакінуць… — Ён прыпыняе мяне, адводзіць убок. — Не будзеце пратэставаць, калі вас пакінем? Усё-ткі мы гаспадарнікі, і нам след быць на прыёме. Вы ж чалавек творчы, далёкі ад рэалій, што вам нашыя заземленыя, нудотныя размовы. Займіцеся чым больш прыемным, схадзіце куды, пашпацыруйце…

— Канешне, — пагаджаюся я. Шчасце сядзець дзесьці ў пакоі і выслухваць розную афіцыйную лухту мяне, сапраўды, не прываблівае. Але і тое, што мною нібы наўмысна грэбуюць, пакідае ў душы непрыемны асадак.

— Што ж гэта яны вас гэтак пракінулі з прыёмам? — іранізуе, ледзь мы застаемся ўдваіх, Жана.

— Мабыць, пабаяліся, што аб'ем, — кажу як мага весялей. — А можа, збаяліся, каб не выпарыўся дачасна на такой спёцы…

— А ці каб не жэкнулі што-небудзь не тое, — кажа яна і лёгка, бы дзяўчо, што неспадзявана пазбавілася

апекі дарослых, збягае з ганка на ходнік. — Будуць анекдотамі адзін аднаго частаваць пра начальства, дэмакратызм удаваць, то навошта ім лішнія вушы? Я вашы газеты калі-нікалі чытаю, дык цямлю, што да чаго.

— Вы разумная, аднак.

— Ну, ужо ж не зусім дурная, — смяецца яна і прыпыняе крок, каб узяць мяне пад руку.

Дзве гадзіны да абяцанае вячэры пралятаюць нібы адно імгненне. Гатэльчык, у які Жана прыводзіць мяне па кароткім шпацыры па горадзе, уражвае цішынёй і амаль што хатняю ўтульнасцю інтэр'еру. Гаспадар яго, прыбалт у другім калене і вялікі аматар чэшскага піва і сацыяльна арыентаванае эканомікі, асабіста ўручае мне ключ ад пакоя і нават праводзіць бліц-экскурсію па вузкіх, завешаных рэпрадукцыямі канцэптуальнага мастацтва і творамі мясцовых графікаў калідорах.

Пацікавіўшыся, ці не маю я ў чым патрэбу, і атрымаўшы адмоўны адказ, ён хутка знікае, і апеку нада мною пераймае Таня, сімпатычная дзяўчына гадоў дваццаці пяці. Яна прыехала ў Т. восем год таму з Браслава з намерам перабрацца пасля ў Рыгу да сваякоў, ды так тут і засталася. Таня без натугі пераходзіць з мовы на мову, у тым ліку і на беларускую, так што я пачуваюся ў гатэлі зусім не як чужынец.

А сёмай з'яўляецца Жана, і мы едзем вячэраць. Дзесяць сантымаў, якія я ахвяроўваю на праезд у аўтобусе за сябе і за яе, з каптуром кампенсуюцца адмысловым Жаніным аповедам з жыцця тутэйшага люду. Я паказваю ёй будынак, дзе месцілася колішняя беларуская гімназія, і нават паспяваю да прыпынку распавесці сёе-тое з яе гісторыі і жыццяпісаў людзей, што ёю апекаваліся.

— Што Райніс — класік, я ведаю, канешне. А вось што гэтак нас шанаваў, не здагадвалася нават, — кажа яна з нотаю няёмкасці ў голасе і падымаецца з сядзення. — Як добра, што вы да нас прыехалі!

Ля будынка Цэнтра нацыянальных культур ужо поўна народу, і мы з Жанаю вельмі хутка губляем адно аднаго з поля зроку. На пляц выходзіць Ілга, запрашае ўсіх падымацца ў банкетную залу.

Нікога з нашае дэлегацыі ў зале няма, і мне, як і ўдзень у зале паседжанняў, выпадае сядзець упобачкі з дэлегацыяй з Харбіна. З дзясятка абыходлівых кітайцаў толькі адзін, таварыш Ду, разумее па-расейску, таму добрую чвэрць вечарыны я баўлю ў самоце.

На шчасце, да мяне падыходзяць двое мастакоў, якіх я ведаю з сумеснае пазалеташняе выставы прамысловага плаката ў Львове, і запрашаюць за свой столік. Там ёсць вольнае месца, я з радасцю скарыстоўваю прапанову перасесці да іх.

За сталом, апроч мастакоў, сядзіць паэтка ў ваўнянай, аздобленай нечым блішчастым сукні і з выразам невыказнае скрухі ў вачах цэдзіць праз саломіну кактэйль. Мой прыход яна сустракае падкрэслена абыякава. Ды, ведаючы не з чужых словаў сапраўдны кошт такое жаноцкае абыякавасці, што амаль заўжды неўпрыкмет, але не без прыхаванага змыслу пераходзіць у сваю процілегласць, я не надаю таму вялікага значэння.

Тым часам народ адчувае сябе ўсё больш раскавана, сям-там гучаць спевы.

Дзесьці праз паўгадзіны ў залу ўваходзіць віцэ-консул Калевіч з маімі хаўруснікамі і Жанаю. Кампанія ўладкоўваецца за столікам у другім канцы залы. І я падымаюся, каб далучыцца да яе, бо запал, з якім дай-

маюць мяне расповедамі пра свае творчыя ды ўсялякія іншыя праблемы мастакі, адзін з якіх, аказваецца, аўтар малюнкаў у гатэлі, пачынае мяне ўжо раздражняць.

Скруха ў вачах паэткі змяняецца расчараваннем, яна праводзіць мяне полымным, як ліпеньская ноч, што абяцае шмат прыгодаў, паглядам.

— Як вам нашая Фаіна? — перахапіўшы яго, пытаецца адзін з мастакоў, што ідзе за мною следам з чаркаю ў руцэ, і, не дачакаўшыся адказу, бо я ўжо адышоўся даволі далёка, плюхаецца на вольнае месца за адным са сталоў.

На подыуме між сцэнаю і столікамі квітнеюць спічы ў гонар сяброўства-пабрацімства. Эстонскі госць, госць ізраільскі, прадстаўнік дэлегацыі з Літвы… Энергічная мэр раз-пораз дэманструе выбітны гумар, суправаджае словы выступоўцаў кароткімі трапнымі рэплікамі.

Стол, напачатку даволі сціплы, з кожнаю хвілінаю багацее. Хлопчыкі-афіцыянты снуюць у вузкіх праходах з бутэлькамі ў руках, апафеоз гасціннасці — велізарная рыбіна ў аздобе з зяленіва — займае пачэснае месца на стале пасярод залы, да яго тут жа выстройваецца чарга.

— Заўтра прыязджае іхні прэзідэнт, — кажа віцэ-консул і паблажліва ўсміхаецца. — Дарэчы, хочаце анекдот пра прэзідэнта?

Анекдот ліберальны, аж занадта, хоць, папраўдзе, гэткі ж вялы, як фізія апавядальшчыка. Мы ўсміхаемся па яго сканчэнні больш з ветлівасці, і толькі Жана ды Зяменя, каб згладзіць няёмкасць моманту, смяюцца доўга і залівіста, чым узбуджаюць цікаўнасць Фаіны.

Паэтка падымае ўгору напоўнены нечым бурачкова-чырвоным фужэрчык, махае нам здаля рукою. Збянтэ-

жаны недахопам эмоцый у нашай ацэнцы ягонага красамоўства віцэ-консул падымае чарку ў адказ, залпам выпівае. Яго высокі, з тузінам кароценькіх валасінак-паўсцінак паперадзе, над самымі бровамі, лоб пры гэтым чырванее, а вусны стульваюцца ў вузкую, як нітка бурштыну на Жанінай шыі, шчэлку.

— Мы з вамі не знаёмыя? — звяртаецца ён раптам да мяне і па-свойску падміргвае.

— Наўрад, — адказваю я і ўглядаюся ў ягоны абсыпаны дробнымі кропелькамі поту твар. — Не, не думаю, хутчэй за ўсё, — не.

— Значыць, я памыліўся, — кажа ён і прастуе праз залу да стала з рыбінай.

На адлегласці хада яго здаецца мне нібыта знаёмай. Я сілюся ўзгадаць, дзе мог раней бачыць гэтага чалавека, але дарэмна. Прытуманеныя віном і ўражаннямі дня глузды мае спяць і прачынацца, прынамсі зараз, у гэтую хвіліну, не жадаюць.

Вячэра доўжыцца амаль чатыры гадзіны. Першая адыходзіць (“Заўтра вельмі, ну вельмі адказны дзень, вы ўсе людзі дзяржаўныя, разумееце!”) мэр. Следам за ёю пакідаюць залу мэрскія чыноўнікі, так што пры гасцях застаецца толькі Ілга.

Жаны, якая выйшла кудысьці чвэрць гадзіны таму, дасюль не бачна. Знік і віцэ-консул, і калі я пытаюся пра яго ў Ілгі, яна толькі неўразуменна паціскае плячыма. Затое мастакі ўсё яшчэ тут і адыходзіць, бачна па ўсім, не збіраюцца. Фаіна, якую яны, відаць, добратакі данялі нецвярозаю балбатнёй, скарыстаўшыся момантам, падсаджваецца да нас, каб прачытаць новы, толькі што народжаны ў бурапенных нетрах вясёлага застолля верш. Пра каханне, шматабяцальна абвяшчае яна напаўголасу і складае вусны сэрцам.

Верш пафасны і вельмі, ледзь не да слёз, чуллівы. Ілга просіць яго ў аўтаркі перапісаць, але тая адмаўляецца: так бы мовіць, юбілейнае, чатырохсотае тварэнне, і барон бог яшчэ згубіцца, так што ўжо, прабачце, як-небудзь іншым разам, пазней…

— Вершы — мае дзеці, — кажа яна і падымае на мяне поўныя жадання атрымаць падтрымку ў гэткім важным перакананні вочы. — Вы як чалавек творчы мяне, напэўна, разумееце.

— Канешне, — заспеты знянацку праяваю ўвагі да сваёй персоны, падтакваю я.

— Вось і добра, і цудоўна, — голасам, у якім зліваюцца ў адно бязмежная ўдзячнасць і аванс на штосьці большае, чым звыклы флірт, працягвае яна. — Спадзяюся, вы не кінеце мяне тут адну, праводзіце дадому.

— Вядома.

— І па дарозе я пачытаю вам яшчэ. Пра каханне. Вы любіце паэзію?

Перспектыва слухаць сярэдначы вершы пяцідзесяціпяцігадовай паэткі Фаіны пра каханне мяне зусім не натхняе, і я сутаргава шукаю слоў, каб збіць яе запал. На шчасце, гэта не патрэбіцца: у размову ўступае Ілга.

— Можаце не турбавацца, Фаіна, — кажа яна і дапівае кактэйль. — У нас ёсць аўто, на ўсялякі выпадак… Кіроўца тут, так што развязем усіх, куды каму трэба. Дык можаце надта не спяшацца адыходзіць, пабудзьце яшчэ з паўгадзінкі.

— Што ж, гэта мяняе расклад, — адзываецца захмялелы Зяменя і замест таго, каб пайсці да выхаду, што не адзін раз ужо мануўся зрабіць перад гэтым, накіроўваецца да століка мастакоў.

Фаіна спапяляе Ілгу паглядам, робячы выгляд, што вельмі радая прапанове наконт аўто, налівае ў фужэр кроплю, як абмачыць вусны, віна.

Паўгадзіны расцягваюцца на цяжка сказаць колькі. І калі мы ўрэшце вырушваем з залы, гадзіннік у холе Цэнтра нацыянальных культур з шыкоўнаю выставаю з жыцця гарадоў-пабрацімаў пры ўваходзе паказвае палову першай.

Дзённая спёка прыносіць навальніцу. Мы сядзім у аўто на стаянцы пры гатэлі, чакаем, калі яна аціхне. Да дзвярэй гатэля крокаў трыццаць, але мокнуць ніхто не жадае. Маланкі раз-пораз успыхваюць, асвятляюць дворык з шыхтам дэкаратыўных дрэўцаў наўзбоч става, фантастычнымі пасамі-ланцугамі сякуць па старанна выстрыжанай траве ўздоўж цэментовай сцяны-агароджы.

Таня выскоквае на ганак са стосам цэлафанавых накідак у руках, порстка імчыць пад ляскат перуноў да машыны, садзіцца на вольнае, вызваленае хвілін дзесяць таму Фаінаю месца.

— Бачыце, якая ў нас выкшталцоная абслуга ў гатэлях, — кажа Ілга і гучна смяецца. — Ну, да заўтра!

Мы выкараскваемся па чарзе з аўто, шыбуем да будынка.

Абыходліва-ўрачысты, белатвары, бы нябожчык у Чыстцы на адной з карцін у калідоры, парцье аддае нам ключы, і мы разыходзімся па сваіх паверхах.

Дзверы ў пакой насупраць майго незачыненыя, і я бачу Жану. Яна стаіць паўголая перад люстэркам, падфарбоўвае вусны. Мяне яна не бачыць, і я, не хочучы яе бянтэжыць, адступаю ад дзвярэй у глыб калідора.

Паркеціна пад маімі нагамі гучна вішчыць. Жана паварочвае голаў, заўважае мяне. Дзверы ваннага пакоя расчыняюцца, і побач з ёю вырастае на хвіліну і тут жа знікае ў пакоі вузкаплечая, з пластком тлушчыку наўкола пояса пастава віцэ-консула Калевіча.

— Ах, прабачце! — кажа Жана і знікае за дзверыною шафкі.

Не паспяваю я, аднак, павярнуць ключ у шчыліне замка, як яна зноў выходзіць у калідор.

— Прабачце, — кажа і прыкрывае ніз твару ручніком. — Мне… Мне прыкра, праўда…

— Нічога, — запэўніваю я і, не ведаючы, як згладзіць няёмкасць, што ўзнікла гэтак нечакана, весела працягваю: — Дарэчы, памятаеце, вы абяцалі сказаць…

Напамін мой нагадвае спробу шантажу, але, на дзіва, яго дастаткова, каб Жана супакоілася.

— А, гэта, пра паходжанне! — бы тапелец за саломіну, хапаецца яна за мае словы і, пэўная, мусіць, што праўдзівага адказу ў якасці разліку за маё маўчанне пра яе сорам будзе дастаткова, голасам, быццам паведамляе невядома якую гнюснасць, прамаўляе: — Я… з Шаркаўшчыны.

Я ўваходжу ў нумар з цвёрдым намерам тае ж хвіліны рынуцца пад душ, але не паспяваю. Дзверы, якія я неабачліва пакінуў незамкнёнымі, рыпяць, у пакой увальваецца Зяменя з пляшкаю піва ў руцэ.

— Не спіш? — пытаецца ён узрушана і куляецца ў крэсла збоч стала. — Ты ведаеш, а няблага тутачка… Кабеты сімпатычныя, асабліва паэтэска, Фаіна, такая ўжо ляля. Цікава, яна замужам?

— Не ведаю, — крыху, папраўдзе, шакаваны ягоным неспадзяваным уварваннем, адказваю я.

Мой адказ яго відавочна расчароўвае, ён падымаецца з месца, гэтак жа імгненна, як і прыйшоў, са словамі “Ну, паглядзім, паглядзім!” вылятае з пакоя.

Я мкнуся як хутчэй зашчапіць дзверы, каб засцерагчыся ад новага госця, але зноў спазняюся.

Гэтым разам візітам ашчасліўлівае мяне віцэ-консул. Ад яго пахне парфумаю, расчырванелыя пасля мыцця твар і шыя выпраменьваюць здароўе.

— Не будзеце супраць, калі трохі ў вас пабуду? — кажа ён дружалюбна і дастае з пачка цыгарэту.

Ён запальвае цыгарэту, і мне нічога не застаецца, як сесці насупраць.

— Вы сапраўды мяне не памятаеце? — У голасе яго чуюцца адначасна інтрыга і занепакоенасць. — Не?

— Не, прабачце, — пачынаючы нерваваццa, адказваю я.

— Што робіць час! — уздыхае ён. — Вы ж Стасік? Так? Няўжо не помніце студэнта, што кватараваў у вашых суседзяў? Таго, што выцягваў вас ды вашага дружбака з падпечка, Васю-практыканта? А вы хаваліся ўсё… Ну ж! Ну… Васю-практыканта!

Вузкая прастора пакоя звужваецца яшчэ больш, настуджанае кандыцыянерам паветра халоднаю плёнкаю застывае між намі.

Камізэлька на рэспектабельным панку насупраць мяне змяншаецца памеру да сорак шостага, лоб вачавідзь ніжэе, твар драбнее, вочы робяцца светлымі і выразнымі, як у юнака.

Цыгарэта дрыжыць у ягоных спярэшчаных вузлаватымі венамі руках, ашмётак попелу зрываецца з яе, падае на манжэту кашулі. Ён похапкам страсае попел далонню, радасна, ажно загараюцца вочы, усклікае:

— Пазнаў! Бачу: пазнаў!

Прыступ ягонае радасці канчаткова мяне спанталычвае, я не ведаю, што рабіць. Першае, што прыходзіць у голаў, — выпхнуць яго з пакоя. Ды цела маё такое слабое па выпітым-з'едзеным, што нават паварушыцца, не тое што ўчыніць штосьці больш грунтоўнае, для мяне зараз неймаверны цяжар. Да таго ж гэты кандыцыянер…

Я цягнуся рукою да пульта, што ляжыць на тумбе ля акна, каб адключыць агрэгат, але госць апярэджвае мяне.

— Адключыць? — кажа і націскае на кнопку.

Кандыцыянер суцішваецца, і ў пакоі адразу робіцца неяк пуста і няўтульна.

— Мне сказалі, ты мастак. Гэта праўда? Я, прызнацца, тваіх прац не бачыў…

— Я займаюся наладжваннем выставаў, і толькі… Сюды ж наогул прыехаў, каб з сім-тым пабачыцца, вось і ўсё. Выкарыстаў магчымасць…

— Магчымасць не плаціць за візу? — падхоплівае ён. — Так?

— Трыццаць пяць еўра на дарозе не валяюцца.

— Плюс страхоўка, плюс кошт праезду ў два канцы… А я вось — з ветэрынарыі ды ў дыпламатыю, як бачыш. Такі вось фінт у жыцці атрымаўся…

Дзіўна, але з кожнаю хвілінаю ягоная прысутнасць раздражняе мяне ўсё менш і менш. Я сілюся выклікаць у памяці што-небудзь такое, што зрабіла б ягоную істоту яшчэ больш злавеснай, як напачатку, калі ён толькі назваўся, але гэта мне не ўдаецца. Больш за тое, я ўжо за паўкроку ад таго, каб сказаць яму пра Тоніка.

— З сябрам прыехаў пабачыцца? — быццам угадваючы мой намер, пытаецца ён і ўстае з месца. — Так?

— Так. Але размаўляць пра гэта не маю жадання. Я стаміўся, вельмі…

— Як хочаш… Прабач, што патурбаваў. Толькі вось што: пра Жану нікому не кажы, яна дама замужняя, то каб не атрымалася якая непрыемнасць, — кажа ён і ідзе да дзвярэй.

Я зашчапляю дзверы на засаўку, брыду ў ванны пакой. На душы ў мяне пуста. Мярзотная прыгнечанасць давіць на цемя, і нават тугім струменям вады не па сілах яе адтуль выпхнуць.

Вася-“заўцехнік”, ото неспадзянка!

— А я ж дык хвіліны не паспала, — жаліцца Жана і цярэбіць у одуме сваю зялёную, пад колер кофты, сумачку. — Ні хвілінкі, ведаеце…

Мы сядзім утраіх (трэці — Зяменя) на канапе ў холе гатэля, чакаем, калі выйдуць са сваіх нумароў астатнія. А палове дзясятай экскурсія па горадзе, і група з Харбіна, да якое нас далучылі, ужо чакае ў двары ў аўтобусе.

— Але ж і доўга штосьці сцэджваюцца, — бурчыць Зяменя і, пазіраючы скоса на экран тэлевізара з відарысам месца двухгадовае даўніны тэракта ў Нью-Ёрку, пачынае разважаць аб прычынах жорсткасці ў стасунках паміж людзьмі. Развагі абяцаюць быць грунтоўнымі, ды, на шчасце, нашы збягаюць у хол, і мы ідзем да аўтобуса.

— Не перадумалі ехаць да сябра? — кажа Жана. — Я перагаварыла з кіроўцам, ён не супраць вас падкінуць куды трэба пасля экскурсіі.

Кіроўца, даволі сталага веку чалавек у шэрым швэдры, ветліва матляе мне галавою, падае мапу мікрараёнаў горада.

— Ну, Жана, вас сам Бог нам паслаў, — кажа Зяменя і шырока, як гіпапатам, пазяхае. — З усіх успа-

мінаў, што ў нас застануцца, вы, бадай, будзеце найпрыемнейшым.

— Няўжо ж прыемнейшым за Фаіну? — кідае ў адказ Жана і залівіста — куды дзелася маркота — смяецца.

— О, Фаіна — па-за канкурэнцыяй! — уздымае ўгору рукі Зяменя. — Фаіна!

— Усе на месцы? — пытаецца Жана і падае кіроўцу знак ад'язджаць.

Чырвоны, з украпінамі чорнага ды шэрага горад плыве наўзбоч, сонна пазяхае насустрач проймамі вокнаў. З абклееных рэкламаю фасадаў млявымі паглядамі клічуць навяртацца да гламурнага ладу жыцця бездакорна фотагенічныя прыгажуні. Аўтобус пятляе, то вынырвае з засені дрэваў, то зноў хаваецца сярод іх. Горача. Чжан Ду злазіць з пярэдняга сядзення, уладкоўваецца на больш зручным месцы побач з Зяменем.

— Харбін — вялікі горад? — пытаецца той, і голас яго, падхоплены парывам ветру з форткі, разносіцца па салоне.

— Мегаполіс, восем тысяцы людзей, — адказвае кітаец і тут жа, спахапіўшыся, папраўляе сам сябе: — Мільёнаў восем, мільёнаў…

Уражаны лічбаю Зяменя хоча штосьці сказаць, але ўжо запозна: аўтобус уязджае на тэрыторыю фартэцыі.

Экскурсаводка, энергічная маладзіца з плецаком за спінаю, падыходзіць да нас, вядзе тунэлем у прыцемненае дрэвамі чэрава мілітаршчыны-старасветчыны.

— Ну, вось вам і колішняе апірышча імперыі, — кажа і дадае з настальгіяй у голасе: — Год дзесяць таму тут месцілася савецкая вайсковая часць і, адпаведна, гэта быў адзін з элітных раёнаў горада, а зараз, як бачыце…

Фразу яна не паспявае скончыць, бо перашкаджае гул аўто, але гэта і не патрэбна. Пустыя аканіцы бу-

дынкаў ды дзіркі ў бруку пасярод вуліцы прамаўляюць самі за сябе.

— І ўсё кату пад хвост, — падхоплівае яе словы Зяменя і плюе сабе пад ногі. — Гадства нясветнае!

— Цяпер тут самае таннае жыллё… — працягвае, ледзь толькі сціхае гул, экскурсаводка і вядзе нас углыб тэрыторыі.

— Вам даводзілася бываць тут раней? — пытаецца Жана і бярэ мяне пад руку. — Так?

— І нават начаваць двое сутак. Мой сябар рабіў у часці цесляром, і я калі-нікалі яго наведваў.

— Той самы, да якога збіраецеся ў госці? Тое я гляджу: нецікава вам. Канешне, у параўнанні з тым, што раней тут было… Дык, можа, паедзеце да сябра, пакуль аўтобус вольны? Я скажу кіроўцу.

Яна рэзка вымае руку з маёй, шыбуе паўз выбоіны назад да аўтобуса, што акурат вырульвае ўжо на шашу:

— Pagaidiet! Пачакайце!

Яе жаданне як хутчэй пазбавіцца мяне, сведкі ўчорашняе сцэны ў гатэлі, мне цалкам зразумелае: з кім не здараецца. Хоць, з іншага боку… Сужэнскія здрады, якія я некалі, па маладосці, гэтак апантана асуджаў, зараз выклікаюць у мяне адно ўсмешку.

Кіроўца высоўвае голаў з кабіны, яны перамаўляюцца. Жана жэстам рукі падзывае мяне да аўтобуса.

— Ведаеце мову, а патлумачыць, што казалася там, у зале, не пажадалі, — кажу я і падымаюся на прыступку. Папрок мой гучыць недарэчна, але Жану ён, здаецца, ані не бянтэжыць.

— Дваццаць словаў, ну, можа, трыццаць, — смяецца яна ў адказ і выводзіць штосьці пальцам на шкле з надворнага боку аўтобуса.

“Ад сілы 50!” — высвечвае, гуляючы ценямі, лічбу запацелая шыбіна і плыве наўздагон гучнаму Жанінаму, з дамешкам гарчыны, смеху.

З кватэры даносіцца музыка, але на званок мой ніхто не адгукаецца. Я тузаю ручку дзвярэй, і тае ж хвіліны яны адчыняюцца.

— Стасік? Ты? — на твары Інары спалох і здзіўленне. Яна адступае ў глыб калідора, прыкрывае далонню рот. — Але ж любіш ты неспадзянкі! Мог бы і папярэдзіць, што прыйдзеш… Ну, ужо як ёсць, уваходзь…

Кучаравы — акурат малады Тонік — юнак вызірае з-за Інарынай спіны, дае “дзень добры”.

— Прывітайся як след, Андрыс, — кажа Інара і прыбірае похапкам раскіданыя па кватэры рэчы. — Прабач, што гэтак нячыста. Я ж прадпрымальніца зараз, ездзіла ў Маскву па тавар, уначы вярнулася, дык не паспела прыбраць…

Я дастаю з сумкі пакунак з гасцінцамі, і ён вокамгненна губляецца на канапе сярод гурбіны штаноў, камізэлек і рознага іншага кірмашовага рыззя. Андрыс употай, бы малое дзіця, выхоплівае з яго колькі цукерчын, вырашыўшы, відаць, што болей тут няма чаго з намі, мастадонтамі, рабіць, знікае ў другім пакоі.

— З Тонькам мы не жывем, — кажа Інара і садзіцца на канапу. — Ужо два гады… Ты не ведаў? Мяне дасталі ягоныя п’янкі. Чым штодня такое бачыць, лепш ужо адной быць. Не згіну, дам рады! Не глядзі на мой рот! Ніяк не збяруся да дантыста. Ды і дорага. Што ў цябе?

— Ехаў пабачыцца з Тонікам, а тут вось такое… Дзе ён?

— У фартэцыі, напэўна, дзе яшчэ… Там поўна падполаў, займаюць лыгі каму каторы глянецца. Я сама не бачыла яго, але кажуць, што там. Спіўся ўшчэнт. Жытло сваё — мы размянялі трохпакаёўку па разводзе — збаёдаў, прадаў за капейкі нейкаму таўстасуму… Нават сына не парупіўся прапісаць, хоць што хлопец меў бы з часам, а так… Андрыс мяне таксама непакоіць, вельмі.

— Чаму? Здаецца, нармальны хлопец…

— Вось-вось, здаецца. — Інара падхопліваецца з канапы, са злосцю расшкамутвае стос рыззя. — Мышы, халера! Пра што гэта мы? А, Андрыс… — яна пераходзіць на шэпт. — Быў бы нармальны, каб не звязаўся з шваллю. Ды з якою! Зрэшты, мы з Тонькам самі вінаватыя. Тонька гэтак піў перад тым, як я зацяжарала, што я баялася раджаць: раптам калека народзіцца? Дый алкагалізм, я чула, перадаецца ў спадчыну, вось і падумвала перарваць… Доўга мучылася, ды так і не наважылася давесці да канца… А тут Тонька ўзяў ды ляпнуў неяк на падпітку Андрысу пра тыя мае здумкі-пакуты. Хлопцу шаснаццаць тады было, сам разумееш, якая магла быць рэакцыя. З таго часу і пайшло-паехала ў нас усё абы-як. Занурыўся, усё, што ні робіць, — наўпроць… Хацела да псіхолага завесці — адмаўляецца.

— Мама, перастань гнаць істэрыку, — падае голас са свайго пакоя Андрыс. — Я нічога благога не раблю. Ні-чо-га! — Ён вызірае з дзвярэй, акідвае мяне цікаўным паглядам. — Чым частаваць госця байкамі, лепш бы кавы прапанавала.

Інара змаўкае, сядае на канапу, але тут жа зноў падхопліваецца.

— А праўда, прабач, Стасік, — кажа і ідзе ў кухню. — Прабач, што гэтак сустракаю. Ведаеш, гэтулькі ўсяго навальваецца, што галава кругам… Ад суда ледзь

адбілася, ставілі пытанне аб перасяленні ў сацыяльны дом за няўплату… А там п'янюгі адны ды зладзеі. У мяне запазычанасць за кватэру дзве тысячы латаў, гэта амаль чатыры тысячы даляраў. Дзе ўзяць такія грошы? Добра, Ірэнцы пашчасціла знайсці працу ў Манчэстары, прысылае сто даляраў у тыдзень, паціху сплачваем. З кіпрыётам, піша, пасябравала, нібыта пабрацца ёй прапаноўвае, то, можа, і назаўжды застанецца ў Англіі.

Ірэнка — дачка Інары і Тоніка, апошні раз я бачыў яе падчас канікулаў у вёсцы: мілае дзяўчо з дзвюма тонкімі коскамі цераз плячо.

— А ці лёгка гэта — выправіць дзіця, ды яшчэ якое гэтак цяжка далося (ты ж ведаеш, як я позна нарадзіла), у чужую краіну і кожную хвіліну думаць, як яно там.

Кава моцная і густая, як кісель, да таго ж аддае чамусьці вішняю.

У пакоі Андрыса адзываецца мабільнік. Інара сціхае, навострвае вушы.

— Мам, Ірка! На…

Інара прыліпае вухам да тэлефона.

— Вы надоўга да нас? — пытаецца Андрыс і схіляе ўбок — бацькава звычка — падфарбаваную белым галаву.

— Паслязаўтра з'язджаю, віза ў мяне на чатыры дні.

— Шкада…

Чаму шкада, ён не дагаворвае, бо зноў у гаворку ўступае Інара. Пасля размовы з дачкою яна значна павесялела, нават пасвятлела з твару.

— Ты па-ранейшаму нацыяналіст? — пытаецца яна і пераводзіць пагляд на сцяну са здымкамі, сярод якіх я пазнаю наш сумесны з Тонікам падчас мітынгу ў Курапатах дзесяцігадовае даўніны. — Усё яшчэ ходзіш на сходкі?

— Не так часта, як раней, але зрэдку бываю. Хоць, папраўдзе, палітыка мяне ўжо не надта цікавіць.

— Расчараваўся? Ат, што я пытаюся, многія расчараваліся. Як згадаю, як сама сядзела пры тэлеку тады, на пачатку дзевяностых, дык сабе не веру, што гэткая была палітызаваная. Цяпер жа адзін клопат: выжыць як-небудзь, здабыць капейчыну. Сам ведаеш, як цяжка адной даваць усяму рады…

Я хачу сказаць ёй пра Васю, але не рашаюся: наўрад гэта зараз будзе дарэчы. І замест таго, каб сказаць, што круціцца на языку, дастаю з кішэні грошы.

— Вось, вазьмі, Інара.

Яна з хвіліну неўразуменна глядзіць на маю далонь.

— Што ты! Не трэба! Во яшчэ надумаўся… — голас яе слабее, робіцца дрыготкім і нерашучым.

— Тут усяго сотня еўра, тое, што я не плаціў за візу і праезд. Гэта замест прэзента, я ніколі вам нічога не дарыў. Будзем лічыць, што гэта я дзядзьку Міхалу вяртаю…

Яна бярэ грошы, павагаўшыся, нібы раздумваючы, ці добра зрабіла, кладзе іх на шуфляду.

Не ведаю, што ўдае ў гэтую хвіліну мой твар, але яна падымаецца, з выглядам, быццам я ўжо сказаў “да пабачэння”, падае мне руку.

— Дарэчы, Рэгіна пра цябе ўвесь час пытаецца. Можа, хочаш з ёю спаткацца? Я патэлефаную ёй, скажу, што ты ў Т.

— Яна ведае.

— Вось як! А мне нічога не сказала, от сяброўка! Дык вы ўжо сустракаліся?

— Не.

— Гаварылі па тэлефоне? Зрэшты, што гэта я лезу не ў сваё… — Інара адпускае маю далонь, ідзе ў калі-

дор. — Вось! Вось чым займаецца мой сын! — кажа і падхоплівае на хаду з зэдля нейкі часопіс з выяваю двух юнакоў у напалову спушчаных джынсах, што са смакам цалуюцца ля рассцеленага ложка.

Часопіс называецца “Logos-contact” — гэта апошняе, што я бачу перад тым, як вымыкаецца з пакоя Андрыс і выхоплівае яго з рук маці.

Я вяртаюся ў гатэль каля паловы трэцяй. Вандроўка па горадзе стаміла мяне, ды і спатканне з Інараю і Андрысам не дадалі, папраўдзе, бадзёрасці. Таму найпершая мая зараз мара — адпачыць перад вячэраю. Адпачыць як след, а далей бачна будзе, што ды як.

Час абеду яшчэ не скончыўся, і я цягнуся ў буфет, з якога выходзяць купкамі поўныя ўражанняў ад экскурсіі ў фартэцыю, з вачавідзь пакруглелымі жыватамі ад нязвыклых прыбалтыйска-еўрапейскіх прысмакаў харбінцы.

Есці мне не хочацца, толькі піць — ці не нагадвае пра сябе неабачліва з’едзенае ў горадзе занадта салодкае марозіва. Жанчына, што сядзіць у самоце збоч дзвярэй буфета, рэзка падымаецца з канапы, кідаецца мне напярэймы.

— Стас! Гэта ты? — кажа, і яе трымцлівы радасны голас падаецца мне занадта пафасным, а злёгку распаўнелы, хоць усё яшчэ вабны стан — неспасціжна-чужым. — Ну, можа, пацалуеш мяне?

Рэгіна.

Яна падстаўляе шчаку, і мой мусовы — куды тут дзенешся — пацалунак засведчвае пачатак нашае першае за трыццаць гадоў пасля расстання сустрэчы.

— Ну, як ты?

— Усё добра. А ты як?

Мы ўсаджваемся за столік, моўчкі глядзім колькі часу адно на аднаго.

— Як твае? — першая парушае паўзу Рэгіна.

— Дзякуй, усё добра.

— Я заўжды цікавілася праз Інару тваімі справамі. Нават, ці паверыш, ведаю імёны тваіх сыноў. А ў мяне вось дачка. Тут, у Т. жыве. Ужо замужам, нядаўна ўнучкаю мяне ашчаслівіла. Табе, можа, нецікава ўсё гэта…

Мне, сапраўды, не надта цікава, але казаць пра гэта не выпадае.

— Не, што ты, наадварот. Ты працуеш?

— Выкладаю крыху ва ўніверсітэце, — кажа яна і круціць у далоні цыгарэту. — Кандыдат навук, хоць, папраўдзе, якая там навука… Так, вякнула штосьці год дваццаць таму пра памежныя культурна-этнаграфічныя стасункі, прычынілася да ўслаўлення, так бы мовіць, дружбы паміж народамі. А й добра, і прыдалося пад старасць кандыдацтва. Кадраў са ступенямі зараз мала ў вучэльнях, дык шануюць… І пасля дасягнення пенсійнага ўзросту да таго ж можна са ступенню працаваць. А гэта і капейчына лішняя, як сам разумееш, і з людзьмі стасункі.

— Словам, задаволеная жыццём?

— Як сказаць? Напэўна… У маладосці ў раскошы за добрым мужам — ён дырэктарствараў на заводзе — пажыла, свету пабачыла, пра непамысноты матэрыяльныя і размовы ніколі не было. Цяпер сціплей, канешне, як адна засталася, жыву, але ж, пэўна, не горш за іншых. Ды і дачка добрая ў мяне, не кіне, паможа, калі што якое…

Яна дастае з сумачкі некалькі здымкаў, раскладае веерам на стале.

— Гэта Ян, муж, ён у пазамінулым годзе памёр з інфаркту, згарэў, можна сказаць, на працы. На дзесяць гадоў быў за мяне старэйшы і такі ўважлівы заўжды… Гэта дачка і зяць, мы ўтраіх у Юрмале залетась падчас фестывалю “Новая хваля”. Унучку паказала б, ды, на жаль, няма тут нічога з сабою прыстойнага. Ты не крыўдуеш на мяне, што гэтак тады з табой абышлася?

— Я? — Пытанне заспявае мяне знянацку, я не ведаю, што сказаць.

— Дай агню. — Яна нахіляецца да мяне, абдае водарам духоў уперамешку з пахам тытуню. — Ці ты не курыш, можа?

Афіцыянт падскоквае да століка, паслужліва падносіць ёй газнічку. Рэгіна зацягваецца дымам, прыжмурвае вочы.

— Успамін пра шчаслівае мінулае — не лепшае суцяшэнне для жанчыны ў гэткім веку, як мой, — кажа і зноў похапліва глытае дым. — Прызнацца, мне было часам шкада, што так між намі адбылося. Але ты не адказаў на маё пытанне.

— Ці куру я? Ты ж бачыш: не.

— Не тое… Ці крыўдуеш ты на мяне?

— Ужо не. Хоць, папраўдзе, мне таксама, здаралася, было шкада.

— Ці мне гэта здаецца, ці мы насамрэч аб адным і тым жа шкадуем? — кажа яна ціхім голасам, і мне выразна чуецца ў ім водгулле далёкага-жаданага, ды няспраўджанага. — Я нават, помніцца, з-за імя цябе даставала, такая была сцерва…

Яна абводзіць паглядам размаляваныя садавіною сцены памяшкання, кідае ў попельніцу недапалак, падпраўляе прычоску.

— Пра Тоніка ведаеш?

— Ведаю, Інара распавяла.

— Маеш намер з ім спаткацца?

— Як атрымаецца. Няблага было б.

— Вось як яно ўсё паварочваецца. — Яна ўздыхае, лезе ў сумачку па насоўку. — Праводзіш мяне? Пагамонім па дарозе.

Яна падымаецца, ідзе да выхаду.

— А можаш і не праводзіць, не пакрыўджуся, — кажа і дадае: — Шкада то шкада, ды, вярніся ўсё зноў, не ведаю, ці зрабіла б я іначай, як тады зрабіла. Хоць хто ведае… Ты кніжку тады знайшоў маю? Памятаеш кніжку Велты Спаарэ? Я знарок, між іншым, яе пакінула. Каб пры выпадку мець нагоду для спаткання. Ты, мабыць, адразу выкінуў яе?

— Пасля бацькавай смерці на гарышчы натыкнуўся сярод рознага друзу. І не выкінуў, аддаў камусьці.

— Але ж і пры сабе не пакінуў. Ат, прабач, што я кажу, хто мы адно аднаму? Ніхто.

Мы выходзім з гатэля, моўчкі прастуем да трамвайнага прыпынку.

— Ніхто, — кажа яна зноў і прыспешвае крок, і ўрэшце ідзе так хутка, і хлясцік на яе плашчыку матляецца ў такт крокам так рашуча, што мне нічога не застаецца, як ёй паверыць.

Я думаю пра тое, што яна, мабыць, запросіць мяне дахаты. І калі яна, сапраўды, прапаноўвае зайсці да яе на каву, адгаворка ў мяне да такой ступені гатовая, што імгненна злятае з вуснаў.

Яшчэ толькі палова шостай, і ў калідоры ціха, бы ў кляштары. Жана з Фаінаю сядзяць на канапе пры дзвярах буфета, штосьці тлумачаць па чарзе разамле-

ламу ад спёкі ды суседства кабет таварышу Ду. Харбінец пры парадзе, яго чорныя, наваксаваныя да бляску туфлі свецяцца, як люстэрка. Жана першая заўважае мяне, твар яе, дагэтуль бесклапотны, імгненна хмурнее.

— Вячэраем у бары а сёмай, — кажа яна і строга, быццам паведамляе невядома якую важную навіну, дадае: — Вас расшукваў віцэ-консул. Сказаў, што прыедзе за гадзіну да вячэры.

Яна зноў паварочваецца тварам да харбінца, і мне міжволі даводзіцца стаць ахвяраю Фаінінай гамонкасці.

— Я, мабыць, кепска выглядаю, — жаліцца паэтка. — Сёння праз усю ноч не заснула, лезлі ў глузды рыфмы праклятыя… О-ох! — Яна адкідвае голаў, робіць выгляд, быццам ратуецца ад непераадольнага жадання пазяхнуць, прыкрывае рот рукою. — Што за жыццё стала! Хачу да мамы ў Варонеж з'ездзіць, а ўсё не выпадае — гэтулькі мітрэнгі з візаю, ды і выдаткі не абы-якія. Раней, бывала, квіток купіў, сеў у цягнік, сюды-туды, і вось ён, Варонеж, дом радзінны… Зноў жа, з тутэйшымі было лягчэй ладзіць. Галас ледзь падымуць пра ўціск, а мы ім — іхняй жа зброяй — у адказ: " Пад акупацыяй вы? Пад акупацыяй! То і змоўкніце!". Цяпер гэткае не пройдзе. Вось я пляменнікаў сюды, у Т., за савецкім часам паперацягвала з Варонежа… А яны цяпер наракаюць: навошта, маўляў? З працаю цяжка, круціцца трэба, а не хочацца, не прывыклі, усё прынясі-падай… І ўдзячнасці ніякай, адно і глядзяць, каб што паймець з цябе. Быццам самой мне нічога не трэба… Во конча камп'ютар трэба купіць… Зусім іншая выгода, а то скрозь паперы ў кватэры, не дапрыбірацца. Прэзентую сама сабе к дню нараджэння…

Маналог абяцае быць працяглым, гэта мяне засмучае. Выручае Жанін мабільнік.

— Гэта Ілга, яна ў бары, — кажа яна па хвіліне размовы і ўстае з канапы. — Фаіна, мы мусім ехаць сёетое памагчы Ілзе, яна просіць… Прабачце, мужчыны.

— Ехаць, ехаць, — хітае галавою кітаец і таксама падымаецца. — Ехаць.

— Вам не трэба, — спыняе яго Фаіна, і ён зноў садзіцца. Пра што ён думае пры гэтым — невядома, і я, каб унікнуць перспектывы чарговы раз стаць суразмоўцам — цяпер ужо дапытліваму ўсходняму сябру, — хуценька іду ў свой пакой.

У нумары прахалодна і нязвыкла — пасля святочнае гамэрні ў горадзе ды несупыннага тараторання Фаіны — ціха. Я кладуся на ложак з надзеяй хоць на хвіліну заснуць, але дарэмна. Ледзь змежваю павекі, як перад вачыма ўзнікае пастава віцэ-консула Васі Калевіча. Да ягонага прыходу, калі ён насамрэч прыйдзе, застаецца дзесяць хвілін. Што ён хоча? Зноў пачне казытаць згадкамі пра тое далёкае вясковае? Вось ужо з кім хацеў бы я як менш размаўляць. Ды так яно: чаго пазбягаеш, тое і даганяе.

Пра Тоніка я не думаю. Дакладней, думаю, але думкі пра яго — абрывістыя і вялыя — самі міжволі чэзнуць, ледзь нарадзіўшыся.

Хтосьці падыходзіць да дзвярэй, кранае ручку.

Набрыяліненая віцэ-консулава галава з праборам на левай скроні энергічна ўсоўваецца ў праём, падхоплены скразняком з форткі водар адэкалону разліваецца па пакоі.

— Прабач, што турбую. З раніцы шукаю моманту з табою перагаварыць, — кажа ён і сядае на ўчарашняе месца. — Я замовіў каву, дык пагамонім крыху. Ты не супраць?

— Хай будзе так, — ці то кажу, ці то думаю — у галаве туман — я.

Таня ўваходзіць у нумар, ставіць на стол два кубкі кавы і сподак з печывам, уключае электрагарбатнік.

— Што не ў гуморы? Бачыўся з Тонікам?

— Адкуль вы ведаеце пра мой намер з ім пабачыцца?

— Што ты ўсё выкаеш? Мог бы і тыкнуць раз дзеля прыліку, гэтулькі гадоў знаёмыя. Адкуль ведаю? Здагадаўся, калі ты сказаў, што шукаеш чалавека. Каго тут табе яшчэ шукаць? Я, дарэчы, таксама яго доўга расшукваў…

— І ці знай… шлі? — Я хачу сказаць "знайшоў", але язык пратэстуе. — Знайшлі?

— А як жа, знайшоў, канешне. — Ён перастаўляе кубак са стала на канапу, старанна перамешвае пітво лыжкай. — Усё пустое, яму нічым не паможаш. Патэнтаваны хронік. Купіш касцюм, і заўтра ён яго прап'е. Грошы дасі — і толькі горш зробіш, бо будзе квасіць да пасінення. Гэтаксама з працаю. Неяк памог уладкавацца вартаўніком у кветнік, і што ты думаеш? Збег, не вытрымаў "рэжыму". А рэжыму таго — пасядзець-пахадзіць ля ружаў-лілеяў тры разы на тыдзень. Некандыцыі заўжды шмат, пры жаданні і гандлянуць можна, сякую-такую капейчыну ў сям'ю прынесці. Дзе там, баронь бог! Палячыцца прапаноўваў — і слухаць не жадае. Ат, што пустое казаць… Чалавек без тормазу. Тут упісвацца трэба ў новыя рэаліі, а гэта — не па ім. Не ўпісаўся і ніколі не ўпішацца. І адсутнасць грамадзянства, і іншае такое — не ў тым справа, усё значна прасцей. Людзі ж жывуць тут і няблага жывуць, хоць бы вашых некаторых узяць…

— Што ж будзе з ім?

— А хто ведае… Змерзне калі ўзімку, ці аўто прыдушыць п'янага. Звычайная рэч, на жаль…

— Чаму вы гэтак пра яго клапоціцеся?

— Таму што адчуваю віну перад вамі ўсімі. Ты ж ведаеш: з-за Ларысы. Гэта заўсёдны мой боль. — Ён адсоўваецца ў глыб пакоя, суцішваецца. — Не ведаю, што і думаць, як тады яно атрымалася. Тры разы мы толькі з ёю ўсяго пабавіліся, ды і гумкаю я карыстаўся. У падстоллі ў вас пачак быў, я браў цішком… А во як атрымалася, хто б мог падумаць… Я праз паўгода дзесьці пра ўсё даведаўся, месца сабе не знаходзіў. Я бабнік, канешне, дрэнь, ды не быдляк жа кончаны… Чаму ты маўчыш? Скажы што-небудзь.

— Што я магу сказаць?

— Хоць што! Мацюкніся ці плюнь на мяне…

— Не бачу сэнсу. Ды, папраўдзе, і права наўрад маю… Тады б — плюнуў, і не толькі… — Словы самі вымыкаюцца з маіх вуснаў — такое ўражанне, быццам не я іх прамаўляю, а хтосьці іншы, хто сядзіць ува мне зараз і хто, мабыць, сядзеў заўсёды, ды не асмельваўся да часу вымыкацца ўсе гэтыя гады. Вымыкаюцца лёгка, як пераспелае зерне з коласа, як пара з гарбатніка, што вось ужо колькі часу сіпіць, заходзіцца ёю, пакрыўджаны няўвагаю людзей, на падваконніку. — Хочаце яшчэ кавы?

Ён падстаўляе кубак, нашы рукі на хвіліну судакранаюцца, і я адчуваю, як дрыжыць ягоная.

— Табе так абыякавае мінулае?

— Мінулым не будзеш жыць вечна. Ды і рахункі ў кожнага свае да яго.

— Я не ведаю, не ведаю, як гэта здарылася, — кажа ён і насыпае ў кубак каву. — Сорак гадоў мкнуся даўмецца і ніяк не дам рады… Ты мне не верыш…

— Чаму, веру, — гэтым разам сваім, а не таго, хто старонні ўва мне, голасам адказваю я і падаю яму цукар.

— Праўда? — ажно падскоквае ён ад радасці і ўпіваецца мне даланёю ў запясце. — Няўжо праўда?

— Ад'язджаем, ад'язджаем, — даносіцца з калідора голас Жаны.

Сівы, з плехам на ўсё цемя чалавек падымаецца з месца, нібыта жадаючы ды ніяк не могучы скінуць з плячэй не абы-які цяжар, торгае плячыма. Мне шкада яго, ды не настолькі, каб тут жа, гэтае хвіліны спыніць яго ды падзяліцца з ім цяжарам уласным.

У бары тлумна і горача, пахне каваю. Моладзь трэцца ля стойкі з напоямі, гучна перамаўляецца. Зала, у якой мае быць вячэра, знаходзіцца за перагародкаю насупраць, там пуста, толькі бачна, як завіхаюцца ля сталоў афіцыянткі.

Двое хлопцаў, пабраўшыся за рукі, размаўляюць у прыцемку на канапе, то аддаляюцца адзін ад аднаго, то зноў зліваюцца ў экстазе ўзаемаразумення. Яны сядзяць так шчытна, што цені іх сілуэтаў на сцяне зліваюцца ў адзін. Адзін з хлопцаў устае, хісткім няпэўным крокам накіроўваецца ў мой бок.

Бледны, з кругамі наўкола вачэй твар, знаёмая ўсмешка. Другі таксама падымаецца, ідзе следам за першым.

— Гэта Валік, мой сябар. Мы пазнаёміліся праз інтэрнэт, а потым аказалася, што і жывем у адным мікрараёне. Вы бачылі бацьку?

Валік, падае мне руку, стульвае вусны ў іранічнай усмешцы.

— Не, не бачыў, на жаль. І не ведаю, ці ўжо наогул пабачу. Наўрад паспею, заўтра ад'язджаць…

Андрыс прыхінаецца плячом да стойкі, абводзіць паглядам шыхт бутэлек на вітрыне.

— І не варта, — кажа бы між іншым і, какетліва выгнуўшыся зацягнутым у скуру станам, абдымае Валіка.

— Чаму?

— Таму што ён сам не жадае нікога бачыць.

— І цябе?

— Магчыма, жадае. Але я не жадаю.

— Чаму так?

— Не жадаю, і ўсё. Хай жыве, як хоча. Кожны мае права жыць, як хоча. Вас здзіўляюць мае паводзіны? Можаце не адказваць, сам бачу: здзіўляюць. А мне плявацъ. Днямі мы з Валікам едзем у Юрмалу. Потым, калі ўдасца, перабярэмся куды-небудзь у Еўропу. Магчыма, у Манчэстар паедзем, да Іркі… Вось так, бывай, Т.! Дарэчы, здзіўлю вас яшчэ раз: я не підар.

— Як так?

— Вельмі проста, звычайны падман, блеф. Насуперак бацькам, калі даведаўся, што маці не хацела мяне раджаць. Які гэта быў для мяне ўдар! Спачатку я ад злосці ды крыўды падзіравіў ім усе гумкі. Натыкнуўся ў шуфлядзе пры ложку на пачак — і голкаю іх, голкаю… Мяне не хацелі, дык вось вам ад мяне дарунак! Вам, вясковаму, ужо прабачце за нетактоўны напамін, у маім узросце гэткія жарсці, пэўна, і не сніліся… Ды дарэмна я з тымі гумкамі стараўся, абышлося без браціка-сястрычкі. Шкада… А праз год мы вось пазнаёміліся з Валікам, і тады я вырашыў папомсціцца інакшай. Маці любіць пра жаніцьбу завесці пры нагодзе гаману, ну, там пра нявестку, унукаў — звычайныя жаночыя тары-бары, самі ведаеце. Вось тады я і аб'явіў пра сваю нібыта блакітнасць. Так і так, нічога з наш-

чадкамі не атрымаецца, агідныя мне жанчыны, мужчын люблю. Маўляў, вось вы пры нараджэнні без ахвоты такога, як Бог даў, мяне прынялі, дык цяпер такога прыміце, якім сам хачу быць. Нібыта хачу, разумееце?

— Значыць, усё гэта — тэатр, маскарад? Усе гэтыя часопісы, манера апранацца? Ці не занадта жорстка ў дачыненні да маці?

— Можа, і жорстка, але — справядліва, згадзіцеся. Да таго ж я павінен цяпер, абавязаны падтрымліваць Валіка. Ён быў адзіны, хто зразумеў мяне, калі было кепска, памог у нядобрую хвіліну… Цяпер мая чарга. І мне пляваць на яго арыентацыю. Любіць трэба тых, хто нас любіць, ці не так? І не трэба мяне перасцерагаць: ах, што, як крый бог… Тым болей што, можа, і прыдасца мне, і неаднойчы, яшчэ ўвесь гэты, як вы кажаце, маскарад. Кажуць, у замежжы праз гееўскае асяроддзе заўжды прыезджым лацвей уладкавацца, чым праз якое іншае. Вось і скарыстаюся… А маці… Ёй скажу наастатак, ад'язджаючы, каб надта не перажывала. Скажу, вядома… І зараз бы сказаў, ды рагязы не хочацца лішне нарабляць. Ужо няхай будзе да часу, як ёсць.

— Гэта, напэўна, цяжка?

— Што?

— Удаваць таго, кім не з'яўляешся. Не быць сабою.

— А вы заўжды такі, як насамрэч? А іншыя? Колькі вы прыгадаеце сваіх знаёмых, якія нічога і нікога не ўдаюць? Шмат? Ісці насуперак заўжды цяжка, вы гэта, пэўна, ведаеце не горш за мяне. Але ж што за жыццё будзе, як ніхто не будзе таго рабіць…

— Навошта вам з'язджаць, вы маглі б і тут няблага ўладкавацца.

— Тут? Вы не ўяўляеце, што такое правінцыя. — Ён змаўкае на хвіліну, скоса, нібы вагаючыся, ці казаць,

што думае, ці не, пазіраючы на мяне, прамаўляе: — Вы гэтак перажываеце за бацьку, між вамі, напэўна, што-небудзь было ў маладосці? У сэнсе…

Тройца нашых на чале з Жанаю ўваходзіць у бар, накіроўваецца ў банкетную залу, дзе ўжо шмат — і калі паспелі прыйсці? — іншых гасцей. Фаіна ў суправаджэнні Зямені і спадара Ду праплывае паўз мяне, абдае воблакам парфумы.

— Хадзем, хадзем, — кажа Зяменя і цягне мяне следам за паэткаю ў банкетную залу.

— …у сэнсе сексу, — выгукае наўздагон нам Андрыс, і ягоны голас працінае мне вушы бязглуздасцю прыпушчання.

Вячэра расцягваецца да поўначы. Першымі адыходзяць — употайкі, ні з кім не развітаўшыся, — Фаіна і Зяменя. Усе на добрым падпітку, таму ніхто знікнення пары, здаецца, не заўважае. Толькі незадаволены спрытам суперніка і вераломствам паэткі таварыш Ду маркотна круціць у руцэ недапіты келіх ды чухае галаву.

Жана размаўляе з кімсьці па мабільніку.

— Мэр просіць конча яе дачакацца, — кажа па размове і цярэбіць у руцэ сурвэтку. — Яны толькі што праводзілі прэзідэнта, і яна ўжо едзе сюды. Літаральна пяць хвілін пачакаць…

Папярэджанне выглядае як просьба, але гэта лішняе: і без таго пакідаць гасціну ніхто не спяшаецца.

Мне цікава, чаму няма віцэ-консула, але даймаць такім пытаннем Жану не хочацца, і я маўчу.

Мэр уваходзіць у залу, накіроўваецца да столікаў: ветлівая, паводле этыкету, усмешка, падзяка за візіт, апошні, пад сцішаны гул застолля, тост.

— Ну, вось, і фініш, здаецца, — кажа Жана, і мне чуецца ў яе голасе палёгка.

У зале пры стойцы, дзе бавіцца моладзь, яшчэ больш шматлюдна, як напачатку, і я затрымліваюся на хвіліну ў спадзеве ўбачыць Андрыса. Ён сам заўважае мяне, ідзе напярэймы.

— Не крыўдуйце на мяне, — кажа і разводзіць рукі ўбакі. — І не засмучайцеся, што бацьку не пабачылі. Я пашукаю яго, скажу, што вы былі. Калі ён у стане будзе хоць што ўспрымаць. Шкада, што ўжо з'язджаеце.

— Мне таксама, — кажу я, і маё ненаўмысна-злачыннае мінулае, згарнуўшыся да памеру пары ягоных вачэй, што глядзяць мне ўслед (я заўважаю іх у люстэрку перад дзвярыма), нябачным ценем валачэцца следам за мною да выхаду.

На дварэ дождж, гэтым разам, праўда, без навальніцы. У аўтобусе прахалодна і вольна: кітайцы ад'ехалі раней, каб паспець на цягнік да Рыгі, ды і нашых паменела.

— Вы ці не скралі сурвэтку? — смяецца Жана і хапае мяне за руку. — Ай-я-яй, ну ж сорам!

Далонь мая выпростваецца, жоўта-залацістая вышыванка бліскае ў паўзмроку дробнымі кветкамі, падае долу. Я адчуваю сябе няёмка, і Жана літасціва прыходзіць мне на дапамогу.

— Не камплексуйце, — кажа і кладзе сурвэтку сабе на калені. — Не знарок жа вы яе панеслі, з кім не здараецца. Хай у мяне застаецца, вярну як-небудзь пры нагодзе ў бар. — Яна разглядае тканіну, і вочы яе загараюцца гарэзлівым агнём. — А можа і не вярну. Рэч

неблагая, застанецца хоць што на памяць пра вас. Яня прыгожыя рэчы любіць, дарма што вясковая.

— Яня? Ваша дачка, мабыць?

— У мяне сын, адзіны. Яня — гэта я сама. Іаана, а яшчэ правільней — Югана.

— Ажно чатыры імі! Але ж! Амаль па адным на кожны дзень тыдня!

— А вы думалі… Ці ж мы з вамі, беларусіны, такія простыя людцы? Ну, вось, цяпер вы ўсё пра мяне, здаецца, ведаеце. Усё, што жадалі, і нават больш.

Я хачу спытаць, ці добра гэта, ці кепска — больш, але Жана апярэджвае мяне бадзёрым, бы майскі гром, смехам. І мне нічога не застаецца, як бегчы следам за астатнімі ў гатэль, каб там, удалечыні ад старонніх вачэй, аддацца чарговы раз чарвячку сумневу. Таго самага, што ўранні ўсё яшчэ бадзёрыць душу спадзевам на спатканне з Тонікам, а напрыканцы дня, спанталычаны маёю нібыта незнарочыстаю — ах, гэтая мітусня! — абыякавасцю да лёсу сябра, выпаўзае вужакай з нетраў памяці і вярэдзіць, вярэдзіць глузды дакорам.

У гатэлі ціха, нават цішэй, як учора. Толькі што з'ехалі літоўцы, рыхтуюцца да ад'езду і іншыя дэлегацыі, так што да раніцы застаемся адно мы. Я іду да пакоя Зямені, каб папытацца, у колькі ад'язджаем, але ён не адзываецца: мабыць, Фаіна залюляла вершамі пра каханне.

Размова з Андрысам раз-пораз пракручваецца ў мяне ў галаве, не дае спакою, вярэдзіць адчуваннем віны перад Тонікам: трэба, трэба было расшукаць. Ды далей дакору справа не ідзе: я занадта стомлены ды і куды зараз, сярэдначы, бегчы?

Я лезу пад душ і затым, ледзь вярнуўшыся да ложка, адразу засынаю.

Мне сніцца бацька. Ён вышчэплівае ў шуле сякераю чарговы пазок. Трэскі з шумам пырскаюць з-пад ляза, разлятаюцца ва ўсе бакі. Раптам сякерышча крышыцца, і бацька, не жадаючы марнаваць час на яго замену, пачынае хуценька — надвячорак, а паспець скончыць працу трэба да змяркання — вышчэпліваць дрэва кіпцюрамі. Драўніна каляная, і бацькавы далоні ўвобміг робяцца чырвонымі ад крыві.

Людзі без твараў — ні вачэй, ні вуснаў, ні насоў — па чарзе ўзыходзяць на трасотнік, бяруць па шчэпіне, хаваюць пад вопратку. Ларыска, цётка Адальфіна, дзядзька Міхал, маці, усіх іх я пазнаю па паставах. Апошнімі з'яўляюцца на трасотніку Рэгіна і Тонік.

Бацька выдзірае з камля чарговую шчэпку, яна, пакружыўшыся ў паветры, з ціхім шоргатам кладзецца ля Тонікавых ног. Тонік нагінаецца, каб падняць яе, але не дае рады: шчэпка выслізгвае з ягоных рук, падхопленая ветрам, узлятае на дах клеці.

Дзядзька Міхал выходзіць наперад, каб аддаць Тоніку сваю, але той не хоча браць і борзда, як толькі можа, бяжыць прэч, туды, дзе чырванеюць цэглаю муры старое фартэцыі.

"Ну, а ты што?" — кажа бацька і падае мне скрываўленую, з вялізным мазалём на далоні руку. Я мкнуся дацягнуцца да яе, але не паспяваю. Моцны вецер уздымаецца над нашымі галовамі, падхоплівае мяне, нясе кудысьці.

Агромністы, як мора, мегаполіс свеціцца агнямі ўдалечыні, і вось я ў ім, і вузкавокі чалавек з бэджам на грудзях вядзе мяне дзівіцца на чайную цырымонію.

Гейша па імі Фаіна выходзіць нам насустрач, вершы раямі вылятаюць з яе вуснаў, асядаюць гірляндамі на галінах магнолій. “Вунь яны”, — кажа яна і ківае ў бок прыбудовы, у якой стаяць (усё бачна, бо дзверы будыніны расчыненыя) прыкутыя ланцугамі да слупа, бы святы Пётра ў Мамерцінскай вязніцы, віцэ-консул Вася Калевіч і Тонік.

Бэлькі выслізгваюць з шула ў куце прыбудовы, абрушваюцца на Тоніка. Я кідаюся ратаваць сябра, але мяне апярэджвае бацька. “Парода да пароды мусіць быць, а яшчэ лепш — калі добра падагнана”, — кажа і заганяе бэлькі сякераю ў пазы. Ды яны зноў праз хвіліну вымыкаюцца адтуль, з грукатам падаюць нам на галовы. Бацька разгублена міргае, хапае адною рукою за плячо Тоніка, другою мяне, цягне прэч з прыбудовы…

Парушаныя грукатам будынкі мегаполіса ўздрыгваюць, паволі распаўзаюцца ва ўсе бакі, трушчачы паселішчы наўкола, мкнуцца ўсё далей і далей і ўрэшце, калі ўсё пачынае нагадваць пустэльню, асядаюць долу…

Гэта апошняе, што я бачу: воблака пылу паўзе па-над зямлёю, і густая, як ноч, цемра запаноўвае над усім…

Я прачынаюся а шостай. Ад’езд а дзявятай, і ў гатэлі ціша, толькі кроплі дажджу, што сцякаюць на падваконнік з даху, парушаюць яе аднастайным, метадычным цурчэннем.

Падымацца не хочацца, і я доўга качаюся ў ложку, то праглядаю прэзентаваныя Ілгаю і Жанаю напярэдадні праспекты, то проста ляжу ўтаропіўшыся вачыма ў столь. Сілюся зноў заснуць, але беспаспяхова: ледзь змежу павекі, як пачынае здавацца, быццам я не ў пакоі,

а ў нейкай скрыні. На шчасце, сродак змагання з гэткаю пошасцю мне вядомы: уключыць святло і ляжаць, ляжаць з расплюшчанымі вачыма, пакуль туман не зацемніць глузды.

Прахопліваюся я зноў ад тэлефоннага званка.

— Прабачце, — кажа парцье, — вы прасілі пабудзіць вас а палове восьмай.

Зборы займаюць паўгадзіны.

Калі я спускаюся ў хол, усе нашы і Жана ўжо там. Усе паснедалі ўжо і цяпер мусяць чакаць, калі тое ж зраблю я.

Аўто стаіць на рамарэнце пры браме. Зяменя садзіцца побач з кіроўцам, загадвае запускаць матор.

— Фаіна тэлефанавала, жадае ўсім шчаслівай дарогі, — кажа Жана і схмурвае тонкія ільняна-шэрыя броўкі. — Я таксама. Шкада, што ад'язджаеце, вельмі, вельмі было з вамі добра.

Яна яшчэ нешта кажа, але я не ўслухоўваюся ў яе словы. Увагу маю прыцягвае чорная "volvo", што з'язджае з шашы ў завулак. Мне падаецца чамусьці, што гэта віцэ-консул Калевіч, і я прашу Зяменю хвіліну пачакаць.

"Volvo" спыняецца ля брамы, разварочваецца, вяртаецца зноў на шашу.

Значыць, не віцэ-консул. Дзіўна, але мне нават шкада, што гэта не ён — быццам абрываецца апошняя повязь з мінулым. З не надта прыемным і ўсё ж — блізкім, дарагім.

— Ну, з Богам, — кажа Зяменя, і аўто вырульвае на шашу следам за "volvo".

Дарога да мытні займае дзве з паловай гадзіны — з улікам часу, што змарнавалі ў краме на выездзе з Т.

дзеля набыцця мясцовых рознасцяў-прысмакаў. Разлічвалі прабыць там хвілін дзесяць, а правалэндаліся ля паліцаў, бы тыя жанкі, усе сорак. Затое і затаварыліся: багажнік як не трэсне.

— Можа, гэтым разам больш пашанцуе, не давядзецца зашмат чакаць, — кажа Зяменя і загадвае кіроўцу прытармазіць вярсты за тры ад памежнага шлагбаума. — Усе пры дакументах, ніхто не забыўся пашпарт у гатэлі?

Пытанне рытарычнае і гучыць недарэчна, ды ніхто пярэчыць Зяменю не жадае: што карысці псаваць нервы ды яшчэ ў гэткую спёку?

Чорнае аўто нячутна падрульвае ззаду, спыняецца побач з намі. Віцэ-консул Калевіч вылазіць з яго, вітаецца з кожным за руку, просіць мяне выйсці на хвіліну. Адводзіць убок, ціха, нібы асцерагаецца, каб не пачулі нашую гаману астатнія, кажа:

— Там паглядзі, хата іхняя нібыта пустая стаіць, можа, угаворым Тоніка пераехаць. Можа, хоць родныя сцены памогуць яму, так бывае, ведаеш… А я, калі што якое, тут плячо падстаўлю, памагу з афармленнем дакументаў. Даведкі там розныя, іншыя паперы… Абы толькі сам ён не ўпёрся рогам… Дык памяркуй… Грошы спатрэбяцца — не шкадуй, усё сплачу, да капейкі.

— Няблага было б, — адказваю я, і нявер'е ў станоўчы зыход ягонае задумы прабіваецца паўз мае вусны так незаўважна, што я і сам яго ледзь-ледзь улоўліваю.

— Ну, тады бывай, — кажа ён і ідзе да машыны.

Я гляджу яму наўздагон, і ўражанне, што час спыніўся, захрас на мяжы двух светаў, ахоплівае мяне. Як неўпрыцям усё зрабілася неістотным з прамінулага жыцця, як незаўважна аддалілася, стала абыякавым тое, што колісь гарачыла кроў, казытала глузды спадзевам на новыя далягляды!

Мне горача і хочацца як хутчэй дадому. Я думаю пра няспраўджанае жаданне цёткі Шуры вярнуцца па мужавай смерці дажываць век у родныя мясціны, затым пра Тонікавых сына ды дачку, што асталююцца, хутчэй за ўсё, назаўжды ў якой-небудзь Англіі, урэшце, пра сваіх сыноў, унукаў і жонку і міжволі — каторы раз за апошнія дні — згадваю бацькава шула і яго больш як саракагадовае даўніны размову з дзядзькам Міхалам на трасотніку.

Жаночы твар з няпэўнымі абрысамі — маці? Ларыска? Рэгіна? — мільгае перад маімі вачыма, я правальваюся ў хісткую, як марыва над полем пасля дажджу, дрэму. І прачынаюся толькі ў Мураванцы — ад Зяменевага воклічу:

— Охці-вохці, ёрш т-тваю р-раз, было — і няма.

Я прахопліваюся ад одуму, і відарыс са збураным котлішчам рымара Ванагіса, што паўстае наўзбоч, збівае мяне з тропу: ні коміна, ні падпечка, ні нават цаглініны. Толькі самотны куст парэчніку ды сляды ад падводы, што губляюцца сярод прыбітага коламі быльнягу, ды ўсё тая ж купка здзічэлых вішняў на краі паўвыспы.

— А ўмеюць частаваць гэтыя еўразвязаўцы, умеюць пыл пусціць у вочы, — кажа Зяменя і смачна пружыніцца ўсім целам. — А няхай…

Мытнік, той самы, што гэтак доўга мучыў нас тры дні таму чаканнем на ўездзе, падыходзіць да аўто, каб спраўдзіць дакументы, і чарада ластавак між кроквамі ангара адзываецца на ягоныя крокі похапліва-сцішаным шорганнем крылаў.

ТЫДЗЕНЬ ВЯЛІКАЙ КОТКІ

Аповесць

I

— Вось так яно ўсё і выплывае на свет Божы, — з выглядам чалавека, які згубіў падчас стыхійнае навалы ўсіх сваіх крэўных, прамаўляе Алуша, і гэтак знаёмая Дарашэнку напятасць жончынага голасу канчаткова пазбаўляе яго надзеі на які-кольвек дыялог. — Дык у вас з гэтаю Люсяй, можа, і дзеці ёсць? Можа, і ўнукі таксама? А мы і чуць пра іх не чулі, і ведаць не ведаем. Пазнаёміў бы ўжо, ці што… Ёсць? Колькі? Ну, прызнайся!

Твар яе пярэсціцца плямамі, колер вачэй імкліва перамяняецца з шэрага на рудаваты — першая прыкмета, што прыступ злосці будзе працяглым. А гэта значыць — спрачацца не варта. Бо цяпер яна будзе гаварыць ды гаварыць, як заведзеная, аж пакуль не стоміцца. І кожнае ягонае неабачлівае слова толькі падліе масла ў агонь. Такая ўжо ў кабеціны заюшлівая натура, нездарма ж — мастачка.

Алуша вырабляе батык і прадае яго праз ралет на кірмашы. Галоўным чынам гэта выявы дзявочых твараў і экзатычных кветак на фоне бляклых пасаў дажджу ці, наадварот, да рэзі ўваччу яркіх сонечных прамянёў. Да таго, як заняцца батыкам, жонка працавала настаўніцай малявання ў школе для дзяцей з затрымкамі псіхічнага развіцця, што, відаць, і паўплывала, хоць сама яна так не лічыць і баронь бог лішні раз нагадаць ёй пра тое, на яе творчую — або толькі чорнае, або толькі белае, і ні пядзі ўбок — палітру.

— Алуша, ну чаму нельга пагаварыць спакойна? — употай спелячы спадзеў хоць на якое, хоць на самае кволае, замірэнне, прамаўляе Дарашэнка. — Мы ж не дзеці, здаецца… Можна высветліць усё цывілізавана…

— Во-во, цывілізавана! Цы-ві-лі-за-ва-на — о, як гэта ўпісваецца ў тваю жыццёвую схему: паводзіны абавязкова ў адпаведнасці з узростам і каб усё пры тым было цывілізавана і ціха! А дакладней — шыта-крыта. І гэтаму ты, мабыць, і моладзь вучыш? Нішто сабе навука!

Апошняе — намёк на Дарашэнкаву працу ў тэхнікуме, дзе ён па выхадзе на пенсію, каб крыху падперці хісткі сямейны бюджэт, застаўся выкладаць на чвэрць стаўкі сваю фізіку. І хоць словы Алушыны па-ранейшаму гучаць злосна і твар яе ўсё яшчэ гарыць абурэннем, ён, аднак, не можа не заўважыць, што гэта ўжо не тыя неўтаймоўныя злосць і абурэнне, што былі напачатку. Значыць, неўзабаве яна супакоіцца, і прыступ агрэсіі зменіцца апатыяй. Вось толькі калі тое будзе?

Ох, сітуацыя! І собіла яму вымкнуцца з тым двухгадовае даўніны Люсіным лістом! Быццам Люсі, з якою яны не бачыліся сорак з гакам год, адно і клопату, што чакаць ягонага прыезду. Тым больш што і не адпісаў

ён тады Люсі, хоць, папраўдзе, і карцела. Але як ты давядзеш Алушы, што ягоная пуцёўка менавіта ў той самы дом адпачынку, дзе два гады таму рабіла Люся, — чыстая выпадковасць? Што зусім не дзеля спаткання з Люсяй, а адзіна каб крыху падлячыцца ды пабыць у адзіноце, падалей ад абрыдлых хатніх клопатаў, ён туды выпраўляецца? І наогул, невядома яшчэ, ці працуе яна ў гэным доме…

— Спадзяюся, ты хоць не забыўся пра наш заўтрашні візіт да Кірыкаў, — кажа Алуша, і перамена тэмы размовы, ды яшчэ ў такім неспадзявана ціхамірным тоне, міжволі прымушае Дарашэнку насцярожыцца. Алушын характар — як надвор'е ўвосень: на тыдзень зменаў восем. І галоўнае, ніколі не ведаеш, якім сюрпрызам абернецца праз хвіліну ўдаваная лагоднасць.

— Не забыўся.

— Ну, і на тым дзякуй… Хоць нешта ўрэшце…

Кірыкі — сям'я Алушынага стрыечнага брата-бізнесоўца Андрэя. Неблагія, хоць, папраўдзе, светапоглядна не так ужо блізкія Дарашэнкам людзі.

Узмажнеўшы ў бурапенны час перабудовы на вывазе ў Польшчу прасаў і рознага іншага побытавага прычындалля, Андрэй Кірык і ягоная жонка Нэля, былая доктарка, так удала распарадзіліся займетымі ад таго паўлегальнага гандлю грашовымі сродкамі, што сёння могуць дазволіць сабе рэчы, якія Дарашэнкам і не снілася. Да прыкладу, тую ж выправу ў Прагу, з якой днямі вярнуліся, нагружаныя пад завязку бра ды люстрамі з праўдзівага чэшскага шкла.

Заўтра спаўняецца дзесяць год, як не стала малодшай дачкі Кірыкаў Олі, адной з дзвюх забітых нейкім маньякам з інтэрвалам у паўмесяца дзяўчын-падлеткаў. Злачынствы тады шмат нарабілі галасу ў мікра-

раёне і ва ўсім горадзе, ды так і засталіся, здаецца, дасюль не раскрытымі.

— Не забыцца купіць чаго-небудзь. Лікёру можна, Нэля любіць лікёр. Ці каньяку… Цукерак якіх, печыва альбо торт… А то заявімся без анічога, з пустымі рукамі, няёмка будзе.

Перавод гаманы ў практычнае рэчышча канчаткова супакойвае Дарашэнку. Да таго ж з калідора даносіцца званок.

Алуша ідзе адчыняць, і праз хвіліну ў дзвярах вырастае мажная Ігарава постаць. Іх дваццацісямігадовы сын-аспірант, які паставіў сабе за мэту не жаніцца раней, як абароніць кандыдацкую дысертацыю, жыве асобна ад бацькоў, у інтэрнаце, і ягоны прыход — дадатковая гарантыя, што вяртанне да тэмы пра Люсю сёння не пагражае.

Ігар — вялікі майстар мірыць продкаў. І робіць ён гэта так спрытна, з выкарыстаннем такіх тонкіх прэвентыўных захадаў, што Дарашэнка і Алуша часам і міргнуць не паспяваюць, як тэма спрэчкі ўжо надзейненька зачынена.

— А, дыпламат наш сямейны, як добра, што завітаў! Заначуеш у нас? — кажа Алуша і, атрымаўшы станоўчы адказ у выглядзе сцвярджальнага сынавага кіўка, дастае з серванта бутэльку віна. Заўтра з раніцы, перад тым як выправіцца да Кірыкаў, яна яшчэ мае намер схадзіць у капліцу, а якая ж малітва ў гэткім растузаным стане… То вось, можа, фужэрчык напою якраз і адцягне думкі ад прыкрае перапалкі з мужам ды дадасць раўнавагі перад споведдзю…

Што ў сына непрыемнасці з абаронай дысертацыі, бо ягоны навуковы кіраўнік акурат за месяц да яе ўмудрыўся грунтоўна перасварыцца з-за нейкай драбязы

з калегамі з атэстацыйнай камісіі і цяпер немінуча чакай помсты з іх боку, яна, як і муж, ведае не горш за самога Ігара. Але распачынаць прыкрую размову не жадае: карысці з тае гамонкі, толькі развярэдзіш душу перад ноччу ды сапсуеш дарэшты і без таго далёка не мажорны настрой.

Палова дзявятай, а на дварэ, нягледзячы на задуху апошніх дзён, шэра і хмурна, як у верасні. Гэтаксама шэра і ў кватэры, толькі блікі ад экрана слізгануць раз-пораз па адпятай на палову акна гардзіне. Сфакусуюцца на імгненне вузкім пукам святла на паставах мужчын пры тэлевізары і зноў рассыпяцца веерам па шчыльна завешанай батыкам сцяне.

— Не дрэнкен коп!* — дэманструючы, як заўсёды ў хвіліну ўзруху, ашмёткі ведаў з замежных моваў, якія яна раз-пораз папаўняе праз гартанне розных размоўнікаў (рэцыдыў няздзейсненага намеру вывучыцца на перакладчыцу), кажа Алуша, і выраз яе твару, і без таго не сказаць каб лагодны, робіцца яшчэ больш незадаволеным. — Што мне да вашага салона ды ўсёй гэтай аўталухты? Толькі і чуеш штодня: стырно, запальванне, каробка перадач… Быццам ужо і размаўляць больш няма пра што. Я ў такім мандражы, а вы са сваімі глупствамі.

Яна ўсторквае на ногі туфлі, знікае ў ванным пакоі.

Глупствы, на яе думку, — мужава з Ігарам пустое (“ані яны вам калі свецяць, гэткія машыны!”) захапленне найноўшымі аўто. Прычына яе мандражу — споведзь, дзеля якой яна збіраецца ў капліцу ледзь

* Не тлумі галавы! (сапс. з ідыш).

не ад самага золаку і дзеля якой нават адмовілася ад звыклай ранішняй цыгарэты.

Ды, як захапленне мужчын машынамі яна лічыць бессэнсоўным, бо і насамрэч яно ў практычным плане далей прагляду ды абмеркавання перадач тэлеканала DISCOVERY не сягае, так і яе пабожнасць, у сваю чаргу, ім таксама чымсьці надзвычайным не здаецца.

Дзесяць год таму Алуша выбрала канфесію так паспешліва, у такім эмацыйным запале, што наўрад той выбар можна лічыць дарэшты ўсвядомленым і абгрунтаваным. За выняткам хіба таго няпэўнага, нічым не пацверджанага прыпушчання, быццам хтосьці з яе продкаў быў католікам. Пра што павінна сведчыць і яе метрычнае каталіцкае імя Альдона, якое яна сама падчас вучобы ў інстытуце памяняла на больш звыклае Ала. Дарашэнку часам нават здаецца, што яна ўжо ўпотай шкадуе аб зробленым выбары і пры выпадку зноў вярнулася б да зручных — жыві, як жывецца, і ніякага табе рэлігійнага свербу — часоў нікуды-не-належання.

— Вось, я ў поўным ажуры, — абзываецца Алуша — яна ўжо ў калідоры — і застывае перад люстэркам. — А вы што седзіце? Ігар, развязеш нас? Я спачатку ў капліцу, а адразу па споведзі — да Кірыкаў. Так што чакай мяне там, Зянонавіч, чуеш? — Яна нахіляецца да мужа, слізгае далонню па ягоных валасах.

Любасны жэст — няйначай, дзеля прыліку, але Дарашэнку бачыцца ў ім жаданне канчатковага прымірэння пасля ўчорашняга непаразумення, і ён згодна хітае галавой.

Жытло Кірыкаў месціцца на восьмым паверсе. І ўсё тут іначай, як у Дарашэнкаў. Перагародка з нержавейкі

перад ліфтам. Дыванок у самім ліфце. Падвойныя масіўныя дзверы з надпісам *+K+M+B* угары. Надпіс сведчыць, што гаспадары жытла, як і Алуша, — католікі.

Насамрэч каталічка толькі гаспадыня, Нэля, якая, у адрозненне ад Алушы, ведае свой радавод да шостага калена. А прозвішча аднаго з прашчураў, сына збяднелага шляхціца, нядаўна нават адшукала ў спісе манахаў разбуранага з прыходам Саветаў на "крэсы" францішканскага кляштара часоў Рэчы Паспалітай.

Жанчыны калі-нікалі разам ходзяць у капліцу, хоць сказаць пры гэтым, што надта сімпатызуюць адна адной, не выпадае. Алушы не даспадобы Нэліна меркантыльнасць. Нэлю раздражняюць у Алушы катэгарычнасць меркаванняў і празмерная схільнасць да фемінізму. Што, аднак, зусім не перашкаджае ім супрацоўнічаць падчас дабрачынных акцый, якія штомесяц наладжвае мясцовае аддзяленне "CARITAS"* для дзяцей-сіротаў і інвалідаў.

Букет пахаў ірвецца Дарашэнку насустрач з кухні, і ён у думках хваліць жонку за падказку купіць лікёру.

— Памятаеце, які сёння дзень? Ну, дзякуй, — кажа Нэля і падае мужу знак адкаркаваць напой. — А мне здаецца часам, што ўсе забыліся пра нашу дачушку. Людзі так хутка пра ўсё забываюцца… І тым больш прыемна, што хоць вы з Алушай памятаеце.

Яна вядзе госця ў пакой, дзе пры Олінай фотцы на стале са стравамі наўзбоч новага чэшскага бра з шыкоўнымі падвескамі гарыць свечка.

— Вось, як жывая дзяўчына на здымку. Як быццам учора ўсё было. Трэба было мне заснуць тады на радасць таму гаду… Ніколі сабе не дарую, ніколі…

---

* Дабрачынная каталіцкая арганізацыя.

Нэля ўпусціла тады Олю праз дамафон у пад'езд, а сама тым часам заснула на канапе. А калі прачнулася, дачкі ў кватэры ўсё яшчэ не было. Пайшла шукаць па пад'ездзе ды і знайшла нежывую, з шалікам на горле, у закутку пляцоўкі перад уваходам на гарышча…

Андрэй уносіць паднос з ежаю, ставіць на стол. Ён, відаць, чуў размову, бо тут жа пачынае супакойваць жонку. Дарашэнка таксама мкнецца зрабіць унёсак у справу, зазначае, што, маўляў, адліюцца забойцу матчыны слёзы. Але парыў ягоны, наўздзіў, не знаходзіць у гаспадыні адабрэння.

— Што ты! — кажа яна і рашуча адсоўваецца ад яго, бы ад нясветнага ерэтыка. — Крый Бог! Хай застаецца ўсё, як ёсць. *Яго* зловяць — і *ёй* горай будзе на тым свеце. Што заўгодна, ды толькі не помста. Айцец Зміцер, наш святар, кажа, нішто так не есць чалавека знутры, як яна, помста. Пачнеш помсціцца, а ў выніку — сам сабе толькі нашкодзіш. Сточыць помста вантробы, бы шашаль гаржэтку…

Андрэй падтаквае ёй, і Дарашэнкава маўклівая нязгода з гэткаю высновай — дараваць забойцу, як можна? — ціхамірна патанае ў суладнай цвярдыні іх хрысціянскай усёдаравальнасці.

— Дык што, едзеш адпачыць? — пераводзіць размову на іншае Андрэй. — Надоўга? Добра табе… А мы вось з Нэляй ніяк не збярэмся за слугаваннем мамоне*. Сцягаліся на тыдзень у Прагу ды Берлін, але хіба гэта адпачынак? Дарога такая цяжкая, ды і ўражанняў тых кот наплакаў, адно паспяваеш падчас язды ад прыбіральні да прыбіральні "Макдональдсы" з іхнімі вар'яцкімі фаст-фудамі за акном аўтобуса лічыць…

---

* Бажаство багацця ў некаторых народаў.

— Гаворыш абы-што, — кажа Нэля і лагодна падміргвае Дарашэнку. — Прыдумаў — мамоне! Падумае чалавек, мы тут няведама які крымінал развялі. Можна і наогул нічым не займацца, а такому мамоне слугаваць, што і чорту не прысніцца. Тым больш не для сябе стараемся, хочацца ж Жэні памагчы.

Жэня — другая, старэйшая Андрэева і Нэліна дачка, равесніца Ігара. Два гады таму яна выйшла замуж за кіпрыёта турэцкага паходжання і з'ехала з ім да яго на радзіму. З'ехала насуперак волі бацькоў, таму напамін пра яе з вуснаў Нэлі, якая зазвычай балючай тэмы не чапае, выглядае дзіўнавата.

— А вось у палітычныя авантуры менш трэба лезці, — працягвае Нэля і моршчыць лоб. — Такі складаны час для прадпрымальнікаў, адну за адной фірмы зачыняюць, а ён, бач, у страйкавы камітэт упісаўся. Паведаміць хто з "зычліўцаў" куды след — і гамон справе, шукай тады вінаватых. Ну, не так, Саша?

— Можа, і так, — кажа Дарашэнка і зноў чамусьці — каторы раз цягам апошніх дзён — згадвае Люсін ліст. Згадка такая ліпкая, што нават тады, калі Андрэй заводзіць размову пра нюансы працы ў фірме па продажы радыёапаратуры, якую ён пяць год таму адчыніў у складчыну з яшчэ адным сваяком, Дарашэнка не дае рады ад яе адчапіцца. І толькі Алушын прыход ненадоўга, бо жанчыны амаль адразу зачыняюцца ў пакоі, каб пагаманіць сам-насам, крыху прыцьмяняе яе.

— А прызнайся, што ўсё яшчэ неабыякавы да гэтай Люсі, — кажа Алуша і з выглядам пакрыўджанага дзіцяці — звычайная яе манера паводзінаў неўзабаве па замірэнні — адводзіць пагляд убок. Злосць усё яшчэ прабіваецца ў яе голасе, але гэта ўжо хутчэй злосць

на мяжы даравання — усцешны вынік доўгай начной размовы Дарашэнкі з жонкаю напярэдадні ягонай выправы ў дом адпачынку. — Цяпер мне зразумела, чаму ты ажно тры гады мітрэнжыўся з прапановаю пабрацца шлюбам… Ніяк *яе* не мог забыцца!

— Ага, так і ёсць, якая ж ты здагадлівая, — кажа ён, імкнучыся надаць голасу як мага болей сарказму.

Канешне, ён пакрывіў бы душой, калі б працягваў даводзіць, што едзе ў той дом без таемнага намеру пабачыць Люсю: з песні слова не выкінеш. І Алуша не такая дурніца, каб пра гэта не здагадацца. Так што яе бурную рэакцыю на ягонае рашэнне ехаць менавіта ў *той самы дом* цалкам можна зразумець: хто ж будзе радавацца, што яго спрабуюць трымаць за дурня? Абраза і падман, хай сабе і ў выглядзе маўчанкі, заўжды ходзяць поруч. І не жанчыну, які б вынаходлівы і спрытны ні быў мужчына, на зазуб тае маўчанкі беспакарана падсякаць.

Гэта была першая іх размова, падчас якой ён распавёў жонцы *ўсё* пра свае дзяцінна-юнацкія стасункі з Люсяй Гарнак.

Але што значыць — *усё*? Як можна распавесці камусьці *ўсё* пра акалічнасці таго, што часам нават самому сабе не можаш належным чынам растлумачыць? Не кажучы ўжо пра нейкія інтымныя падрабязнасці, што, як правіла, суправаджаюць падобныя гісторыі. Кшталту таго ж помнага кожным з нас ад гадоў маленства камяка ў горле ад доўгачаканага пагляду, дотыку, усмеху ўпадабанага чалавека, што апячэ душу праяваю нечаканай прыязнасці ды застанецца ў памяці на фоне абыякавасці іншых людзей як ледзь не самае дарагое, што здарылася з намі ў жыцці.

Адзінае, у чым ён не быў упэўнены на тую хвіліну, — гэта тое, ці дасць Алуша яму веры. Жанчын жа заўсёды найперш цікавіць — *ці было*, а калі *было*, то *што*? І тут паспрабуй даць рады не патрапіць у нерат недаверу. Скажаш, што было — значыць, юрлівец, валацуга. Скажаш, што *не было*, — значыць, хлус, бо не быць пры гэткім жаданні сустрэцца праз гады папросту не можа.

Як ні дзіўна, Алуша такога пытання яму не задала. Быццам адчула яго недарэчнасць і дыпламатычна ўнікла, хоць, магчыма (і хутчэй за ўсё, што так), і круцілася тое пытанне ў кабеціны на языку.

Галава цягніка з кропкаю святла паперадзе вынырвае з-за павароту, набліжаецца да станцыі.

— Дык што — неабыякавы? — нагадвае пытанне Алуша і саступае пад ціскам пасажыраў з пляцоўкі на суседнія рэйкі. — Ну, што тут скажаш! Тэлефануй, як што спатрэбіцца… Дарэмна Ігараў мабільнік не ўзяў, вось і будзеш мучыцца, шукаць якой тэлефоннай будкі, калі наогул яны там яшчэ ёсць.

І дадае быццам паўжартам ужо пад самы адыход саставу:

— Глядзі ж, хоць там без глупстваў…

Яна нешта кажа яшчэ, але словы яе патанаюць у гудку цеплавоза. І неўзабаве і сама яна, ухутаная завесаю ці то дыму, ці то шэрані — надвячоркам прайшоў пасля невыноснае паўдзённае спёкі спорны дождж, а прыпарка па-ранейшаму трымаецца — знікае з вачэй пад вясёлы постук колаў цягніка.

Састаў то гайданецца на павароце, то суцішыць рух, то зусім спыніцца на чарговым паўстанку. Субота, люду ў цягніку няшмат. Купэ, у якім Дарашэнку дастаўся квіток, — бадай, адзінае цалкам запоўненае

пасажырамі ва ўсім вагоне. Ззаду паўгадзіны язды, і вось ужо, асвойтаўшыся збольшага сярод незнаёмых людзей, то адзін, то другі з Дарашэнкавых суседзяў адзавецца асцярожлівай рэплікай у спадзеве намацаць глебу для размовы.

Самая гаманкая з чацвёркі — пажылая кабета-медычка з Таліна. Яе сусед, маладзён год трыццаці, таксама талінец і таксама, як і жанчына, беларус з паходжання. Абое хваляць не нахваляць жыццё ў сваім Таліне ("палтус такі танны — ледзь не штодня ямо!"), і разам з тым абаіх родніць нейкі неўразуменна-глыбінны асцюк помслівае незычлівасці да тамтэйшых аўтахтонаў, што раз-пораз вымкнецца з вуснаў то аднаго, то другога.

— Паспытаюць яшчэ і нішчымнага… Палтус, ведаеце, таксама не бясконцы, — падагульняе тэму кабеціна і з мінаю чалавека, што належным чынам выканаў свой грамадзянскі абавязак, застывае над сканвордам.

Чацвёртая пасажырка, дзяўчына з фінгалам пад левым вокам, знешне, асабліва неахайнасцю прычоскі, нагадвае ці то ўлюбёную Ігараву спявачку Б'ёрк, ці то маладую Пугачову. Яна, як і Дарашэнка, тутэйшая, раз-пораз выходзіць у тамбур пакурыць. Фінгалам яна абавязаная свайму сталічнаму каханку-сутэнёру, які ўзлаваўся на яе за тое, што прыхавала ад яго частку заробку. Два тыдні таму яна збегла ад мучыцеля да бацькоў, але ў правінцыі жыць сумна, ніякіх табе забаваў, вось і вяртаецца дзеўка зноў у сталіцу, каб быць бліжэй да цывілізацыі.

— Час бяжыць, што ўхопіш, тое і тваё, — кажа і прыхільна — ужо хто-хто, маўляў, а мы з табою дамо рады паразумецца — усміхаецца маладзёну.

— Ну, гэта як каму што даспадобы, — шматзначна, быццам ведае штосьці такое, чаго ніхто на свеце больш

не ведае, зазначае медычка. — А не баіцеся, што зноў ваш каханак вас паб'е? Нос паламае ці яшчэ што… Гэтак і калекай нядоўга застацца. Вунь колькі выпадкаў, у газетах штодня пішуць ды па тэлебачанні распавядаюць…

— Ужо лепш застацца калекай, чым так марнець, як некаторыя ў нашым заштатным горадзе марнеюць. Ні пайсці табе куды, ні шашні якія завесці, — парыруе дзеўка. — Да таго ж — каханне ёсць каханне, і нікуды ад яго не дзенешся. Я свайму Артурчыку ўсё-ўсенька,усе ягоныя выверты дарую, абы толькі побач з ім быць!

Яна паварочваецца тварам да Дарашэнкі, слізгае вачыма па канверце, які ён толькі што дастаў з валізы і зараз з мінаю, быццам затаілася ў ім ды зараз вось высунецца і ўджаліць вужака, трымае перад сабою.

— І вам дзеўкі пішуць? — кажа, і зрэнкі яе туманяцца, набрыньваюць вільгаццю ў чаканні працягу размовы. Аднак Дарашэнка ўдае, што не чуе яе, і яна, памуляўшыся хвіліну-другую ў нерашучасці, ці след чапаць яго зноў, з выглядам абражанае цнатлівасці накіроўваецца ў тамбур пакурыць.

Дарашэнка вымае з канверта ліст, пачынае павольна, быццам усё яшчэ не вырашыў, ці след гэта рабіць, вадзіць вачыма па зжоўклым, спярэшчаным знаёмымі літарамі-крывулямі аркушы.

Люся… Люська-Люсінда… Як даўно ўсё было, быццам і не ў гэтым зусім, а ў іншым нейкім, аддзеленым ад цяперашняга кавалкам сама меней у чатыры з добрым гакам дзясяткі год, жыцці.

Ноч яшчэ не запанавала над мястэчкам, але і дзень дарэшты не скончыўся. Водбліскі святла раз-пораз вымыкаюцца над альтанкаю з захаду танюткімі пасамі,

ясняць на хвіліну двор і дрывотню па той бок ценькага і дробнага — лета сёлета з перападамі, то занадта сцюдзёна, то, наадварот, нясцерпна горача — малінніку.

— Ні тры, ні два, — кажа дзядзька Зюзялёк і цяжка ўздыхае. Ён надоечы вярнуўся з суседняга раёна ад брата, на котлішчы якога здарыўся пажар, і ніяк не можа ад выгляду таго папялішча ачомацца. Курыць адну за адной папяросы, ды ўздыхае, ды каторы раз распавядае падрабязнасці жахлівага ("уяўляеце, сусед падпаліў, помсцячы за нейкую даўнюю крыўду, і ўсё — дашчэнту, на прысак, добра, самі жывыя засталіся") няшчасця.

Зюзялёк — дзядзькава мянушка, што прыліпла да яго ў маленстве пасля таго, як маці-ўдава аддала сына на выхаванне ў сям'ю сваякоў. Ды прыліпла так грунтоўна, што сапраўднае ягонае прозвішча — Капіч — ніхто ўжо амаль і не ўзгадвае.

Дзверы ляпаюць, на двор выходзіць Люся, прымошчваецца побач з мужчынамі на лаве.

Люся — васьмігадовая дачка лясгасаўскай прыбіральшчыцы цёткі Любы Гарнак, Сашкава равесніца. Яны з маткаю жывуць у бараку-прыбудове побач з домам. І, хоць там і няблага, і зручнасці нават сякія-такія маюцца, чакаюць не дачакаюцца ўласнага жытла. Яны прыехалі ў пасёлак аднекуль з Поўначы. Абедзве, што маці, што дачка, вельмі маўклівыя, і суседкам, якія прывыклі ўсё пра ўсіх ведаць, гэта вельмі абыходзіць.

— Ну, вось, Люся-Люсінда, будзе табе сяброўка, — кажа дзядзька Зюзялёк і запальвае чарговую папяросіну. — Вазьму да сябе пляменніцу, хай пажыве, пакуль адбудуюцца-акрыяюць пасля пажару. Усіх не магу ўзяць, няхай выбачаюць, цеснавата, а дзеўку вазьму... Сваякі, куды дзенешся.Ужо ж, можа, не аб'есць.

Люся штосьці мармыча яму ў адказ, абхоплівае рукамі калені, заглыбляецца ў нейкія свае, ёй адной дасяжныя думкі-мроі.

Акно прыбудовы расчыняецца, і голас цёткі Любы працінае вечаровую цішу:

— Лю-юся…

Люся паслухмяна падхопліваецца з месца, брыдзе дахаты. У яе праблемы з пісьмом, і яны з маткай вырашылі іх за лета зліквідаваць, дзеля чаго штовечар пішуць дыктоўкі.

Зэня, Сашкаў бацька, выходзіць з хаты, садзіцца на лаву побач з дзядзькам Зюзяльком.

— Зімна, як увосень, халера, — кажа і дастае з кішэні шваркі капшук з тытунём, пачынае скручваць папяросіну. Тытунь сыплецца паўз скалечаныя на фронце пальцы яму на калені, але ён, заняты гамонкаю з суседам, на тое не зважае.

Дзядзька пазірае раз-пораз на акно Гарнакоў, нахіляецца да бацькавага вуха.

— Дзіўныя нейкія яны, гэтыя Гарначышкі, што адна, што другая, — шэпча, і папяросіна няўклюдна торгаецца ў куце вуснаў у такт ягоным словам. — Ні да іх хто, ні яны да каго… Што дзе ні дзеецца, а ім, казаў той, — ані шум баравы, нішто не абыходзіць. А ўчора двое мужыкоў з раёна прыходзілі, цікавіліся Любаю. З выгляду — бы вайскоўцы, і гамонка нянаская. Што за дзівосы?

— Ну, мала што, — цэдзіць праз занятыя папяросінай зубы бацька. — Мала якая можа быць нагода ў людзей.

Ён падымаецца, каб ісці дахаты, і Сашка тае ж хвіліны ўскоквае з бервяна, сунецца паўз калюжыны — іх поўна ў двары з заўчорашняга дажджу — за ім следам.

Зазвычай яны спяць усе асобна: маці — на лаве ў кухні, бацька — на тапчане, Сашка — на палку пры печы ці, калі занадта горача, — на лавах за перабойкаю. Побач з бацькам спаць нязручна, бо ён храпе ды і пакурыць падымаецца ўначы, растузаны бяссоннем, раз-пораз. Але сёння Сашку хочацца конча легчы побач з ім, і ён пераносіць з-за перабойкі да яго на тапчан падушку і караценькую сваю, зладаваную маткаю са старых бэбахаў коўдру.

На тапчане цёпла, хоць, папраўдзе, крыху і мулка. Сашка прыціскаецца плячом да бацькавага дужага цела, упэўнены, што ён ахвотна адкажа, пытаецца, што такое Поўнач і ці далёка яна знаходзіцца ад мястэчка. Бацька хвіліну маўчыць, быццам абдумвае, што адказаць, затым рашуча гасіць лямпу ва ўзгалоўі.

— Бач, што ўзбрыло табе ў голаў, — кажа і рэзка, ажно заходзяцца енкам дошкі тапчана пад тонкім сенніком, адварочваецца тварам да сцяны. — Чаго захацеў: пра Поўнач яму раскажы! У нас тут свая Поўнач! Спі!

І тае ж хвіліны амаль засынае.

Сашка счэквае, пакуль ён як след успіцца, саслізгвае з тапчана, асцярожна сунецца да дзвярэй. Яму прыкра і вельмі, аж да слёз, крыўдна. Ведаў бы загадзя, якім будзе бацькаў адказ, ці ж пайшоў бы класціся на той тапчан…

На дварэ цёмна, толькі на лаве ў альтанцы бялеецца штосьці, ды з пакоя Гарнакоў прабіваецца паўз фіранку на панадворак скупы пасак святла ад лямпы, ды з клеці дзядзькі Зюзялька даносіцца заклапочаны голас курыцы-квактухі.

Люся сядзіць у альтанцы, абшчаперыўшы, як заўсёды, калені рукамі, штосьці ціха мармыча, быццам

прамаўляе пацеры. Ён садзіцца побач, і яна адразу замаўкае, і насцярожаная цішыня запаноўвае наўкола. Сашку карціць загаварыць з ёю, але ён баіцца: раптам і тут напаткае адлуп, як колькі хвілін таму ад бацькі?

— Што карысці сумаваць, — кажа Люся і кладзе сваю далонь на ягоную. — Вось хочаш, пра Поўнач табе распавяду? Хочаш?

— Хачу.

— Ну, дык... ліст напішу, — кажа яна і, перш чым хлопец паспявае што-колечы скеміць, бяжыць паўз цемру ўсцяж ліпняку да свайго барака.

Наступны дзень наўздзіў — учора яшчэ было гэтак сцюдзёна — спякотны, з прыпаркаю. І на дварэ ні душы, толькі ценькая Люсіна пастава ўзвышаецца самотным ценем на бервяне пры альтанцы.

Сашка сядзіць у кухні ля акна, назірае пад гукі патэфона, што даносяцца аднекуль з суседняй вуліцы, як мітусіцца ў доме насупраць па кватэры Зюзялькова жонка цётка Каруся: то ходзіць з кута ў кут, то вызірне ў акно, то раптам пабяжыць ні з таго ні з сяго ў калідор.

Сёння субота, дзень прыходу цягніка, і дзядзька Зюзялёк выправіўся пад яго з раніцы на падводзе сустракаць дачку брата-пагарэльца Лёлю. Вось з чаго цётка гэтак хвалюецца, вось з чаго і Сашку, хоць і чужыя яму тыя Зюзялькі, а тым болей іхнія сваякі, неяк не па сабе. Прыезд новага чалавека — заўсёды новыя ўражанні, і якія то яны, менавіта вось гэтыя, будуць?

Люся саскоквае з бервяна, моўчкі, як заўжды, прастуе да барака. Вымае са сшытка прыхаваны сярод старонак аркуш, падае Сашку знак выйсці. Яму не надта

хочацца тое рабіць, бо турботы цёткі Карусі займаюць яго на гэтую хвіліну куды болей. Але ён пераадольвае сябе, ідзе на двор.

— Я абяцала напісаць табе ліст, — кажа Люся і падае самаробны, з аляпістымі плямкамі клею па баках канверт.

— Лісты паштарка носіць, вось што, — абражаны простасцю дзеі, кажа ён і з абыякавым выглядам кладзе канверт у кішэню.

— Праз паштарку нельга перадаваць, — пярэчыць яна. — Трэба асцярожна, бо скрозь вушы…

Яна яшчэ штосьці дадае, але што, ён не чуе, бо з-за ліпняку далятаюць гукі колаў. Падвода дзядзькі Зюзялька з незнаёмым дзеўчанём паперадзе ўязджае ў двор, спыняецца пад вокнамі пад радасныя воклічы цёткі Карусі.

Ужо і шарэць пачало на дварэ, а Лёлі Сашка з Люсяю яшчэ зблізу не бачылі. Раз-пораз выходзяць на двор то цётка Каруся, то сам Зюзялёк, а госця быццам знікла куды, ні слыху пра яе, ні дыху. Сашка з Люсяй сядзяць у альтанцы, знэнджаныя абрыдлым чаканнем, з надзеяй — а раптам раздобрыцца-такі прыезджая прынцэса, выйдзе пазнаёміцца — пазіраюць на вокны Зюзяльковай кватэры.

— Сашка, ты ліст мой пачытаў? — кажа Люся і ўстае з месца. Цётка Люба яшчэ не клікала яе, але яна і сама, мабыць, адчувае важнасць тых штодзённых пісанак-дыктовак перад школаю.

Сашка чакае па яе адыходзе яшчэ колькі часу, і толькі калі наўкола зусім цямнее, брыдзе, зняверaны ў спадзеве на новае знаёмства, дахаты, і забыты на час марнага чакання Люсін ліст самотна шорхае ў кішэні

ў такт ягоным знарок гучным — ведай, хто тут, у гэтым двары, галоўны — крокам.

У кватэры гэтаксама цёмна, як і на дварэ, бо бацька і маці ўжо спяць. Ён прабіраецца ў свой пакой, запальвае ва ўзгалоўі святло, цягнецца рукою да кішэні, дзе стаіўся ў прыціхлым здранцвенні канверт з Люсіным лістом.

І што ў ёй, гэтай паперчыне, такога сакрэтнага, што нельга нават дасылаць яе па пошце? І што за ліст гэта: каб табе знак прыпынку, суцэльны тэкст, а літары — бы калочкі-слупкі толькі што пасаджаных вербалозін усцяж брукаванкі ад цэнтра мястэчка да чыгункі?

Ліст Сашку незразумелы. Ды і як тут даць рады што-кольвек зразумець, калі замест апісання — спрэс адны недаказкі-недагаворкі.

Ну, хай сабе гурбы, хай сцюжа, хай хвоя-спарыш з арэлямі… А пры чым да ўсяго нейкая пайка ды братавы пялюшкі, якія цётка Люба мусіць сушыць, абгарнуўшы іх вакол уласнага цела? І чаму яна выносіць цела брата, а потым не вяртае — што гэта значыць?

Нішто сабе Поўнач, нішто сабе аповед. Ці тое гэта, пра што то адзін, то другі з суседзяў не-не ды і згадае паўшэптам у размове? Хоць папытайся ў каго са старэйшых, напрыклад, у бацькі або ў дзядзькі Зюзялька?

Але ж пытацца ў абыход Люсінай персоны не выпадае. Як-ніяк яны з Люсяю сябры, а што такое праўдзівае сяброўства, ён, Сашка, ужо няблага кеміць. Асабліва зараз, па прыездзе Лёлі, якая і глядзець у іх з Люсяю бок, фанабэра, не жадае. Ды і цьмяная здагадка, што крыецца за Люсіным лістом штосьці

больш сур'ёзнае, чым проста занурыста-зацятая звычка бязбацькавіцы рабіць з усяго таямніцу, стрымлівае Сашкаву дапытлівасць.

Ён сядзіць у самоце на звыклым месцы, у альтанцы, чакае, калі выйдзе з барака госць Гарнакоў. А разам падчэквае і Люсю, якая выправілася з паўгадзіны таму з цёткаю Карусяй у пассавет па сахарыну.

Госць Гарнакоў з'яўляецца ў двары першы. Гэта дужы мужчына год трыццаці з тонкімі, як намаляванымі вусікамі і спружыністай хадою, што хутчэй за ўсё выдае ў яе ўладальніку або вайскоўца, або службоўца міліцэйскай сістэмы. Па ягоным расчырванелым твары бачна, што ён не ў гуморы. Ён выцірае насоўкаю пот на лбе, сыходзіць з ганка, шырокім крокам, ажно разлятаюцца ўбакі полы дыхтоўнага плашча, прастуе прэч ад барака.

Цётка Люба праз хвіліну выскоквае на двор, подбегам імчыць за ім, і яны ўдваіх знікаюць неўзабаве па-за ліпавымі прысадамі.

— Хахаль, няйначай, — хіхікае-цвеліцца з акна Зюзялёк, і бацькаў стрыманы голас, таксама з акна, толькі насупраць, асаджвае яго:

— Сціхні ты! Чым вярзці абы-што, пад жонку лепей падышоў бы. Там, можа, гэтулькі тае сахарыны далі, што і не прывалачэш адною ходкай. Гэтулькі, можа, далі, што і каня, глядзі, не лішне было б запрэгчы.

Кулепадобная пастава цёткі Карусі вымыкаецца з-за прысадаў, і па яе панылым твары няцяжка здагадацца, што не толькі каня, а і блыху, бадай, запрагаць дзеля гэткага багажу было б не варта.

Лёля пераймае цётку Карусю ля дзвярэй пад'езда, штосьці кажа напаўголаса. І хоць ні гуку не далятае да альтанкі з тае нячутнае гаманы, па непрыязным

паглядзе, які кідае ўпотайкі Лёля на вокны Гарнакоў, Сашку зразумела, пра каго размова. Дзядзька Зюзялёк перахоплівае пагляд пляменніцы, усмешліва хмыкае:

— От табе прырода жаночая: колькі тае дзеўкі, а ўжо натурыцца, быццам суперніцу ў іншай адчувае. А што будзе, як падрастуць?

Што здарылася нешта надзвычайнае, першымі даведваюцца Сашка з дзядзькам Зюзяльком. Навіну прыносіць паштарка. Яна толькі што з таго канца мястэчка, і там, калі даваць ёй веры, дзеецца штосьці неверагоднае: люд стабуніўся ля млына, а на доле на камянях нібыта ляжыць мярцвяк.

— Сцягацца паглядзець, — кажа дзядзька Зюзялёк і перакідвае праз падваконнік (ісці праз дзверы яму ці то лянота, ці то боязна, што не пусціць на тыя гледзіны цётка Каруся) хударлявае сваё, з непрапарцыйна даўгімі рукамі цела. Бацька далучаецца да яго, яны скіроўваюць з двара.

Сашка маніцца прыпусціць следам за імі, але яны тут жа спыняюцца, гоняць яго прэч. Яны адыходзяць, а ён, счакаўшы колькі хвілін, ідзе да барака. Люся (яна колькі хвілін таму вярнулася следам за цёткаю Карусяй з пассавета) паказвае яму на мігі з-за шыбіны, каб уваходзіў, і цёмнае, праніцанае пахам спарахнелага дрэва і тарпы — так называюць у пасёлку торф для паліва — прадонне калідора праглынае яго.

Люся сядзіць у здранцвенні пры акне, лічыць пігулкі сахарыны. У пакоі цемнавата, але, здаецца, нават і самая густая цемра не перашкодзіла б Сашку чарговы раз уразіцца яго беднасцю: самаробны старэнькі стол у куце, тапчан, два зэдлі-калечкі ля парэпанага, складзенага сяк-так з карыстанае цэглы шчытка.

— Ты ліст мой прачытаў? — пытаецца Люся і строга дадае: — Калі прачытаў, то аддай яго мне.

— Які ж то ліст, крыжаванка нейкая, а не ліст, — адказвае Сашка. — Што ў ім зразумееш?

— Усё адно аддай. Які б ні быў…

Ён хоча запярэчыць, што дасланыя лісты не вяртаюць, але не паспявае: з двара даносяцца галасы.

Люся падымаецца з зэдля, напружана, ажно падрыгваюць павекі, глядзіць паўз фіранку ў акно.

Дзверы ляпаюць, трывожны тупат чыіхсьці таропкіх крокаў урываецца ў пакой. Сашкава маці кідаецца да Люсі, прытуляе да грудзей бялявую галаву дзяўчыны з няўцямна вытарапленымі вачыма.

Пігулкі выслізгваюць з Люсіных рук, падаюць на падлогу, і глухое рыпенне маснічын пад нагамі, калі яна падхопліваецца з месца, каб бегчы на двор, паглынае яе роспачлівы, кароткі, як пошчак грому ўдалечыні, енк.

Тыдзень ад паховінаў цёткі Любы прамінае пад знакам прысутнасці ў двары старонніх людзей. Найбольш назаляюць дазнаўцы. То адзін, то другі прымчыць у лінейцы з раёна, пачне доўга і нудотна распытваць, што ды як. І вось ужо, ледзь паспее атрамант падсохнуць на паперчыне з паказаннямі сведкаў, трэці тут як тут, ды палохае дарослых і дзяцей суворасцю і моцаю голасу, ды маніцца конча пераплюнуць папярэднікаў мудрагелістасцю высноваў. Найбольш усім траім чамусьці абыходзіць дазнацца, ці мела нябожчыца спадкаемную схільнасць да самазабойства.

Пра мужчыну, следам за якім цётка Люба пайшла ў той дзень, ніхто не распытвае. А калі дзядзька Зюзялёк нагадвае пра яго трэцяму дазнаўцу па прозвішчы Бібік, той заспакойвае дзядзьку, што версія правяра-

ецца, але, хутчэй за ўсё, працягу мець не будзе, бо чалавек той — свой і падазраваць яго ў такім цяжкім грэху, як забойства, аніяк не выпадае.

Люся ўсе гэтыя дні, пакуль яе бабуля Настазя, свякрова нябожчыцы, даводзіць да ладу гаспадарку ў вёсцы, жыве ў Дарашэнкаў. Яна старанна пазбягае ўсіх і паводзіць сябе на дзіва спакойна. Сядзіць цэлымі днямі ў куце пад абразамі падалей ад акна, за якім бушуюць жарсці нядаўняе трагедыі, ды малюе ў сшытку выявы паўночных гурбаў і заснежаных хвояў-спарышоў з жалязякамі для арэляў паміж камлямі. А ўначы доўга не спіць, і тады Сашкава маці бярэ яе да сябе ў ложак, і яны напаўголасу штосьці адна адной распавядаюць.

Праз два тыдні баба Настазя перавозіць сваё няхітрае майно ў барак, і Люся пакідае Дарашэнкаў. Гэта і добра, бо ў іх даволі цесна. І разам з тым кепска, бо Сашка прывык да ненавязлівай Люсінай прысутнасці і ахвотна згадзіўся б мець такую дзяўчыну за сястру.

II

Дзверы то прастуджана керхнуць, то зойдуцца тоненькім рыпеннем, то адгукнуцца на пазоў скразняку рэзкім, кароткім пошчакам. А то дарэшты аціхнуць, бы тая котка перад скачком падчас палявання, замоўкнуць у чаканні чарговай мажлівасці нагадаць пра сваю прысутнасць.

Дзвярэй шмат, люду, наадварот, мала, таму будынак хутчэй нагадвае кляштар суворасці сярэдняе рукі, чым корпус дома адпачынку. Ды і памяшканне сталоўкі з выяваю дзяржаўнага герба ў міжваконні і расцяжкаю з цытатай пра ролю культуры ў духоўным узрастанні асобы тут, здаецца, выглядае іначай, як звы-

чайна ў падобных установах: ні грукату посуду з-за перагародкі паміж залаю і кухняй, ні пошуму лядоўняў, ні галасоў абслугі.

Дарашэнка азіраецца ў надзеі ўбачыць хаця б адзін новы твар, але дарэмна. Напярэдадні з'ехала сям'я з Чарнобыльскай зоны, якая сядзела за ім пры акне, а цяпер яе месца заняў стары па прозвішчы Зелянуха, які дагэтуль месціўся пры канцы залы.

Старому пад восемдзесят, калі не ўсе восемдзесят пяць. Але ён яшчэ такі жвавы ды порсткі, што кульба, з якою ён, падобна, не развітваецца ні ўдзень, ні ўначы і якой, напэўна, больш пасаваў бы шляхецкі назоў "ляска", выглядае пры ім не як прадмет ужытковага прызначэння, а хутчэй як модная прычындаліна з побыту амбіцыйнага падпанка якога-небудзь пазамінулага стагоддзя.

Стары падымае кульбу ў знак прывітання, і яго шчыльна прылеглыя адно да аднаго бровы павольна рассоўваюцца ўбакі, у кірунку скроняў, а твар асвятляе кволая, з дамешкам незадаволенасці, быццам яна каштуе яму немаведама якіх фізічных высілкаў, усмешка. Ён сядзіць колькі хвілін нерухома з узнятаю кульбай, пераводзіць пагляд на акно, за якім шчыруе пры клумбе з гваздзікамі ды астрамі прыбіральшчыца Міла Сцяпанаўна.

Жанчына ўздымае голаў, зіркае спадылба на акно, усміхаецца Зелянуху, і нязмушаная суладнасць іх дзеянняў міжволі зноў вяртае Дарашэнку да ўчорашняга роздуму.

Што лучыць гэтых дваіх, Зелянуху і прыбіральшчыцу? Здаецца, быццам прыраслі адно да аднаго, быццам так моцна трымае іх нейкая ўнутраная повязь, што ўжо і не парваць яе.

Амаль два тыдні Дарашэнка назірае за старым і Мілай Сцяпанаўнай. І чым далей назірае, тым менш знаходзіць тлумачэнняў сяброўству-прыяцельству паміж імі. Папраўдзе, часам яму нават здаецца, што гэта і не сяброўства наогул, а нейкая мусовая звязка, якую ні адзін, ні другі чамусьці не ў стане рашуча адпрэчыць.

Міла Сцяпанаўна была першая, каго Дарашэнка тут, у доме адпачынку, спаткаў у дзень прыезду. Цётка ў выцвілым халаце, са швабраю ў руцэ і вантузам падпахай, у якой ён Люсі ў іншым месцы ды пры іншых абставінах нізавошта не прызнаў бы. Што робіць час з чалавекам!

І яна таксама яго, здаецца, на шчасце ці на жаль, не пазнала. Ва ўсялякім разе на тую хвіліну абышлася з ім, як з абсалютна стороннім чалавекам. Хіба што пасля даведалася прозвішча. Але дзеля чаго прыбіральшчыцы спраўджваць ягонае прозвішча? Магчыма, ён скажа ёй, хто ён, але не раней, як у дзень ад'езду. Калі, вядома, не надарыцца іншай якой нагоды.

Зэдаль ззаду ціха рыпіць: мабыць, то адыходзіць Зелянуха. Ён заўсёды адыходзіць ад стала ў адзін і той жа час, з дакладнасцю да хвіліны, і адзін і той жа рыплівы гук зэдля той да педантызму дакладны адыход педантычна абвяшчае.

Прыбіральшчыца зноў кідае ад клумбы пагляд на акно, на месца, дзе толькі што сядзеў стары, і выраз ні то разгубленасці, ні то радасці застывае на яе твары. Яна рэзка падхопліваецца, ідзе насустрач Зелянуху, які ўжо паспеў высунуцца на ганак, і жылка няпэўнасці ў куточках яе вуснаў ледзь заўважна торгаецца ў такт шырокім, не па-жаночы размашыстым крокам.

Гэтыя крокі…

Яшчэ неба не паспела як след заірдзецца на далягледзе таемным паўкругам апошняга перадночнага ззяння, а Лёля ўжо на рамарэнце: то выскачыць на двор паваксаваць і без таго наваксаваныя да глянцу туфлі, то высунецца ў акно з люстэркам у руцэ, то з гучным спевам схіліцца над парэнчаю сходаў.

Субота, на танцпляцоўцы пры клубе вечарына, і яна чакае не дачакаецца, калі ж урэшце агалосяць прыклубную прастору прызыўныя гукі прайгравальніка. Тыдзень з двух яе гасцявання ў дзядзькі Зюзялька ўжо мінуў, і яна, абражаная адсутнасцю ўвагі да сваёй персоны з боку мясцовых кавалераў, спадзяецца ўзяць рэванш перад іншымі дзяўчатамі за кошт заляцанак электраманцёра Вітака Дунчонка, аднаго з брыгады маладзёнаў, што вядуць лінію электраперадач ад цэнтра мястэчка да нядаўна пабудаванага за тры вярсты адсюль новага элеватара. Што Вітак нібыта жанаты, яна, канешне ж, начутая, ды што не зробіш дзеля падвышэння собскага прэстыжу?

Лёлі, як і Сашку з Люсяю, — сямнаццаць. Але ў параўнанні з тою ж Люсяй яна выглядае і значна больш дарослай, і значна больш дасведчанай у жыццёвых пытаннях. Бо жыве вось ужо колькі год у горадзе, да якога заштатнаму мястэчку-гэпэ з яго паўразбуранай інфраструктурай, як вераб'ю да бусла.

Яны сядзяць у пакойчыку на канапе, разглядаюць аблігацыі пазыкі, што засталіся Люсі ад бабы Настазі, якая памерла тры месяцы таму, пакінуўшы ўнучку сам-насам са шматлікімі побытавымі і рознымі іншымі клопатамі, ды абменьваюцца меркаваннямі наконт уступных экзаменаў у тэхнікум. Яны сядзяць амаль усутыч на раздзеленай валікам канапцы,

і іх ногі міжвольна раз-пораз судакранаюцца, і гэта робіць размову сумбурнай і крыху нервовай.

Ініцыятыва паступаць у вучэльню належыць Сашку, і Люся, зразумела, сумняваецца. Тым больш зараз, па смерці бабулі, калі і спадзявацца на чыю-колечы матэрыяльную помач не выпадае, і іншыя, не менш страхавітыя турботы — адна анкета да таго паступлення чаго вартая — даймаюць.

Усё гэта надае перспектыве іх сумеснага навучання адценне прывіднасці. Да таго ж у Люсі, хоць яна і лічыць сябе стоадсоткавым гуманітарыем, як ні дзіўна, усё яшчэ праблемы з пісьмом. Дакладней, са звычкаю адмалку пісаць суцэльным тэкстам, без знакаў прыпынку і прапісных літар, ад якой настаўнікі так і не далі рады дарэшты яе адвучыць. Якая асабліва дае знаць пра сябе, варта дзяўчыне крыху пахвалявацца.

Лёля чарговы раз выбягае на ганак, кідае ганарлівы позірк на акно Дарашэнкаў, мчыць праз двор насустрач Вітаку, што цягнецца прысадамі ў кірунку клуба.

Цётка Каруся высоўваецца ў акно, праводзіць пляменніцу няўхвальным — "от жа знайшла сабе залётніка, дурніца!" — паглядам. Зноў знікае ў прыцемненым чэраве пакоя, штосьці кажа незадаволеным голасам стомленаму хваробінай — у небаракі рак горла, і ўсе ў наваколлі пра тое, апроч яго самога, ведаюць — дзядзьку Зюзяльку. Слабое сіпенне даносіцца ёй у адказ, і зноў усё аціхае.

Сашкавы з Люсяю ногі чарговы раз датыкаюцца адна да аднае і тае ж хвіліны спуджанымі вераб'ямі зноў разлятаюцца па розныя бакі валіка.

Яны падымаюцца з канапы, пакліканыя гукамі прайгравальніка, дружна: ён — імкліва і дробненька, яна,

наадварот, — размашыста, як касец на сенажаці, — крочаць да дзвярэй. Без чвэрці адзінаццаць, зазвычай у такі час там, ля клуба, адзінай ацалелай з вайны будыніны на водшыбе мястэчка, усё і пачынаецца.

Бадай, канцу свету наканавана хутчэй прыспець, чым ім расшчапіць вусны, гэткі ён, першы Сашкаў з Люсяй пацалунак, смачна-ўтрапёны. Люся схіляе голаў, мкнецца вырвацца з ягоных абдоймаў, але як ён можа цяпер яе адпусціць?

— Пачакай... Яшчэ... — кажа і адчувае, як ні то дужэе, ні то, наадварот, слабее, перакрапаная павуціннем трывогі ад усведамлення, што вось зараз, крый бог, усё яно, ледзьве пачаўшыся, і скончыцца, ягоная вызваленая ўрэшце ад абрыдлых правінцыйных табу воля.

Вечарына ў самым разгары, і паўз рэдкія галінкі адцвілага бэзу, што атуляе з усіх бакоў таямніцу іхняга першага з Люсяй мілавання, бачна, як вальсуюць на памосце — у клубе занадта горача — порсткія маладыя пары.

Паперадзе ўсіх імпэтна танчыць, мяняе раз-пораз партнёраў Лёля. Сёння яна як ніколі ў гуморы: усмешка не сыходзіць з твару, а сама яна як не вылузнецца з сукенкі. Час ад часу яна кідае пагляд акурат у тое месца, дзе стаяць Сашка з Люсяю, і выраз ці то радасці, ці то нейкага таемнага, адной ёй ведамага змыслу слізгае па яе вуснах, бяжыць хваляю па шчоках, павольна знікае ў прадонні падцененых тушшу вачэй. Яна кідае на іх пагляд, і Сашка адчувае, як сцінаецца пад ім міжвольна, уздрыгвае, бы патрывожаная подыхам вятрыска гронка бэзу ўгары, ценькае Люсіна цела.

— Чаму ты яе баішся? — пытаецца ён, і пытанне ягонае патанае ў мелодыі чарговага танца.

Што Люся асцерагаецца Лёлі, яму вядома даўно, але чаму так — яны ніколі не высвятлялі. І цяпер, калі ўсё гэтак добра між імі ўсталявалася і растала дарэшты ў хвалях пяшчоты заўсёдная боязь непаразумення, ён адчувае, што можа, прынамсі мае якоеніякое права пра тое запытацца.

— З чаго ты ўзяў, што баюся? — Люся адкідвае голаў, і твар яе відочна хмурнее. — Вось яшчэ... — Яна прыгінаецца пад голлем, хутка — ён нават не паспявае зразумець, што здарылася, — шыбуе прэч з кустоўя.

Ён кідаецца Люсі наўздагон, мкнецца загаварыць, але яна ўпарта адмоўчваецца. І толькі ўжо на падыходзе да двара быццам спахопліваецца, адорвае яго знэнджаную нечаканаю зацятасцю істоту літасціваю ўсмешкай.

— Памятаеш, ліст табе калісьці пісала? Пра Поўнач — памятаеш? Дзе ён?

— Божа, ліст, ты б яшчэ што прыдумала запытацца... Калі тое было! Гадоў дзевяць прамінула, сама меней...

— Калі б ні было, — кажа яна і кранае пальцамі клямку весніц. Ён хоча спыніць яе, каб прадоўжыць размову, але дарэмна. Люсін твар робіцца непранікальным, і сухмень яе зрэнак, колькі яшчэ хвілін таму вільготна-прыязных, ашаламляе яго выразам нясветнавусцішнае адстароненасці.

Шэпт то аддаляецца, то, наадварот, бліжэе — быццам хтосьці гуляе ў хованкі, а што за правілы ў той гульні і кім і дзеля чаго яна змыслена, нізавошта не здагадаешся.

Ён вызірае ў акно, каб паглядзець, хто там. Дзве няясныя плямы-постаці бялеюць на тле дрэваў няпэў-

нымі абрысамі, дружна падымаюцца, сунуцца з двара. Трэцяя, гэткая ж няясная, як і тыя дзве, што толькі што патанулі, атуленыя цямрэчаю, за рогам Зюзяльковага дома, вымыкаецца з шэрані, зладзеявата шмыгае ў прагалак паміж баракам і шыхтам скрыняў для тарпы, з няўмольнасцю лёсу, што конча вырашыў учыніць Сашку іспыт на трываласць натуры, набліжаецца да акна.

— Люся?

Постаць замірае, дзве рукі ўспырхваюць па-над падваконнем, перакрыжоўваюцца абручам на ягонай шыі.

— Ат, далася яна табе, гэтая Люсіндора, гэтая…

— Лёля?

Рукі слабеюць, быццам збянтэжаныя нотаю расчаравання ў ягоным голасе, паволі ападаюць. Але праз імгненне зноў узлятаюць — цяпер ужо каб і яго сцягнуць на дол, сашчэпліваюцца на ягоных перадплеччах.

Ён саскоквае на зямлю і акурат трапляе ў Лёліны абдоймы. Яна сцішана хіхікае, моўчкі, быццам гэтая начная прыгода была загадзя між імі ўзгодненая, цягне яго за руку з двара ў тым кірунку, дзе зніклі колькі хвілін таму плямы-постаці і дзе ўздымаюцца па-над соннымі пабудовамі ліпы прысадаў.

— Куды? Што ты надумалася?

— Спужаўся?

Цемра імкліва радзее, дзве цьмяныя постаці порстка, толькі шашчыць, чуваць, пад нагамі сухое голле, кідаюцца ў розныя бакі, заміраюць у зарасніках бэзу.

— Ну, годзе вам хавацца, каханкі, — кажа Лёля і шпурляе ў гушчар адзін за адным колькі каменьчыкаў. — Выходзьце ўжо!

Яна дастае з сумачкі ліхтарык, са смехам, што больш нагадвае шатанскае хрыпенне, водзіць пукам

святла па кустоўі. Водзіць настойліва і доўга, аж пакуль не натыкаецца пасярод яго на зніякавелыя, вінаватыя твары Люсі і Вітака.

Ужо амаль раніца, а ён яшчэ і на хвіліну не змежыў павек. Стаіць прад вачыма тое праклятае кустоўе, і Лёлін смех лунае над ім, аддаецца ўвушшу д'ябальскім звонам, ад якога вось-вось, здаецца, абрынецца на голаў столь звузелага ўвобміг да абрыдласці, сцяснелага пакоя. Так звузелага вачавідзь ды сцяснелага, што адно жаданне і ўзнікае — падхапіцца з ложка і бегчы, бегчы далей ад яго.

Лёгкія, ледзьве чутныя крокі даносяцца з двара і тут жа аціхаюць, прыглушаныя ціўканнем цвыркуноў ды бацькавым храпеннем за перабойкай.

Яму няўсцерп паглядзець, што там у двары, і ён ужо прынікае тварам да шыбіны, як бацька падымаецца з тапчана, сунецца вобмацкам да вядра з вадою.

Белы прыпол сукенкі ў воддаллі рвецца на ветры, нібы напалоханы звонам конаўкі, дваіцца, чэзне ў завесе густой перадранішняй шэрані. Дваіцца, ці, можа, насамрэч іх там двое?

— Халерная спёка. — Бурклівы голас бацькі вяртае яго ў яву.

Ён падымаецца з ложка і, як толькі бацька заціхае на тапчане, не раздумваючы куляецца ў цьмянае, спярэшчанае прывідна-зыбкімі абрысамі падзеяў-прыпамінаў прамінулага дня прадонне акна.

У двары прахалодна і ціха, толькі з кватэры дзядзькі Зюзялька далятаюць да альтанкі гукі радыё. Дзядзька слухае радыё і ўдзень, і ўначы, гэта, кажа цётка Каруся, быццам дапамагае яму не звар'яцець ад пякельнага болю.

Ён прыхінаецца плячом да дошак альтанкі і толькі паспявае збольшага супакоіцца, як яшчэ адзін гук, гэтым разам зводдалеку, ад студні, даносіцца да ягоных вушэй. Але ён такі глухі, такі непрывабны на тле чароўных гукаў вясковае ночы, што ён не надае яму значэння.

Белы прыпол вымыкаецца з-за рога дома, імкліва набліжаецца да Люсінага пад'езда. Яму карціць падхапіцца насустрач, але крыўда не пускае.

Ад тае хвіліны, як Лёлю выцягнулі са студні ды звезлі ў райцэнтр у бальніцу, мінула гадзіны дзве з паловаю. І прыезджы дазнаўца ні на хвіліну не адыходзіць з двара, то аднаго з суседзяў пакліча для размовы, то другога, то ў цёткі Карусі возьмецца штосьці высвятляць, то зноў распарадзіцца гукнуць Вітака. Адзіны, каго ён пакуль што не чапае, — дзядзька Зюзялёк. Ды яшчэ — мабыць, з увагі на кволасць дзявочае натуры — Люся, якая ўвесь гэты час, што цягнецца дазнанне, сядзіць у кватэры і толькі зрэдку, быццам каб знарок спраўдзіць, што яна тут, на месцы, віхне паставаю ў акне.

Узрушаныя неспадзеўнаю прыгодай ды гнаныя пугаю цікаўнасці жыхары іншых вулак час ад часу зазіраюць у двор. І дазнаўца Бібік, строгі, крыху хамаваты дзядзька гадоў пяцідзесяці, той акурат, што дзевяць год таму вёў справу Люсінай маткі, калі тая разбілася ля млына, голасам, што не ўдае і намёку на мяккасць характару, вытурвае ўсіх прэч. Усіх, апроч дзятвы, што раямі абляпіла голле дрэваў і толькі і чакае нагоды ўставіць у размову старэйшых слова-другое.

Апоўдні дазнаўца вырашае апытаць і Люсю. Яна апошняя ў даўгой чарадзе сведкаў, мужчына стаміўся, таму размова між імі цягнецца нядоўга. Так нядоўга,

што, калі Люся хвілін праз пятнаццаць выходзіць з кватэры, Сашку здаецца, што ён бачыць на яе твары расчараванне.

Ён мкнецца да яе ў спадзеве хоць на якое, хоць на самае кароткае замірэнне, але дарэмна. Яна з абыякавым выглядам праходзіць міма, і нечаканая, няведамая раней жорсткасць яе пагляду апякае яго трывожным прадчуваннем новых неспадзянак.

— Ну, дык што, так ты нікога і не бачыў уначы са сваёй альтанкі? — пытаецца, болей, відаць, дзеля прыліку, чым дзеля пацвярджэння нейкай канкрэтнай гіпотэзы, дазнаўца і зашчапляе на тэчцы з паперамі парэпаную спражку з выяваю вужакі. — Ну, не дык і не, што тут скажаш…

— Ні слова, ні паўслова — хто так робіць! — кажа цётка Каруся і безуважна падносіць мужу кубак нішчымнага вару замест прыгатаванага, што ўжо колькі хвілін падтомліваецца на пліце, курынага булёну. Яна ўсё ніяк не дасць рады ачомацца ад падзення пляменніцы ў студню і, каб не капрызлівасць знябожанага нямогласцю Зюзялька, якому то адно падай, то другое прынясі, і ўсё не так, не па-ягонаму — ведама, хворы чалавек, — наўрад наогул здолела б выйсці з нервовага стопару. Неспадзеўны ж начны ад'езд Люсі (хтосьці з суседзяў бачыў, як яна садзілася на паўстанку ў цягнік), здаецца, толькі ўзмацніў яе пакуты. З'ехаць, нават не развітаўшыся, быццам не маеш большых ворагаў на свеце? Цётцы такія паводзіны і не зразумелыя, і не сімпатычныя.

Куды з'ехала Люся, ніхто не ведае. І хоць сёй-той сцвярджае, што паехала паступаць вучыцца, даць

веры таму цяжка. Гэтак вось раптам, увадначас? Ды і час іспытаў яшчэ не прыспеў, хіба што навострылася дзеўка ў якую-небудзь задрыпаную вучэльню, дзе бяруць усіх без вынятку, абы мелася ў чалавека якое-кольвек жаданне.

Адзіным, хто, магчыма, у курсе, куды ўсё-такі Люся з'ехала, з'яўляецца Вітак. Але звяртацца па дапамогу да суперніка Сашку не хочацца. Да таго ж і сам Вітак неўзабаве нібыта з'язджае, ашчаслівіўшы цяжарнасцю дзеўку-заіку з другога канца пасёлка.

Абставіны таемнага Люсінага знікнення праясняе паштарка, дакладней, ліст, які яна прыносіць Сашку праз тыдзень. Стандартны канверт з выяваю сярпа і молата змяшчае шмат намёкаў, апроч намёку на іх сумесную будучыню. І гэта ўяўляецца яму найгоршым з усяго, што здарылася напрыканцы спякотнага гэтага, азмрочанага Люсінай здрадаю ды няшчасцем з Лёляю ліпеня.

І хоць цьмяная здагадка, што абедзве падзеі між сабою нейкім чынам звязаныя, не пакідае яго, распавядаць пра яе дазнаўцу Бібіку ні намеру, ні ахвоты ён не мае. Тым больш што і сама Лёля нічога яму распавесці не пажадала, сабралася ды з'ехала моўчкі праз два дні па выпісцы з бальніцы ў свой горад.

Яшчэ толькі восем гадзін вечара, а ў корпусе так ціха, быццам на дварэ ноч. Адзінае, што парушае цішыню, — гукі радыё пры канцы калідора ды абрывістая гамана гульцоў у даміно ў нішы наўзбоч дзвярэй сталоўкі. Ды яшчэ шоргат анучы па падлозе, якую прыбіральшчыца Міла Сцяпанаўна то акуне ў вядро з вадою, то з гучным усплёскам апусціць на дол. Яе дзя-

журства сканчваецца а дзявятай, і яна, як заўсёды, спяшаецца дахаты. Бо ў дзесяць пачынаецца па тэлеку яе ўлюбёная перадача “Тыдзень вялікай коткі”, і яе яна прапусціць — гэта ўсе ў доме адпачынку ведаюць — ніяк не можа.

Час ад часу жанчына падыходзіць да дзвярэй пакоя Зелянухі нібыта з намерам штосьці спытаць, але не наважваецца, і няспраўджаны намер тонкімі лініямі зморшчын заклапочанасці асядае на яе лбе.

Адміністратарка падымаецца з долу на паверх, голасам, што выдае перасцярогу перад рэакцыяй чалавека, які нікога і нічога не баіцца і прывык рабіць толькі тое, што яму самому даспадобы, просіць Мілу Сцяпанаўну прыбраць аскепкі толькі што разбітае парывам ветру вазы ў холе будынка.

Міла Сцяпанаўна скідвае з плячэй халат, кладзе яго на падваконне, з бурклівым выглядам спускаецца па вільготных сходах следам за адміністратаркай на першы паверх. І ў калідоры адразу робіцца яшчэ цішэй, так ціха, што чутно, як ходзіць у сваім пакоі, то адчыніць дзверку шафы, то ляпне кульбаю па падлозе, то кашляне з прысвістам стары Зелянуха. Дзверы ягонага пакоя адчыняюцца, заінтрыгаваны гаманою жанчын стары выходзіць у калідор, азіраецца, прастуе да акна. Похапкам пераварочвае пакінуты прыбіральшчыцай халат, зладзеявата шнарыць рукою ў кішэні, вывуджвае нейкую паперчыну.

Ён стаіць да Дарашэнкі бокам, і той бачыць, як сунецца ўгору па меры прачытання паперчыны брыво старога ды бялее, зліваецца з колерам валасоў на скроні ягоны твар. Затым ён кладзе паперку назад у кішэню, ідзе да пакоя. І акурат у той момант, калі палову

ягонага цела разам з кульбаю праглынае паўпрыцемак памяшкання, на сходах зноў з'яўляецца прыбіральшчыца.

Ці бачыць яна сілуэт Зелянухі, невядома. Але гук дзверыны, за якою той знікае, яе вушэй дасягае несумненна. Жанчына кідае заклапочаны пагляд на вопратку, пядзя за пядзяй абмацвае льсністы, з тоўстымі швамі спод халата. Натыкаецца, відаць, на паперчыну, і твар яе набывае звыклы выраз паважнае непранікальнасці. Яна апранае халат, ідзе да Зелянухавых дзвярэй, далікатна стукае далонню па аўшаку:

— Ну, дык што, а сёмай заўтра адыходзім, Васіль Іванавіч? Га?

— А сёмай, дык а сёмай, — адказвае стары і прыадчыняе дзверы. — Чарвякоў я ўжо накапаў. Вопратку і абутак таксама падрыхтаваў, так што ўсё як след.

— А я да юшкі прыправаў ды яшчэ сяго-таго прыкупіла. Такі ўладзім баль пасля рыбалкі, што звяр'ю навакольнаму моташна стане. Праўда?

— Гэта ўжо як з клёвам нам з вамі падфарціць, Міла Сцяпанаўна, хто ведае.

— З клёвам як з клёвам, а вось нага б ваша не разгулялася на змену надвор'я.

Яны яшчэ колькі хвілін стаяць моўчкі па розныя бакі дзвярэй, затым адначасна, быццам кожны ўзгадаў неўпрыцям пра неабходнасць штосьці конча дарабіць недаробленае, разыходзяцца. Разыходзяцца так імкліва, так шпарка, што Дарашэнку, які назірае за абаімі праз паўрасчыненыя дзверы працэдурнага пакоя, зноў міжволі прыходзіць у голаў думка пра ўдаванасць дзіўнага іхняга — ні то прыяцельства, ні то варажнеча, ні то адно і другое адначасна — яднання-супольніцтва.

III

Міла Сцяпанаўна зірнула з долу на акно, але, на дзіва, святла ў ім не ўбачыла. Быццам яго яшчэ і наогул там, у Зелянухавым пакоі, не запальвалі. Толькі пасак променя, які прабіўся, відаць, у памяшканне праз дзверы ад ліхтара пры ўваходзе ды тае ж хвіліны і згубіўся, не даўшы рады вымкнуцца вонкі, дзесьці ў міжсценні. Ды яшчэ кволы яго адбітак на гардзіне, што тут жа і знік, патрывожаны асцярожным, ледзь заўважным рухам тканіны.

Што стары назірае за ёю з пакоя, яна не сумнявалася. Адчувала ягоны пагляд хутчэй усім целам, чым вачыма — такое ўжо аднойчы было з ёю, падчас першага яе наведвання ў заснежаны А., неўзабаве пасля выпадкаў з Лёляй ды Наталляй. Калі яна брыла вулкаю да цягніка, а ён, тады яшчэ значна маладзейшы, спрытнейшы ды жвавейшы, цікаваў за ёю цераз фіранку, і вось гэткае, як цяпер, адчуванне таемнага ягонага змыслу працінала яе свядомасць прадчуваннем чагосьці да вусцішу, да дрыжыкаў кепскага.

Тады ўсё абышлося, бо яна проста з'ехала з А., а як будзе зараз? Ці дастаткова абачлівай яна была ўвесь гэты час, што ён тут жыў, каб не выклікаць падазрэнняў наконт уласнае персоны? Ці здолела гэтак пераадолець сваю нянавісць, каб, удаючы прыязнасць, няўрокам не пасеяць да сябе недавер? Якая гэта пакута — удаваць кагосьці іншага і з дня ў дзень штохвіліны думаць пра тое, каб падман не раскрыўся.

Рука яе міжвольна пацягнулася да кішэні халата. Што, калі ён насамрэч, як падалося ёй, паспеў-такі пашнарыць па кішэнях, калі яна пайшла на дол прыбіраць вазу, ды прачытаць на пасведчанні аб рэабілітацыі сям'і яе дзявоцкае прозвішча? Ад заплечных

справаў майстра што заўгодна можна чакаць. Колькі разоў давала сабе слова не насіць больш тое пасведчанне ў кішэні, пакідаць дома, ды што зробіш, калі да такой ступені ўелася звычка. Маці заўжды насіла яго пры сабе на ўсялякі выпадак і яе навучыла ў маленстве. Маўляў, ці мала што здарыцца, то хай будзе заўсёды для надзейнасці паперчына пад рукой… Вось і носіць, лічы, паўстагоддзя.

Хоць, папраўдзе, карысці з яе, гэтай паперчыны… Сям'ю Гарнакоў рэабілітавалі ў 56-м, вунь колькі часу сплыло. Тым больш што і пасадзілі бацькоў (яна сама ўжо ў лагеры нарадзілася) ні за што ні пра што — за царкоўны шлюб. Хтосьці з суседзяў з нейкай помсты, няйначай, паведаміў у органы, і закруцілася… У дзень вяселля забралі маладых, нават як след з крэўнымі не дазволілі развітацца. І сем гадоў з гакам — кату пад хвост. Гэта калі на тое, што пасля, па вяртанні на радзіму, давялося перажыць, не зважаць…

Яна мінула наўскос пляц, за якім адразу, праз агароджу, пачыналіся жылыя дамы, шмыганула ў абсаджаны хвоямі цёмны, замглёны шэранню прагалак брамы. Азірнулася наастатак і скаланулася ад нечаканасці: святло ў Зелянухавым пакоі на тле астатніх цёмных вокнаў не проста гарэла, а было такое яркае, што ажно нават зводдалеку сляпіла вочы. Акурат так, як у А. напрыканцы дня, калі змрок апускаўся на баракі для зняволеных і магутны пражэктар нечакана заліваў наваколле не проста пукам — вадаспадам святла.

Яна пасунулася да пліты ў спадзеве хоць крыху сагрэцца, але дарэмна: цагліны былі зусім халодныя. Такія халодныя, што нават здаліся ёй больш халоднымі за паветра ў пакоі.

Яна легла дагары, упетрылася паглядам у святло пражэктара за акном, што лілося з вышкі на тэрыторыю склада, на суседнія баракі, на шыхт хвояў з хваінаю-спарышом пасярэдзіне з прыладжанымі між камлямі арэлямі.

Святла было так шмат, што, здавалася, яго хопіць не толькі каб асвяціць наваколле, а і напоўніць цяплом настылыя за дзень будынкі баракаў.

І сапраўды, быццам стала цяплей. Але толькі яна пачала сагравацца, як Паўлік заквіліў у зыбцы ў сваім закутку за фіранкаю, просячы нечага, голасна заплакаў. Яна злезла з тапчана, падалася да дзіцяці, тыцнула рукою ў зыбку.

Пялюшка пад братам была мокрая, воблачка пары падымалася ад яе ўгору і адразу ж таяла, астуджанае сцюжаю, у паветры па-над зыбкаю.

Яна выцягнула пялюшку з-пад Паўлікавага цела, падсунула пад бок замест яе сухую, глянула на ходзікі.

Палова дванаццатай, звычайна ў такі час маці ўжо дома. Змена заканчваецца толькі апоўначы, але жанчыны-напарніцы адпускаюць яе з тартака крыху раней, каб даць магчымасць хоць крыху даўжэй пабыць з дачкою і Паўлікам, бо а пятай уранні пачынаецца новая змена, і ў чатыры яна ўжо адыходзіць. Пакідае ім з братам рэшту пайка і сыходзіць на ўвесь дзень. І яны застаюцца ўдваіх аж да яе прыходу. Такі парадак усталяваўся пасля таго, як бацьку перавялі ў іншы лагер, і доўжыцца ён вось ужо амаль паўгода.

Наогул, усё не так блага. Адзінае, што даймае яе, Люсю, нават больш, чым даймаюць заўсёдная адсутнасць маці і сцюжа, — смурод ад Паўлікавых пялюшак. Але куды ад яго дзенешся: пакой такі маленькі, што

схавацца няма дзе. То трэба трываць, не заўсёды ж брат будзе малы, калісьці падрасце і пачне сам прасіцца на гаршчок.

Кароткі хісткі цень слізгануў па шыбіне, маці таропка, быццам ад кагосьці ўцякала, выбегла з-за хвояў на пляц, аслепленая пражэктарам, захінула даланёю вочы ад святла. Мужчынская постаць дагнала яе, схапіла за крысо ватніка, пацягнула да сябе. Яна вырвалася з рук мужчыны, не марнуючы ні хвіліны, шмыганула ў прагалак між хвояў.

Мужчына — цяпер, калі ён стаяў тварам да барака, Люся пазнала ў ім бацьку Зелянухі Вадзькі з адміністратыўнага дома — незадаволена зморшчыўся, штосьці злосна крыкнуў ёй наўздагон, пераскочыў праз гурбіну, памчаўся прэч.

Маці ўвайшла ў пакой, узялася распальваць грубку. Але заплакаў Паўлік, і яна кінулася да яго. Выцягнула з-пад малога мокрую пялюшку, пачала шнарыць у закуцці ў пошуках сухой. Сухой, аднак, не аказалася, і яна пачала хуценька распранацца. Распрануўшыся, абкруціла мокрую пялюшку вакол аголенага пояса, ускінула наверх швэдар і ватнік, і гузак на яе скроні (калі ён з'явіўся, учора ж не было?) разгладзіўся, зрабіўся не такім страхавітым, як напачатку, калі яна толькі ўвайшла, і вочы прыкметна пасвятлелі.

Яна гатавала ежу ды мацала гузак, і выраз заклапочанасці на яе твары то гусцеў, то, наадварот, радзеў, прытуплены, мабыць, думкамі аб новых, што чакалі заўтра, клопатах. Але яна была побач, і рэзкае святло ад пражэктара больш не поўніла Люсіну істоту трывогаю, і хвойка-спарыш з арэлямі між камлёў наўзбоч суседняга барака здавалася ёй куды больш прыветнай, чым дагэтуль.

Супакоеная, яна так моцна заснула, што нават не чула, як маці паднялася, каб зняць з пояса падсохлую пялюшку ды ўхутаць ёю Паўліка.

Як маці сышла ўранні на працу, яна таксама не чула — толькі лёгкае рыпенне маснічыны пад нагамі ды мяккі, бы хтосьці шмаргануў вяхоткаю, дотык вуснаў да ілба. А калі прачнулася, у пакоі было зусім светла. Але не ад пражэктара. Проста дзень стаяў на дварэ, і бясконцы, як заўсёднае чаканне маці напрыканцы змены, снег валіўся густою завесаю з неба на зямлю і хвоі, поўніў беллю прагалкі паміж баракамі.

Луста хлеба, варанае яйка і шклянка астылае гарбаты — звыклы паёк — чакалі на стале. Але есці не хацелася, і яна вырашыла спачатку пакарміць брата. Прыслухалася, як ён там: з-за фіранкі не даносілася ні гуку.

Яна паднялася, каб паглядзець Паўліка, падскокам хіснулася за перабойку.

— Паўлік, до спаць, — сказала і адшморгнула фіранку. — Час снедаць.

Брат спаў так моцна, што нават не адазваўся ані гукам, як рабіў тое заўсёды, на яе пазоў. Яна падышла бліжэй, каб пабудзіць яго, датыкнулася далонню да шчакі.

Шчака была халодная і белая, як снег за акном. І гэткая ж халодная, як шчака і ўсё цела, была пялюшка пад Паўлікавым бокам.

Яна апромеццю выскачыла на двор, рынулася да суседняга барака, дзе жыла свякрова адной з напарніц маці цётка Галя Кудзельская. Спадзеў, што за гэты час брат апрытомнее, не пакідаў яе. Але калі яны з

цёткаю Галяй вярнуліся, Паўлік па-ранейшаму прыкмет жыцця не падаваў.

Цётка Галя роспачліва заенчыла, пабегла да тартака па маці, а Люся засталася ў пакоі. І снег усё ішоў ды ішоў, і здавалася, яго неўзабаве стане так шмат, што не тое што ад цётчыных слядоў, а і ад суседніх будынкаў абапал двара не застанецца напаміну.

Разам з маці прыйшлі яшчэ дзве жанчыны, адна з іх незнаёмая, другая — нявестка цёткі Кудзельчыхі Ліда. Маці ўхутала Паўліка ў прасціну, у разгубленасці застыла з целам на руках пасярод пакоя.

Затым жанчыны і цётка Галя ўзялі прасціну за рагі, памалу панеслі ношку на двор. Але навошта і куды панеслі — не сказалі, і Люся правяла рэшту дня ў чаканні, што яны, мабыць, вось-вось вернуцца разам з братам.

Але яны не вярнуліся. І ёй нічога не засталося, як сядзець пры акне і глядзець, як патанае пад пластамі снегу самотная хвоя-спарыш ды меншае, меншае, чэзне пад снегам ніз сцяны барака насупраць.

Ёй хацелася конча дачакацца маці, каб спытаць, куды яны занеслі Паўліка, але яна не дачакалася. З'ела хлеб, спачатку свой, затым братаў, і, як толькі запаліўся на вышцы і асвяціў усё наўкола пражэктар, кульнулася на тапчан.

І, радая, што гэтак во неспадзеўна паболела ежы і пачысцела ў пакоі паветра, бо не смярдзіць болей мокрымі Паўлікавымі пялюшкамі, моцна заснула.

Міла Сцяпанаўна ўключыла тэлевізар, не чакаючы, калі з'явіцца на экране карцінка, — навошта, праграма "ANIMAL PLANET" — адзінае, што яна глядзіць апошнім часам, — пайшла ў кухню па гарбату.

Падсела да стала, на якім з раніцы грувасцілася горка прыдбанага для заўтрашняе выправы з Зелянухам да ракі харчу ды розных прыправаў, адхлюбнула з кубка раз, другі. Хацела ўжо падняцца, каб пайсці зноў у пакой, як раптам убачыла на дварэ постаць.

Мужчына стаяў на ходніку, прыхінуўшыся плячом да газетнага шапіка, і похапліва курыў.

Канешне, ён, Аляксандр Зянонавіч, Сашка, хто ж яшчэ, падумала яна і засталася сядзець пры акне. Падумала, што, можа, няблага было б запрасіць яго зайсці, але тае ж хвіліны адагнала спакусу прэч.

Запрашаць? З якое нагоды? Вось скончыцца ўся гэтая мітрэнга з Зелянухам, тады, можа… І то ці варта? Вунь жа не адказаў два гады таму на яе ліст, а пэўна ж, атрымаў яго. Не пажадаў адказаць — такой бяды, казаў той, вольнаму воля.

Зрэшты, меркаваць проста, а вось на справе… Як бы двое адмалку ні зрасліся, бы тыя спарышы, душамі, чаго ўсё яно вартае, калі целы — урозь… Што тая хваінка-спарыш у А.: карэнне і ніз камля агульныя, а самі камель ды ствалы — кожны па сабе. Цела ж, вядома, без душэўнае спажывы, як і душа без цялеснае, — пустая абалонка, не болей.

Але найбольш сумненняў у яе наконт уласнага знешняга выгляду: як-ніяк пяцьдзясят восем кабеціне. Ды і занятак, што ні кажы, накладвае адбітак. Тры гады з вантузам пад пахай і вядром ды швабраю ў руцэ — не жартачкі. Быў бы ён жанчынай — усё прасцей тады было б. Як вось з Лёляю. Шэсць год таму (яна тады яшчэ на пошце рабіла) прыслала ліст, прасіла прабачэння за прадаўнюю прыкрасць.

І яна адпісала, і ўжо дамовіліся спаткацца. Шкада, не лёс быў: памерла Лёля за месяц да спаткання, а то,

глядзіш, і добрае што магло б між імі наладзіцца… І, напэўна, наладзілася б, калі ўжо за гэтулькі год пра той яе (ды і свой, напэўна) паскудны ўчынак ля студні нікому не распавяла…

Яна зашмаргнула фіранку, пайшла зноў у пакой.

На экране львіца Тора ляжала ў зарасніку побач з дрэвамі, высочвала здабычу. Па тым, як напружылася ўся яе істота, ды па шчыльна сціснутай пашчы драпежніцы было бачна, што хвіліна пачатку атакі зусім блізка. Гэтым разам ахвяраю мусіла стаць цяля, матка якога, аднарогая буйваліха, ва ўчорашняй серыі ўсмерць забіла рогам аднаго з дзіцянят Торы, калі тая адлучылася да вады, а цяпер сама выправілася ў спадзеве спатоліць смагу да бліжэйшага ручая, пакінуўшы цяля сярод кустоўя.

Гэтыя перадачы пра жывёл! Яна прызвычаілася глядзець іх не так даўно, з паўгода таму, як толькі падключылася да спадарожнікавага тэлебачання. І з таго часу не прапускае ніводнай серыі.

Глядзіць уранні, удзень, увечары, абы вольная хвіліна. Глядзіць з такім утрапеннем, што, здаецца, неўзабаве сама, наглядзеўшыся ўсяе тае жорсткае экзотыкі, абрасце поўсцю ды ператворыцца ў звера, а то, глядзіш, і рыкне па-львінаму. Глядзіць з такім імпэтам, так уніклiва, што ўжо ўпаўне магла б быць кансультантам па фаўне ў якім-небудзь запаведніку, ва ўсялякім разе аленя пуду ад антылопы куду адрозніць так лёгка, быццам усё жыццё побач з імі пражыла.

Але асабліва даспадобы ёй тыя перадачы, дзе на паляванне выходзяць не звяры, а людзі. Чаму? Было б проста адказаць: хто ж ведае. Так адказаць — значыць, пакрывіць душою, як крывяць тыя, што ў пашанотным ужо нават узросце, шукаючы дурняў, даводзяць

іншым, быццам не разумеюць вытокаў собскіх учынкаў. Усе ўсё ведаюць, усе ўсё разумеюць. Іншая рэч, ці гэтак тыя вытокі прывабныя, каб жадаць дзяліцца веданнем пра іх з іншымі.

Так і з гэтымі праграмамі пра паляванне… Бо яна не проста іх глядзіць, яна імі — без перабольшання жыве.

Яна глядзіць, як знешне сімпатычны чалавек з манерамі інтэлігента не ў першым калене дэманструе з экрана без аніякіх пакутаў сумлення галаву забітай хвіліну таму прыгажуні антылопы або аленя, і яе ўласныя пакуты з нагоды колісь учыненага ёю зла здаюцца ёй на фоне ўсяго таго калі не марнымі, то дакладна мізэрнымі.

Яна слухае прыемны, поўны абертонаў гонару ад перамогі над безабароннаю жывёлінай дзе-небудзь у Кеніі ці ў Замбіі прывабны голас паляўнічага і міжвольна адчувае сябе часткаю пераможнай сілы.

Яна глядзіць на пераможцу і бачыць у ім сябе. Яна быццам бачыць сябе вачыма старонняга чалавека, і, што вельмі ёй важна, той старонні чалавек не асуджае яе.

І рашучасць выканаць сваю ролю да канца, паставіць апошнюю кропку ва ўласнай гісторыі поўніць яе. Нават калі, як тым птушанятам пярэстае казаркі, што, рызыкуючы жыццём, скачуць са скалы, з радзіннага гнязда следам за бацькамі ў памкненні да вады, давядзецца рынуцца галавою ў самы небяспечны, непрадказальны вір.

Яна выключыла святло, асцярожна падсунулася да акна. Адпяла даланёй рог фіранкі, зірнула на дол. Але там ужо нікога не было, толькі пара слядоў вяла паўз намецены ветрам друз ад ходніка да брамы дома адпачынку.

А ўсё-такі цікава, чаму ён не адказаў тады на яе ліст? Проста не пажадаў ці, можа, збаяўся, што яна прад'явіць (смяхоцце, па гэтулькіх гадах!) нейкія прэтэнзіі? Ці, можа, не дазволіла жонка? Зрэшты, ён ніколі жаданнем пісаць не вылучаўся. Не тое што яна: хоць бы той першы ліст у маленстве ўзяць, у якім яна апісвала Поўнач ды гісторыю Паўлікавай смерці і які потым гэтак адгукнуўся ёй праз Лёлю.

Тым часам Тора паспела паваліць цяля на дол ды ўпіцца зубамі ў шыю няшчаснага ў спадзеве як хутчэй задушыць. Буйваліха кінулася напрасткі паўз зараснік на ягонае адчайнае мычанне, і вось ужо дзве маткі сышліся ў жорсткім, як бывае, калі на кон пастаўлена само жыццё, паядынку.

Цяля ўзбрыкнула, узбадзёранае падмогаю, адскочыла ўбок, і праз хвіліну яны ўдваіх з буйваліхай зніклі па-за хмызам. Львіца праводзіла іх вачыма, прынаджаная з'яўленнем на даляглядзе нейкай іншай, мабыць, больш лёгкай здабычы, стаілася ў зараснiку.

Міла Сцяпанаўна адвяла пагляд ад экрана, зноў зірнула на акно, за якім чарнеўся шыхтам дрэваў бераг ракі. Вось там якраз, дзе рака робіць паварот, і знаходзіцца самае прыдатнае, калі даваць веры тутэйшым мужыкам, месца для рыбалкі. Праўда, абрыў там не надта высокі, усяго метраў з пяць, не тое што на пляцы ля млына, які яна дасюль памятае і будзе памятаць, напэўна, да скону, а ўсё ж…

Яны стаялі на пляцоўцы амаль пад самым дахам млына, і іх постаці то аддаляліся адна ад адной, то зноў зліваліся ў адну. Яны былі так высока, так далёка ад Люсі, што, каб хаця збольшага ўсачыць за іх рухамі, ёй трэба было шторазу ўскідваць голаў угору.

І кожны раз, як толькі яна тое рабіла, пігулка сахарыны выслізгвала з яе пальцаў на дол, гублялася ў траве. Раз-пораз яны штосьці казалі, і іх нягучная гамана бязладным ашмеццем ледзь улоўных гукаў працінала паветра, таяла па-над сценамі млына, і насоўка ў руцэ маці то трапяталася на ветры, то хавалася ў далоні.

Яна чакала, што яны, мабыць, яшчэ больш наблізяцца адзін да аднаго, і інтуіцыя не падманула яе.

Першы крок зрабіў мужчына. Ён так рэзка падаўся да маці, што яна на хвіліну, здаецца, зніякавела ад нечаканасці. Яна ўскінула рукі быццам каб абараніцца ад яго, але не паспела. Ён схапіў яе за запясце, са спрытам дзікага звера рвануў да сябе. Іх целы судакрануліся, але толькі на момант.

Маці вольнаю рукой ударыла яго па галаве, выхапіла другую з ягонай далоні. Невядома, ці моцны быў той удар, але мужчыну ён, безумоўна, прыйшоўся недаспадобы. Ён гэтак жа груба, як колісь у А. пад пукам святла ад пражэктара, схапіў маці за руку, цяпер ужо за локаць, тузануў да сябе.

І цяпер абрысы іх сплеценых у адно паставаў нагадвалі абрысы камля хвоі-спарыша ў А..

Маці зноў паспрабавала вызваліцца з абдоймаў мужчыны, але не дала рады. Ён трымаў яе так моцна, што яна ледзь-ледзь магла паварушыцца.

Вецер вымкнуўся з надстрэшша, зухаватым сватам пранёсся над пляцоўкай, абляпіў твары абаіх поламі ягонага плашча.

Мужчына абхапіў маці за стан, штурхнуў убок. Яна павалілася на дол, нерухомым кулем застыла на самым краі пляцоўкі.

Ён счакаў хвіліну, рашуча накіраваўся да яе. Шпаркасць і ўпэўненасць ягонае хады і скрыўленыя злосцю

вусны сумневу наконт таго, што мае быць далей, не выклікалі.

Ён падышоў да маці, выпрастанай наперад рукой лёгка-лёгенька да яе дакрануўся…

Жах ахапіў яе. Яна штосьці — здаецца, ці не "мама!" — закрычала і ўпала ніцма на траву.

Калі яна зноў узняла голаў, на пляцоўцы нікога не было. Толькі насоўка кружляла, бы планер, па-над краем выступу, але і яе неўзабаве знесла ветрам кудысьці ўбок.

Яна падумала, што, мабыць, яны ўжо пайшлі з пляцоўкі, і, не зважаючы на пігулкі сахарыны, што цурком сыпаліся са скрутка на дол, кінулася наўцёкі. Цела яе зрабілася такім бязважкім, што яна яго амаль не адчувала.

Яна ляцела паўз кустоўе няведама куды, і кароślівая лёгкасць ягонага дотыку пранікала ў яе глузды, штурхала прэч са свядомасці ўсе іншыя рухі і жэсты, якія яна ведала дагэтуль.

Вось так яна тады займела лёгкасць *дотыку*. Як няўчаснае раставанне антарктычнага айсберга выклікае метамарфозы клімату за дзясяткі тысяч вёрстаў ад яго, так выпадкова падгледжаная лёгкасць дотыку Зелянухавай рукі стала падмуркам фармавання яе новай сутнасці. Сутнасці, якая суправаджае яе ўсё жыццё і пра якую яна нікому, бадай, ніколі не наважыцца сказаць. Хоць, можа, і варта было б. Тым больш гэта было б апошняе, што яна наогул хацела б сказаць перад тым, як паспрабаваць той лёгкасці пазбыцца.

Менавіта гэтак — пазбыцца. І менавіта праз здзяйсненне задуманага. Бо *гэткая* лёгкасць — той жа цяжар, як валіза за плячыма, толькі шматкроць большы.

Двойчы яна ўжо спрабавала тое зрабіць. Першы раз — праз лекара-псіхатэрапеўта. “Вы да кагось датыкнуліся? — сказаў ён з мілым усмехам і паклаў ёй далонь на лоб, быццам хацеў памацаць глузды. — Ну, гэта не страшна, мы вас вылечым”. Другі раз — праз святара. Ды зноў няўдала, бо стары святар быў глухаваты і наўрад зразумеў з яе блытанага аповеду, пра што гамана.

А як жа Бог? О, калі гэта праўда, што Бог бачыць намі ўчыненае, то як ёй хацелася б, каб ён насамрэч, як прынята тое лічыць, бачыў усё. Бо тады, можа быць, і ёй застанецца які-ніякі шанц на выратаванне душы. Вось толькі як яна яго, той шанц, скарыстае? Хутчэй за ўсё — з’едзе ў А., адзінае месца на свеце, што, адчувае, ніколі не адпрэчыць яе. Успамін пра якое цвіком сядзіць у яе памяці адмалку і прыцягвае, бы магнітам, жорсткай праўдай дзяцінных мрояў-прыпамінаў. Месца, якое так шмат вызначыла ў яе жыцці і ў якім яна магла б (а можа, ёй толькі так уяўляецца, што магла б) заставацца сабой.

Тора ашчэрыла пашчу, пазяхнула, легла на пясчанік побач з ручаём, і жоўтыя вочы яе зліліся колерам з фарбамі пустэльні.

Яна выключыла тэлевізар, затым святло, легла на канапу. Уявіла, што яна Тора, і мроя ліслівaю ласкай абвіла яе голаў, стаілася ў звілінах глуздоў: што з таго, што невысокі той рачны абрыўчык. Затое пад ім, мабыць, шмат каменння, і, пэўна ж, яно зусім не такое мяккае, як пясчанае дно абмялелай за лета студні…

Яна выйшла на двор і па нязвыклых Лёліных паводзінах — кінулася да яе, бы да роднай, калі такое было? — адразу зразумела: штосьці дзеўцы трэба. Але што?

Лёля дастала з кішэньчыка нейкую зжоўклую паперчыну, тыцнула ёй пад нос:

— Ліст, дзе ты ўсё распавядаеш Сашку пра жыццё з маткаю і братам у лагеры. З гэткім лістом, варта аддаць яго куды след, не тое што ў інстытут — у самае задрыпанае ПТВ не возьмуць. Дык не ўзносся высака, а ідзі во з Вітакам. А тады, як вернецеся, і ліст аддам.

Вітак вымкнуўся з-за альтанкі, наблізіўся да іх, абдаў перагарам.

— А што, пайшоўшы, рабіць маем? — спанталычаная Лёліным нахабствам, спытала яна.

— А гэта ўжо мяне не датычыць. Хочаце — біцеся, хочаце — мілуйцеся, хочаце — хоць пацеры адмаўляйце, мне не абыходзіць.

Вітак стаў упобачкі, і дотык ягонай далоні апёк яе плячо. Яна хацела скінуць ягоную руку з пляча, але вырашыла не спяшацца: не такая ж ужо яна ў рэшце рэшт бездапаможная, каб у выпадку чаго не даць рады адбіцца ад нецвярозага.

Зрушыліся яны з Вітакам з месца, пасунуліся ў кірунку танцпляцоўкі. Мінулі прысады, вось і да клуба ўжо блізка, рукой падаць.

І тут хапель Вітак яе ўпоперак стану ды ў хмыз бэзавы, дзе перад тым яны з Сашкам цалаваліся, павалок. Завалок у сярэдзіну кустоўя і трымае, як воўк казу перад раздраннем. Трымае за плечы ды пазірае скоса ў бок сцежкі, быццам чакае каго, ды перагарам смуродлівым яе абдае.

І тут хтосьці яшчэ з'явіўся на сцежцы. Хацела яна паглядзець, хто там, але ж як даць рады ў цямрэчы, ды яшчэ паўз хмыз, пазнаць? Хоць галасы быццам і знаёмыя.

І толькі калі ліхтарыкам пачалі вадзіць са сцежкі па кустоўі, пазнала яна прыхажаяў: Лёля, а з ёю Сашка.

Кроў ударыла ёй у голаў: Сашка з Лёляй? Ды ці не ў змове яны? Хацела ўбок куды шмыгануць, каб незаўважнаю застацца, ды ногі падранцвелі, не жадаюць слухаць.

Сашка збег адразу, ледзь іх з Вітакам сярод кустоўя пабачыўшы. Неўзабаве і Лёля, нацешыўшыся, відаць, збянтэжанасцю яе, пайшла. І вось і Вітак яе адпусціў, быццам толькі і трымаў дзеля таго ў кустоўі, каб тыя двое іх разам пабачылі. Тут і зразумелы ёй стаў д'ябальскі, нялюдскі Лёлін змысел.

Як было такое перажыць? Думала за Сашкам следам бегчы, каб растлумачыць яму ўсё, ды сорам не пусціў.

Доўга-доўга, ледзь не да світанку цягалася, растузаная прыкрасцю, па наваколлі. А як першы раз певень кукарэкнуў, пайшла дахаты з цвёрдым намерам ліст той дзевяцігадовае даўніны, у якім пра Поўнач Сашку распавядала і які Лёля абяцала аддаць, калі пойдзе яна з Вітакам, запатрабаваць. Як абяцала — то хай жа і аддасць!

Пастукала Лёлі ў акно. Выйшла Лёля.

— Ліст узяла? Давай!

— Які ліст? Я ж пажартавала, што ён у мяне. Я яшчэ тады, калі малыя былі, чытала яго, а пасля і не бачыла ніколі. Якая ты даверлівая. Вось і плаці за гэта. Сашка твой на цябе зараз, пасля таго, як з Вітакам у хмызе заспеў, і не зірне ніколі.

Сказала так і да студні (папіць ёй гэтак конча захацелася) пайшла.

І вось ля студні яны, і вось нахінаецца Лёля, каб вядро ў зрубе адчапіць з цвіка. Нахінаецца, каб дацяг-

нуцца рукой да вядра, шнарыць рукою па сцяне, і ўсё дарэмна.

А ёй нібыта варажына-шатан глузды засціў. Глянула на Лёліны лыткі, што агаліліся напалову над зрубам (віднець акурат пачало), і замест іх мокрае цела маці з абгорнутымі наўкола пояса Паўлікавымі пялюшкамі перад сабою ўбачыла. І так ёй нясцерпна захацелася да тых малочна-белых, са шнарамі ад гумак вышэй каленяў лытак датыкнуцца, што ажно сама спалохалася таго жадання.

А Лёля ўсё кешкаецца з вядром, ніяк не дасць рады яго адчапіць. То так павернецца, то гэтак, а ўсё непярэліўкі. Цела — над зрубам, плечы і галава — у зрубе, і сукенка ўсё вышай і вышай падкасваецца, і ногі снегу паўночнага ў А. пры хваіне-спарышы бялей.

Як датыкнулася да тых ног лёгенька-лёгенька, як узмылі ўгору — нічога амаль у памяці не засталося. Адно, што засталося, — гэта як калодзеж раўнуў, быццам прымаць старонняе не жадаючы, ды як рэхам глухім наваколле на міг ад падзення старонняга таго ў прадонне агаласілася. І — усё.

Пастаяла яна крыху ля студні ды пасунулася дахаты.

Дабрыла да двара, глядзь: Сашка ў альтанцы сядзіць. Зайшлося сэрца ад жадання падысці, а ў вуха нібыта нашэптвае хтосьці: не трэба, не трэба, не спяшайся. Пайшла ў пакой, на ложак кульнулася ды і пракачалася без сну да рання.

Уранні паднялася: гармідар на дварэ, вэрхал. Суседзяў цягаюць па адным на дазнанне, а ёй — каб знак хто падаў ісці. Сядзіць яна, чакае. Паўдня гэтак сядзіць ні жывая ні мёртвая, дзень, вечар. Заснула — сон сасніўся. Быццам гоняцца за ёю нейкія людзі,

а яна, каб уратавацца ад іх, у неба ўзлятае. І лятае там, лятае… А на доле маці-нябожчыца ўдзвюх з цёткай Галяй Кудзельскай сігналы перасцярогі па чарзе ёй, як толькі наблізіцца каторы з пераследнікаў, падаюць.

А назаўтра прыйшлі па яе. Ды нядоўга мучылі-дапытвалі. Так, сполахам лёгкім абышлося. Яна б ужо, папраўдзе, з пярэпалаху таго ды з пакутаў сумлення і рада была б арышту, але, казаў той, — не лёс. Пераначавала, а ўранні, ледзь золак заняўся, да цягніка, сёетое з майна, пасведчанне аб рэабілітацыі ды аблігацыі бабуліны ў заплечнік запхнуўшы, пасунулася.

Куды далей, што, якім чынам — ні пра што не думала, нічога сама сабе не загадвала. І толькі як ужо састаў падышоў да паўстанка, схамянулася ў одуме, і А. з заснежанаю хвояй-спарышом, якім адмалку трызніла, ды твар цёткі Галі ўзбрылі ёй у голаў.

А. дык А., падумала і скочыла ў вагон.

Яна прахапілася ад дрэмы, зірнула на ходзікі: палова адзінаццатай, у гэткі час яна звычайна спіць. Падумала, што няблага было б раскласці канапу, як пачула з вуліцы нейкі гук. Адхінула фіранку, каб паглядзець, што там, але дарэмна: пагляд утыкнуўся ў густую завесу цемры, застыў на вершаліне хвоі па-за будынкамі дома адпачынку. І тае ж хвіліны амаль зноў саслізнуў долу, прынаджаны кропкаю святла ад цыгарэты. Нехта цёрся ў прагалку між брамаю і ходнікам і няспешна, раз-пораз падносячы да вуснаў цыгарку, курыў.

Зноў ці не *ён*, падумала яна і напружыла зрок у спадзеве хоць што-небудзь выхапіць вачыма, што пацвердзіла б прыпушчанне. Але цемра была занадта густая, а ўспышка ад цыгарэты, калі чалавек падносіў яе да

рота, занадта слабая, каб яго пазнаць. І ўсё ж… хай бы *ён* і быў.

Як яны цалаваліся тады ў хмызе наўзбоч танцпляцоўкі! Яна іх, тыя пацалункі, і зараз — бес у рабрыну — зрэдчас узгадвае. Згадкі прыходзяць раз-пораз так неспадзеўна, што яна літаральна ад іх дранцвее. Дранцвее і доўга-доўга пасля не можа вярнуцца ў яву. Стаіць, бы заспеты градабоем сярод поля вандроўнік, і бязгучна варушыць вуснамі ў адчайным жаданні прымусіць стрэлкі часу спыніцца на тым прамінулым імгненні. Варушыць вуснамі і думае пра тое, як шкада, што ад пацалункаў не нараджаюцца дзеці. Гэта адзінае шкадаванне, якое выяўляе яе слабасць. І яна беражэ яго ў сабе як сведчанне другой сваёй, няспраўджанай, ды не забітай дарэшты сутнасці.

Але наўрад гэта *ён*. З чаго б яму тут цэлы вечар цікаваць? Ды і энергетыка, падказвае ёй інтуіцыя, у *гэтага* зусім інакшая: занадта злавесная, ці што, каб быць *ягонай*.

Чалавек кінуў цыгарэту, і яна, апісаўшы ў цямрэчы дугу, упала па той бок тыну. Гэткі ж, як і напачатку, калі яна толькі прачнулася, гук, быццам хтосьці тыцнуў цвёрдым у глебу, данёсся праз шыбіну да яе вушэй, спарадзіў іншую здагадку. Фара аўто прарэзала змрочную гусціню, слізганула па ходніку, высвеціла ногі незнаёмца з кульбаю наўзбоч і знікла па-за дрэвамі.

Яна паўзіралася яшчэ колькі часу ў цемру, захінула фіранку, расклала канапу.

“Авохці! То каб хто пад вокнамі, а то во — двое адразу!” — падумала і наравіста, як колісь у маладосці тое рабіла, трасянула галавой у спадзеве як хутчэй пазбавіцца трывожнага, як тады, падчас першага спаткання з Зелянухам у А., прадчування.

А. сустрэў яе з абыякавасцю незнаёмца. Пасля пакутлівых перажыванняў з-за разрыву з Сашкам і ад'езду з дому гэта было першае яе новае ўражанне, таму яна вырашыла не марнаваць часу і адразу накіравалася ад станцыі шукаць патрэбнае месца.

Яна прайшла каля вярсты ўздоўж чыгуначнага палатна і трапіла ў падказаны адным з мінакоў раён. Раён месціўся ў нізіне і ўвесь быў забудаваны хрушчоўкамі. Ён заўжды асацыяваўся ў яе памяці са снегам, а цяпер было лета, так што выглядаў ён непазнавальна, прынамсі, зусім не так, як яна памятала. Так непазнавальна выглядаў, што сумнеў ахапіў яе: ці туды яна трапіла, куды мкнулася? Разам з тым інтуіцыя ёй падказвала, што прыйшла правільна.

Яна падышла да маладой жанчыны, якая развешвала ў двары бялізну, і сказала, што шукае. Жанчына здзіўлена глянула на яе і адказала, што гэта акурат тут. Маўляў, баракі знеслі пяць год таму, і вось якраз на месцы гэтае пяціпавярхоўкі насупраць месціўся адзін з іх.

Яна зірнула на будынак. Ён бліснуў ёй насустрач вокнамі, але ніякага знаку на гасціннасць не падаў. Тады яна вырашыла абысці яго наўкола. Павінна ж што-небудзь застацца, што яна пазнала б, падумала і ступіла за рог дома.

Адразу за домам пачынаўся яр. Гэта давала надзею, бо пры бараку, дзе яны колісь жылі з маткаю і Паўлікам, яр таксама быў. Усцяж яра цягнуўся падковаю, паўтараў ягоныя звілістыя лініі шыхт паўночных хвояў. Яе ўвагу міжвольна прыцягнула адна з іх напрыканцы шыхта.

Яна падышла бліжэй, і тут яе сумнеў канчаткова развеяўся. Гэта была тая самая хваіна-спарыш, толькі

значна падрослая. Яна пазнала яе па жалязяцы між камлямі, да якой звычайна дарослыя мацавалі для дзятвы ўлетку арэлі.

Усцешаная, што вандроўка сюды, на Поўнач, не была дарэмнай, яна вярнулася да дома, каб запытацца ў жанчыны, ці не ведае яна цётку Галю Кудзельскую. "Ведаю, — адказала тая. — Але цяпер яе няма, бо яна з'ехала да сына ў Саратаў і вернецца ў А. толькі напрадвесні".

Навіна расчаравала яе, бо пазбаўляла магчымасці сёе-тое распытаць пра маці і пра тадышняе іх жыццё ў А.

Яна спытала, ці не здае хто-небудзь паблізу кватэру. "Якраз я і здаю, — адказала жанчына. — Я жыву адна, у мяне двухпакаёўка, і вам было б у мяне няблага". Жанчына спытала, дзе яна працуе, і яна адказала, што яшчэ не працуе, але мае намер уладкавацца куды-небудзь, напрыклад, паштаркай у аддзяленне сувязі. Жанчына сказала, што плата за пакой будзе невялікая, бо ёй сумна адной і яна даўно падшуквае кватарантку, і павяла яе да сябе.

Яна паказала гаспадыні аблігацыі і папрасіла памарудзіць з аплатаю жытла да пачатку тэрміну іх пагашэння, што вось-вось павінен быў пачацца. Жанчына згадзілася. Назаўтра яны выправіліся ўдзвюх на пошту, дзе якраз рабіла гаспадыніна сваячка, і яе ўзялі паштаркаю. Так яна засталася ў А.

Удзень яна разносіла па кватэрах газеты і лісты, увечары, калі заставаліся сілы, блукала па мясцовасці. Відарысаў у наваколлі, якія яна магла дакладна ўзгадаць з часоў маленства, было няшмат. Але тыя, што згадваліся, выклікалі ў ёй такую буру эмоцый, што яна пасля тых шпацыраў доўга не магла заснуць. Дадавала

маркоты і расстанне з Сашкам, якога яна згадвала штодня і пра сустрэчу з якім марыла кожную хвіліну.

Аднаго разу яна так задумалася падчас прагулянкі, растузаная ўспамінамі, што не заўважыла, як забрыла на могілкі. Паманулася адшукаць магілку брата Паўліка, але не дала рады: клады былі занадта вялікія, да таго ж многія магілкі на іх — без помнікаў. А калі яна дома спытала ў Наталлі, гаспадыні, як усё-такі знайсці братава захаванне, тая ў адказ толькі махнула рукой: якое захаванне, хутчэй за ўсё ляжыць твой брат дзе-небудзь у яры, тады так шмат мерла тут люду, асабліва дзяцей, што было не да пахаванняў. Здаралася, што і ў зямлю нябожчыка не закопвалі, такая яна была каляная. Дык прысыпалі цела снегам ды і пакідалі пад гурбаю.

Увесь гэты час ёю ніхто не цікавіўся, і яе тое цалкам задавальняла. Як і роўныя адносіны з Наталляй, што ўсталяваліся між імі ад першага дня і якія, бадай, толькі штосьці зусім ужо надзвычайнае магло парушыць. Яна распавяла сваёй гаспадыні збольшага пра сябе (апроч студні, вядома).

Наталля ўспрыняла яе гісторыю спакойна, і гэта нібыта давала надзею на яшчэ большае паразуменне надалей. Наколькі яна тады памылялася, паказаў час. Што да неспадзянак кшталту спраўджання асобы, то іх яна не баялася: пасведчанне аб рэабілітацыі заўсёды было пры ёй.

Праз тры месяцы пасля яе прыезду ў А. начальніца пошты папрасіла яе падмяніць на працы занямоглую паштарку з суседняга ўчастка. Яна згадзілася, і клопатаў ды беганіны ёй значна дадалося. Яна прапрацавала на два ўчасткі два тыдні і ўжо амаль дачакалася вяртання каляжанкі, як здарылася нечаканае.

Яна панесла ў адну з кватэр тэлеграму і спаткалася там з Зелянухам, старым знаёмцам. Тым, што быў за наглядчыка ў лагеры і колісь сфатаграфаваў яе са сваім сынам Вадзькам і які прыязджаў у мястэчка ў дзень смерці маці. І якога яна бачыла з маці на пляцоўцы млына перад тым, як маці загінула.

Ён яшчэ не паспеў адчыніць дзвярэй, а яе ўжо быццам абдало сцюжаю. Ён стаяў у дзвярах і разглядаў яе ва ўпор з такой настойлівасцю, што ёй тае ж хвіліны захацелася збегчы куды падалей. Яна глядзела на яго і не ведала, як сябе паводзіць: ці то загаварыць, нагадаць, што яны знаёмыя, ці то змаўчаць.

А ён усё свідраваў ды свідраваў яе неверагодна блакітнымі сваімі вачыма, быццам сіліўся ўплішчыцца паглядам у думкі. На нейкі міг ёй нават здалося, што ён пазнаў яе. Страх загнанага звера, гэткі самы, як у той дзень, калі ён прыязджаў у мястэчка і аб нечым угаворваў маці, а тая не пагаджалася з ім, мільгнуў у блакітных вачах, і яна скураю адчула небяспеку, што зыходзіла ад усяго ягонага лядашчага цела.

Яна вырашыла нізавошта сябе не называць. Тут ён спытаў, як яе завуць. "Мілай", — адказала яна, інтуітыўна адарваўшы палову ад свайго поўнага — Людміла — імя, і пайшла прэч.

Сустрэча з Зелянухам ускалыхнула яе, ды галоўная неспадзянка падчэквала ўсё-такі дома.

Быў перадабедзенны час, ёй захацелася перагледзець старыя фоткі. Яна палезла ў альбом, дзе яны ляжалі заўсёды побач з аблігацыямі. Фоткі былі на месцы, затое аблігацыі, адзіны яе спадзеў хоць на якую капейчыну ў прышласці, быццам карова злізала языком. Яна ператрэсла ўсе свае рэчы, але дарэмна, аблігацыі зніклі.

Ёй захацелася гарбаты, яна вырашыла запаліць пліту, але ўбачыла, што ў кухні няма запалак. Яна пайшла ў Наталлін пакой, каб узяць запалкі з энзэ ў шуфлядцы стала, і там натыкнулася на сваю згубу — аблігацыі.

Знаходка ашаламіла яе. Але ўзаемаадносіны з гаспадыняй не давалі падставы для нейкіх кепскіх высноваў, і яна вырашыла пачакаць яе рэакцыі на знікненне злашчасных паперак з шуфляды.

Яна прыхавала знаходку ў сваім пакоі і пачала чакаць прыходу Наталлі.

Наталля прыйшла а палове другой і адразу пачала рыхтаваць сабе абед. Запалак не было, і яна пайшла па іх у пакой. Было чутно, як яна адчыняе па чарзе шуфляды, тым часам як запалкі ляжалі на самым бачным месцы, спрыхаду.

Яе вяртанне канцэнтрацыяй жарсці нагадвала рэакцыю сярэднявечнага ваяра на знікненне паса вернасці ў юрлівае жонкі. Наталля моўчкі прайшла ў кухню, запаліла пліту, кінула запалку ў бляшанку з-пад часціка. Затым павярнулася да яе тварам, не гледзячы ў вочы, сувора сказала:

— Не думала, што ты гэткая неахайная. Паглядзі, колькі бруду паўсюль у калідоры. Няўжо цяжка падмесці?

Зачэпка для больш грунтоўнае "размовы" была такой відавочнай, а заўвага была прамоўленая такім зласлівым тонам, што яна знямела ад нечаканасці. Аднак Наталля, відаць, інтэрпрэтавала яе маўчанне як вышэйшую ступень абыякавасці да яе слоў, таму прадоўжыла наступ яшчэ больш жорстка:

— І хто дазволіў табе шнарыць у маёй шуфлядзе? Ты што — дазнаўца? — Тут яна канчаткова страціла

кантроль над сабою і закрычала што мела моцы: — Варагіня народа! Спадзяешся абвесці ўсіх вакол пальца. Дзе аблігацыі? Вярні іх на месца, не то будзе блага! Я табе так зраблю, што ніколі нікуды больш са сваім паскудным мінулым не ўладкуешся, і пасведчанне тваё гаўнянае табе не паможа!

Яна схапіла балейку з прапаласканаю ўранні бялізнай, кінулася на балкон яе развешваць. Злосць усё яшчэ трэсла яе, і, здавалася, мокры — хвілін дзесяць таму на дварэ працерусіў кволы дожджык — дол балкона без парэнчаў наўкола не вытрымае той распаленай не на жарт злосці, вось-вось засіпіць пад босымі Наталлінымі нагамі.

Богведама, як так сталася, але раптоўна спакой ахапіў яе. Яна пабыла колькі хвілін у пакоі, выйшла следам за гаспадыняю на балкон.

Наталля стаяла да яе спінаю з зашчэпкамі ў зубах, і пара злымі шэрымі аблочкамі выштурхвалася разам са словамі з яе рота, слалася над галавой. Яна ніяк не магла спыніцца і ўсё гаварыла, гаварыла… Яна была такая непрыгожая ў прыступе злосці і разам з тым такая кранальная ў няведанні сваёй незайздроснай будучыні, што Люсі міжволі захацелася да яе датыкнуцца — лёгенька-лёгенька, быццам муху адагнаць ад талеркі са страваю ці восвіну. Так лёгенька, што яна, мабыць, і сама не заўважыла б ні таго дотыку, ні таго, што сталася б у наступную хвіліну. Так хутка, што бялізна, як колісь насоўка з далоні яе маці, не паспела б выпасці з Наталліных рук.

Яна ўявіла, як Наталля ляжыць з раскінутымі ўбакі рукамі і нагамі на доле пад балконам і ў немым здзіўленні, быццам хоча штосьці запытацца, глядзіць на яе нежывымі вачыма, і… рашучасць пакінула яе. Яна ад-

вяла пагляд убок, стрымгалоў кінулася назад у пакой. Паклала ў партманет аблігацыі і хуценька пайшла з кватэры.

На яе шчасце, пошта была ўжо цалкам пасартаваная, таму ні з кім спатыкацца на працы ёй не давялося. Яна разнесла рэшту пошты, пакружляўшы па А., пабрыла на станцыю. Падумала, што няблага было б, напэўна, вярнуцца ў кватэру па рэчы, але не насмелілася: раптам гаспадыня ўсё яшчэ не супакоілася, і як потым, калі што якое, каму давядзеш, што чалавек — гэткі ж звер, як і астатнія звяры, і што будзіць у ім жывёліну — небяспечная справа?

Вось так, пракантаваўшыся паўдня на станцыі, яна з'ехала тады з А. Хвоя-спарыш, адзіны матэрыяльны напамін з яе маленства, праводзіла яе маркотным шапаценнем голак, ды стрыклівы, не менш стрыклівы ад крапівы вакол тае хвоі пагляд Зелянухі кальнуў з-за фіранкі наўздагон у спіну, калі яна праходзіла з валізаю паўз ягоны дом.

Яна ўзняла голаў, зноў глянула на ходзікі: палова дванаццатай. Акурат ці не гэткаю во парою сышла яна тады без капейчыны, але з аблігацыямі ў кішэні на станцыі па дарозе з А. ды і захрасла ў чужым гарадку на без малога трыццаць гадоў. Нават на трыццаць два, калі браць пад увагу, што, уладкаваўшыся ўжо на працу ў дом адпачынку, не-не ды і вярталася ў гарадок, зазвычай увесну ці ў восень, каб то магілку мужа дагледзець, то забраць сёе-тое з пакінутых у цёткі Кудзельчыхі рэчаў.

З мужам ёй пашчасціла, безумоўна, хоць і выйшла за простага каюра, даглядчыка сабак. Пётра Баговіч (так звалі каюра) чалавек быў добры, а галоўнае —

аднае з ёю крыві, з аселых на Поўначы ссыльных беларусаў. І разумеў яе. Калі яна, да прыкладу, дзесяць год таму надумалася ўзяць да сябе нямоглую цётку Галю, сын і нявестка якой загінулі ў аўтааварыі, не тое што словам не запярэчыў, наадварот, памагаў даглядаць старую, як мог. Шкада, рана памёр, але тут ужо каму як наканавана.

Ад цёткі Галі яна тады шмат чаго даведалася пра сваё з маці жыццё ў А. падчас высылкі. Нават пра такія дробязі, як матчыны гузакі на скронях у дзень смерці Паўліка, якімі яе, аказваецца, усё той жа Зелянуха ўзнагародзіў, жаноцкае прыхільнасці дамагаючыся. А яшчэ пра тое, як мітусіўся пасля расстрэлу Берыі, баяўся, каб каторая з жанок не заявіла куды след, ды паляцеў расшукваць адну з найбольш ім пакрыўджаных — Любу Гарнак.

Вось тады, даведаўшыся пра ўсё, яна і вырашыла папомсціцца…

Але што значыць — вырашыла? Рашэнне само прыйшло, і значна раней, яшчэ ў дзень сустрэчы са старым падчас яе першай вандроўкі ў А. І якая ёй справа да ўсіх гэтых мудрагелістых разваг пра марнасць помсты ды наступстваў, якімі яна абарочваецца для таго, хто помсціць?

Гэта праўда, на свеце шмат людзей, і з соцень, тысяч, дзясяткаў тысяч заўсёды ёсць шанц выбраць найбольш табе сімпатычных. Але ж і міма подласці праходзіць не выпадае. Ёсць рэчы, якіх не ўнікаць трэба, а наадварот, — набліжацца да іх, каб не даць ім мажлівасці паўтарыцца ў прышласці. Так што і не дараваць — таксама навука. І яе яна спасцігла дасканала. І цяпер дакладна ведае: яе час настаў.

Настаў… Яна гэтак часта, з гэткімі падрабязнасцямі складала ў галаве план помсты, што ён урэшце стаў неад'емнаю часткай яе сутнасці. Яна так доўга

выношвала ды песціла той план у глуздах, што ён, напэўна, ужо нізавошта, нават каб яна таго вельмі пажадала, яе не адпусціў бы. Як не адпускала яе ўсе гэтыя гады адчуванне віны з-за Лёлі. Якому яна, праўда, навучылася-такі збольшага даваць рады, забіваючы сябе працаю ды рознымі альтруістычнымі ўчынкамі, за што тут, у гэтым заштатным доме адпачынку, яе і клічуць усе не іначай, як маці Тэрэзай. І гэта калі не выкупляе дарэшты (вядома ж, не!) былых яе правінаў, то хаця б робіць іх у яе ўласных вачах не такімі злавеснымі. А калі і гэтага недастаткова ёй для самазаспакаення, яна ўключае тэлевізар і глядзіць праграмы пра паляўнічых.

Сёння чацвёрты тыдзень, як яна наблізілася ўшчыльную да ажыццяўлення сваёй задумы. Бо тры тыдні таму ў доме адпачынку з'явіўся, нарэшце, Зелянуха.

Ён прыехаў уначы, і яна была першая, з кім ён сутыкнуўся ў прыёмным пакоі. Ён не пазнаў яе, ды і яна яго, прызнацца, — з цяжкасцю: мінула гэтулькі гадоў. Ён пасяліўся на паверсе, дзе яна за прыбіральшчыцу, і вось яна ўжо тры тыдні прыбірае ягоны пакой. Яны нават, можна сказаць, у пэўным сэнсе пасябравалі, як могуць пасябраваць два пажылыя, з розніцай у нейкія два дзясяткі гадоў, чалавекі.

Такія адносіны расслабляюць яе, і яна, каб не паддацца старэчай абаяльнасці Зелянухі, змушае сябе ўяўляць яго калі не монстрам, дык хаця б нягоднікам. Гэта няцяжка, варта толькі ёй згадаць эпізоды з аповеду цёткі Галі пра тое, якую ролю адыграў ён у жыцці маці ў лагеры ды прыпушчанне наконт вытокаў трагедыі на млыне. Нічога гэтага сам ён, вядома, не ведае і калі і ўведае, дык не раней, як у апошнюю сваю хвіліну. А яна, гэтая хвіліна, не за гарамі.

Заўчора ён прапанаваў ёй выправу на прыроду напрыканцы ягонага тэрміну адпачынку. Яна згадзілася.

Не адразу, памулялася крыху дзеля прыліку, але згадзілася. І па тым, як загарэліся ягоныя вочы, яна зразумела, што для яго яе згода чамусьці вельмі важная.

Гэта яе насцярожыла: ці не вядзе і ён нейкую гульню? Ад гэтых пенітэнцыярыстаў-адстаўнікоў што заўгодна можна чакаць. Ці не вызнаў ён выпадкам, хто яна, і ці не ладуе якую-небудзь пастку? Што, калі злаўчыўся-такі пашнарыць учора ў кішэнях халата?

Ды ў любым выпадку пікнічок адбудзецца.

Яна добра ведае мясцовасць і прапануе пайсці да ракі. Туды, дзе самы высокі, стромы бераг і наўкола шмат віроў. Яны раскладуць вогнішча, і, пакуль ён будзе вудзіць з абрыву рыбу, яна зоймецца прыгатаваннем перакусу. Затым пакліча яго есці, але ён, захоплены ўдалым клёвам, нават яе не пачуе. Тады яна падыдзе да яго, каб паклікаць зблізку. Крок, другі, трэці, вось ён усё бліжэй, бліжэй…

Ён будзе стаяць да яе спінаю і з утрапеннем маладзёна, што ўпершыню выйшаў на ловы каханкі, глядзець, як гайдаецца на вадзе паплавок. Ён будзе такі кранальны ў сваёй зачараванасці хараством хвіліны ды чаканні ўзнагароды за цярплівасць, што ёй захочацца да яго датыкнуцца.

І яна падыдзе і датыкнецца — лёгенька-лёгенька, як колісь да Лёлі. Так лёгенька, што ён і зразумець нічога не паспее.

Яны будуць стаяць так блізка адно да аднаго, што яна будзе чуць ягонае дыханне, бачыць, як пульсуе жылка на ягонай старэчай, у шызаватыя пупырышкі, патыліцы. І калі што пойдзе не так, як след, яна тут жа выправіць сітуацыю. Не, не скочыць з адчаю на дол, гэтага яна ніколі не зробіць, *ні-ко-лі* — не дзеля таго гэтулькі гадоў чакала!

Яна — *датыкнецца да яго*. І вецер — адзіны сведка доўгачаканай дзеі — падхопіць ягоны крык і разнясе рэхам па бязлюдным наваколлі, як колісь разнёс ейны па ваколіцы млына.

Яна датыкнецца, і гэта будзе першая яе ў жыцці параза, якую яна прыме без горычы і шкадавання. Цень якой, у адрозненне ад папярэдніх, ні на хвіліну не азмрочыць рэшту адпушчаных ёй лёсам гадоў. І за мажлівасць якой удзячнасць яе Богу будзе такой вялікай, што яна нават сходзіць у святыню ды шчыра-шчыра, як толькі зможа, да Яго памоліцца.

Толькі б даў вытрымку не саступіць у апошнюю хвіліну, як колісь у А., на мокрым тым Наталліным балконе. Чаму яна тады сышла? Збаялася? Аказалася не гатовай да гэткага ўчынку? Можа быць…

Штосьці шорхнула на дварэ, быццам хто шпурнуў у сцяну з расшпару жменю пяску, і працяглы енк рубероўднае абіўкі балкона агаласіў наваколле. Яна паднялася, каб паглядзець, што там, адшмаргнула фіранку.

Вецер на дварэ быў такі моцны, што ажно згіналіся ледзь не напалам пры ходніку кустоўе і маладыя дрэўцы.

“Дажджу толькі не хапала”, — падумала яна і націснула кнопку тэлепульта.

Экран успыхнуў, абрысы пустэльні калыхнуліся на далягляцдзе зыбкім мроівам, адцяняючы самотна-ўтрапёную постаць Торы наўзбоч ракі з высокім, метраў у дзесяць абрывам, у колькіх кроках ад якога знайшлі пад дрэвам ратунак ад бязлітаснага сонца аднарогая буйваліха з цялём.

Львіца смачна пазяхнула нібы ў прадчуванні ўдалага палявання, выгнула спіну дугою, пасунулася краем берага да абрыву. Але тут жа знікла з поля зроку, бо на экране з’явілася застаўка, і знаёмы голас вядоўцы па-за кадрам абвясціў канец серыі.

“Мабыць, гэта апошняя”, — падумала яна і незадаволена — вось жа конча ім, гэтым вядоўцам, перапыняць дзею на самым цікавым — выключыла тэлевізар.

Яна прачнулася а шостай. Дакладней, не прачнулася, а прахапілася ад забыцця. Бо праз ноч амаль не заснула, толькі ўжо на самым дасвецці на колькі хвілін змежыла павекі ды акунулася ў кароткую цяжкую дрэму.

На дварэ было светла, але бязлюдна. І зусім, на дзіва, бясхмарна. Гэта дадало ёй гумору. Яна хуценька злезла з канапы, пачала апранацца. Падумала, што няблага было б глытнуць перад адыходам кавы або гарбаты, пасунулася ў кухню. Але запальваць пліту не стала. Наліла ў кубак астылага ўчорашняга кіпеню, густа засаладзіла варэннем. Ужо падняла кубак, каб выпіць, але ўзгадала, што шэсць дзён не прымала, занятая думкамі аб выправе на прыроду, лекаў ад страўніка, зноў паставіла кубак на стол. Вылузнула з пласціны пігулчыну, сунула ў рот, запіла вадою з гарбатніка. І толькі накіравалася ў ванны пакой, каб пачысціць зубы ды навесці збольшага марафет на твары, як азваўся тэлефон.

У слухаўцы не чутно было ні гуку, але яна не сумнявалася: тэлефануе Зелянуха. І, пэўная, што не памыляецца, бадзёрым голасам сказала:

— Выходжу праз пяць хвілін, чакайце мяне на дварэ, Васіль Іванавіч.

На тым канцы лініі, аднак, працягвалі маўчаць, і гэта крыху збіла яе з тропу: а раптам і не Зелянуха тэлефануе, а хто іншы?

Але гэта быў ён, што і пацвердзілася ў наступную хвіліну:

— Не забудзьцеся прыправу для юшкі. І хлеба паболей вазьміце. Раптам не захочуць кляваць на чарвяка… Ды і я сам без хлеба — ні кроку, такая звычка.

Яго голас гучаў спакойна, але неяк нязвыкла ціха, гэта яе насцярожыла.

— Вы кепска сябе адчуваеце?

— Не, з чаго вы ўзялі? Проста недаспаў, мабыць…

— Ну, гэта не страшна, галоўнае — каб імпэт да лоўлі быў. Як нага?

— Нішто.

Ён паклаў слухаўку гэтаксама нечакана, як і патэлефанаваў. І зноў яна, як перад пачаткам размовы, адчула сябе так, нібыта яе акунулі з галавою ў бязважкасць.

Што ў яго наўме? Чым скончыцца ўся гэтая яе авантура? Што, калі пойдзе ўсё зусім не так, як яна плануе?

Яна выняла з лядоўні падрыхтаваны звечара правіянт, хуценька склала ўсё ў сумку. Падумала, што няблага было б прыхапіць і гарэлкі, пасунулася ў пакой да шафачкі. Пстрыкнула па дарозе пультам тэлевізара ў надзеі ўбачыць хоць кавалак чарговае серыі з жыцця львоў, але ёй не пашанцавала. Серыя, відаць, ці то толькі што скончылася, ці яшчэ не пачыналася. Тора з разяўленаю пашчаю схілілася на застаўцы перад магутным, вялізным, як гара, старым львом-адзінотнікам у памкненні абараніць ільвяня ад небяспекі.

Цяпер можна было і вырушаць з кватэры, але яна не спяшалася. Старанна абгледзела сябе з усіх бакоў у люстэрку і тады толькі падалася да дзвярэй.

І ўсё адно штосьці было не так. Але што?

Пагляд яе слізгануў па пакоі, запыніўся на грудцы вопраткі пры рабрыне канапы. Ну, канешне ж, пасведчанне аб рэабілітацыі, як яна магла забыцца?

Яна пераклала пасведчанне з кішэні халата ў кішэньчык кофты, пайшла на пляцоўку.

На дварэ акурат перад яе вокнамі двое мужчын у жэкэгоўскай апратцы торкалі ў ямкі пры ходніку невысокія, сантыметраў пад шэсцьдзесят, саджанцы хваінаў. Следам за імі сунулася кабеціна з вядром і ашчадна, быццам тут наўкола бракавала вады, палівала з конаўкі саджанцы рудаватаю жыжай, і знябожаныя сушшу тонкія іглістыя дубчыкі порстка ўздрыгвалі пад вадзянымі струмянямі.

Яна прайшла паўз тройцу, мінула браму, папраставала да корпуса дома адпачынку.

Зелянухі на дварэ не было. Яна пачакала колькі хвілін, зірнула на ягонае акно, але нічога не ўбачыла, апроч гардзіны, і пайшла ў будынак.

У калідоры на другім паверсе было ціха, толькі з-за Зелянухавых дзвярэй даносіліся гукі радыё.

Яна пераклала сумку з правай рукі ў левую, стукнула костачкамі пальцаў па аўшаку.

— Чакаю вас, Васіль Іванавіч, — сказала і стукнула яшчэ раз — па абіўцы. — Без чвэрці сем, пара адыходзіць. А то гэтак і ўвесь клёў прапусцім.

— Адыходзіць дык адыходзіць, — азваўся ледзь чутна стары і расчыніў дзверы.

Пагляды іх сустрэліся на імгненне, адцягненыя тупатам у сталоўцы, куды толькі-толькі пачала збірацца на змену абслуга, цьмянымі пытальнікамі завіслі ў паўзмроку калідора.

— Што вы так ціха гаворыце, быццам чаго перасцерагаецеся? — спытала яна паўжартам, аддаючы яму сумку з правізіяй.

— А ці мала што, — гэтак жа паўжартам адказаў ён і лёгка перакінуў сумку цераз плячо. — Раптам — скрозь вушы? Ну, Міла Сцяпанаўна, здзіўляеце вы мяне. Не вучылі вас ніколі асцярожнасці, ці што?

IV

Дарашэнка расчыняе дзверыну, ціха, каб не пабудзіць няўрокам каго з суседзяў, высоўваецца на балкон. Вятрыска вее з-за рога будынка, казытлівым бесянём слізгае па шыі, валасах, улагоднены сонечнымі прамянямі, што ўсё настойлівей прабіваюцца на дол праз рэдкую, амаль празрыстую завесу хмарак, суцішваецца ў прагалку паміж акном і плітою балкона.

На дварэ свежа, але не холадна і галоўнае — на дождж, які адзіны можа стаць перашкодаю для абяцанага Алушынага прыезду, быццам не паказвае.

Што жонка мае намер наведаць яго ў доме адпачынку, Дарашэнка даведаўся напярэдадні ўвечары з тэлефоннае размовы з ёю. Нэля едзе ў М. па тавар для фірмы, гэта якраз па дарозе, вось Алуша і вырашыла скарыстацца нагодаю пабачыцца з ім. Пабудзе ў доме адпачынку паўдня, а на зваротным шляху Нэля зноў яе забярэ з сабою.

Дзве постаці, адна бездакорна роўная, бы гатычная калона, другая прыкурчаная і пры кульбе, мільгаюць пад брамаю, таропка прастуюць ходнікам у кірунку сцежкі, што вядзе да ракі.

Ён думае, што няблага было б аклікнуць іх, але не паспявае. Хтосьці ляпае дзвярыма, і голас медсястры працінае відочна пасвяжэлае праз расчынены балкон паветра пакоя:

— Ціск будзем сёння мерыць, Аляксандр Зянонавіч? Не?

Ён хоча адмовіцца ад працэдуры, каб хутчэй вярнуцца на балкон ды павіжаваць з вышыні за выпраўшчыкамі, але перадумвае: што з таго віжавання? Похапкам вызваляе з-пад кашулі локаць, абыякава, быццам усё яшчэ знаходзіцца ў думках на доле з Зелянухам і Мілай Сцяпанаўнай, кладзе руку на стол.

Ігруша стэтаскопа віскоча раз-другі нібы ў знак пратэсту, змірыўшыся з моцаю рукі, пакорліва аціхае ў спрактыкаванай далоні медычкі.

— Сто трыццаць на дзевяноста, даражэнькі. Норма.

Медсястра адыходзіць, і ён зноў застаецца адзін. Выходзіць на балкон, зіркае на дол.

Дзве постаці абмінулі ўжо сажалку, мерна зыбаюцца абрысамі на фоне кустоўя.

Санлівасць раптам ахоплівае яго, і ён вяртаецца да ложка. Кладзецца не распранаючыся паверх накрыўкі, змежвае павекі. “Было не адмаўляцца ад мабільніка, а то вось прыедзе Алуша знячэўку, а я — ніякі, быццам усю ноч дзесьці бадзяўся”, — думае і правальваецца ў сон.

Прачынаецца ён ад гуку клаксана. І хоць ні Кірыкавага аўто, што выслізнула, пакуль ён спаў, з-пад брамы пад самае акно, ні пасажыраў у ім ён не бачыць, адразу здагадваецца: Алуша з Нэляю.

Сапраўды, гэта жонка і Нэля. Ён яшчэ не паспявае збольшага апаласнуць пад кранам твар, як жанчыны ўжо ў пакоі. Абедзве выглядаюць здарожанымі, да таго ж Нэля, — рэдкі выпадак — нешта не ў гуморы.

— Штосьці здарылася? — ачомаўшыся ад пачуцця няёмкасці, што вось у гэткім непрэзентабельным выглядзе сустракае гасцей, пытаецца ён.

— Ай, не кажы! — Нэля махае рукой, сядае на зэдаль. — Андрэйка мой… Дурань! Казала ж: не лезь у гэты дурацкі страйкавы камітэт, дык не… Знайшоўся хтосьці, данёс куды след, і вось ужо — маем непрыемнасці. Мала таго, што фінансавую праверку фірмы ўсчалі, дык яшчэ па тэлевізары на ўсю краіну ў пазаўчорашніх навінах зняславілі, ледзь не здраднікамі радзімы аб’явілі. Амаль шэсць дзясяткаў чалавеку, а розуму…

Яна падхопліваецца, нервова ходзіць з кута ў кут.

— Ну, можа, усё яшчэ і абыдзецца, — кажа Алуша. — Не хвалюйся гэтак, машыну ж весці…

— Ага, лёгка сказаць: не хвалюйся! Я б таму даносчыку — не ведаю, што зрабіла б. Далібог, яйцы паадрывала б. Зрабіў паскудства, і хоць бы што яму, як не героем пачуваецца, два вечары запар не сыходзіць з экрана…

— І халера з ім. — Алуша дастае з сумкі пакецікі кавы, адданая схільнасці да слоўнае замежчыны ды поўная жадання хоць крыху развесяліць сяброўку, звяртаецца да мужа: — Саша, як наконт кохі*? Ці тут у вас праблема з варам?

— Можна ў сталоўцы папрасіць, — адказвае ён.

— Ну, піце сабе свой кохі, а я паехала, — маркотна кажа Нэля і ідзе да дзвярэй.

Яна адыходзіць, і Дарашэнка з Алушаю застаюцца ўдваіх. Быццам у чаканні, хто першым загамоніць, моўчкі сядзяць, забыўшыся пра намер папіць кавы, насупраць адно аднаго хвілін пяць, аж пакуль не абзываецца з калідора, абвяшчаючы пра перадабедзенны пасілак, раздатчыца Зінаіда. Тады адначасна падымаюцца з месцаў, радыя неспадзеўнаму ўмяшальніцтву старонняга, падаюцца ў калідор.

“Вось, усяго тыдзень мінуў, як не бачыліся, а нібыта чужыя адно аднаму”, — жахаецца Дарашэнка, сутаргава падшукваючы ў думках тэму для далейшае размовы. Алуша, аднак, апераджае яго.

— У Ігара, ведаеш, нібыта наладжваецца з абаронаю, — кажа і бярэ яго пад руку. — Пры Нэлі не хацела табе казаць, дык цяпер скажу… Чын адзін са службаў,

---

* Японізаваная англійская назва кавы.

з тых, што на размову яго выклікалі летась перад паездкаю на сімпозіум у Швецыю, абяцае паспрыяць. Не за так, канешне, сам разумееш, давядзецца хлопцу адпрацоўваць. Але ж хоць нейкая надзея…

— Адпрацоўваць? — агаломшана перапытвае ён. — Як гэта? Хочаш сказаць — будзе стукачом?

— Ды супакойся, нічога страшнага. Усялякую ж справу па-рознаму можна рабіць…

Ён хоча запярэчыць, але не паспявае. Раздатчыца Зінаіда заўважае яго са сталоўкі праз расчыненыя дзверы, нецярпліва вабіць да сябе. Яна вялікая прыхільніца тэлесерыялаў, а праз чвэрць гадзіны акурат пачынаецца чарговая серыя, і ёй карціць як хутчэй скончыць працу.

— Толькі жанчыне дадзена гэтак адчуваць, толькі жанчыне, — кажа Алуша і са шкадаваннем глядзіць на экран, дзе курчацца ў перадсмяротным любоўным экстазе змарнелыя целы персанажаў яе ўлюбёнага, бачанага-перабачанага “Начнога парцье”. — Каханне, што па-над усім, — хіба мужчына, які б ні быў ён тонкі ды далікатны, такое зразумее? Наогул, мужчына такі фільм наўрад і зрабіў бы. Калі б нават і вельмі захацеў. Малайчына гэтая Кавані*. Праўда, Нэля?

— Ну, вядома, — з выглядам чалавека, які не дасць рады ўцяміць, з чаго гэтулькі эмоцый, адказвае Нэля. Яна толькі што ўвалілася ў пакой пасля ўтомнага шляху з М. і зараз прагна прыгублівае раз-пораз з гарляка бутэлькі прыхоплены ў прыдарожнай забягалаўцы напой. — На тое яны і мужчыны, каб уносіць у жыццё каліва чэрствасці ды грубасці. Хоць, з іншага боку,

---

* Кавані, Ліліяна — італ. рэжысёр.

вось Макс гэты з фільма, да прыкладу, — хіба не ўзор абыходлівасці ў дачыненні да каханкі?

— Садыст, нягоднік, забойца! — прамаўляе Алуша, і ў голасе яе выразна чуецца захапленне. — Але ж затое які рызыкант!

— І віжам умее даць рады, — вяртаючыся да ранішняй гамонкі пра набалелае, кажа Нэля.

Апроч непярэлівак са страйкавым камітэтам у Кірыкаў яшчэ, аказваецца, непрыемнасці, звязаныя са здачай у арэнду памяшкання нейкай апазіцыйнай грамадскай структуры. Арэнда выгодная што адным, што другім, але хтосьці парупіўся данесці пра яе "куды след", і цяпер тую дамову аб арэндзе, каб не паляцеў у тартарары адладжаны, паспяховы кірыкаўскі бізнес, трэба тэрмінова скасоўваць.

— І здольныя ж людзі на вось такія бессаромныя ўчынкі. Я маю на ўвазе тых, што даносяць. І гэта пасля ўсяго распаведзенага ды напісанага пра тое апошнім часам. Поп Гапон ды Паўлік Марозаў у параўнанні з імі — святыя. І сумленне іх не мучыць, і спяць сабе яны спакойна… Як такое назваць? Поўная дэвальвацыя каштоўнасцей…

— Не дэвальвацыя, а змена парадыгмы, так цяпер гэта мянуецца, — адзываецца Алуша. — Якую можна выкарыстаць дзеля апраўдання якога заўгодна паскудства. А як чаго заўгодна, ды яшчэ без належнага падмурку прынцыповасці ў людскіх галовах, — то, лічы, і любой амаральшчыны. Ты згодны, Саша?

— І галоўнае, — апераджае Дарашэнку Нэля, — куды ні паткніся, каб высветліць, адкуль вушы растуць, — нідзе ніякіх канцоў. І калі яно гэткае скончыцца і ці скончыцца калі ўвогуле? Ну, пастраляць толькі гадаў…

— Во-во, пастраляць! То яй… геніталіі паадрываць, то ўжо во — пастраляць… А яшчэ каталічка, як не сорамна! Не ведаеш хіба: апантаны помстаю дзве магілы капае — таму, каму помсціць, і сабе, — кажа Алуша і дадае праз хвіліну: — Адзіны спадзеў застаецца — на маладых, можа, яны што зменяць… Ды на гэтых яшчэ… нацыяналістаў.

Аднак усцешнасць яе высновы падвяргаецца рэзкаму крытычнаму нападу Нэлі:

— Ат, усе яны адным возам па піва едуць! Ці ты не бачыла ні разу па тэлевізары, з якім понтам маладыя часам сваімі стукацкімі замашкамі выхваляюцца? А нацыяналісты? Мы вось з Прагі з Андрэем ехалі з адным гэткім, усё спевы круціў нейкага Суніцкага*, ці як яго там… Андрэй пра неабходнасць каардынацыі дзеянняў падчас акцый пратэсту завёў гамонку — дзе там, на смех падняў! Вы, кажа, з Прагі, са святога для кожнага свядамага грамадзяніна месца вяртаецеся, а вось адрасы гэтага спевака, што цяпер чуеце і што ў самой Ла Скала спяваў, ці парупіліся наведаць? Не? А пра Ларысу Генюсь што ўведалі? Нічога? То пра якую каардынацыю можа быць размова, калі мы з вамі, манкуртамі-недавяркамі, на розных *плянэтах* жывем? Такая парадыгма атрымліваецца.

— Што дзіўнага, адвеку ў нас так: утраіх сярод трох хвояў заблукаем і не заўважым адзін аднаго… А як што якое, непярэліўкі якія — абставіны ў нас вінаватыя, парадыгма. Зручна: на іншых панаракаў, а сам і чысты нібыта застаўся.

— Мабыць, праўда твая… Вось маёй адной знаёмай мужык, пісьменнік, да прыкладу, таксама пра пара-

---

* Забэйда-Суміцкі, Міхал, бел. спявак.

дыгму любіць паразважаць. Толькі не тэарэтычна, як мы зараз, а з прывязкаю да жыццёвай сітуацыі. Кніжак ягоных людзі не чытаюць, дык вырашыў, ведаеце, па-новаму пісаць. Маўляў, няма чаго боты апісваць, трэба больш прынадныя для чытача сферы асвойваць. І во толькі што, хваліўся, аповед мадэрновы выдаў на-гара — пра эякуляцыю ў гумовік.

— Вар'ят, — рэзюмуе ўчынак героя аповеду Алуша і глядзіць на Дарашэнку. — Саша, што ты маўчыш?

— А што казаць. І так усё зразумела, — прамаўляе ён і паціскае плячыма.

— Усё, час ад'язджаць, а то да рання не дабярэмся дахаты, — кажа Нэля і дапівае напой.

Жанчыны падымаюцца і, перш чым Дарашэнка паспявае хоць бы дзеля прыліку запярэчыць, ідуць да дзвярэй.

— Ну, не сумуй надта, — Алуша счэквае, пакуль выйдзе з пакоя Нэля, цмокае яго ў шчаку. — Дарэчы, працу маю новую не жадаеш паглядзець? Знарок везла, каб табе паказаць.

Ён ідзе следам за жанчынамі да прыторкнутага скрай пляцоўкі аўто, паслухмяна лезе следам у салон.

— Вось, скончыла ўрэшце распачатае, — кажа Алуша і дастае з-за сядзення батык. — Нічога асаблівага быццам, а сілаў шмат запатрабавала.

— І дзе гэта ты бачыла зялёны мухамор? — ахае Нэля. — Ну, я разумею, гарошына там зялёная, ці травіна якая, ці яшчэ што, а то мухамор… Верх шапачкі зялёны, іспод чырвоны, плямы блакітныя, аж вочы адбірае — ну і грыб! Дзівосы, а не грыб! Сюр-шыза дый годзе! Зусім на цябе не падобна, поўная змена парадыгмы. З чаго б гэта?

— А табе як, Саша? — запальваючы цыгарэту, пытаецца Алуша, і надзея на мужаву ўхвалу гучыць

у яе голасе так непасрэдна і разам з тым так нечакана, што Дарашэнка не адразу дае рады знайсці належныя словы ў адказ.

Ён глядзіць на ўвасоблены ў ядвабе Алушын грыб і ловіць сябе на думцы, што яму хочацца адшчыкнуць ад яго кавалачак. І тае ж хвіліны другі, з адшчыкнутым ужо краем шапачкі, Люсін, паўстае перад ім, і думка, што нішто-нічагуткі на гэтым свеце не знікае бясследна, а значыць, не дарэмна, лагодзіць яго.

Яшчэ толькі пачатак жніўня, а дажджы ліюць такія, быццам ужо восень. З раніцы сонца выблісне на пару гадзін, наабяцае богведама якога шчадроцця, ды вось зноў аднекуль наплывуць хмары, зацягнуць ад краю да краю неба, і пачынаецца залева. Яна такая густая, што на двор не высунеш носа: імгненна змочыць да ніткі. Ды і з абуткам у хаце напруга. У Сашкі з маці адны боты на дваіх, іх па чарзе яны і абуваюць, выходзячы па патрэбе. След бы купіць яшчэ хаця б адны, але не выпадае: ёсць рэчы ў гаспадарцы пільнейшыя.

Маці сядзіць пры акне, лапіць бацькавы нагавіцы, то падчэпіць корт голкаю, быццам выпрабоўвае тканіну на трываласць, то порстка-порстка запрацуе нажніцамі.

Тым часам залева пакрысе цішэе, і вось ужо зноў на дварэ светла і сонечна. А гэта значыць, што Сашкава з Люсяю выправа ў грыбы ўсё-такі адбудзецца.

Сашка скідвае з ног атопкі, улазіць ступнямі ў падсушаныя з вечара пры шчытку боты. Боты яму велікаватыя, і ён перад тым, як іх абуць, старанна — бацькава навука: як абуешся, так і паходзіш — абгортвае ногі анучамі.

— Акуратна там, глядзі, не ўзбіся дзе на патарчаку, — кажа маці і здымае з пальца напарстак. — Падзіравіш апошнія — будзем да зімы басаногі хадзіць.

— Ужо ж пастараюся не ўзбіцца, — рады перспектыве набадзяцца, урэшце, удосталь па ачмурэлым ад несупынных дажджоў наваколлі, адказвае ён і глядзіць на ганак барака, дзе чакае ўжо ўхутаная ў падкарочаны на траціну непрамакальны вайсковы Зюзялькоў плашч Люся.

Акно насупраць з рыпам расчыняецца, і Лёлін (яна тры дні таму прыехала пагасцяваць у Зюзялькоў) тонкі, але гучны, не раўнуючы як у цёткі Карусі, калі тая нервуецца ці злуе, голас урачыста абвяшчае:

— Мухаморы — найлепшыя грыбы! Паясі іх — і адразу па полі паляціш. Паляціш, ажно хвоі замільгацяць прад вачыма і неба бялей гурбаў снегу паўночнага здасца.

— Што яна трылузіць пра хвоі ды пра снег, гэтая дзеўка? Снег сярод лета, авохці! — кажа маці і паціскае плячыма. — От жа дзіўная. А гамоніць складна — павучыцца ў яе.

— Наваражыла Лёлька-варажбітка, — кажа Люся і кладзе мухамор паверх накрыўкі вярэні. Шляпка грыба такая вялікая, што дарэшты хавае пад сабою і накрыўку, і астатнія, ядомыя, грыбы.

Яны стаяць на горняй пляцоўцы паўразбуранага млына, перачэкваюць чарговы напад калючых пасаў дажджу. Холадна, і яны (ці, можа, Сашку так здаецца, што яны, а насамрэч — толькі ён?) ціснуцца адно да аднаго ў спадзеве хоць крыху сагрэцца.

Яны ціснуцца целам да цела, і кожны іхні дотык адзываецца ў яго ў грудзях дробным, як ціўканне

вераб'ят па падстрэшшу, лекаценнем. Ён штосілы мкнецца суняць лекаценне, і Люся быццам адчувае гэта: то пасунецца ўбок, то адступіць паўкроку назад, то наогул павернецца да яго бокам.

Гэта першы іх за шэсць год пасля смерці цёткі Любы сумесны пад'ём на пляцоўку і першае Люсіна пераадоленне справакаванае тою даўняю трагедыяй фобіі. Люся панічна баіцца вышыні, але сёння яна сама пажадала падняцца на пляцоўку, і, мабыць, толькі Бог ды анёлы-ахоўнікі ведаюць, што дзеецца зараз у яе галаве.

Яна нахіляецца над выступам муру, доўга, быццам жадае як болей увабраць у сябе з убачанага на доле, глядзіць на каменне ўнізе. Глядзіць і бязгучна, бы прамаўляе малітву, варушыць вуснамі. Затым безуважна выпроствае руку да вярэні, адшчыквае малюсенькі, як змясціць на краі пазногця, кавалачак мухамора, падносіць яго да рота. І, перш чым Сашка паспявае спытаць, ці не збіраецца яна яго з'есці, злізвае языком з пальца.

Яна глытае, і роспачлівасць ягонага пагляду адбіваецца ў яе прыцемненых няведамым змыслам зрэнках.

— Што ты робіш? — крычыць ён і адчувае, як блытаецца ад жаху ў вузкай прасторы між нёбам і зубамі ягоны скалянелы, спалярушаны ўбачаным язык. — Што?

— Што з табой? — прамаўляе яна, і голас яе гучыць спакойна і крыху расчаравана. — Гэта ж усяго толькі грыб. Грыб!

— Гэта атрута! Ці ты не разумееш? Выплюнь!

— Ну, не! — пярэчыць яна і, быццам баючыся, што ён зараз пачне гвалтам змушаць яе да ванітаў, падаецца ад краю ў глыб пляцоўкі. — Нічога не здарыцца, ні-чо-га. Не будзь нервозам!

Яна прамаўляе апошняе так рашуча, што яму нічога не застаецца, як змоўкнуць.

Яны стаяць спінамі адно да аднаго, і цень непаразумення ўпершыню раздзяляе іх. Упершыню ягоная мяккасць закаханага пятнаццацігадовага падлетка раз біваецца на аскепкі аб яе каменна-спарудлівы спакой.

Яны маўчаць, і нясцерпнае жаданне, каб як найхутчэй гэтае дурное маўчанне ўрэшце скончылася, вярэдзіць яго.

Ён думае, як зрабіць крок насустрач, і тут адчувае дотык Люсінай далоні да свайго пляча. І хоць дотык такі лёгкі, што ён ледзьве яго адчувае, радасць ягоная — вось і замірэнне! — такая вялікая, што пераважае ўсе сумневы.

— Навошта ты гэта зрабіла?

— Захацела і зрабіла, — кажа Люся, і ўсведамленне недасяжнасці яе думак-мрояў, хоць яна і не выдае ўжо такой страхавітай, як напачатку, зноў ахоплівае яго.

— І хто ж гэта кладзе атрутныя разам з ядомымі, — кажа баба Настазя і асцярожна здымае мухамор з вярэні. — Ды яшчэ такі аграмадны грыб, гэткім паўмястэчка можна атруціць.

— Паўмястэчка як паўмястэчка, а сяго-таго не шкодзіла б, — адзываецца Люся, і твар яе зноў, як паўгадзіны таму на млыне, робіцца ўтрапёна-зласлівым.

Яна падыходзіць да акна, за якім зноў дождж сячэ па лістоце кустоўя, што ўжо нават і не ўздрыгвае ў марным памкненні працівіцца стыхіі, глядзіць на зацягнуты плеўкаю шэрані — неўзабаве ноч — хвойнік удалечыні.

Яна ўзіраецца ў дрэвы, што то цьмянеюць, то, наадварот, святлеюць на тле небасхілу, і здаецца,

што нічога болей важнага за тыя хваіны на памежжы святла і ценяў зараз для яе не існуе.

Яна свідруе вачыма знябожаныя непагаддзю дрэвы, і адстаронена-няўлоўная таемнасць яе пагляду і намёку на жаданне шчырасці з кім бы то ні было не дакляруе.

Машына меддапамогі падрульвае да будынка, прыпыняецца побач з уваходам у корпус. Другая, міліцэйская, абганяе яе, утыкаецца перадам у сходы ганка. Двое мужчын у цывільным вылазяць з салона, дружна, бы па камандзе, запальваюць па цыгарэціне.

Зелянуха мкнецца вылезці з аўто следам за імі, але яму падаюць знак, каб заставаўся на месцы, і ён пакорліва ўцягвае зноў у салон разам з кульбаю высунутую напалову вонкі нагу.

Маладзейшы з мужчын кідае ў сметніцу ледзь раскураную цыгарэту, ідзе ў корпус. Другі, старэйшы, што вельмі з твару ды паставы кагосьці Дарашэнку нагадвае, застаецца пры аўто.

Дарашэнка стаіць на балконе наўзбоч ганка, і ўсё, што дзеецца ля аўто і “хуткай”, яму добра бачна. Ён сіліцца ўгледзець у салоне паставу Мілы Сцяпанаўны, але зрабіць гэта цераз танаванае шкло немажліва, і яму нічога іншага не застаецца, як чакаць.

Але і чакаць доўга не выпадае, бо маладзейшы з хаўруснікаў заўважае яго са сходаў паміж паверхамі, адчыняе фортку, гучна, быццам баіцца, што на доле яго не пачуюць, кажа старэйшаму:

— Тут на балконе чалавек, таварыш Бібік, можа, з ім паразмаўляць? Можа, ён што бачыў…

Старэйшы ўздымае голаў, глядзіць у задуменні хвіліну-другую на Дарашэнку.

— З балкона? Адсюль да ракі вярсты тры, калі не болей, — адказвае сіплаватым голасам і адмоўна круціць галавой. — Ды і не стаяў жа ён там, на балконе, цэлы дзень. Ну, ты даеш, аднак, Галыга!

Галыга падымаецца ў калідор, ідзе да пакоя абслугі і праз колькі хвілін зноў збягае на дол — з халатам Мілы Сцяпанаўны ў руцэ. Мужчыны па чарзе абмацваюць халат, нічога не знайшоўшы, кідаюць яго ў салон.

Зелянуха зноў падае голас, штосьці кажа ім, высоўвае з салона кульбу.

— Не-не, — спыняе яго Бібік і, счакаўшы хвіліну, пакуль стары ўцягне кульбу назад, зачыняе дзверку аўто, загадвае кіроўцу "хуткай" ад'язджаць.

"Хуткая" скранаецца з месца, паварочваецца бокам да будынка, і Дарашэнка выразна бачыць праз шыбіну на лежаку накрытае прасцінаю цела. Мяркуючы па абутку, што вытыркаецца з-пад рога прасціны, — цела жаночае. Але разглядзець яго не атрымліваецца, бо аўто дазнаўцаў ужо мчыць наперад, засланяе сабою і шыбіну, і руку ці то медыка, ці то санітара ў белым, што таропка нагінаецца над целам, каб прыкрыць ногі прасцінаю.

— А я дык і не сумнявалася, што гэтак скончыцца, — кажа раздатчыца Зінаіда і падцінае танюткія, быццам усохлыя з-за недахопу плоці, што ўся пайшла на фармаванне іншых частак яе неабдымнага цела, вусны. — З такога сяброўства калі што добрае атрымлівалася? У вочы — сю-сю, у вачах жа — спрэс нянавісць, што ў яе, што ў яго… Вось ён яе, гэты старэча, і ўходаў. Вось паглядзіце: ён забойца, шалава буду, калі не пацвердзіцца маё прыпушчанне.

Зінаіда заўсёды ўсё ведае, таму і на гэты раз ёй даюць веры без залішніх ваганняў. Балазе, і навіну пра

смерць прыбіральшчыцы яна даведалася першая. І цяпер ахвотна дзеліцца ёю з кожным, хто таго ні пажадае. Хоць ужо, папраўдзе, нікога, хто б быў не ў курсе справы, у корпусе, відаць, няма.

— У пастарунак ні за што, так сабе не пацягнуць, — рэзюмуе наастатак раздатчыца, і гэта — апошняя кропля, пасля якой ні ў каго нават каліва сумневу наконт Зелянухавай вінаватасці ў смерці Мілы Сцяпанаўны не застаецца. Тым больш што ўжо гадзіны тры мінула, як аўто дазнаўцаў і "хуткая" ад'ехалі ад будынка, а яго ўсё няма і няма. Значыць, штосьці такое ёсць: хто б гэтак доўга трымаў у пастарунку невінаватага, тым больш старога ды ў дадатак не надта здаровага чалавека?

"Штосьці ёсць", — думае Дарашэнка і брыдзе калідорам да свайго пакоя. Думае, што няблага было б як след адаспацца, але класціся яму зусім не хочацца, і ён выходзіць на балкон. І адразу натыкаецца паглядам на кропку святла ўдалечыні.

Кропка няўхільна большае, і вось тое самае аўто, у якім Галыга з Бібікам павезлі надвячоркам Зелянуху, спыняецца ля ганка.

Стары вылазіць з легкавіка, памалу ступае па жвіры да ўвахода ў корпус.

— Дойдзеце самі, ці памагчы, дзядуля? — пытаецца праз прыспушчанае шкло кіроўца.

Зелянуха грэбліва — адчапіся, маўляў, што за глупствы — адмахваецца ад запытанта кульбаю.

— Ну, глядзіце самі, мне што. Мне загадалі зрабіць чын чынам — я і раблю. Каб потым не наракалі ды не скардзіліся…

Аўто з'язджае з двара, і стары доўга-доўга глядзіць яму наўздагон. Глядзіць так утрапёна, так пільна і ра-

зам з тым так насцярожана, быццам баіцца, што яно, крый бог, вернецца. І толькі калі дарэшты чэзне сярод зарасніку кропка святла, ажывае, плюе сабе пад ногі, з выглядам паляўнічага, якому нясветна пашэнціла падчас ловаў, сунецца да дзвярэй.

— І ахвота ж людзям мерзнуць на балконе, — кажа, і ягоны хрыплівы голас з'едлівым тэнарком працінае паветра. Працінае так неспадзеўна, што Дарашэнка нават не паспявае даўмецца, да каго той тэнарок скіраваны. А калі ўрэшце дапетрвае, што менавіта да яго, адказваць ужо няма каму.

Палова дванаццатай, а сонца яшчэ ні на хвіліну як след не вызірнула з-за хмараў. І неба, што сям-там свіціцца кволаю празрыстаю сінечаю на тле іх шматкоў, нагадвае сурвэтку з плямамі ежы па абедзе. Быццам нехта там, угары, сядзіць з мяшалкаю і наўмысна, каб дадаць маркоты ўсяму, што месціцца на доле, збівае іх у бязладны, неахайны гурт. Але і дажджу, праўда, няма. Ды гэта ці не горш, бо толькі дадае наваколлю вусцішу і няпэўнасці.

Дарашэнка сядзіць у альтанцы наўзбоч уваходa ў корпус, згадвае ўчорашні візіт Алушы і яе расповед пра Ігаравы справы. Ды нядоўга, бо іншамарка, вельмі падобная да той, што ўчора павезла Зелянуху ў пастарунак, уязджае ў двор, павольна паўзе да пляцоўкі пры канцы алеі, абуджае іншую згадку.

Гэты Бібік — ці не сваяк ён дазнаўцу, што колісь вёў у мястэчку справу Люсінай маці? Так яны падобныя адзін да аднаго, што, калі б побач паставіць, далібог, не даў бы рады адрозніць… Сын і бацька, можа, ці нават унук з дзедам? А можа, так сабе аднафамілец, ці мала здараецца гэткіх супадзенняў?

Дзверы ляпаюць, на двор выходзіць Зелянуха ў суправаджэнні Зінаіды, шкандыбае да іншамаркі.

Мужчына год пяцідзесяці ў плямістай камізэльцы вылазіць з аўто насустрач старому, моўчкі вітаецца, штосьці кажа.

Зелянуха колькі хвілін стаіць побач з аўто, затым спахопліваецца, паважна, бы леў падчас прагулянкі пасля ўежнага абеду — паўрасчынены рот з шыхтам бліскучых устаўных зубоў, грыва выцвілага, але ўсё яшчэ даволі густога валосся над ілбом, — вяртаецца разам з прыбіральшчыцай да корпуса.

Зінаіда бярэ старога пад руку, стульвае сэрцам ледзь заўважныя сярод шчочна-сківічных наростаў тлушчу вусны:

— Ад'язджаеце ўсё-такі, Васіль Іванавіч… І правільна, пасля такога — што тут вам заставацца? Вось як яно бывае, хто б мог падумаць…

— Ай, не кажыце, — прамаўляе ахвотна, быццам толькі і чакаў, што яго зачэпяць, Зелянуха. — Гэта ж уявіце сабе: ледзь-ледзь датыкнуўся да яе пляча, каб загаварыць, а яна, дурніца, — скок ні з таго ні з сяго з абрыву на каменне. Быццам чакала таго майго дотыку. Ведаў бы, што гэткая неўрастэнічка, нізавошта б не пайшоў з ёю на той бераг. Яна рынецца галавою на дол, а ты адказвай… Нішто сабе! А яшчэ ж знойдуцца такія, што і забойства прыпішуць… Вось і навука будзе старому дурню, як асцярожна трэба паводзіць сябе з людзьмі… Што ж, век жыві, казаў той, — век вучыся.

Яго зрэнкі на міг затрымліваюцца на Дарашэнкавым твары, заміраюць быццам у здранцвенні і тут жа падаюць долу.

— Памагчы з рэчамі, тата, ці без мяне дасце рады? — пытаецца кіроўца.

— Колькі там тых рэчаў, — адказвае за старога Зінаіда і лагодна ўсміхаецца. — Галоўнае, не забыцца што з майткоў ды скласці ўсё як след, каб надта не пакамечылася… Дарога ж няблізкая.

— Ну, глядзіце самі, як лепей. А то магу пасобіць, няцяжка…

Стары і прыбіральшчыца знікаюць у будынку.

Дарашэнка яшчэ колькі хвілін застаецца ў альтанцы, пацепваючыся — на дварэ халаднавата, пранізліва-куслівы вецер так і гуляе па плячах — ідзе следам за імі. Падымаецца ў пакой, уключае тэлевізар. Але ледзь паспявае зірнуць на экран, як з двара зноў даносяцца галасы Зелянухі і прыбіральшчыцы.

Ён падыходзіць да акна, ды запозна. Аўто ўжо праязджае пад брамаю, і рука прыбіральшчыцы са сціснутаю між пальцаў шакаладкаю — няйначай, плата за турботы падчас збораў — весела махае яму наўздагон.

Дарашэнка колькі хвілін узіраецца ў аўто, затым вяртаецца да тэлевізара, у тупым здранцвенні ўтарапліваецца вачыма ў экран, дзе львіца Тора мчыць па пустэльні з намерам упаляваць імпалу. І хоць адлегласць паміж драпежніцай і ахвяраю то меншае, то, наадварот, павялічваецца, здаецца, зыход гонкі сумненняў не выклікае.

І ўсё ж у апошні момант імпале ўдаецца-такі ў нейкім неверагодным скачку пазбегнуць кіпцюроў пераследніцы, і яна, збіўшы львіцу з панталыку собскімі спрытам ды адвагаю, знікае ў прырэчным зарасніку.

Тора са шкадаваннем глядзіць колькі хвілін услед уцякачцы, з выглядам істоты, за якою заўжды будзе галоўнае слова, брыдзе ў логава.

Гэта апошняе, што Дарашэнка бачыць. Дрэма, цяжкая, як хмары за акном, авалодвае ім, і ён паступова правальваецца ў сон.

Адна з думак, што мільгае ў ягонай галаве ў гэты кароткі паміж яваю і забыццём момант, — пра тое, што дарэмна ён усё-такі не паразмаўляў з Мілаю Сцяпанаўнай. Ды пра тое, як чамусьці яму карцела, калі стаяў апошні раз на балконе, скочыць на дол і датыкнуцца да Зелянухі — лёгка-лёгенька, як колісь павуцініна да шчакі ў кароткую пару бабінага лета на вузкім лапіку пожні пры альтанцы насупраць кватэры дзядзькі Зюзялька і цёткі Карусі.

І калі Зінаіда ўваходзіць у ягоны пакой быццам каб штосьці запытацца, а насамрэч болей з ахвоты пагаманіць пра страхавітае здарэнне з Мілай Сцяпанаўнай, ён ужо так моцна спіць, што жанчыне нічога не застаецца, як расчаравана ўздыхнуць ды пакінуць яго ў спакоі.

Цягнік спыняецца, і Дарашэнка паспешліва — стаянка ўсяго пяць хвілін, а пасажыраў даволі шмат — улазіць у гарачы, напалены сонцам за дзень тамбур, ідзе калідорам да вызначанага правадніцай купэ.

У абвешаным гронкамі штучных кветак калідоры яшчэ гарачэй, як у тамбуры, і думка, што то будзе за ноч у гэткай задусе, дарэшты псуе ягоны і без таго маркотны настрой.

Рашэнне з'ехаць з дому адпачынку дачасна, не дабыўшы тэрміну пуцёўкі, выспела ў яго неўпрыцям, само сабою. Яно, мабыць, і някепска, што выспела, бо неўзабаве мінае год кантракту на працу ў тэхнікуме, і трэба афармляць усе паперы нанова, то няхай будзе на тыя турботы дзён з запасам. Апроч таго, і сумнеў наконт сынавай дысертацыі, абарона якой прызначана на наступны аўторак, не дадае ахвоты адпачываць.

У купэ цемнавата і амаль пуста, толькі з лежака насупраць ягонага месца звісае на дол жаночая рука з бранзалетам на запясці.

Жанчына ўздымае голаў, і гучны, з адмысловаю інтанацыяй выкліку голас дзеўкі з прычоскаю ні то Б'ёрк, ні то маладой Пугачовай, той самай, што ехала тры тыдні таму ў сталіцу да каханка-суценёра, напаўняе купэ:

— Вы, дзядзька? Ну ж сустрэча! Хваліцеся, як адпачылі?

— Дзякуй, добра. А вы як? Вяртаецеся дахаты? Надакучыла ў вялікім горадзе?

— Якое там! — Дзяўчына падхопліваецца з лежака, сядзіць колькі хвілін моўчкі нібы ў здранцвенні, затым зноў пачынае гаварыць. — Пакуль я ў бацькоў гасцявала, Артурчык, гад балотны, з сяброўкай маёй, Анжэлкай, скруціўся. То не заставацца ж мне трэцяй! Але і выдала абаім на развітанне, доўга будуць памятаць. Будуць памятаць, паскуднікі, не хутка забудуцца!

— А самі што будзеце рабіць?

— А што мне, прыткнуся дзе-небудзь. У камерцыі, да прыкладу, можна… Вунь сястра мая з мужыком каторы год курэй возяць з Расіі на продаж — прыбытковая справа. У Турцыі, кажуць, таксама няблага на зборы ўраджаю можна зарабіць. Пару месяцаў напрыканцы лета парабіў і адпачывай сабе рэшту года. Або ў Маскву падацца, там ёсць дзе разгарнуцца. А не выгарыць нідзе — дома справу адкрыю, ахвотных зарабіць дзяўчат вунь колькі наўкола, толькі прапануй. Досвед маю, што ды як, дам рады. Паглядзім… А на іх і на б.....і іхні бізнес заяўлю куды след, хай пацягаюць разумнікаў…

Яна гаворыць хутка, і выраз яе твару штохвіліны робіцца ўсё больш помслівым, і ўрэшце ён, спопелены злосцю, ператвараецца ў непрыгожую, пачварную маску.

Дарашэнка куляецца ніцма на ляжак, стараючыся не слухаць, што гаворыць дзеўка, бо гаварыць яна, ад-

чувае, можа доўга, адварочваецца тварам да сцяны. На дзіва, і яна адразу ж змаўкае.

Колькі хвілін мінае ў цішыні, затым цішыню нечакана пранізвае слабы ўсхліп. Ён такі па-дзіцячы жаласны і так няўмольна набірае з кожнаю хвіляю моцы, што Дарашэнку робіцца не па сабе. Ён мяркуе, што б сказаць дзяўчыне такое, каб супакоіць яе, але не знаходзіць слоў. Глыбей унурваецца шчакою ў падушку, намагаецца ўспомніць, як зваць (вось жа казала колісь Люся, а ён забыўся) Зелянухавага сына.

Думка пра тое, якая гэта нялёгкая справа — здзяйсняць учынкі ў адпаведнасці з узростам, яшчэ хвіліну трымае яго ў палоне, павольна чэзне ў нетрах растузаных падзеямі тыдня глуздоў.

РАЗ — ШКІЛЕТ, І ДВА — ШКІЛЕТ

Аповесць

I

Што лецішча можа быць так сабе, Тадэвуш Піліпавіч зразумеў яшчэ падчас тэлефонных перамоваў з гаспадыняю дома. Пусціць у жытло кватаранта за мізэрныя грошы, амаль, лічы, задарма, — такое дабрачынства ў часы, калі кожны штомоцы грабе пад сябе, хіба што ў сне або ў казцы ці ў мыльным серыяле сустрэнеш. Ды і самі перамовы прайшлі неяк надта ж ужо паспешліва. Быццам толькі і мела кабеціна наўме як хутчэй каго-небудзь гэтым нехлямяжым будынкам за трыццаць вёрстаў ад горада ашчаслівіць. А калі яшчэ і ключы ад дома не асабіста, а праз нейкага ці то сваяка, ці то нават суседа Тадэвушу Піліпавічу перадала, дык і зусім ніякіх сумневаў наконт узроўню тутэйшых дачных выгодаў у яго не засталося.

Але што ажно так будзе ўсё на гэтым вузкім падворку на ўскрайку аточанага хвоямі пасёлка занядбана,

ён, канешне ж, не чакаў. Мала таго, што куты дома засмечаныя, дык яшчэ ж і наўкола яго рознага друзу — ногі зломіш. Кроку не ступіць без таго, каб не ўзбіцца на стыканую ржавымі цвікамі бэльку ці не спатыкнуцца аб зарослую быльнягом купку жвіру або патрушчанай цэглы.

Будынак пасля рамонту, а выглядае так, быццам і рук ні да чаго рамонтнікі пры ім не прыкладалі. Адзінае, што пра той расхвалены гаспадыняю рамонт нагадвае, — комін. Абгорнуты бляхаю цагляны чатырохкутнік з вычварнымі антэнападобнымі вусікамі-драцінкамі па-над краямі. Надарэчны, як занадта мудрагелістая прычоска на галаве абы-як апранутай маладзіцы. Сам па сабе вока быццам здалёку і лашчыць. А зірнеш уважліва зблізку — і куды яно, тое ўсцешліва-прывабнае, увобміг знікае.

Словам, такое бязладдзе ў сярэдзіне і абапал дома, што лепш было б, можа, яго наогул не бачыць.

Хаця, што праўда, і выгода (і немалая, між іншым) таксама маецца — месцазнаходжанне лецішча. Акурат жа тое, што Тадэвуш Піліпавіч ад самага пачатку з увагі на акалічнасці справы, дзеля якой бавіць тут час у самоце вось ужо чацвёртыя суткі, і падшукваў.

Канешне, нядобра, што давялося дзеля гэтага пакінуць без нагляду кватэру сына Генадзя, у якой узахвоціўся пабыць за вартаўніка, пакуль той адпачывае з жонкаю і сынамі ў Балгарыі. Але ж усюды не паспееш, чымсьці трэба часам і ахвяраваць. Тым больш што тэрмін Генадзевага адпачынку неўзабаве заканчваецца і не сёння дык заўтра вернуцца сын з нявесткаю і двое іх гарэзлівых хлопцаў-мацачкоў дахаты.

Вось-вось, яны вернуцца, а ты і цягніся тады, бацечка Тадзюня, зноў у сваю “хрушчоўку”, ды ўздрыг-

вай там штохвіліны ад грукату суседчыных абцасаў над галавою, ды, заходзячыся злосцю на той несупынны грукат, бегай па кватэры ў марным пошуку ратунку ад яго.

Ды калі ўжо на тое пайшло, нахабства вось гэтага гундосага чмяля, што ўляцеў учора ўвечары ў пакой і даймаў амаль палову ночы сваім зумканнем, а цяпер ціхамірна падрэмвае, рахманы з рахманых, на фіранцы, у параўнанні з тым шалёным грукатам — нявінная забава прыроды, на якую і зважаць не варта. І не даражы тут, пры такім раскладзе, лішняю хвілінаю спакою, і не радуйся, што можаш, хай сабе і без асаблівага шыку, а ўсё ж адпачыць ад да сябе падобных ды справакаванае іх паводзінамі собскае непрыязнасці да ўсяго роду людскога.

Шоргат колаў аўто даносіцца да вушэй Тадэвуша Піліпавіча і тут жа сціхае, праглынуты нечаканым парывам ветру з расчыненага акна. Чмель на фіранцы варушыць крыламі, узлятае, пачынае бязладна мітусіцца ў цесным прагалку паміж сцяной і канапаю.

“Дзякуй богу, хоць мух ды камар’я пакуль што няма”, — думае Тадэвуш Піліпавіч і цягнецца даланёю да фіранкі, каб перагарадзіць чмялю шлях да адступлення. Той жвава, як для жамярыны гэткага камлюкаватага, грувасткага целаскладу, шмыгае пад столь, незадаволена гудзе. Затым, не маючы, мусіць, ахвоты трапляць у зладаваную Тадэвушам пастку, рэзка пікіруе на дол і тут жа куляю вылятае ў акно.

Час падымацца, але якраз падымацца Тадэвушу Піліпавічу зусім і не хочацца. Цяжкая, гнятлівая апатыя скоўвае ягонае прыкметна раздабрэлае апошнім часам (ах, гэты пракляты недахоп руху!) цела, зноў прыгінае да канапы.

Быццам адчуваючы нежаданне чалавека што-кольвечы рабіць ды хочучы пацвеліцца з ягонае лянівае

нямогласці, няўрымслівы чмель вяртаецца ў пакой. Няспешна кружляе колькі хвілін вакол канапы, уладкоўваецца таўсматым жмутам рудавата-шэрых паўсцінак на фіранцы.

“Той самы, відаць, а можа, ужо другі”, — думае Тадэвуш Піліпавіч і намагаецца ўзгадаць, ці паклаў у валізу падчас збораў да ад’езду купленую адмыслова дзеля выправы на лецішча мухабойку.

***

Апатыя апаноўвае Тадэвуша Піліпавіча не першы раз. Праз усё жыццё, колькі ён сябе памятае, апаноўвае. Такі адмалку няроўны, пераменлівы ягоны характар. Надта ж, сапраўды, няроўны. То энергія пругка струменіць з кожнае сітавіны, ліецца цераз край, то абыякавасць дарэшты ім завалодвае. Толькі, здаецца, паспее галава збольшага астыць ад нейкага неспадзеўнага ўзруху, як вось ужо і яна, апатыя-лянота, тут як тут, шчэрыцца наўслед абяцаннем непазбежнага ваярства. У якім, канешне ж, колькі б яно, тое ваярства, ні доўжылася ды якім бы зацятым-заюшлівым ні было, сама ў рэшце рэшт і пераможа.

Апошні наступ апатыі даўся Тадэвушу Піліпавічу ў знакі па дарозе ў Парыж, куды ён выправіўся турыстам два месяцы таму, напрыканцы траўня, з мэтаю хоць крыху адысці ад маркоты ў сувязі са смерцю жонкі Караліны. Збіраўся паехаць раней, ды ўсё адцягваў паездку, ніяк не мог адважыцца на такую нявінную авантуру. І колькі Генадзь ні ўгаворваў бацьку не марудзіць з выправаю, колькі ні абяцаў і грашыма памагчы, і надзейную турфірму праз інтэрнэт падсобіць знайсці — усё было дарэмна.

А тут во ўзяў ды і спакусіўся Піліпавіч справакаванымі нападам тэрарыстаў на рэдакцыю “Charlie Hebdo”

таннымі распродажнымі коштамі, набыў-такі пуцёўку ў культурную сталіцу свету. У выніку не сказаць, каб што прайграў, але дакладна — нічога і не выйграў. Бо ўжо ў дарозе зразумеў, што ў плане эмацыйнага ўспрыняцця тамтэйшых выдатных мясцін будзе турпаездка не з шыкоўных, і загадзя змірыўся з наканаванасцю.

І сапраўды, ні цікавосткі Прагі, дзе іхняя група прабавіла палову сутак перад тым, як накіравацца да французскае мяжы, ні нават знакамітыя парыжскія відарысы градуса Тадэвушавай абыякавасці не збілі. Базіліка Сакрэ-Кёр, Манмартр, плошча Пігаль, Эйфелева вежа, знакамітыя бульвары — усё прамільгнула неяк наўзбоч глуздоў хісткім, невыразным ценем-прывідам.

Дык і атрымалася так, што ці не найбольшым уражаннем засталіся ад тае вандроўкі ў памяці Тадэвуша Піліпавіча бруднаватыя накрыўкі на ложку гатэльчыка ў акрузе са шматабяцальнай прыпіскай у праспекце, што гэта, маўляў, не абы-што вам, спадары турысты, а самая што ні ёсць хоць і "ўскраіна", ды ўсё-такі якніяк — "цэнтра горада". Ды яшчэ нарыў пад пазногцем вялікага пальца левай рукі, зароблены ім у час, калі, падымаючыся аднаго разу з буфета да сябе ў нумар, неасцярожна затрымаў далонь на створцы дзвярэй вузенькага, ледзь дваім змясціцца, гатэльнага ліфта. І, канешне ж, вандроўнікі-суайчыннікі, якія так нагружаліся ў мясцовых крамах розным харчам, што толькі дзівіцца часам заставалася, як давалі рады пасля ўвесь той харч спажыць.

— Малако будзеце купляць? — нібы адмыслова ў працяг тэмы пра ежу перарывае ягоныя лянівыя ўспаміны жаночы голас за акном. — Будзеце? Вызірніце ж, калі ласка, на хвілінку… Гэй, чалавеча! Дзе вы там? Ад-гук-ніцеся!

Тадэвуш Піліпавіч падхопліваецца з канапы, намагаючыся не натыкнуцца рукою на чмяля ды злуючыся на нахабу за тое, што, мабыць, з-за ягонага гудзення не пачуў набліжэння аўто, адшморгвае ўбок фіранку.

— Дык будзеце? Не? Малако таннае, кошт на дванаццаць капеек ніжэйшы за крамнае. І свежае, толькі што ад каровы… Бярыце — не пашкадуеце. Тлустае. Паставіце ў слоіку ў лядоўню, дык за паўсутак на траціну пасудзіны вяршкоў настаіцца.

Жанчына год шасцідзесяці, даволі густоўна, як для вяскоўкі, апранутая, з кароткімі пасамі фарбаваных валасоў на галаве, жвава выскоквае з салона легкавушкі, похапліва мітусіцца ля багажніка з шыхтам напоўненых малаком паўтаралітровікаў з-пад мінералкі. На акно лецішча, адкуль цікуе за ёю з-за скамечанай ільняной фіранкі Тадэвуш Піліпавіч, яна не глядзіць. Але што там, за фіранкаю, нехта ёсць і што той нябачны нехта яе бачыць і чуе, не толькі, відаць, здагадваецца, але і, мяркуючы па ўпэўненасці голасу, не сумняваецца. Адзінае, чаго, мабыць, яна пакуль што не ведае, дык гэта тое, што яе не толькі бачаць, але і даўно ўжо, у першы ж дзень, як толькі яна тут, ля дома, са сваім танным малаком аб'явілася, пазналі. Хаця ні сказаць ёй пра тое, ні нават словам азвацца на яе заклікі вызірнуць ні разу за паўтыдня не рызыкнулі.

— Вяршкоў! — адчуваючы, як нахлынвае ні з таго ні з сяго жаданне конча сказаць што-небудзь насуперак, і не маючы ані сілаў, ані імпэту тое неспадзеўнае жаданне ў сабе загасіць ды адначасова намагаючыся як мага больш рашуча засведчыць перад жанчынаю ўласную абазнанасць у вясковых гаспадарчых справах, выгуквае Тадэвуш Піліпавіч. — А тое, што па зняцці вяршкоў застанецца, пад плот загадаеце выліваць, ці як?

І хоць фраза атрымліваецца не такая ўжо рашучая, прынамсі, не да такой ступені, як яму самому, можа, хацелася б, жанчыну яна абыякавай не пакідае.

— Ну, навошта ж адразу ажно гэтак па-свінску — пад плот? Навошта такое марнатраўства? — абураецца яна і свідруе акно дапытлівым паглядам. — Скажаце яшчэ… Скісне малачына́ — жонцы ад прышчыкаў ратавацца кіслае прыдасца. Вунь як спраўна памагае… Нанач памажа вашая каханачка тварык — і ні на якія крэмы ды спа-салоны не трэба раскашэльвацца. Не абыякая эканомія. А самому з бадуна таксама чым блага кісленькага папіць? Быццам не ведаеце, быццам такі ніколі не пілі… Падумайце… Калі пастаянна будзеце купляць, тады і не адразу, а пасля можна разлічыцца, оптам, — кажа і застывае ля аўто з бутэлькаю ў руцэ ў чаканні адказу.

— Мабыць, буду, — зацікаўлены не так заваблівaю прапановай, як дасціпнаю гаманой суразмоўніцы, адказвае Тадэвуш Піліпавіч. — Пастаўце бутэльку там… дзенебудзь.

Жанчына торкае пасудзіну пад разгалісты куст парэчак, абвешаны шматкамі цэлафану, што начапляўся, мабыць, на голле яшчэ падчас так званага рамонту дома.

— Заўтра ў гэткі ж час зноў прыеду, — кажа і садзіцца ў аўто. Ад'язджае колькі метраў ад лецішча, высоўвае вонкі голаў, весела дадае: — А во, як пажадаеце, яшчэ файную рыбу магу вам падвезці. Жывых карасікаў, толькі што вылаўленых, наўпрост з сажалкі. Пасмажыць іх з цыбуляю ў алеі, вяршкамі добранька паліць — за вушы ад такога смакоцця самі сябе не адцягнеце. Вёска — не горад вам, абы-што не прапануе.

"Ну, канешне, — не прапануе, як жа", — думае Тадэвуш Піліпавіч і куляецца бокам на канапу. Ляжыць

колькі часу нерухома, глядзіць на чмяля, што ціхамірна корпаецца на падваконніку наўзбоч пагбанае бляшанае жырандолі з пукамі ссохлых зёлак замест свечак. Затым нацягвае на галаву прасціну ў надзеі, што, можа, зноў зморыць сон, але дарэмна.

Сон яго не морыць, і чмель, як на злосць, цяпер, калі раптам захацелася скінуць з сябе абрыдлае павуцінне апатыі-адзіноты, голасу не падае. Затое круціцца ў глуздах ды не дае ні на чым, апроч сябе, засяродзіцца ўскалыхнуты словамі гандляркі пра рыбу пяцідзесяцігадовае даўніны ўспамін пра ментузоў з кармы́ Шаршатачкавай лодкі.

Ага, канешне, толькі рыбы яму тут, на гэтым зарослым па вокны крапівою лецішчы не хапала! Добра, ментузоў не прапанавала дабраслівіца, а ўсяго толькі карасікаў… Як ведала, што можна яму прапанаваць, а што не. А можа, і сапраўды ведала, здагадалася па голасе, хто перад ёю? Ці па твары, можа, пазнала, калі неасцярожна высунуўся на момант з акна, адшоргваючы фіранку… Ды наўрад…

Спраўная, аднак, цётачка! А гамоніць як спрытна! Слова што ні мовіць — акурат у сярэдзіну трапляе. Сказаў бы яму хто-небудзь паўстагоддзя таму, што гэткаю языкатай стане ціхмяная, негаманкая суседка Яня Лаўцэвіч — нізавошта б не паверыў. Яшчэ вось каб гэтак вёскі не хваліла, дык і наогул цаны ёй, гэтай кабеціне, да душы, не было б.

Бо вёскі ён, Тадэвуш Дзерваед (папросту — Тадзя), і без таго даўняга выпадку з ментузамі і не любіць, і занадта, у адрозненне ад сяго-таго з равеснікаў-гараджанаў у першым калене, не рамантызуе. Адмалку наеўшыся яе сумнеўных дабротаў, не тое каб з узростам дазвання іх адцураўся — не, хутчэй пастараўся

запхнуць згадкі пра іх як глыбей у спіжарню памяці. Як запіхваюць звычайна туды старыя, быццам бы ўжо і непатрэбныя, што карціць як хутчэй выкінуць, а разам з тым яшчэ і неблагія, з якімі шкада развітацца, рэчы. Што зусім напачатку было зрабіць і не проста. Асабліва ў пару, калі былі яшчэ жывыя Піліп і Ядзюня, Тадзевы бацькі, і кожнае наведванне іх у вёсцы зацягвала ў вір мінулага так, што ад гарадскога ягонага, адносна камфортнага *цяпер* заставаліся рожкі ды ножкі.

Тры гады вучобы ў тэхнікуме, праца, спачатку, падчас вучобы, лабарантам, затым ветэрынарным фельчарам у прыгараднай гаспадарцы, служба ў войску, выкладчыцтва ў тэхнікуме, новае, пераважна гарадское, асяроддзе — усё быццам карова языком злізвала ў хвіліны тых наведванняў, вяртаючы да дзён прамінулых, да часоў, калі, як любяць пісаць і дэкламаваць ахвотныя да рамантычных метафараў паэты, “дрэвы былі вялікія”.

***

У Дзерваедах, куды Тадэвушавы бацькі вярнуліся пасля няўдалае спробы асесці дзе-небудзь у горадзе, і сапраўды дрэвы былі вялікія. Такія высачэзныя шугалі па-над стрэхамі прыземістых хат у неба срэбналістыя надвісленскія таполі, такія кудлатыя, разгалістыя ліпы і дубы ахоўвалі паселішча ад старонняга вока, што два з паловаю дзясяткі сядзібаў, большасць гаспадароў якіх (за выключэннем аднаго Мацура і двух Лаўцэвічаў) мелі прозвішча Дзерваед або Лакотка, і з недалёкай адлегласці ўгледзець было няпроста.

Дваццаць пяць хат, гэтулькі ж хлявоў ды пуняў, шэсць — у складчыну на некалькі сем’яў — лазняў, пяць студняў, пачатковая школка, у якую сцякалася

па веды малеча з навакольных вёсак і хутаркоў і па сканчэнні якой выпраўлялася вучыцца далей у дзесяцігодку ў Чарасах, што за чатыры вярсты ад Дзерваедаў, — вось і ўся вёска, шараговае заходніцкае паваеннае паселішча з будзённымі яго клопатамі ды адвечным калаваротам сезонных працаў.

Тадзева дзяцінства акурат прыпала на гады хрушчоўскай адлігі. Але пра гэта ён даведаўся значна пазней, ужо дарослым чалавекам. Бо ў аточаным векавымі дрэвамі закутку памежжа пад назовам Дзерваеды і панятку тае адлігі не ведалі, і поступ яе калі і адчулі, дык зусім не так, як, можа, адчулі куды больш далучаныя да дабротаў і перавагаў цывілізацыі жыхары якога-небудзь вялікага горада.

Наогул, атрымалася так, што часы быццам бы мяняліся да лепшага, а ўмовы існавання вяскоўцаў, тых жа дзерваедаўцаў, — наадварот, усё больш да горшага. Самавітыя ўладальнікі зусім нядаўна яшчэ аднаасобных падворкаў, каржакаватыя руплівыя дзяды ў самаробных брылях ды пашытых за польскім часам картузах пакрысе сыходзілі ў лепшы свет, пакідаючы скалектывізаваныя прашчураўскія спадкі на волю кепканосных драбнаватых сыноў і ўнукаў, выхаваных у маралі неўласцівай тутэйшым абшарам традыцыі супольнага гаспадарання.

Дык, пэўна, і не дзіва, што менавіта на час адлігі прыйшліся ў Дзерваедах і пік п'янства, і пік самагубстваў. Чацвёра мужчынаў, двое Дзерваедаў і двое Лакоткаў, амаль адначасова, з розніцай у некалькі месяцаў, пазбавілі сябе жыцця. Не даўшы рады працівіцца поклічу зялёнага змія ды не вытрываўшы звяглівых папрокаў уласных жонак, павесіліся хто ў прылеглым да свірнаў і асецяў бярэзніку, хто, як, напрыклад, стры-

ечны Тадзеў дзядзька Ганэрак, і ў роднай хаце, на перакінутай праз ма́ціцу вяроўчыне.

Апошнім засіліўся ў Дзерваедах тры гады таму Лакоткавых Юзік, ці, як усе яго ў наваколлі звалі, — Юзі́ла, бацька Тадзевай аднакласніцы Карольці. Міхалка, Юзілаў бацька, выліў неяк у роспачы ад сынавых запояў свінням у карыта застаўленую пад сівуху брагу, і гэтага дастаткова сталася, каб нябога пазбавіў сябе жыцця. Уранні знайшлі Юзілу ў свірне ў пельцы, дарэшты астылага, з учарнелым, бы галаўня, тварам, з вырачанымі вачыма і высалапленым на падбароддзе языком.

З часу тых самагубстваў, мабыць, Тадзева прыязнасць да вёскі і пачала мізарнець. Не тое каб саступіла дарэшты нейкай там нелюбові — не, да гэтага, дзякаваць богу, усё ж такі не дайшло. Але і звыклае замілаванасці, якою сілкавалі ягоную душу Дзерваеды з іх маляўнічымі пагуркамі, нізінамі і векавымі таполямі раней, да трагічных добраахвотных сыходаў з жыцця аднавяскоўцаў, мясціна больш не выклікала.

Побытавы складнік вясковага існавання, знешне ціхамірна-прыстойнага, а насамрэч поўнага тых жа, што і ў горадзе, жарсцяў, тых жа праяваў хцівасці, зайздрасці, сквапнасці, няўцямна-дурнаватае варажнечы на глебе нішчымства, падгарачанай нейкімі старымі, шматгадовае даўніны, крыўдамі, вывернуўся раптам вонкі жорсткімі швамі споду безвыходнага калгаснага жыцця, закружыў, заматляў, прымусіў паглядзець на сябе ды на свет навокал больш пільна, больш уважліва, унікліва, аб'ектыўна. І не толькі бясстрасна, бесстаронне, як на штосьці хоць і вабнае, ды ўсё ж чужое, паглядзець, але і сякія-такія крокі зрабіць да пераменаў.

У Біцясаве, прымежным мястэчку па той бок ракі, за дзесяць вёрстаў ад Дзерваедаў, адчыніўся тэхнікум

па падрыхтоўцы фельчараў-ветэрынараў. Гэта была першая тут навучальная ўстанова такога кшталту. То і не дзіва, што зусім нядаўна яшчэ бяспашпартным мясцовым жыхарам, з якіх мала хто сам меў за плячыма сямігодку ці хаця б пачатковую школу, але, канешне ж, як і ўсе бацькі на свеце, марыў пра годную адукацыю для дзяцей, уявілася яна дарункам нябёсаў.

Першым з маладых дзерваедаўцаў надумаўся пайсці ў Біцясава вучыцца Тадзя Дзерваед. Але не таму, што так ужо, можа, вабіла яго ветэрынарыя. З якою ён дагэтуль, папраўдзе, за выключэннем выпадкаў, калі даводзілася памагаць (штосьці там патрымаць, падаць або прынесці ці аднесці) лекару-саматугу Клямпасавічу падчас лячэння свінні або цяляці, не сутыкаўся. Хутчэй прычыніліся да таго складнікі практычныя: блізкасць месца вучобы ад бацькоўскае хаты ды тое, што можна было падчас яе падпрацоўваць лабарантам пры тэхнікумаўскай ветстанцыі, зарабіць якуюніякую капейку. Як нярэдка гэта бывае, у значнай ступені паўплываў на рашэнне хлопца і збег абставінаў, прынамсі адно дзіўнаватае здарэнне…

Так яно тады ўсё ў Дзерваедах пачыналася. Ды, на жаль ці на шчасце, моцы канчаткова спраўдзіцца не дабрала. Не лёс быў Тадзю застацца на ўсё жыццё вяскоўцам, глытнуць як след прашчураўскае сялянскае долі. Звабіў хлопца пасля некалькіх год працы фельчарам горад, канчаткова ж дарабіў справу адступніцтва пераход на выкладчыцкую працу.

І сёння шэсць сотак гарода пры па-гарадскому абсталяваным блочным дамку за шэсць вёрстаў ад горада, у які цяпер, пасля таго, як прыбрала там усё пакрысе да рук увішная нявестка Ілона, жонка сярэдняга сына Мірона, і ходу яму няма, — хіба гэта сапраўднае вяс-

ковае? Тое любае і нялюбае адначасова, да якога і прыхінуцца асаблівага жадання не ўзнікае, але якога і адцурацца дазвання, выдзерці з коранем з душы, каб і надта хацеў, наўрад ужо калі-небудзь атрымаецца.

II

Якім бы наравістым ні надаралася часам лета ў ваколіцах Дзерваедаў, няўрод на трускалкі, аднак, наведваўся ў вёску рэдка. Нават не ў самыя спрыяльнае для гэтых ягад надвор'е лехі з трускалкамі на гусценька акупаваным хвашчом ды павітухаю мясцовым суглінку нязменна радавалі вока шчодрым ураджаем. Такая прыдатная была ў Дзерваедах для вырошчвання трускалак глеба, што і на продаж іх людзям хапала, і на варэнне ці на кампот яшчэ з каптуром ад продажу заставалася.

Дзіва, але нават і на занядбаных, парослых пустазеллем здзічэлых нічыйных градах, дзе колькі год запар ніхто ўжо наогул нічога не садзіў і не сеяў, трускалкі таксама па-ранейшаму выспявалі спраўна. Кволымі парасткамі прабіваўся раптам трускалачнік па вясне з няўдобіцы на свет Божы, а праз месяц-другі, глядзіш, ужо наліваліся ягады сакавітаю чырванню. Смех дый годзе: здаецца, дзірван дзірваном мясціна, а ягад на ёй паўнютка, як быццам з неба зоркі ўначы пападалі на разоры ды да радасці дарослых і дзятвы на тыя трускалкі няўзнак перарабіліся.

За ўвесь час, што існуюць Дзерваеды, мабыць, толькі аднойчы надарыліся там з трускалкамі непярэліўкі. І то не па ўсіх гародах, а часткова, у асобна ўзятай, так бы мовіць, гаспадарцы — на сотках Міхалкі Лакоткі па мянушцы Шаршатачка.

Што з трускалкамі ў ягоным гародзе дзеецца нешта не тое, першы заўважыў тады сам гаспадар. Адцвілі, здаецца, акурат у пару, пусцілі дружна завязь, а далей як хто сурочыў расліны — гэтак пачалі яны раптам чахнуць. Флянцы зніцелі, лісце пабілася дзіркамі, зрабілася месцамі, што зверху, што спадыспаду, воглае і слізкае, быццам смаркачамі яго наўмысна нейкі злыдух-варажына абляпіў.

Міхалкава незамужняя дачка Броня торкнулася следам за бацькам у гарод паглядзець, што там да чаго. Разгарнула адзін лісцік, другі, глядзь — а там, унутры лісця, аграмадныя, з палец, слімакі. Такія тлустыя, такія агідна-раздабрэлыя корпаюцца-варушацца ў лісці трускалак істоты, што ледзьве дала кабеціна сабе рады, каб стрымаць ваніты.

Зляцеліся суседкі паглядзець на дзіва. Пачалі навыперадкі меркаваць, як пазбавіць лехі ад неспадзеўнае навалы. І хоць меркавалі больш не ад спачування, а з перасцярогі, каб, крый бог, не перакінулася пошасць на іншыя гароды, зацікаўленасць жанчын справаю перасягала ўсялякія межы. Хтосьці ўзгадаў бабулін расповед пра тое, як у даўніну ратавалі ягаднікі ад слімакоў з дапамогаю попелу.

— Ай, што там той попел, — не пагадзілася на прапанову скарыстацца пракаветным спосабам Броня. — А вось запусціць курэй, дык умомант пажаруць гэтую гідкую нечысць. Або во яшчэ лепш: індыкоў на яе нацкаваць. Ужо гэтыя буркатлівыя зласліўцы дадуць паскудству рады.

Сказана — зроблена.

Індыкоў Лакоткі самі не гадавалі, давялося дзеля такой неадкладнай справы па людзях пазычаць. Тыя,

за выключэннем даўніх лакоткаўскіх непрыяцеляў Дзерваедаў (пра прычыны непрыяцельства расповед наперадзе), адгукнуліся на патрэбу суседзяў ахвотна.

Птушкі, якіх перад тым, як пусціць у гарод, пратрымалі двое сутак у загародцы не кормленымі і не поенымі, аблаташылі лехі з трускалкамі спраўна. Уранні пачалі латашыць, а к заходу сонца таго ж дня, лічы, ужо і скончылі. Ды так панаядаліся крылатыя рупліўцы дармовых слімакоў, так панапхалі імі свае знашчаныя двухдзённаю бяскорміцай воллі, што ледзьве маглі здыхацца.

А ўранні наступнага дня сведкаю іншае бяды стала Броня. Пайшла а сёмай гадзіне да птушніка, каб зноў выпусціць індыкоў на лехі з трускалкамі, і як не самлела ад сполаху. Індыкі бегалі па загародцы, бы звар'яцелыя, і раз'юшана адзін аднаго дзяўбалі. Амаль ва ўсіх грабеньчыкі, наросты-бародаўкі на шыях і не прыкрытыя пер'ем лапікі скуры пры копчыках і на жыватах сачыліся крывёю. А ў аднаго нават вока было выдзеўбанае і на месцы яго зеўрала дзірка велічынёю з добрую фасоліну.

Уражаная ўбачаным Броня паспрабавала птушыную збродню як-небудзь залагодзіць. Сыпанула спачатку шчодра круп, затым пакрышыла хлеба, але ўсё было дарэмна. Індыкі не толькі не суцішыліся, але, наадварот, здаецца, яшчэ болей усхадзіліся. Тады яна пайшла сказаць пра ўсё бацьку.

Згадзіўшыся з дачкою, што ўсё гэта даволі дзіўна, Міхалка, каб апярэдзіць закіды нядобразычліўцаў, ці не самі яны, шкадлівыя Лакоткі, наўмысна неяк раздражнілі птушак, каб давесці да вось гэткага непрытомнага стану, вырашыў паклікаць дзеля высвятлення

прычын дзіўных паводзінаў індыкоў фельчара з біцясаўскай ветстанцыі.

Няўрымслівая ж Броня перад тым, як выканаць ягоны загад наконт фельчара, спачатку паткнулася па параду да Клямпасавіча: маўляў, памажыце, даражэнькі, пакуль заявіцца той вучоны дзядзька з Біцясава, каб горшае што не зрабілася… На што Клямпасавіч, чалавек даволі амбітны і раней ужо неаднойчы выпадкамі звароту суседзяў да лекара з дыпломам дарэшты абражаны, адказаў катэгарычнаю адмоваю.

Фельчар, паважнага веку чалавек з вузлаватымі далонямі, абсівераным тварам і спецыфічным пахам быдла ад вопраткі, не дурань выпіць на дармаўшчыну ды пагаманіць на падпітку пра хваробы свойскае жывёлы, прыехаў ахвотна і хутка. Утаймаваць індыкоў і яму, аднак, не ўдалося. Затое прычына іх агрэсіўных паводзінаў была названая адразу: захворванне на канібалізм, або так званы масавы раздзёўб, справакаваны перакормліваннем птушак пасля перыяду працяглага галадання. Што, напрыклад, здараецца гэтаксама са свіннямі, толькі ў інакшай, так бы мовіць, форме. Бо там церпяць ад канібальства хвасты і вушы супляменнікаў, а нярэдка — і нованароджаныя парасяты, якімі без згрызотаў сумлення пачынаюць ласавацца іхнія ахопленыя бацылаю канібальства маткі.

Іншымі словамі, сказаў фельчар, як след нацешыўшыся разгубленасцю прысутных перад праявамі ягонае вучонасці, пааб'ядаліся індыкі з голаду, вось і сталася вынікам гэткае вычварнае здарэнне.

— А што вы хацелі, людцы, ад жывёлы пры такіх умовах утрымання? — дадаў напрыканцы. — Вось вас саміх пасадзі ў цесненькі катух ды пратрымай хаця б

два дні без ежы і пітва — што атрымаецца? Ці не пачняце адзін аднаго без дай прычыны жэрці?

І хоць гэткае яго выказванне прагучала даволі зняважліва, абвяргаць яго ніхто не асмеліўся. Балазе згаданы раздзёўб відавочна меў месца і, больш за тое, усё яшчэ, нягледзячы на кволыя Броніны захады па яго спыненні, працягваўся. А вось каб дзейсна, аднойчы і назаўсёды яго спыніць, выйсце, на думку лекара, мелася адно: усіх індыкоў панішчыць.

Броня з Міхалкам спрабавалі запярэчыць, што гэта, маўляў, выйсце кепскае, бо птушкі ж не свае, а пазычаныя, таму ці не лепш было б вярнуць іх гаспадарам. Але фельчар быў няўмольны.

— Вернеце, а яны і разнясуць хваробіну па іншых хлявах ды загародках, — сказаў катэгарычна і тыцнуў прутам у індыка, які толькі што пазбавіўся носавага выростка і, мяркуючы па ўсім, вось-вось павінен быў пазбавіцца і страўніка. Вантробы няшчаснага ўжо вытыркаліся з раздзяўбанага чэрава, і было дзіўна, як яны яшчэ дагэтуль з яго не вылузнуліся.

— Ну, добра, — пагадзіўся Міхалка і пашкандыбаў у хату па стрэльбу. Спачатку падумаў, што, можа, прасцей было б скарыстацца сякераю, але не наважыўся: чорт ведае, што за хваробіна гэты канібалізм? Пачнеш секчы індычыя шыі ды яшчэ падхопіш яго сам, як трапіць неўспадзеў кропля крыві на рукі. Здурнееш ды і паляціш вар'ятам па полі…

Праз колькі хвілін Міхалка вярнуўся. І ледзь паспела жаласлівая Броня схавацца ад жахлівае сцэны масавага забойства індыкоў за рогам хлява, як усё ўжо было скончана. Як заўсёды ў такіх выпадках — не без драбка ўласцівага дзерваедаўцам, звыклым адмалку на ўсім ашчаджаць, сумневу: а што, калі

і не такія ўжо насамрэч хворыя былі індыкі і можна было іх не нішчыць?

Ды сумнеў сумневам, але, што праўда, слімакі больш ні назаўтра, ні паслязаўтра ні ў Шаршатачкавым, ні ў чыім бы то ні было яшчэ гародзе не аб'явіліся. Пазнікалі, быццам іх ніколі ў Дзерваедах наогул не было.

А трускалкі — дай веры! — неўзабаве падняліся. Пакрыліся спрэс нанова лісцем і кветам ды і забуялі пладамі. Ды так шчодра, а галоўнае — так хутка і дружна забуялі, што затрымкі ў тэрмінах выспявання ягад у параўнанні з мінулымі гадамі не здарылася.

І яшчэ адно адбылося важнае падчас таго выпадку з трускалкамі ў Дзерваедах: адзін з мясцовых хлопцаў, які вось ужо колькі часу вагаўся ў выбары далейшага жыццёвага шляху, менавіта пад уражаннем ад спрытных дзеянняў фельчара ды ягонае дасведчанасці канчаткова тое зрабіў.

Хлопца звалі Тадзя Дзерваед. Яму было без месяца васямнаццаць (як і амаль усе ягоныя равеснікі, ён, з увагі на тое, што давядзецца пасля сканчэння пачатковай школы пешкі хадзіць у дзесяцігодку штодня за чатыры вярсты, пайшоў у першы клас не ў сямі-, а ў васьмігадовым узросце), і свет калі і не здаваўся яму бясконца прыязным ды гарманічным, дык зусім не з-за нейкіх там слімакоў на лісці трускалак ці шалёных індыкоў. Бо не пра слімакоў і індыкоў думаў ён у той летні надвячорак, перасцярожліва цікуючы здаля, з-за дрывотні, за тым, што дзеецца на Міхалкавым падворку.

На аточаным жа кустамі ядлоўцу ды выгінастымі дубцамі ніцае вярбы Міхалкавым падворку калі чым і пераймаліся, дык гэта гібеллю птаства. Шэсць велі-

зарных, на падоймішча, індыкоў і дзве ўкормленыя, ажно пер'е на іх ільсніцца, індычкі — немалая па беднаватым часе страта. Тым больш што ўсе птушкі, як вядома, па суседзях панапазычаныя і цяпер невядома, чым і як іх падзеж пазычантам (дарма што суседзі, а хто-ніхто нават і сваякі) сплачваць. Восем індычых галоваў — не жартачкі. Такія выдаткі, што хоць да пер'іны-пушыны ўсіх абскубі, грашыма ад продажу на біцясаўскім кірмашы тых пер'я ды пуху стратаў і блізка не пакрыеш.

— Утрамбаваць гэтае наскубанае як след у насыпцы, дык добра, калі хоць на адну падушку яго хопіць, — казала Броня і маркотна абводзіла вачыма корабы са скубаннем. — І добра, калі яшчэ — цьфу-цьфу! — хваробы не падхопіш, гэтак во штоpазу дакранаючыся…

— Пустое, цётачка, — адгукалася на цётчыны словы Карольця ды знарок (рызыкантка дый годзе) па чарзе апускала руку спачатку ў адзін лазовы кораб — з пер'ем, затым у другі — з пухам. — Хіба вы не чулі, што дзядзька той, фельчар, сказаў? Не перадаецца птушыная хвароба людзям, не пе-ра-да-ецца! А што няшмат пер'я — гэта праўда. Ну, такая, значыць, і вы́звалка* з яго будзе. А вось каб прадаць саміх індыкоў, дык і зусім іншы, мабыць, быў бы цымус.

— Прадаць! Гэткіх прадаць? Дохлых? Смеху варта! — жахалася-жагналася Броня. — Ну, прыдумала ты, дзеўка, паўтара людскога…** Прыдумала ўжо дык прыдумала…

— Што ні прыдумала, а ўсё ж лепей, як нічога, — падаваў голас Міхалка. Ён другі тыдзень рамантаваў

---

* Даход ад продажу (дыял.).

** Тут: нялюдскае (дыял.).

лодку, якую ўзяўся засмаліць-залапіць к пачатку трускалкавага сезону, што ўжо быў не за гарамі. Завіхаўся пры лодцы з ранку да вечара: то малатком зацята клацаў, то габляваў штосьці, то шмараваў. То выпроставуся з рыштункам у руцэ над кармою, страсаючы з плячэй стому, то зноў прысядаў, упетрваўся вачыма ў дол. Але адначасна і прыбіраць рук з пульсу іншых справаў клышаногі руплівец не жадаў, сачыў за ўсім з-пад далоні ўважліва, па-гаспадарску. — Жыць захочаш — вунь як пачнеш усялякае-якае прыдумваць, мазгі напружваць.

Дзедава падтрымка Карольці была даспадобы. І, як толькі цётка Броня скончыла абскубваць апошняга індыка ды знікла з корабамі ў прыцемку сяней, дзяўчына наблізілася да яго.

— Вось добра было б, каб лодку ты, дзядуля, як шыбчэй* падмастачыў, — сказала пад постук малатка, якім Міхалка забіваў дубовую за́тычку ў адтуліну таўшчынёю з палец на сутыку дна і бакавіны лодкі. — На не кранутых слімакамі градах, што на ўзгрэве за пуняю, ягады даспяваюць, дык можна абіраць іх ужо і ў Біцясава несці. А то перастаяць, азызнуць — хто захоча гэткія купляць? Разам во і пер'е ды пух можна было б занесці. У торбы, каб зручней было несці, спхаць — і на кірмаш…

— Дык ужо амаль падмастачыў. Не паспее ссутоніцца на дварэ, як, глядзіш, і на вадзе будзе пасудзіна. Заўтра пагойсаю па рыбных мясцінах, апрабую пасля рамонту. А паслязаўтра можна будзе і на той бок з трускалкамі ды рыбаю і пер'ем выпраўляцца, — сказаў стары і пачыкільгаў да павеці па рыдлёўку — капаць яміну для абскубаных дохлых птушак.

---

* Хутчэй (дыял.).

Спяшаўся Міхалка: яшчэ апоўдні замовіў на вечар у суседа Фра́нькі Мацура каня перацягнуць адрамантаваную лодку да берага, а ўжо сонца зусім нізка. Перадумае Франька даць каня — і хоць на сабе тады валачы ўвесь гэты немаленькі цяжар да вады.

***

— Дык пойдзеш ты з намі ці не? — дапытвалася Карольця і ўсё трымалася даланёй за клямку. Быццам і хацела ўжо пайсці з хаты, і ўсё ніяк не наважвалася тое зрабіць. Ды мацала пальцамі папсуты слясак, што разпораз выслізгваў з адтуліны, ды перасмыкала, бы карова пашчэнкамі падчас жавання, шыракаватымі сваімі, абцягнутымі вузенькаю паркалёваю спаднічкай сцёгнамі. — Думай жа!

— Ну, можа, надумаюся, — нерашуча казала Яня, кладучы ў шуфлядку падручнік нямецкае мовы, па якім каторы дзень запар рыхтавалася да іспытаў у інстытут. Падышла да акна, адшморгнула ўбок фіранку, каб паглядзець, што там дзеецца на дварэ.

Хмары па-ранейшаму сноўдалі сюды-туды па небе: то пасоўваліся бліжэй, гусцелі, то, гнаныя ветрам, раптам пачыналі радзець, рассейвацца дзіравым сітам панад прыхопленым перадвечароваю шэранню надрэччам, над вастраверхімі алешынамі, задрамалымі ў абдымку з жгутамі маладога, абсыпанага гронкамі жаўтлявых суквецця́ў хмелю.

— Па радыё абяцаюць заўтра к вечару навальніцу, — працягвала Карольця. — Але што яна нам! Абы толькі ад ракі паспець па сухім дамчаць да Біцясава, а там ужо дамо сабе рады. Тры кошыкі трускалак ды колькі жменяў пер'я і пуху прадаць такім увішным, як мы, маладзіцам, — раз плюнуць. То і няхай сабе тады заходзіцца неба грымоццем…

— Ну, угаварыла. Пайду…

— Вось і добра! — усцешаная Я́нінаю згодаю, сказала Карольця ды дзелавіта падцяла вусны: — Адыходзім а шостай, падаіўшы кароў. Дзед хутка не можа хадзіць, то трэба раней выправіцца. Дык ужо не пазніся. Не праспіш? А хочаш, унаначкі сёння прыйду да цябе? Раптам навальніца ўначы ўзляціць — вось і не так страшна будзе ўдзвюх.

— Дык і прыйдзі, — радая, што гэтак проста ўсё ўладзілася з наначкамі, сказала Яня і зашморгнула фіранку. — А то вось, калі хочаш, цяпер адразу заставайся, што дарэмна ад хаты да хаты цягацца…

— Цяпер нельга. — Цень рашучае нязгоды слізгануў па твары Карольці, стаіўся зморшчынкамі злосці ў куточках вуснаў. — Бронька гэтая, цётка… Як бес яе падсуклечвае ва ўсё нос соваць, усюды лезці. Так і пільнуе, праціўнота, так і шнарыць вачыма, так і высочвае… Гэта ж не папярэдзь яе загадзя, куды пойдзеш, дык такі лямант усчыніць, што і не будзеш потым ведаць, як адкараскацца. Яшчэ ж прыдумае чорт ведае што…

— Во як, аказваецца, няпроста ўсё ў вас, — не зважаючы асабліва на словы сяброўкі, зажартавала Яня. — А збоку дык і не скажаш пра тое. Такая, здаецца, згода між вамі траімі — на зайздрасць.

— Праўда што — здаецца… Яно ж так: у чужым роце і зубоў болей, — сказала Карольця і ступіла ў сенцы.

Страх перад навальніцаю пачаў пераследаваць Яню Лаўцэвіч чатыры гады таму, калі маланкаю забіла ўлетку іх карову. Яня толькі што падаіла тады Чыжуню, а баба Фрасеня вырашыла яе перавязаць на лепшую пашу. І толькі паспела старая выдзерці з зямлі калок ланцуга, каб торкнуць яго ў дзірван у іншым месцы, як жахнула маланка.

Карова грымнулася бокам на дол бы падкошаная. Баба ж Фрасеня неяк злаўчылася за хвіліну перад тым адкінуць калок прэч, дзякуючы чаму, мабыць, і засталася жывая. Але старую так моцна тады скаланула, што яна літаральна здранцвела. І неўзабаве, так ад таго здранцвення як след і не ачуняўшы, памерла.

Ад таго часу Яня, якая ўсё тое страхоцце на ўласныя вочы бачыла, бо акурат павярнулася, каб перасцерагчы бабу Фрасеню, што не след трымаць у навальніцу ў руках жалеззе, і стала баяцца маланкі. І кожны раз, як толькі яна ўсчыналася, нават тады, калі была ў хаце не адна, а з маткаю, міжволі плішчылася ў якінебудзь закуток, ды жагналася, ды пачынала адмаўляць пацеры. Калі ж маці, як сёння, побач не было, або бегла да суседзяў, або клікала каго-небудзь да сябе.

Апошнім часам удзень найчасцей клікала яна суседа Тадзю, аднагодка і аднакласніка Тадзіка Дзерваеда, які ад нядаўняе пары, падобна, пачаў да яе заляцацца. Заляцанак якога яна хоць надта ўсур'ёз не ўспрымала, аднак жа і адпрэчваць не спяшалася: ціхмяны, сарамяжлівы хлопец ёй падабаўся.

Маці таксама супраць маладога суседа нічога не мела. Але і візітаў ягоных, якія рабіліся ўсё больш частымі, асабліва не ўхваляла. Узгадвала, якім ветлівым ды пашанотным быў да шлюбу Янак, Янін бацька, і ў якога звера ператварыўся пад уздзеяннем гарэлкі праз дзясятак год сумеснага жыцця, ды і пачынала перасцерагаць дачку ад залішняе даверлівасці адносна мужчынаў.

Яні, якая і сама дастаткова набылася сведкаю, як п'яны бацька пагражае маці збіццём, патрабуючы сказаць, дзе схаваная гарэлка, гэткія яе павучанні здаваліся занадта ўжо просталінейнымі, і яна старалася вельмі

на іх не зважаць. Ва ўсялякім разе з Тадзем сяброўства не перарывала.

Вось і сёння, напэўна, паклікала б яна ўвечары — не, не ўнаначкі, канешне, барань бог, а так проста пасядзець — Тадзю, ды — непярэліўкі. Хлопец сышоў у Біцясава падаваць дакументы для паступлення ў тэхнікум і калі вернецца — невядома. Як і невядома, ці вернецца да заўтрага маці. Стрыечная Яніна сястра Лінка, якая жыве з бацькамі і нежанатым братам у Чарасах, нарадзіла першынца, і яна, пакінуўшы Яню за гаспадыню, паехала на ровары ў адведкі. Дык іншага выйсця Яні, як скарыстацца прапановаю Карольці, і не засталося.

Хлапечы твар вымыкаецца на святло з прыцемку сянец, гайдаецца расплывістым, няясным адбіткам на шыбіне акна. Тадзя Дзерваед нясмела, быццам не пэўны, ці будуць тут, у гэтай хаце, яму радыя, перакрочвае праз парог, застывае спарудаю пры дзвярах кухні.

— Тадзік! — Яня падхопліваецца з месца, мкнецца насустрач хлопцу. Да дзвярэй, аднак, не даходзіць, збітая з тропу перасцярожлівай думкаю, ці не занадта паводзіць сябе з суседам эмацыйна, ці не занадта вачавідзь радуецца ягонаму прыходу, спыняецца пасярод пакоя. — Падаў дакументы?

— Падаў, а як жа, — напускаючы на сябе рашучасць, адказвае Тадзя. — Праз два тыдні ўжо і першы экзамен здаваць. Карольця, бачыў, ляцела ад цябе, сцёгнамі круціла… Ці не ўнаначкі напрошвалася?

— А што, калі і ўнаначкі? — паціскае плячыма Яня і паварочваецца тварам да акна з намерам перавесці размову на што-небудзь іншае. Варажнечу паміж сем'ямі аднакласнікаў, Дзерваедаў і Лакоткаў, яна

і заўсёды ўспрымала даволі нервова. Цяпер жа, калі вось гэтак ледзь не штодня, ледзь не штохвіліны даводзіцца міжволі выбіраць паміж Карольцяю і Тадзем, яна пазбягае слізкае тэмы асабліва старанна.

Што ёй тая чужая варажнеча-непрыязнасць? Ні адзін, ні другі, што Карольця, што Тадзя, ёй кепскага не зрабілі. Да абаіх яна добра ставіцца, то што лезці ў чужую зваду са сваім медзяком? Захочуць — самі разбяруцца. Абы даў Бог жадання захацець. Мяркуючы ж па ўсім, з'явіцца яно няхутка, калі наогул калінебудзь з'явіцца.

— Ну, глядзі, — неяк няўважліва, быццам штосьці яму муляе, прамаўляе Тадзя і робіць крок да дзвярэй. — Пайду, стаміўся крыху.

— А мне яшчэ карову даіць, — пераадольваючы ніякаватасць ад такое ягонае паспешлівасці ды не жадаючы саступаць бачнасць ініцыятывы аб расстанні ў ягоныя рукі, адказвае наўслед хлопцу Яня і падымаецца, каб ісці ў істопку па даёнку. Думае, ці не занадта гэта здрадліва — не сказаць Тадзю пра заўтрашнюю ходку з Лакоткамі на кірмаш, але тут жа сябе і супакойвае: маўляў, такое бяды, не пытаўся — і не сказала. Не спяшаўся б гэтак сыходзіць — можа, і сказала б, а так…

Адхінае Яня фіранку ў надзеі, што, можа, ён хаця б азірнецца наастатак, ды марна. Тадзя крочыць прэч ад хаты так шпарка, што праз хвіліну ўжо і знікае за рогам абсаджанае вішняком вулкі.

"Няйначай, пакрыўдзіўся, — вяртаецца ў думках да размовы з хлопцам Яня. — Дзіўны нейкі. Захаканы так, быццам дзесяць вёрстаў подбегам ляцеў. Ажно шчокі вунь, бы маладая квашаніна ў цеснай місцы,

торгаюцца… Долата нейкае з кішэні, як у цеслі таго, тырчыць”.

Думае так Яня, ды пазірае раз-пораз на цадзілку, што плешчацца за акном на шыпшынавым кусце ў парывах ветру, ды зноў няўзнак перабягае ў думках на непрыязнасць паміж сем’ямі аднакласнікаў.

Ох, гэтая варажнеча… Колькі сябе памятае Яня, гэтулькі яны, Тадзевы і Карольціны сваякі, і варагуюць. Ужо колькі часу мінула, як пачалося тая нялюдская, ваеннае яшчэ пары, звада, а канца ёй не бачна.

Дваццаць сем год таму Карольцін дзед, кульгавы Міхалка Лакотка, празваны аднавяскоўцамі за вострасць языка і порсткасць нораву Шаршатачкам, пад страхам расстрэлу і расправы над сям’ёю быццам бы паказаў нямецкім карнікам падчас аблавы на партызанаў спрат, дзе хаваўся Тадзеў дзед Пётра са сваім старэйшым сынам Зыгмонам.

Дзерваеды доўга адстрэльваліся, і немцы, каб не марнаваць патронаў на двух зацятых партызанаў, кінулі ў пограб гранату. Што засталося пасля выбуху ад мужчынаў, назаўтра па адыходзе карнікаў бачылі з дзерваедаўцаў нямногія. Але тыя, што бачылі, запомнілі відовішча надоўга. Целы бедакоў так паразносіла асколкамі, што вяскоўцы ледзь здолелі іх збольшага сабраць. Так і пахавалі ў адной труне, не даўшы рады дазнацца, дзе тут чые могуць быць парэшткі.

Ад таго дня варажнеча і пачалася. Міхалка бажыўся, што ў гібелі Дзерваедаў невінаваты. Але яму не паверылі. Затое паверылі нагаворам паліцыянта Уладака Шумака. Як Міхалка ні намагаўся давесці, што Уладакавы словы — усяго толькі помста яму, Міхалку,

за тое, што ён перад вайною выкрыў таго з кражаю збожжа, так давесці свае праўды і не змог.

Уладака неўзабаве застрэлілі партызаны. І хоць іншых сведкаў таго, што Пётру і Зыгмона выдаў менавіта Міхалка, не знайшлося, таўро вінаватага ў іх гібелі за ім ад тых часоў і замацавалася.

У абедзвюх сем'ях старэйшыя даўнаватае тае гісторыі ад малых не хавалі, і міжволі варожасць перакінулася і на іх. Яня памятае, як настаўніца ў школе пасадзіла Тадзю ў першы дзень вучобы за адну парту з Карольцяю, а ён, дазвання абражаны гэткаю перспектываю — сядзець побач з унучкаю Міхалкі, вінаватага ў смерці ягоных дзеда і дзядзькі, — тут жа хуценька перасеў да яе, Яні.

Міхалка надта праўды сваёй болей не даводзіў, і яго з часам перасталі чапаць. Проста абыходзілі, як абыходзяць штосьці ганебнае, не вартае таго, каб на яго зважаць. І ён, прыняўшы відавочную непрыязнасць ды пагарду аднавяскоўцаў за хоць і прыкрую, але ж непазбежную наканаванасць, не знайшоў іншага выйсця, як дэманстратыўна ад усіх аддаліцца. Мабыць, дзеля гэтага і сядзібу сваю шчытненька абсадзіў ад старонняга вока кустамі маладога ядлоўцу і прутамі вярбы, і сцежкі, што да яе вялі, перакапаў раўчукамі, і ў гаспадарчыя клопаты дазвання, з галавою занурыўся.

Спачатку, яшчэ падчас працы начным вартаўніком на калгасным зернятоку, загадаваў Міхалка пры падворку пчол. Але бортніцтва не заладзілася: пчолы то мерзлі ўзімку, то ўлетку раптам падымаліся і ні з таго ні з сяго кудысьці роем увадначас зляталі.

Тады Міхалка ўзяўся за прапрадзедаўскае сямейнае рамяство — пляценне кошыкаў. Нарыхтоўваў па

зарасніку над ракою лазы ды штукаваў на продаж і сабе дзеля гаспадарчых патрэбаў кашолачкі.То белыя-бялюткія, так званыя святочныя, — для ходак на кірмаш з ягадамі ці ў касцёл з яйкамі і іншым правіянтам на Вялікдзень, то зялёныя — да сезону прыбірання гародаў увосень або збору грыбоў.

А па выхадзе на пенсію заняўся Міхалка гандлем. Употай перакупліваў у прымежных латгалаў-аднаасобнікаў, большасць якіх адвеку складалі на тамтэйшых землях такія ж, як сам ён, печкуны* з ліку мясцовых перасяленцаў, адносна танны статак і, крыху патрымаўшы яго на маладой атаве, здаваў у Біцясаве на мясакамбінат. На вызвалку ад розніцы ў коштах пры куплі і здачы тых бурых латвійскіх бычкоў і цялушак, канешне, раскашаваць было немагчыма, але і скардзіцца, што справы зусім ужо дрэнь, таксама не выпадала. Адзінае, што не спрыяла такому саматужнаму, паўлегальнаму гандлю, дык гэта тое, што патрабаваў ён значных фізічных сілаў, а дзе было ўзяць іх кульгаку Міхалку?

Тут і прыдалася маладзёну засвоеная ў дзяцінстве ад бацькі і дзеда яшчэ адна патомная справа — рыбацтва. Міхалка перакупіў за восем мяхоў ячменю ў чалавека з суседняй вёскі няновую лодку ды і пачаў сноўдаць на ёй ад рання да вечара з вершамі, сеткамі і невадамі па рацэ. Налоўленае што сваякам раздаваў, што падсольваў-падсіверваў ці падвэнджваў, а потым вёз у Біцясава прадаваць. За неймаверным прыбыткам не гнаўся, дык адносна танныя Міхалкавы ляшчы, шчупакі, ліні, язі, плоткі ды нават ліліпуцікі курмялі і ракінедаросткі на кірмашы расхопліваліся ўвобміг.

---

* Той, хто шмат, цяжка працуе, вытв. ад “пекацца” (дыял.).

А з часам і кола пастаянных Міхалкавых пакупнікоў у наваколлі склалася. Бывала, ледзь паспее вытыркнуцца ягоная галава з-за прысадаў, як ужо галас на кірмашы між радамі ваўсю шугае: “Шаршатачка! Шаршатачка з рыбаю!” З рыбаю, а часта і са шкуркаю андатры, якой тады даволі шмат усюды распладзілася, стрэлам-другім па якой Міхалка таксама падчас гойсання па рацэ не грэбаваў.

Дык так яно і ўсталявалася няўзнак, што людзі праз усё лета на пожнях з косамі ды граблямі да сёмага поту завіхаюцца, Міхалку ж іхнія нарыхтоўча-пошарныя* клопаты — не да галавы. Бо з капейчынай у кішэні ніякі недахоп корму для каровы і авечкі яму не страшны, заўсёды ён зможа таго ж сена ці добрай саломы па восені ў каго-небудзь з суседзяў прыкупіць.

Гэта ўлетку. Узімку ж Міхалка звычайна займаўся нарыхтоўкаю дроў і ўсё тым жа паляваннем. Толькі не на андатраў, як улетку, ужо паляваў, а на лісіц ці шашкоў. Шпурне ўвечары наводдаль ад лазні кавалак якога-небудзь шмакуддзя, якой-небудзь смярдзючай дохліны, засядзе сам у будынку пры акенцы і чакае, пакуль рудая хітраванка ці той жа сквапны на дармовае шашок не спакусіцца пачастункам. Здаралася, што і два лісіныя хвасты за ноч упалёўваў. За лета ж і наогул штук дзесяць–пятнаццаць шкурак у Міхалкі да радасці якой-небудзь тутэйшай модніцы (жонка яго Маня, якая пафарсіць любіла, але ж зусім маладою неўзабаве пасля вайны памерла) набіралася.

Бліжэй к вясне, як толькі крыху вышэла на небе сонца ды пачынаў яснець далягляд, браўся Міхалка за догляд лодкі: ад рання да ночы бясконца падраман-

---

* Пошар – травяныя нарыхтоўкі (галоўным чынам – сена) к зіме для жывёлы (дыял.).

тоўваў, падгаблёўваў, шараваў, лапіў, смаліў. Даглядаў, як даглядаюць у добрай сям'і любае, доўгачаканае дзіця. Дык і не дзіва, што праслужыла пасудзіна чалавеку вунь колькі год.

Вось на гэтай самай лапленай-пералапленай, але ўсё яшчэ спраўнай лодцы заўтра і паплывуць Шаршатачка, Карольця з цёткаю Броняй і Яня на кірмаш. Броня і Карольця — пры каша́х з ягадамі ды торбах з пер'ем, Міхалка, як заўсёды, з рыбаю, а Яня — так сабе, збоку прыпёку, за кампанію.

Апошні і адзіны раз Яня была ў Біцясаве на кірмашы год дзесяць таму. Бацька вазіў тады неяк увосень на продаж парасят і ўзяў яе з сабою.

Людзей так шмат было ў той дзень на кірмашы, такая гамэрня панавала на пыльным і шырокім, памерамі з добрую пожню гандлёвым пляцы, што нічога асабліва Яня і не запомніла. Апроч купкі паваенных калек, бязрукіх ды бязногіх, што туліліся ўздоўж радоў у чаканні міласціны, якую ўсе тут тады яшчэ называлі на польскі лад (ад прыходу другіх саветаў мінула не так шмат часу) — ялмужнаю.

Давалі няшчасным няшмат, і даванне тое суправаджалася такім страшэнным гвалтам, такім усплёскам жвавасці сярод калек, такою зацятаю звадаю абдзеленых лёсам людзей за хоць які, хоць і не самы лепшы кавалак, што і праз гады вусцішна ўсё тое ўзгадваць.

***

Ноч, на дзіва, прайшла даволі спакойна. Увечары вецер, праўда, пагойсаў па падстрэшшы ды па завуголлі, паскавытаў, папалохаў густым, пранізлівым енкам. Але бліжэй к поўначы аціх і да рання болей не ўзнімаўся.

І ўсё адно дзяўчаты недаспалі. Бо спачатку доўга размаўлялі. Затым Карольці ўзбрыло раптам у голаў пераняцца ўласнаю знешнасцю. І яна з паўгадзіны, можа, калі не болей, круцілася перад люстэркам, усё вышуквала ў паставе ды твары то нейкія вельмі прывабныя рысы, то, наадварот, жахлівыя недахопы. Першага, вядома ж, аказвалася нашмат больш, як другога. Ды і тое другое Карольця, дзеўка даволі самаўпэўненая, без асаблівых пакутаў сумлення пераводзіла ў катэгорыю першага.

— А што там тыя шырокія сцёгны? — казала і акідвала сябе паглядам у люстэрку то з аднаго, то з другога боку. — Такой бяды! Мужчынам, кажуць, якраз шырокія больш падабаюцца. Хіба не? Валяр'яна Сцяпанавіча, напрыклад, узяць… Я ж бачу, на што больш за ўсё чалавек у жанчынах зважае. Дарма што прылюдна пра мараль балбоча… А ты заўважыла гэта? Не?

— Гэта ўсе заўважылі, — не баючыся пакрыўдзіць сяброўку, бо тая сама распачала размову, азвалася Яня. — Ён цябе на ўроках да дошкі знарок кожнага разу выклікаў, каб потым, як вяртаешся зноў да парты, на іх… на сцёгны твае паглядзець. А то і аблізнуцца наўслед…

— Вось жа кот марцовы! А яшчэ настаўнік… Тое вы заціхалі-наструньваліся ўсе, як ён мяне выклікаў. А я ўсё даўмецца ніяк не магла, што за халера: то галас невыносны ў класе стаіць, а то раптам такая ціша напятая ні з таго ні з сяго запаноўвае? Ну ж, старэча…

— Хм, старэча! Яму ж толькі трыццаць. А можа, і менш нават… І нежанаты яшчэ, сама ведаеш.

— Ведаю, анягож… Яшчэ б не ведаць. Ты як? Бачыла, Тадзюта Дзерваедчык ляцеў ад цябе надвячоркам… Так борзда мчаўся, быццам вятрак яму хто ў дупу ўставіў. Далёка ў вас зайшло?

— Не далей, мабыць, як у цябе з Валяр'янам Сцяпанавічам.

— Ой, вельмі трэба мне… А цябе зачапі! Ужо як цётка Броня, гляджу, робішся. Тая апошнім часам кожную гаману на мужчын пераводзіць. І ўсё з пацвельваннем нейкім, з дурнымі намёкамі… Цалаваліся?

— Хто? З кім?

— Быццам не разумееш! Вы з Тадзютам.

— Ага, як жа… Прыбег захаканы, як сто грабежнікаў за ім з доўбнямі гналіся. З долатам нейкім у кішэні, і твар ажно льсніцца ад поту… Хвіліну пабыў — і проздзверы, дзіва, як аб парог не спатыкнуўся. А ты кажаш — цалаваліся… Ці да пацалункаў тут?

— Во як — ажно з долатам, смех дый годзе. Ну, ці мала што… Глядзі, не варонь… Пойдзе ў тэхнікум — дзеўкі там, варванкі* местачковыя, хутка абкруцяць хлопца. І вокам не паспееш плюснуць, як ужо не твой будзе. Падбяруць увобміг. Але што гэта я пра адно і тое… — Карольця чарговы раз упетрылася паглядам ва ўласны адбітак у люстэрку. — Новую сукенку пашыць, ці што? А то гэтая надта ж нешта паўніць мяне. Мабыць, сселася пасля мыцця… Бы кадка я ў ёй, праўда?

— Не выдумляй, добра ты выглядаеш.

Ад размовы пра Карольціну знешнасць перайшлі да іншых тэмаў ды і не заўважылі за гаманою, як ноч мінула.

На дварэ было не тое каб сцюдзёна — неяк надта ж няўтульна, золка, бы ў дачасна выстылай, кепска напаленай напярэдадні лазні.

---

* Ад *варванец* – гарэзлівы, свавольны (звычайна пра дзіця, дыял.).

Карольця паманулася збочыць да сваёй хаты, каб, можа, цяплей апрануцца ды ўсторкнуць на ногі якія гумовікі, але ў апошні момант перадумала: дзед Міхалка-Шаршатачка і сам ніколі звычайна нікуды не спазняўся, і іншым такую звычку — спазняцца — калі і дараваў, дык вельмі неахвотна. Тым больш што быў ён ужо на прыстані, уходжваўся, бачна было, з прымацаваным да аскабалка старадрэвіны ланцугом для прывязвання лодкі. Дзяўчаты здалёк убачылі ягоную прыгорбленую, увянчаную рудым саламяным капелюшом паставу і дадалі хады.

На прыстані смярдзела рыбаю ўперамешку з падсушаным багавіннем і аернікам, якімі Міхалка адмыслова ўсцілаў кожны раз дно скрыні, каб надаць тавару, як сам казаў, паболей "каларыту натуральнасці". На карме аднавокая Броня, саракадвухгадовая кабеціна ў спадніцы з моднай апошнім часам "чортавай скуры" і хадаках на босую нагу, абжаргаўшы каленямі кошык, даперабірала трускалкі. Звечара, відаць, не паспела, дык, каб не адштурхнуць непрывабнасцю ягад распешчанага, пераборлівага біцясаўскага пакупніка, цяпер старалася зліквідаваць учарашнія недаробкі.

— Ну, дзеўкі, павысыпаліся вы хоць? — спытала, пазяхнуўшы ды зіркаючы спадылба то на пляменніцу, то на Яню.

— Выспішся тут, калі то адно нялюдскае, то другое праз усю ноч сніцца, — махнула рукою Карольця.

— Што ж так? Зноў сны? І што ўжо сёння табе саснілася?

— Ды гіда розная, цётачка Броня, усё рыба нейкая… Спачатку быццам лінёк. Невялічкі такі, пухнаценькі-вачасценькі. Вымкнуўся з ціны, паплаваў па-над

глеем, суцішыўся. Затым круць-верць — на вялізнага шчупака перарабіўся ды да мяне з глыбіні, гляджу, прастуе… Падплыў і давай аб лытку бокам церціся. Ды моцна так церануўся, ажно засвярбела мне… І што да чаго?

— Ого, засвярбела ёй, гляньце! Дзіва што… Лінёк, шчупачок… Гэта, мая ты дзевачка, на сынка табе сон. На сынка-байстручка, няйначай. Карася, ліня, акуня прысніць — гэта ўсё на байструка. А шчупака — акурат на сына-байструка. Складзі ў адно ды і глядзі, што атрымаецца. Не такая ўжо вялікая навука, здаецца.

— Але ж скажаце, цётачка! — усплёснула рукамі Карольця і, відаць, не жадаючы больш чуць гэткіх глупстваў, скіравала пагляд на ката Міхася, Шаршатачкавага цёзку і заўсёднага хаўрусніка падчас рыбалкі, які раз-пораз высоўваў пысу з-пад лодкі, цікаваў за кашом з ментузамі наўзбоч борта.

Міхалка апсікнуў у бок ката, падхапіў аберуч кош, выкуліў рыбу ў скрыню кармы. Выцер твар рукавом, абапіраючыся на здаровую нагу, пачаў павольна спіхваць лодку з водмелі глыбей у ваду.

— А давядзецца-такі вярнуцца ўсё ж дахаты — па торбы з пер'ем і пухам, — усхапілася раптам, успомніўшы, што забылася пра галоўнае, Карольця.

— Не тузайся, — зласнавата асадзіў яе Міхалка. — Вунь твае торбы-тарбэнцыі пад кустом. Дзед дбайны, пра ўсё загадзя парупіцца, не тое што іншыя некаторыя… Нясі сюды.

Карольця вінавата ўсміхнулася, падхапіла торбы, кінула ў лодку.

Раптам вецер сціх. Зайшоўся наастатак роспачлівым енкам і, дарэшты аслабелы, счэз у праніцаным шэранню лабірынце з камлёў прыбярэжных альшын.

Броня ўзняла голаў, зірнула на неба краем адзінага, аблямаванага рэдкімі светлаватымі вейкамі вока.

— Кепска будзе, — сказала і похапліва пераажагналася.

Яня і Карольця дружна засмяяліся, узгадаўшы адначасова назву праграмнага школьнага верша.

— Не каркай, бы тая варона, — ці то смехам іхнім, ці то словамі дачкі ўзлаваны, узбрыкнуў Міхалка і ў сваю чаргу задраў голаў угору. — Хмары тае з шалупініну, а яна — кепска будзе. Будзеш абы-што вярзці — жахне малання, і сапраўды кепска стане, другога вока пазбавішся.

— Другога і д'ябал мне, татка, не зачыніць, не тое што твая малання, — агрызнулася Броня. Правае вока яна страціла яшчэ ў маленстве, натыкнуўшыся ў хмызе на патарчаку. Да бацькавых жа недарэчных пацвельванняў наконт сваёй аднавокасці даўно прывыкла і, дарма што непачцівасцю ў стаўленні да старога асабліва не грашыла, нагоды даць яму здачы падчас гэткае во слоўнае перапалкі не прамінала.

Міхалка пакруціў пальцам ля скроні ды і, адарыўшы жанчыну грэблівым паглядам, узяўся за вёслы. Па тым, як і другі, і трэці раз зірнуў ён спадылба на неба, уважлівая Яня, аднак, зразумела, што Броніна перасцярога дарэмнаю не была, што Міхалка і сам з-за надвор'я непакоіўся, адно што, у адрозненне ад дачкі, выгляду пра тое не падаваў.

Міхась вымкнуўся з кустоўя, кінуўся да лодкі, быццам просячы гаспадара не пакідаць яго на беразе, жаласна замяўкаў. Але скакаць у лодку не стаў. Наструніў спіну, пачаў церціся бокам аб калок-аскабалак. Затым узняў угору хвост, порстка, быццам падчас палявання на птушак-разявакаў, шмыгануў у хмыз.

І раптам вецер вярнуўся. Нечакана, як і сціх, нахапіўся, завіхурыўся чортам, закружляў, замітусіўся панад вадою. Хмара крыху рассунулася, але не рассеялася дарэшты, як звычайна яно падчас моцнага ветру бывае, а толькі дзе-нідзе месцамі парадзела, пабілася лапікамі святлейшага. А праз хвіліну зрабілася яшчэ больш шчыльнай, густой, марудліва-непаваротлівай. Завісла коўдраю над галовамі і тут жа, не даючы долу і ўсяму жывому на ім апамятацца, сыпанула спорным, як з палівачкі, дажджом.

Тым часам лодка ўжо на добры дзясятак метраў аддалілася ад берага. Міхалка спраўна махаў вёсламі, не зважаючы на вохканні жанчын, стырнаваў і стырнаваў наперад. Такія перапады надвор'я, як вось гэты сённяшні, былі яму не ўпершыню, і ён пачуваўся ў рачной дзікай стыхіі калі не дазвання, дык даволі ўпэўнена.

Упэўненасць ягоная міжволі перадалася і жанчынам, таму нават тое, што лодку хоць і не нашмат, але ж усё-такі пачало зносіць цячэннем убок ад прыстані на супрацьлеглым беразе, іх да часу надта не палохала.

Пярэпалах усчаўся тады, калі адчулі пад нагамі ваду. Пачалі похапліва вычэрпваць яе бляшанкамі, бо спачатку падумалі, што нацякло, мабыць, з дажджу.

Але хутка зразумелі: справа не ў дажджы, а ў самой лодцы, у дзірцы памерам з палец на сутыку дна і бакавіны. Яе намацала Карольця, тыцнуўшы даланёй у месца, дзе найбольш энергічна пульсавала, вірылася вада. Збялелая, яна ўсё намагалася то заторкнуць дзірку кавалкам анучы, то хаця б прыкрыць уласнаю пятою і раз-пораз роспачліва наракала, што не ўмее плаваць.

Лодку моцна гайдала хвалямі, дык пакуль Міхалка шнарыў рукою ў скрыні з праалееным пакуллем ды ладаваў з таго пакулля затычку, вады набралася ў чоўне пад самы борцік.

Міхалка прыўзняўся на сядзенні, каб заткнуць дзірку, але не ўтрымаўся нагамі на слізкім дне, няўклюдна шмякнуўся азадкам на ранейшае месца. Лодка гайданулася, пахілілася набок, пачала павольна тануць. Жанчыны закрычалі, забыўшыся на кошыкі з ягадамі ды торбу з пер'ем, паўчэпліваліся рукамі ў барты судна.

— Выскоквайце і трымайцеся лодкі! — перакрыкваючы голасам вецер, скамандаваў Міхалка і кінуў вёслы ў ваду.

Але каманда ягоная была ўжо недарэчы, бо і без яе праз хвіліну ўсе чацвёра былі ў вадзе. Яня чула наастатку, як енчыла побач з ёю, намагаючыся ўтрымацца пры лодцы, цётка Броня. Бачыла, як, роспачліва пакружляўшы вакол Броні ды не знайшоўшы вольнага месца, каб учапіцца рукамі ў край борта поруч з ёю, Карольця раптам імкліва наблізілася да жанчыны, квэцнула штомоцы па пальцах, якімі тая трымалася за яго. Як Броні не стала, а праз хвіліну ўзнік пры тым месцы, дзе толькі што яна была, мокры, аблеплены зблытанымі валасамі Карольцін твар. Як затым пачалі ўсплываць з кашоў ды, б'ючыся ў хвалях, заліваць усё навокал чырванню трускалкі, ды залюлялася, загайдалася на хвалях індычае пер'е.

І толькі паспела Яня гэта ўсё ўбачыць ды пашкадаваць у думках пра тое, што вось жа дарэмна праганялі яны з Карольцяю з лехаў суседскіх дзяцей, не даючы малым паласавацца дармовымі ягадамі, якія цяпер і змарнуюцца, як страшэнны віхор пранёсся па-над вадою і ўсё знікла.

На згібе ракі лодку прыбіла да берага. Там яна зачапілася за голле і карэнне кустоўя, там яе неўзабаве і падцягнулі мужчыны баграмі да берага. Гэты момант Яня памятала так смутна, што пазней нават акалічнасцей свайго цудоўнага выратавання і збольшага не магла ўзгадаць. Апроч таго, што, калі яе зраненыя рукі адарвалі ад борта лодкі, яны так крывавілі, што ледзьве дала рады пасля іх загаіць. Так моцна ўчапілася Яня ў хвіліну сполаху ў борт, што быццам прырасла да яго.

Як ні дзіўна, уратавалася і Карольця, хоць і не ўмела плаваць. Доўга не ўтрымаўшыся пры лодцы і пасля таго, як саслізнула з борта, вызваляючы ёй месца, аслабелая Броніна рука, ухапілася за парожні кошык з-пад ягад ды, трымаючы яго перад сабою і б'ючы штомоцы нагамі па вадзе, плыла па цячэнні, пакуль не прыспела лодка з падмогаю. Памагла ёй, напэўна, і тонкая балоневая куртачка, што надзьмулася пухіром за спінаю. Яе людзі своечасова і ўбачылі з берага, а то невядома, чым бы ўсё для дзяўчыны скончылася.

Міхалка і Броня патанулі. Старога знайшлі на водмелі наўзбоч выспачкі метраў за сто ад месца пераправы. Там жа, паблізу, выцягнулі з вады і Броню. Цела жанчыны гайдалася пасярод запарушанага багавіннем і пер'ем віру, і незакрытае яе вока абыякава глядзела ў неба. І пасля, колькі ні клалі ёй на павекі суседкі (зазвычай небаязлівая Карольця нават наблізіцца да труны чамусьці ні разу не наважылася) медзякі, так яно, тое неслухмянае, упартае вока, і не закрылася. Так і ляжала Броня, быццам выконваючы дадзенае надоечы бацьку абяцанне, на покуці з незакрытым.

Да гібелі старэйшых Лакоткаў дзерваедаўцы паставіліся спачувальна. Нават да гібелі Міхалкі, якога

гэтак зацята недалюблівалі і іначай як Шаршатачкам за вочы, а часам і ў вочы, не звалі.

Лодку выцягнулі на бераг, агледзелі. Сапраўды, на краі дна, на сутыку яго з бортам, свяцілася дзірка з пасамі прыліплага пакулля, якім Міхалка марна спадзяваўся яе падчас віхуры заткнуць.

Падзівіліся ўсе: такі, здаецца, дбайны гаспадар быў Міхалка, а бач ты — недагледзеў відавочнае хібы. Нядаўна ж зусім аглядаў-падрамантоўваў лодку. Гэтак акуратна кожны шоўчык засмаліў, гэтак старанна ўсё падладаваў-падправіў — на заглядзенне. А адтуліны таўшчынёю ў палец у такім бачным месцы і не заўважыў. Як магло такое здарыцца?

Формаю адтуліна нагадвала форму сучка, дык дасведчаныя мужыкі спачатку выказалі здагадку, ці не выпаў, ці не вылузнулася, маўляў, ён, той сучок, з дна ўжо пасля рамонту. Але неўзабаве такое прыпушчанне самі ж і забракавалі: тры дні запар перад выправаю ў Біцясава гойсаў Міхалка па рацэ, лавіў рыбу. То хіба за кароткі час перапынкаў паміж тымі гойсаннямі мог сучок ажно гэтак усохнуць, каб так вось лёгенька ўзяць ды вылушчыцца з гнязда? Ды, хутчэй за ўсё, і не сучок то быў, а затычка. Можа, акурат яна, тая затычка, выслізнула ды і стала прычынаю бяды. Перакулілася, як толькі лодка асела, праз борт і знікла сярод хваляў, нікім не заўважаная. Што і не дзіўна пры гэткім разгуле стыхіі, калі вецер так шалёна шкуматаў усё наўкола, што лісце на галінках прыбярэжнага хмызу чыста паабдзіраў.

Так, не знайшоўшы вартага адказу, пытанне пакрысе і счэзла, заслоненае пахавальнымі ды рознымі іншымі, якіх гэтак шмат адвеку на вёсцы, турботамі.

Ментузоў са скрыні ў карме Міхалкавай лодкі хтосьці з суседзяў прапанаваў пусціць на закусь падчас хаў-

тураў па тапельцах, але Карольця не дазволіла. Самаруч выграбла са скрыні ўсё да апошняе рыбіны, панесла ў хлеў свінням. Шаснаццаць ментузоў кінула ў карыта, сямнаццатага, самага вялікага і тлустага, акуратна загарнула ў лісце дзядоўніку, зноў прынесла ў хату. Паманулася ісці ў істопку, каб пачысціць, але тут жа штосьці і перадумала. Абгарнула рыбіну шчытна паверх дзядоўніку кавалкам мешкавіны, каб надта не распаўсюджваўся ад яе смурод, занесла ў пограб. Вярнуўшыся, пайшла ў запечак, забілася ў самы цёмны, куды нават удзень ніколі не сягала святло, кут і праляжала там нерухома, упетрыўшыся вачыма ў столь, да самае раніцы.

***

Два дні мінулі ад хаўтураў па Міхалку і Броні, а Тадзя ўсё не выходзіў з хаты. Сядзеў пры акне, глядзеў, як мітусіцца наўзбоч сажалкі чародка маладых, па вясне выседжаных курыцаю індычат ды гультаяваты стары індык-забіяка, што дзякуючы варажнечы паміж сем'ямі Дзерваедаў і Лакоткаў пазбегнуў лёсу пазычаных Лакоткам іншымі суседзямі, купаецца ў пыле пасярод сцежкі.

Маці некалькі разоў спрабавала Тадзю разварушыць, заахвоціць да якой-небудзь справы, ды, бачачы, што ўсё марна, што чапаць сына, бадай, пакуль што не мае сэнсу, махнула рукой, пакінула ў спакоі.

На трэці дзень надвячоркам, якраз тады, калі Тадзя быў у хаце адзін, на сцежцы насупраць панадворка Дзерваедаў спынілася раварыстка. Ровар належаў Яні Лаўцэвіч, але прыехала на ім не сама Яня, а яе сяброўка Карольця.

Дзяўчына аб'ехала няспешна наўкола індыка, што ні на пядзю не зрушыўся з месца перад пагрозаю быць

стаптаным, дастала з сумкі штосьці накшталт вялікага канверта, змайстраванага ці то з грубай паперы, ці то з кавалка нейкай тканіны, памахала ім у акно Тадзю.

“Напэўна, паперы з Біцясава, з тэхнікума прыслалі”, — заінтрыгаваны нязвыклым выглядам канверта, падумаў ён і падаўся на двор. Падаўся порстка, як толькі мог — папраўдзе, не гэтак карцела яму даведацца пра змест той паперчыны, як, можа, перакінуцца з Карольцяю словам. Собскаю персонай дзеўка заявілася — нездарма ж гэта, штосьці ж змусіла яе пайсці на такі крок, зрабіць насуперак таму, чаму вучылі ўсе гэтыя гады заюшлівыя старэйшыя.

Ды дарэмна ён спяшаўся. Бо пакуль прамінаў Тадзя пакой ды прамарудзіў пару хвілін у кухні ў перагароджаным вілкамі вузкім праходзе паміж прыпекам і сталом, Карольця сама ўжо была ля дзвярэй, варушыла знадворку клямкаю.

Ён штурхнуў ад сябе дзверы, лёгка адчыніў іх. І толькі паспеў узняць вочы ды раскрыць рот, каб павітацца з дзяўчынаю, як штосьці воглае, слізкае і смуродлівае з праціўным глухаватым гукам шархнула яму па галаве, не даючы апамятацца, замільгала раз-пораз прад вачыма. Другі, трэці ўдар… яшчэ… яшчэ… яшчэ…

Тадзя паманўўся ўнурыць голаў у плечы, каб калі не ўхіліцца зусім ад наступных удараў, дык хаця б крыху змякчыць іх, як яны і скончыліся. Скончыліся раптоўна, імгненна, як сканчаецца часам улетку кароткі сляпы дождж. Але невыпадкова скончыліся: вярталася да хаты сцежкаю наўзбоч сажалкі Ядзюня, Тадзева маці.

Карольця кінула ментуза, якім толькі што хвастала хлопца па галаве, на груду жвіру ля ганка, выцерла аб кавалак мешкавіны, у які ён быў загорнуты, спэцканыя рыбінай рукі, хуценька пабегла да арэшыны з прыслоненым да камля Яніным роварам.

***

Праз месяц пасля трагедыі на рацэ Яня збіралася на працу ў Біцясава. Інстытут замежных моваў адчыніць перад ёю дзвярэй не пажадаў, бо падчас уступных экзаменаў дзяўчына недабрала балаў. Была гэтак растузаная смерцю Міхалкі і Броні Лакоткаў, гэтак цяжка адыходзіла ад нядаўняга рачнога жаху, што здавала іспыты як скрозь сон. Асабліва даймаў яе прыпамін з апошніх хвілін у лодцы, тыя дзіўныя, незразумелыя паводзіны Карольці, пра якія яна і хацела цяпер сяброўку распытаць, і асцерагалася.

Лёгка сказаць — распытаць! Такое дзікае падазрэнне — не жартачкі. Пра такое не толькі спытаць — употай падумаць і то не абы-якой рызыкі-смеласці трэба набрацца.

Але ж і ад думак, вядома, не ўцячэш. Вось і круцілася ў галаве, і не давала Яні спакою жахлівая здагадка. Дык і не дзіва, што і балаў на экзаменах, здагадкаю тою ў думках занятая, недабрала, і надта, папраўдзе, з-за правалу пасля і не перажывала. Маўляў, як ёсць, так і ёсць, рук не падкладзеш.

Вярнуўшыся дахаты, Яня параілася з сім-тым з настаўнікаў і вырашыла дзеля здабыцця стажу пайсці ў выхавацелькі дзе-небудзь пры школьным інтэрнаце. Акурат вызвалілася палова стаўкі ў дзесяцігодцы ў Біцясаве. Ніхто з настаўнікаў школы заняць тае куртатае, капеечнае вакансійкі не захацеў, і дырэктарка з дазволу раённае ўправы адукацыі прапанавала яе Яні, дарма што была дзяўчына без належнае адукацыі.

Раптам зазбіралася ў Біцясава і Карольця. Яна пару ўступных іспытаў з-за сямейнае трагедыі прапусціла наогул, нават дакументаў нікуды не падавала. Ды, падобна, і без трагедыі падаваць не збіралася. Хаця нахлебніцтвам ні дзед Міхалка, ні Броня, якая пасля смерці

братавай (Ганна шэсць год таму трапіла ўвосень на полі пад колы камбайна) была дзяўчыне за матку, ніколі сірату не папікалі, сваё месца ў хаце яна ведала добра. І ўсё рабіла так, каб залежаць ад сваякоў як найменш.

І вось табе навіна: быццам бы збіраецца Карольця ў Біцясава, будзе рабіць сартавальшчыцай у цэху гароднінакансервавага завода. Заводзік той невялічкі, кепска аснашчаны, ледзьве ліпіць. Людзі на ім доўга не затрымліваюцца, дык і бяруць туды кожнага, хто ні пажадае, — гэткі часовы прыстанак для шукальнікаў месца пад сонцам і розных выпівох. Канешне ж, часовым, спадзяецца Карольця, будзе ён і для яе. Цётка Лёдзя, матчына сястра, працуе масавічкай у клубе веттэхнікума, напрыканцы года выходзіць на пенсію — вось і тое самае месца пад сонцам для Карольці. Галоўнае — як-небудзь зачапіцца, а там ужо неяк будзе.

Тым часам Яня, дабіраючы ў валізу то адно забытае, то другое, не-не ды і пазірала ў акно, чакала хоць якога знаку ад Тадзі. Нервавалася: за ўвесь час пасля здарэння на рацэ толькі двойчы яны з хлопцам і бачыліся. Ды і то похапкам, нават як след не пагаварылі. Бо як падмянілі ўвадначас Тадзю, такі зрабіўся адстаронены, занурыста-недасяжны. Ходзіць маўчком, слова лішняга ні да каго не прамовіць.

Акурат такі цяпер заўсёды Тадзя, як быў у той злашчасны вечар напярэдадні выправы на кірмаш, калі забег да яе, вярнуўшыся з Біцясава: твар панылы, шэры, вочы ўніклівыя, як быццам штосьці ўкраў, а што — прызнацца не асмеліцца. І наогул увесь нейкі не такі, як раней. З чаго такая перамена? Зразумела, з чаго — з яе, Янінага падману. Непрамоўленага, не сказанага, а ўсё-такі, як ні круці ды ні паварочвай, — падману.

Канешне, з падману, з чаго яшчэ? Было б іначай — даўно загаварыў бы. Адно добра: разам будуць у Біця-

саве, дык, можа, там, наводшыбе ад людскіх паглядаў, раскатурхаецца аднакласнік Тадзя, загаворыць нарэшце.

Хтосьці ўвайшоў у сенцы, шкрабнуў рукою па клямцы. Карольця ўкулілася ў хату, села на зэдаль пры акне.

— Ой, стамілася, — сказала і скупенька, як праз сілу, усміхнулася. — Надвор'е нішто, дык вырашыла мэтлахі перасушыць-ператрэсці. Рыззя гэтага ў хаце па кутках назбіралася за гады́ — не дапавыносіцца. Адных толькі зношаных, дзіравых дзедавых ботаў і чаравікаў, бадай, каля дзясятка пар пад плот выцягнула. Цётчыных палітонаў, шашалем паточаных, сумак нейкіх, партманетаў, ісподак розных, панчох тое ня тое бярэма*... А ў шуфлядзе шафы, на самым нізе пад бялізнаю, уяві сабе, на пачак грошай натыкнулася. Руку торк пад стос наўлечак, а там яны, грошы! Амаль дзве тысячы рублёў дзясяткамі... Паклаў, мусіць, каторы са старых ды і забыўся... Ох, гэтыя старыя... Матка твая, казалі мне, бядуе, што трэба конча вам карову на маладзейшую памяняць, а не выпадае з-за грошай... Дык калі што якое — не саромейцеся, кажыце. Я багатая цяпер, магу і пазычыць. А магу і так, без аддачы даць. Лёгка прыплыла капейчына — лёгка няхай і сплыве.

Пачынаўся апошні тыдзень жніўня. Дні стаялі цёплыя, лагодныя. Лета раптам ні з таго ні з сяго расшчодрылася, быццам адмыслова вырашыла кампенсаваць дзерваедаўцам бясконцую паласу непагадзі. Праўда, з раніцы неба ўсё яшчэ па-ранейшаму хмылілася, але к поўдню зноў весялела; хмары сплывалі, далягляд выясняўся, паветра налівалася сонцам, поўнілася водарам ранніх яблыкаў, сена, збажыны.

---

* Тут: вельмі шмат (дыял.).

І рака была спакойная, толькі дзе-нідзе на самым быстраку наўзбоч выспачкі злёгку моршчылася паскамі хваляў. І ўсё адно думаць, што вось зараз давядзецца пераплываць яе на хай сабе і надзейна, як сцвярджае Карольця, адрамантаванай Шаршатачкавай лодцы, было непрыемна. Хіба не тое самае мог бы ён сам сказаць пра лодку ў дзень сваёй гібелі? І што наогул значыць — надзейна адрамантаваная? У адным месцы — надзейна, у другім, глядзіш — не зусім, а то і зусім ненадзейна…

Яня так доўга не адважвалася сесці ў лодку, што Карольця ажно зазлавала:

— Ды садзіся ўжо, не круціся вужакаю! Будзеш цяпер усё жыццё пераправаў баяцца? Маланкабояззі табе мала? Мужыкі такім шворанам дзірку заканапацілі, што ніякімі абцугамі яго цяпер, каб і хацеў, не выдзераш. На ўласныя вочы бачыла, як рабілі.

Яня перасцярожліва апусціла вочы долу, упетрылася паглядам у дно лодкі. Сапраўды, яно было роўнае, быццам вычасанае з цэльнага кавалка дрэва.

— Я ж кажу: ніякім долатам не выб'еш затычкі! Вось што значыць майстры, — паўтарыла казанае хвіліну таму Карольця і порстка шмарганула ступаком па месцы, дзе ледзь-ледзь вымалёўвалася на фоне дрэва заканапачаная смалою затычка.

Аднак яе бадзёры напамін пра долата прагучаў так, быццам яна знарок хацела хоць ускосна нагадаць пра Тадзю, і гэта Яні зусім не спадабалася. Да такой ступені падалося ёй гэта ў тую хвіліну лішнім і недарэчным, што яна нават распачынаць размову пра сплату пазычкі на набыццё маладой каровы, якую днямі прывялі ўдзвюх з маці з аднаго хутара пад Чарасамі, не стала.

III

Тадэвуш Піліпавіч прахопліваецца ад дрэмы, акідвае памяшканне ўважлівым паглядам. “Пакой як пакой, — думае і пераскоквае вачыма з аднаго прадмета на другі. — Шпалеры зусім новыя, мухамі нават нідзе не заседжаныя. На столі вунь каб пляміна табе, на сцяне — каб ра́жына… І што ад першага дня ў голаў узбрыло, быццам так ужо ўсё тут, у гэтым доме, кепска? Нервы, няйначай…” Узгадвае Піліпавіч учарашнюю тэлефонную размову з малодшым сынам, Аляксеем, яшчэ больш весялее. І нездарма: што-што, а ўзняць суразмоўцу настрой дасціпны, зычлівы хлопец умее. Аптыміст, якіх мала: рызыкант, весяльчак-весялун, гаварун. Не ў бацьку ўдаўся, дарма што з выгляду — выліты ён, Тадэвуш Піліпавіч, у маладосці. Нос праменькі, вочы-гузікі, пастава, жэсты — усё ягонае, Тадэвушава. Адзінае, што знешне нагадвае ў Алёшку Лакоткаў, — маўленне. Такое падчас хвіліны ўзруху таропкае, такое, здараецца, паспешліва-няўцямнае, што і рады іншым разам ледзьве дасі датумкаць, што чалавеку ў гэты момант абыходзіць.

А вось жа, аднак, нягледзячы на такую відавочную хібу маўлення, да публічнае прафесіі хлапчына пахіліўся: святар. Ды не проста які-небудзь там вікарый*, не — сам за пробашча**, немаленькаю парафіяй*** кіруе. Казаннямі ягонымі падчас службы, кажуць, заслухваюцца парафіяне. Асабліва парафіянкі, колькасць якіх з прыходам у парафію айца Аляксея Дзерваеда, лічы, амаль падвоілася. Адно і глядзі, каб не збіла каторая

---

* Намеснік пробашча (настаяцеля).

** Кіраўнік парафіі (настаяцель).

*** Прыход.

з тропу ды не завабіла ў цянёты граху. Што пры гэткім дэфіцыце ў храме вернікаў-мужчынаў было б, напэўна, і не дзіўна.

Ды, дзякаваць богу, спраўны маладзён Алёшка, як-небудзь дасць рады не ўквэцацца ў гідкае. Балазе і справаў у пробашча — вышэй галавы. Службы, хрост, пахаванні, шлюбы, адведзіны старых-нямоглых — усё на ім. Зноў жа, штоквартал ездзіць у замежжа грошы на рамонт касцёла ды пабудову новай плябаніі* збіраць. Днямі з Амерыкі вярнуўся, распавядаў пра тамтэйшае жыццё.

Такі вось незвычайны адзін з іх, Тадзіка з Карольцяю, сыноў атрымаўся. Такі здатны да справы, такі адукаваны ды разумны хлопец. Для любога бацькі мець такога сына — і гонар, і ўсцеха. Для яго ж, Тадэвуша, — яшчэ і надзея. Бо, магчыма, усё-такі аднойчы настане дзень, калі, наважыцца ён урэшце сказаць святару падчас споведзі тое, што гэтулькі год носіць у сабе, але пра што прызнацца пакуль што ніяк не дабярэ смеласці. І зробіць гэта на вуха не старонняму, хай сабе і ў арнаце**, чалавеку, а менавіта роднаму сыну.

Калі такое здарыцца — Бог ведае. Споведзь, гэты які-ніякі, але ж момант агалення душы, — рэч і заўсёды для яго, Тадэвуша, няпростая, нервовая. З улікам жа таго, *што* мае ён намер сказаць падчас яе ксяндзу Аляксею, — нервовая ўдвая. Але і загадзя адракацца ад яе адбыцця з якіх бы то ні было прычын — таксама не выйсце. Таму і рабіць гэтага — адракацца — ён, далібог, не збіраецца. Бо дакладна ведае: час — не толькі лекар, але і штукар; такі сюрпрыз здатны часам паднесці, што толькі ахнеш.

---

* Парафіяльны дом.

** Верхняе літургічнае адзенне ў ксяндза.

Гэта — Аляксей, на якога, каб зразумець ад першае хвіліны, чый ён сын, паглядзець дастаткова. А вось ужо абодва Аляксеевы браты — адыстар Лакоткі. Асабліва Мірон. Стоадсоткавы Шаршатачка, адно што — цьфуцьфу! — не кульгавы. Як і Міхалка, гэткі ж схільны да розных пераўвасабленняў, нездарма ж, відаць, па сканчэнні школы пайшоў вучыцца на актора. Амаль дваццаць год ужо, як служыць у тэатры.

Яно б і няхай, канешне, але ж… Быццам і артыст, кажуць, неблагі з іхняга Мірона атрымаўся, а матэрыяльна ўсё перабіваецца з кулька ў рагожку. Усё чакае нейкае неверагоднае, зорнае ролі. Такой, што і азалаціць яго, можа, і вядомасці нясветнае надасць. А калі яна, тая роля, надарыцца і ці надарыцца наогул — хто ведае. І, між іншым, выпіць дзяцюк не дурань — тут ужо ці не ад дзеда Юзілы звычка перадалася. Добра, ажаніцца паспеў у пару, дык хоць жонка ў каршэнь штурхае, не дае дарэшты апусціцца. І ўнучкаю бацькоў ашчаслівіў. А то ўсё хлопцы ўнукі ў іх з Карольцяю былі. У кастрычніку дваццаць два Аніце, унучцы, спаўняецца, неблагая дзяўчына, не тое што матка яе, прайдзісветка Ілона.

А самы, бадай, удалы з тройцы братоў, самы спраўны ў сэнсе ўмення найлепшым чынам уладкавацца ў жыцці — бізнесовец Генадзь. Той самы, якога ён, Тадзя, немаўлём за роднага сына прыняў. Гэты не толькі свайго нідзе і ніколі не праміне, але, хоць зрэдку, хоць рады ў гады, і братам падсобіць капейчынай. Як у ваду глядзела Карольця, калі прадказвала за два гады да смерці такі расклад з сынамі ды намаўляла Тадэвушу Піліпавічу менавіта на Генадзя найбольш спадзявацца ды Мірона не пакідаць без помачы.

Але што ён можа памагчы? Калі б і хацеў — надта з пенсіі не разгонішся. Хіба што ўзяць ды да ранней-

шага занятку, да фельчарства, вярнуцца, прыткнуцца дзе-небудзь хаця б на паўстаўкі рабіць. Пенсію самому тады можна было б пражываць, заробленае на працы аддаваць дзецям — так многія робяць.

Ды зноў жа, што з яго сёння, з таго фельчарства, з паўстаўкі тае, будзе наедку? Гэта даўней, бывала, купаліся фельчары ў раскошы, бы якія-небудзь шахі. Парася вылегчыць, цяля вылечыць, карове памагчы ацяліцца — нарасхват былі даўней фельчары на вёсцы. Дык і карысталіся каровіна-свінячыя эскулапы з тае запатрабаванасці як толькі маглі. Левыя грошы самі ў рукі плылі, вунь які быў прыварак да афіцыйнага заробку. І харчам расплачваліся людзі за паслугу, і пітвом, і капейчынай. Свінні, бывала, як пачнуць напрадвесні па хлявах парасіцца, ці каровы цяліцца, ці авечкі каціцца — толькі паспявай ездзіць глядзець. Пасля гледзінаў, як звычайна, — пачостка. Вылечыў ты жывёліну, не вылечыў, даў хваробіне рады, не даў, а ўсё адно без яе з хаты гаспадары не выпусцяць. Дня без застолля не мінала. Праз іх, тыя застоллі-пачосткі, і кінуў ён фельчарства. Сам бы, можа, не кінуў, ды Карольця, бачачы, што співацца мужык пачынае, пераканала кінуць. І добра, што пераканала, бо ўсё адно праз пару год, як ужо перайшоў рабіць выкладчыкам у тэхнікум, усе тыя назбіраныя падчас фельчарства тысячы ляснулі. Як вокам міргнуць на нікчэмныя паперкі перарабіліся.

Без малога трыццаць тысяч савецкіх рублёў ляснула ў Тадэвуша і Карольці-Караліны Дзерваедаў на пачатку дзевяностых. Усё да капейчыны, што гадамі збіралі-ашчаджалі, што ягонае фельчарства ды супольная абачлівая беражлівасць прынеслі, увадначас спрахла. І хоць не толькі ў іх, вядома, спрахла, нікому ў тым,

нават сваякам найраднейшым, нават суседзям найбліжэйшым, прызнавацца не сталі.

Бо прызнаешся — і пачнуцца роспыты: што, ды як, ды адкуль, маўляў, гэткія вось не маленькія зберажэнні? Маўляў, на кепскія заробкі ўсё жыццё вы, панове, наракалі, а адкуль жа тады грошыкі? Бусел у дзюбе вам іх прынёс разам з сынамі, ці што? А самае паскуднае, што дзеля выгляду быццам бы і паспачувае каторы з зычліўцаў, а ў той жа час употай і парадуецца: тутэйшы чалавек, дарма што ўласнаю спагадлівасцю любіць пахваліцца, — зайздроснік яшчэ той.

Дык і перажывалі Дзерваеды страту грошай цішком, кожны сам па сабе, як перажываюць часам у маладосці няўдалае каханне ці неспадзеўную здраду. Бедная ж Карольця так перанялася стратаю, што і захварэла нават. Спачатку нервы ў жанчыны схібілі, зрабіліся напятыя, бы тая струна гітарная, — слова насуперак не скажы. Затым, на нервовай, мабыць, глебе, — на страўнік занемагла. Больш за год праляжала ў дыспансеры, пакуль акрыяла.

І вось праз колькі часу вярнулася зноў да нябогі тая самая хвароба. Не гэтак неспадзявана, як калісьці, заявілася, але затое з намерам болей не адпусціць куды больш грунтоўным. Так неўзабаве, не даўшы рады вызваліцца з путаў немачы, з тае справакаванае шмат год таму нервамі хваробы і згасла Карольця. Сышла, пакінуўшы тузін сямейных клопатаў на Тадзю-ўдаўца.

Ён жа, што праўда, жончыну смерць перажываў куды цяжэй, чым нават калісьці смерць бацькоў. Не таму, што, можа, спалохаўся цяжару адказнасці за сыноў. Не, іншае, куды больш таемнае і глыбокае, больш асабістае да таго прычынілася. Сышоў чалавек, які быў адзіным, хто гэтак шмат пра яго, Тадзю, ведаў. І ведаў, і разам з тым

заставаўся запарукаю спраўджання надзеі на дараванне — калі не Божае, дык хаця б людское. А як Карольці не стала, і яна, гэтая апошняя надзея, сіратлівым прывідам заблукала ў закутках свядомасці.

Жыць з такім успамінам — канешне ж, няпроста. Бо хоць і не смыліць ён штодня, і не даймае штохвіліны, і не пераследуе кожнае ночы, але ж і таемных спратаў мінулага дарэшты, такая-разгэткая сволач, не пакідае. Гадамі можа не трывожыць, а варта неўспадзеў нейкай дробязі вылузнуцца ў памяці — і тае ж хвіліны нагадае пра сябе. І чым далей у жыццёвы гушчар, тым больш сувора, больш жорстка, нягоднік, нагадае. І плішчыцца тады жывасілам у душу, пячэ прадаўнім тым, страхавітым успамінам пра злашчаснае Шаршатачкава долата ў кішэні. Пячы пячэ, а паўстаць ва ўсёй сваёй мярзотнасці перад светам дзеля нават хаця б хвіліннага адхлання чалавеку не жадае.

***

Выспа ўтварылася наводдаль ад пераправы год сем таму. Неўпрыкмет насунула льдзінамі на водмель падчас крыгаходу глею і жвіру ўперамешку з пяском ды розным ламаччам, і з таго часу, ледзь павузее, памялее на пачатку лета рака, уздымаецца нанесенае па-над вадою, пакрываецца па халуях дзе асакою, дзе аерам, а дзе ўжо і ладнымі выросткамі вербалоззя.*

Спачатку, да тае пары, як пачалі завітваць на выспачку людзі, гняздзіліся тут кнігаўкі. Але апошнім часам, мабыць, навучаныя горкім досведам суседства

---

* Затопленае месца на згібе ракі, куды ўвесну падчас крыгаходу наплывае розны друз.

з людзьмі, ладзіць на выспе гнёзды гаманкія птушкі перасталі. Пакрычаць-палямантуюць па вясне над лапікам зяленіва ды і ляцяць на сталае жыхарства кудынебудзь у іншае, больш спакойнае, непрыступнае месца.

У гарачае, як цяперашняе, лета выспачка для дзерваедаўцаў — старт-пляц для пешае, уброд, пераправы праз раку. Чым чакаць невядома колькі часу кульгаку Міхалку-Шаршатачку з лодкай, куды прасцей распрануцца ды, закінуўшы за спіну кіёк з вопраткай, перабрысці ад берага да выспы, а затым, адпачыўшы пару хвілін на сугрэве, на цёплым пяску, — рушыць далей, да другога берага. І хутка, і выдаткаў (скнарысты Шаршатачка, вядома, не тое што чужога — сваяка без платы не павязе) ніякіх. А калі яшчэ Міхалка, як сёння вось з Тадзем, занатурыцца, зробіць выгляд, быццам цябе не заўважыў, ды яшчэ пры гэтым і абразіць паманецца, тады без сумневу дарога табе на другі бераг уброд, праз выспу.

Тадзя ведаў найкарацейшы шлях да супрацьлеглага берага як свае пяць пальцаў, бо пераходзіў гэткім чынам раку неаднойчы. Таму, нягледзячы, што было ў гэты дзень на дварэ халаднавата і стомленасць пасля хуткае хады ад Біцясава добра-такі ва ўсім целе адчувалася, палез у ваду ахвотна.

У вадзе было значна цяплей, як на беразе. Дык і прайшла Тадзева пераправа амаль незаўважна. Менш за чвэрць гадзіны ад берага да выспы, кароткі адпачынак, яшчэ з дзясятак хвілін уброд ад выспы — і вось ён, апошні быстрак, ад якога да дзерваедаўскага берага метраў дзесяць. Праўда, на быстраку шмат вострага камення і месцамі сам ён крута абрываецца ды пераходзіць у даволі глыбокія донныя віркі. Але для

чалавека, які дасканала ведае маршрут пераправы, гэткая перашкода — драбяза.

Бераг расхінуўся насустрач Тадзю купкамі лазняку, абдаў парывам ветру, сцебануў па вачах россыпам пяску.

Міхалкава лодка пагойдвалася на хвалях наўзбоч выросткаў аерніку, нагадвала вялікую, застылую ў пене рыбіну. Тадзя наблізіўся да яе, кульнуўся бокам на сплямлены смалою дол. І, як знарок, адразу ж акурат патрапіў тварам на месца на сутыку дна і борта, дзе расплывалася абрысамі прад вачыма шчыльна забітая ў дошку затычка.

Жаданне папомсціцца з Шаршатачкам за крыўду, папалохаць яго як след працяла Тадзевы глузды.

Ён падхапіўся з месца, выскачыў з лодкі, хуценька падцягнуў яе на сухое. Сунуў руку ў чэрава кармы, дзе стары складваў звычайна налоўленую рыбу і дзе цяпер, пасля рамонту лодкі, знайшло да часу прыстанак рознае цяслярскае прычындалле. Пальцы ягоныя хвіліну прамарудзілі ў нерашучасці, затым павольна, быццам усё яшчэ не пэўныя, ці варта тое рабіць, ці не, ліхаманкава намацалі малаток і долата.

Уся справа заняла некалькі хвілін. Можа, дзесяць, можа, пяць. А можа, і ўсяго толькі тры: час мінаў незаўважна. Незаўважна і неяк надта ж адстаронена. Так, быццам і не з ім, Тадзем, усё адбывалася, а з кімсьці яшчэ, каго ён і не ведаў нават толкам, і бачыў упершыню.

Затычка вылузнулася з паза дошкі лёгка, як намасленая. Куды ён дзеў яе пасля таго, як яна вылушчылася з дрэва, Тадзя не памятаў. Затое добра памятаў, як хіснуўся наводдаль лодкі па сухую траву, як похапліва,

быццам хто за ім гнаўся, нарваў ды зладаваў з яе пучок. Як запхнуў той шорсткі, ажно кроў пырснула на згібе з пальца, пучок на месца затычкі — на ўсялякі выпадак, каб дзірка не выявілася перад гаспадаром лодкі дачасна, ледзь адплыве лодка ад берага.

І яшчэ памятаў Тадзя, як шпурнуў малаток у хмыз. А вось як долата апынулася ў кішэні ягоных штаноў, хоць забі, не мог пасля ўзгадаць. Не заўважыў, як, мабыць, сунуў яго ў кішэню ды і паляцеў з ім да Яні. Затым, дома ўжо, ад Лаўцэвічаў дахаты прыйшоўшы, другія, чысцейшыя ды сушэйшыя апрануў нагавіцы, а на долата ў кішэні старых і забыўся. Так грунтоўна забыўся, што ні праз тыдзень яго не спахапіўся, ні праз два. Аж да таго дня, як прыехала да хаты з ментузом у пакунку з мешкавіны Карольця на ровары, не спахапіўся. А спахапіўся, торкнуў руку ў кішэню — і як варам скуру апякло.

Жаданне як хутчэй пазбавіцца ад жалязякі літаральна розум яму адняло. Ужо засланку печы адсунуў Тадзя, каб кінуць яе ў агонь, але, на шчасце, у пару спыніўся, падумаўшы, што вось раптам матка пачне выграбаць попел ды і ўбачыць, і здагадаецца, што да чаго. Прыхаваў да часу долата сярод рыззя ў запечку, а позна ўвечары, як добра сцямнела, панёс да ракі, шпурнуў у ваду далей ад берага.

Так, дзякуй богу, і знікла з вачэй тое долата, як і не было яго ніколі. Адно, што засталося на памяць яго, — адчуванне пякоткі на скуры. Ды яшчэ — уражанне, быццам у кашулі ён, Тадзік Дзерваед, нарадзіўся. Цеснай, дарма што навырост, з разлікам на не адзін год наперад, пашытай, а ўсё-такі якой-ніякой, а апраткі.

***

— Малако! Ма-ла-ко! — голас гучыць так пранізліва, што ад паўсонных трызненняў Тадэвуша Піліпавіча імгненна не застаецца следу. — Бярыце пасудзіну, што ўчора вам пакінула, і ідзіце сюды. Чуеце?

Тадэвуш Піліпавіч падхопліваецца з канапы. Узгадвае, што так і не ўзяў пакінутую жанчынаю ўвечары пад кустом бутэльку з малаком, ідзе на двор, каб, можа, хаця б цяпер гэта зрабіць. Але дарэмна: гандлярка ўжо стаіць ля куста, хітае дакорліва галавою, і цень заклапочанасці блукае па яе гусценька напудраным ілбе.

— Вось і паспадзявайся на вас, мужчынаў, — кажа незадаволена, дастаючы з-пад голля ўчорашні паўтаралітровік. — Згадзіліся браць, а не ўзялі… Што, рукі не дайшлі? Ох, мужыкі, мужыкі… Як жанчыны побач няма, дык ні туды ні сюды. Цяпер во, пэўна, скажаце, што і плаціць ужо адмаўляецеся…

— Ды не адмаўляюся… Заплачу.

— Ну, і на тым дзякуй. А то сядзеў тут адзін такі да вас… Усяго, бывала, увечары назамаўляе з бадуна, назаўтра ўранні замоўленае прывязеш — а ён у хамут ужо… Занатурыцца гаўнюк і не возьме нічога. І вязі тады зноў тавар дахаты. Яшчэ і аббрэша… Быццам і клопату мне пільнейшага няма, як яго ўлагоджваць. Ці лёгка з гэткімі боўдзіламі, га?

— Я не з такіх.

— А хто вас ведае, з такіх вы ці не… — Жанчына паціскае плячыма, зганяе цень з ілба, шырока, на ўвесь рот усміхаецца. — Што наконт рыбы скажаце?

— Не, рыбу браць не буду. Наогул яе не спажываю. Ні карасёў, ні іншай якой. Ну, хіба што ментуза, можа, узяў бы…

— Во захацелі — ментуза! Дзе ж яго ўзяць? Ментуза тут, таварыш дарагі, даўно ўжо нямашака. Быў, ды

сплыў… Экалогія, дзядзечка, дрэнь, вось і знік мянтуз, загадаў доўга жыць. Можна сказаць, на Шаршатачку скончыўся…

— Ого — на Шаршатачку! — заспеты знянацку згадкаю знаёмае — куды ўжо знаёмей — мянушкі, выгукнуў ён. І, не ведаючы, як паводзіць сябе далей, няўпэўнена дадаў: — Ды пажартаваў я наконт ментузоў…

— Вядома ж — пажартавалі…Жартаўнік вы… ты наш, Тадзя Піліпавіч. Тадзя? Ці, можа, як-небудзь інакшай цяпер завешся? Не памяняў імя?

— Навошта? — кажа ён і змаўкае. Што Яня ў рэшце рэшт, раней ці пазней, абавязкова пазна́е яго, ён надоечы не сумняваўся. Але што ўсё адбудзецца гэтак на дзіва будзённа, проста — зусім не чакаў.

— Як навошта? Каб гучала адпаведна… сітуацыі. Тодар, Федзя — ці мала як можна было б… Многія ж памянялі. Вось і я — Ніна цяпер. Паводле пашпарта Яніна. А так, штодзень — Ніна Іванаўна.

— Не, я не мяняў, — кажа ён і ўзгадвае, як падчас службы ў войску некаторыя хлопцы, сапраўды, спрабавалі зваць яго Федзем. — Тадэвуш — нармальнае імя. Людзі не з такімі нязвыклымі для вуха жывуць і не пераймаюцца…

— Гэта праўда, — пагаджаецца Яня. — А я цябе адразу, вось як толькі ўбачыла, пазнала. Можа, і не пазнала б гэтак хутка, калі б акурат заўчора на твой здымак у “Аднакласніках” не натыкнулася.

— Здымак? Гэта Алёшка, малодшы сын, напэўна, выклаў…

— Можа. Такі ў святарскім строі мужчына.

— Ага, ён. Ксёндз.

— Добра… Свой святар, сямейны — ого! І яму, пэўна, добра… Ксяндзы вандруюць шмат, я чула…

— Гэта праўда. Але што з тых вандраванняў? — рады зачэпцы пагаманіць да часу пра што старонняе, хапаецца за тэму Тадэвуш Піліпавіч. — Два гады пасля семінарыі на Філіпінах адбыў, дык ледзь не спражыўся там, кажа, у тым задушлівым іхнім, вільготным азіяцкім клімаце. Мала таго, што горача, дык яшчэ і ў вечным страху, штодня ў чаканні якога-небудзь тэракта. Што добрага?

— Ну дык не адны ж, пэўна, Філіпіны гэныя на свеце… Ёсць жа і іншыя, спакайнейшыя краіны.

— А ў іншых што? З шапкаю па крузе жабраком хадзіць — ці вялікая радасць? Тую ж Амерыку ўзяць… Іншы дабрадзей, кажа, ахвяруе вось такому, як Алёшка, чужынцу-зборшчыку пяць даляраў, а паводзіць сябе потым так, быццам азалаціў, быццам з галавы да ног абсыпаў грашыма. Там добра, дзе нас няма.

— Гэта праўда. Ведаю, бо сама па замежжы крыху пакалясіла. Чула, Карольця твая памерла. Спачуваю.

— Дзякуй.

— Не мучылася хоць напрыканцы?

— Не, дзякуй богу…

— І то добра, як па сённяшнім часе. Людзі вунь гадамі-дзесяцігоддзямі, здараецца, пакутуюць… На бутэльку, і паеду я, відаць… Як наконт ягад? Клубніцы даспяваюць. Яшчэ дзень-два, і, мабыць, дойдуць…

— Ого, дык ты яшчэ і клубніцамі гандлюеш!

— Гандлюю. А што, лепш рукі склаўшы сядзець, халяўнага чакаць? Паглядзела б я, як ты круціўся б пры такіх крэўных.

— Пра каго гэта ты?

— Пра сынка-недарэку, пра каго яшчэ… Мальцу чацвёрты дзясятак, а розуму — бы ў таго дзіцяці. Быццам спыніўся семнастовікам у развіцці — і ні кроку

далей. Рабіць не хоча, яшчэ, прабач, і блядзей у хату на дармовае навалачэ. Надоечы танных курыных кумпячкоў накупляла, дык агледзецца не паспела, як ужо і пажэрлі. Я з хаты па справах — яны ў хату, і паспрабуй дапільнавацца. Але што гэта я разгаварылася? О-ёй, першая гадзіна, трэба далей ехаць. Дык не будзеш рыбу? Шкада, шкада… То, можа, сапраўды, клубніцаў да малака? У нас сёлета дзялянка — на паўгарода. Такія вялікія параслі ды салодкія клубніцы — пальчыкі абліжаш.

— У каго гэта "ў нас"?

— У нас з Валянцінаю, нябожчыка мужыка майго сястрою. А ты, мабыць,падумаў, быццам я ўсімі гэтымі гароднінныемі ды жывёлагадоўчымі справамі займаюся? Не, я ў горадзе жыву. А тут усяго толькі служка — сезонны пасярэднік паміж гаспадыняю тавару і пакупніком. Нават рыбы не лаўлю сама, Валянціна і блізка да става мяне не падпускае, собскаю персонаю кожны дзень стаіць з вудаю. А наогул, не за так, канешне, я служу, сёе-тое маю ў кішэню… Не ахці што, але ж які-ніякі прыварак да пенсіі.

— Ну, клубніцы, бадай, можна набыць. Калі ўжо гэткія яны вабныя ў вас, то чаму ж не ўзяць, — пагаджаецца Тадэвуш Піліпавіч. Хоча спытаць напрыканцы, ці не памятае яна старога мясцовага назову ягад — трускалкі, ды, пакуль збіраецца з думкамі, жанчына ад'язджае.

Пра тое, што Яня Лаўцэвіч гандлюе вясковымі прысмакамі ў гэтым дачным пасёлку, ён даведаўся ад дачкі дзерваедаўскага суседа, нябожчыка Франькі Мацура. Паехаў неяк увосень, напярэдадні Задушнага дня, у вёску прыбраць магілы сваіх і Карольціных сваякоў і там,

на кладах, Ванду і сустрэў. Якая, да ягонае радасці, сама гаворку, што акурат яму абыходзіла, і распачала. Яна адзіная з усіх іхніх равеснікаў засталася ў Дзерваедах на сталае жыццё, таму і ведала пра кожнага больш за ўсіх.

Распытваць, што там ды як склалася ў колішняй ягонай сяброўкі Яні, ён жанчыну не стаў. Адзінае, што парупіўся даведацца, — дзе яе шукаць. Усё астатняе, вырашыў тады, само высветліцца, калі будзе ў тым патрэба. Зрэшты, якая там патрэба — не дзеля жаніхоўства ж ён надумаўся праз гэтулькі год сустрэцца.

І вось яна, сустрэча… Не сказаць каб надта цёплая, але ж і непрыязнасці, а тым больш нейкай злосці ён з боку Яні ў адносінах да сябе не адчуў. Абыякавасць — так, але ж, аднак, не варожасць. Хаця Бог ведае, ці насамрэч гэтак яно і ёсць: у чужую душу не ўлезеш. Было б усё так проста, як нам здаецца і хочацца, дык не жыццё было б, а суцэльны рай.

Тым часам аўто гайдаецца сярод парослых драбналессем грудкоў, павольна, як нехаця, сунецца ў кірунку шашы. Тадэвуш Піліпавіч колькі часу глядзіць яму наўздагон, сіліцца ўявіць, як выглядае за стырном яго гаспадыня. Ды марна: аблічча жанчыны расплываецца, мізарнее і ўрэшце зусім чэзне, заслоненае нечаканаю, як снег па вясне, згадкаю пра даўнейшае. Пра тое, што і забылася амаль, а вось, неўспадзеў ускалыхнутае, выплыла са схронаў памяці, замільгала перад вачыма хісткім, няпэўным, як гэты мройлівы, спярэшчаны сонечнымі блікамі ранак за акном, прыпамінам.

Навюткі, з блішчастымі спіцамі ў колах і гарэзлівым званочкам на стырне ровар, і Карольця на ім, і смурод ад расшматанага аб ягоны твар ментуза, і адчуванне роспачы пры думцы, ці не бачыў хто, як

хвастала рыбінай па твары і ці не пойдзе заўтра па вёсцы вясёлая пагалоска. А яшчэ — неадступны, як зацяты восеньскі дождж, страх: што яна, Карольця, ведае, каб гэтак вось бязбоязна, не асцерагаючыся атрымаць здачы, лупцаваць яго рыбінай? І тая жахлівая ноч з прыступам псіхозу, што скончыўся ў рэшце рэшт бальніцаю. І тупое, на мяжы вар'яцкага відзежу неўразуменне, калі назаўтра пасля таго, як прывалаклі яго амаль непрытомнага ў палату, дзверы яе расчыняюцца і Карольця ўваходзіць у цесны, са сцяною на адно акно, бальнічны пакойчык, схіляецца над ложкам.

— Ляжыш? — кажа спачувальна ды, крутнуўшыся ў праходзе тугімі, бы набітыя пер'ем клункі па дарозе на біцясаўскі кірмаш, сцёгнамі, сядае побач, абдае твар капою рудаватых, навалкаваных бігудзямі валасоў. — Рыбы прынесла. З'ясі?

— Не ўжо, дзякуй, — адмаўляецца ён. Хоча спытаць, чаму яна гэтак хутка змяніла злосць на літасць, а разам і спраўдзіць здагадку пра прычыну тае шалёнае злосці, але яна не дае загаварыць. Прыкладае далонь да ягоных вуснаў, хуценька перасядае з ложка на табурэт.

Медсястра Таня са стойкаю для кропельніцы ў адной руцэ і шпрыцам у другой увальваецца ў палату, запаўняе сваім таўсматым целам вольны прамежак прасторы паміж ложкам і сцяной.

— Чулі мы пра вашыя Дзерваеды, як жа, — кажа нізкім, як у мужчыны, голасам і намацвае пальцамі вену на Тадзевай руцэ. — І што ж там здарылася такое на рацэ, што ажно два чалавекі патанулі?

— Што здарылася, тое і здарылася. — Карольця адсоўваецца яшчэ далей ад ложка, стульвае вусны ў непрыступнай усмешцы. — Цяпер ужо рук не падкладзеш.

І па тым, як глядзіць дзеўка на яго спадылба, як доўга яшчэ потым пільна ўзіраецца ў ягоныя шырока раскрытыя вочы, Тадзя ўсё ў тую хвіліну пра таемныя яе думкі, мабыць, і здагадваецца.

Спраўджваць нялюдскую здагадку пры Тані, аднак, нялоўка, і ён вырашае дачакацца, калі тая пойдзе. Ды дарэмна. Калі медсястра, правалаводзіўшыся даволі доўга з голкаю, урэшце патрапляе яму ў вену і збіраецца адыходзіць, Карольця таксама падхопліваецца з месца.

— Ментузяціну забылася! — гукае ён наўздагон не без таемнае надзеі гэткім чынам затрымаць дзяўчыну.

— Ой, праўда! Толькі не ментузяціна гэта, а карасі. Франька, сусед, з ночы дзедавы вершы павытрасаў ды прынёс пачаставаць. Ментузяціна! Перш чым балбатаць абы-што — паглядзеў бы як след... Вось жа рыбны знаўца!

Карольця вяртаецца, з незадаволеным выглядам бярэ пакунак з рыбаю, похапліва торкае медсястры ў руку.

— Вам падарунак на ўдачу, каб наступным разам лацвей калолася, — кажа і заходзіцца гучным і разам з тым натужлівым, як праз сілу, смехам. — Бярыце, у нас гэткага дабра — заваліся. Не свінням жа скормліваць.

Шлюбам яны пабраліся праз два месяцы пасля ягонае выпіскі з бальніцы. Пабраліся спехам, доўга не думаючы. Так, быццам і сумневу ніякага быць не магло, што акурат во гэтак, як робіцца, і было ім ад самага пачатку лёсам наканавана. Быццам сам Усявышні загадзя пра іхнія лёсы паклапаціўся і толькі штурхаў цяпер абаіх, дарма што гэткія маладыя, у каршэнь, прыспешваў з'яднаць іх як мага хутчэй.

Так паменела ў Дзерваедах адною Лакотчышкай, затое Дзерваедаў, наадварот, на адну асобу паболела.

Бо Карольця Юзілаўна Лакотка надта пераймацца стратаю спадчыннага прозвішча не стала і перарабілася ў Караліну Іосіфаўну Дзерваед ахвотна, без лішняе мітрэнгі.

Ядзюня перажывала, што сыходзяцца Тадзя і Карольця не вянчаныя, то, каб яе заспакоіць, паабяцалі па вясне, як толькі выдасца вальнейшы ды цяплейшы дзень, выправіцца па касцельны шлюб у бліжэйшую з латвійскіх святыняў.

Гасціны з увагі на жалобу па Міхалку і Броні не ладзілі. Па роспісе ў Біцясаве ў пассавеце пасядзелі, вярнуўшыся ў Дзерваеды, гадзіну-другую за сталом у хаце з Тадзевай маткаю ды і сышлі на Шаршатачкаў падворак. Тадзя спачатку ўпіраўся, даводзіў, што, можа, не след яму на тым Лакоткавым, спаконвеку ім, Дзерваедам, варожым котлішчы гэтак во адразу, ад першага дня шлюбу атабарвацца, але Карольця ўпарта стаяла на сваім. А каб канчаткова пераканаць маладога, што так, як яны маюць намер цяпер зрабіць, і будзе найлепш, распавяла, *што* за месяц да трагедыі на рацэ ўведала ад дзеда пра вытокі прадаўняе варажнечы паміж іхнімі, наваспечаных сужэнцаў, сем'ямі.

Тое, што ўсё-такі, як вынікала з Карольцінага аповеду, Міхалка ўвесь гэты час цярпеў ад пагарды-нянавісці аднавяскоўцаў не бязвінна, што прыклаў-такі ён, нягоднік, руку да гібелі Пётры і Зыгмона Дзерваедаў, Тадзю не так узлавала ці хаця б узрушыла, як супакоіла. А больш за ўсё здзівіла, і найперш — самім фактам прызнання правіны.

— Чаму ён табе прызнаўся? — уражаны пачутым, спытаў ён і ўнурыўся паглядам у асветлены месяцовым святлом з акна (сядзелі ў прыцемку, без электрычнасці) твар Карольці. — І чаму ўчыніў гэтак з дзедам ды дзядзькам?

— Страшна стала перад немцамі за сябе і за сям'ю, вось і ўчыніў. Хіба не зразумела… Страх — гэта ж вунь які магутны кіроўца, хіба не так? — адказала яна і, быццам знарок, каб падражніцца ўласнаю абыякавасцю да прадаўняе тае, парослае мохам часу справы, шырока, на ўвесь рот пазяхнула. — А чаму прызнаўся? Хто ж ведае чаму… Мне і самой гэта, папраўдзе, дзіўна было. То маўчаў колькі год, а то раптам — такое выкуліў ні з таго ні з сяго вонкі: от наце вам, ешце… Можа, каб пазбыцца цяжару з душы, выкуліў, можа, з іншае якое прычыны… Але і тут, мабыць, без страху не абышлося. Ну, а вось ты… чаму?

Такога пытання Тадзя чакаў, але толькі не цяпер і не ў гэткім выглядзе. І, заспеты ім знянацку, не на жарт сумеўся.

— Я… Ты пра што пытаешся?

— Сам ведаеш, пра што. Кажы ўжо, не чужыя ж…

— Мабыць… мабыць, таму, што злы быў, і злое тое і вылезла ў апошнюю хвіліну. Таксама ж усё проста.

— На каго злы?

— На яго, на Шар… на дзеда твайго нябожчыка, на каго яшчэ…

— З-за чаго? З-за таго даўняга, што ў вайну здарылася?

— Не толькі. Як сказаць… Усё неяк увадначас атрымалася, у адну хвіліну. Я з Біцясава вяртаўся. Гукнуў яго з таго берага, каб перавёз. А ён азірнуўся на крык, спыніўся на хвіліну і пайшоў прэч ад лодкі. Потым яшчэ раз азірнуўся. Ды мала таго, што зноў пайшоў, яшчэ і плюнуў у мой бок. Дзіва, як яшчэ азадак не агаліў ды не выставіў… Усё гэта ўзлавала мяне. Пакінуць чалавека аднаго на беразе, ды ў такое няпэўнае надвор'е, ды яшчэ гэтак зняважліва — хіба не варта таго, каб узлавацца? Але…

— Што?

— Таго, што атрымалася, я зусім не хацеў. Думаў толькі папужаць, павучыць яго, можа, крыху… Маўляў, паплыве неўзабаве старэча лавіць рыбу, а тут вада пад нагамі — вось і няхай тады паскача, і ўзгадае ўласнае прыкрае… А тут, як на тое, гэты віхор пракляты ўзляцеў. Хто мог падумаць, што так яно станецца…

— Бачыш, як усё сапраўды проста, — сказала Карольця і зноў пазяхнула — лянiва, як праз не магу, абыякава.

“Даравала, мабыць”, — падумаў ён з палёгкаю, і гэта ўсё ў іх узаемаадносінах канчаткова і вырашыла. Так грунтоўна вырашыла, што, калі праз гадзіну пасля таго, як закіпела кіпенем у абаіх кроў ды штурхнула ў абдымкі адно аднаго, раптам усхадзілася на дварэ віхура кшталту нядаўняе на рацэ, яны яе амаль не заўважылі.

Што Карольця не дзеўка, ён здагадаўся сам. Якім чынам — і сам не разумеў, бо досведу фізічных любошчаў да тае шалёнае, пад несупынны посвіст ветру і шум дажджу ночы не меў. Але ж здагадаўся.

А вось пра тое, што ўжо і дзіця нават Карольця чакае і што бацька дзіцяці — чарасоўскі настаўнік гісторыі Валяр’ян Сцяпанавіч, яна прызналася сама. Прызналася гэтаксама будзённа і проста, як распавядала толькі што пра даўні пракудлівы ўчынак дзеда Міхалкі. І, напэўна, гэтаю простасцю паводзінаў яго, Тадзюпаняверчыка, і ўлітасцівіла. Тады, на тую хвіліну, — мабыць, на хвалі падагрэтай жарсцю дабраслівасці ўлітасцівіла. Пасля — рупнасцю ў хатніх справах. Балазе гаспадыня з Шаршатачкавай унучкі, дарма што гадавалася без маці, пры дзеду ды цётцы, атрымалася — лепшай пашукаць.

Пра тое, хто бацька дзіцяці, ні адзін, ні другі, хоць і не згаворваліся між сабою, нікому, у тым ліку і Валяр'яну Сцяпанавічу, не сказалі. Так неўзабаве і з'ехаў аматар пругкіх дзявочых сцегнікоў, не даведаўшыся пра ўласнае бацькоўства, настаўнічаць кудысьці на сваю малую радзіму.

Так і пачалося Тадзева сумеснае з Карольцяю жыццё.

Чаму менавіта яго яна абрала на ролю мужа ды бацькі чужога дзіцяці, Тадзя так тады толкам і не зразумеў. І толькі зусім нядаўна, напярэдадні жончынай смерці, прыадкрылася таямніца. Не дарэшты, хаця размову Карольця сама пачала. Відаць, добра муляла і ёй тое таемнае з далёкае мінуўшчыны, што не вытрывала, каб напрыканцы жыцця, ды яшчэ ў такім цяжкім стане, калі ніводнае хвіліны без болю не прамінае, не распачаць пра яго гаману.

— Памятаеш, даймаў ты ўсё мяне, як толькі ажаніліся, чаму не паглядзела на варажнечу між нашымі сем'ямі, пайшла за цябе? Дык вось… Казаць нічога не буду, а падказаць, дзе шукаць на гэткае пытанне адказ, — усё ж падкажу… Спытай у Янькі Лаўцэвічышкі, мабыць, яна ведае. Спытай, што яна бачыла тады… у той дзень, як… як дзед і цётка Броня патанулі… Ведае і памятае — тваё шчасце, і ты будзеш ведаць. Хаця, можа, лепей яго, такога ведання, і не трэба… А калі скажа Янька, што не ведае, — значыць, не лёс табе ведаць. І жыві сабе тады спакойна далей. Зарасло быльнягом — туды яму і дарога…

Сказала гэтак Карольця, заплюшчыла вочы і адышла ў лепшы свет з лагоднаю ўсмешкаю на твары.

Яні Лаўцэвіч ён тады, растузаны смерцю Карольці, шукаць не стаў. А вось цяпер, як крыху супакоіўся ды стаў вальнейшы, нарэшце рашыўся. І вось яна, Яня-Яніна, і вось ён, мабыць, запознены жаданы адказ.

IV

Ніна Іванаўна падагнала аўто пад бярозіну, заглушыла матор. Вылазіць адразу з салона, аднак, не стала: захацелася, пакуль не ўгледзела яе з акна гаспадыня сядзібы, балбатлівая братавая Валянціна, з якой яны ў складчыну даглядаюць гарод і якая гэтак спрытна пераклала на яе клопаты па збыце гародніны і садавіны ды продажы малака і рыбы, пасядзець у самоце, падумаць пра тое, што ўскалыхнула сустрэча з Тадзем.

Ах, Тадзя… Так нечакана ўсё атрымалася, што ажно дасюль ад тае нечаканасці ў галаве трымціць. Быццам нейкія струны там, неасцярожным дотыкам патрывожаныя, заторгаліся-задрыжэлі, а спыніцца, падгарачаныя хваляваннем, ніяк не дадуць рады. Ведала б загадзя, што за прыгода чакае яе ў тым дачным пасёлку, можа, дзесяць разоў падумала б, ці варта туды наогул ехаць. Тым больш што і пакупнікоў там — кот наплакаў, болей паліва спаліш, чым на іх сціплых апетытах заробіш.

З хаты даносіліся гукі тэлевізара, па гравійцы наўзбоч гарода, чутно было, раз-пораз праносіліся, натужліва рыпелі коламі па кепска ўтрамбаваным гравіі — дарогу правялі тут зусім нядаўна, — апошнія легкавікі.

Ніна Іванаўна варухнулася, каб перамяніць позу ды вызваліць ад напругі нагу, якую нязручна вывернула лыткаю да дзверкі ў хвіліну, калі спыняла машыну, пачала ўзгадваць падрабязнасці спаткання з Тадзем.

Але ж як мяняюцца з узростам людзі! Асабліва мужчыны. І амаль заўсёды, магчыма, з-за таго, што спаконвеку меней за жанчын сочаць за сабою, — да горшага. Ледзь пасталее дзяцюк — і ўмомант у мех старызны ператвараецца. Учора яшчэ, здаецца, быў маладзён — вачэй не адвесці, а сёння — хоць плюнь ды

выкінь. Ад аднаго толькі валосся ў вушах ды носе і зашмальцаваных калашынаў нагавіц і гэткіх жа (цьфу, што за слова ўзгадалася!) кятурак* на ваніты міжволі пацягне.

Вось хоць бы і Дзерваедчыка гэтага пастарэлага, Тадзю, узяць. Гамоніць, а капелюша не здымае з галавы. Усё адно як саромеецца зняць. Відаць, добры плех тля выскубла на цемі, што так і не наважыўся яго агаліць. А можа, дзеля таго не зняў капелюша, каб за ёю ямчэй было з-пад яго цікаваць? Ці, можа, недахопы ў яе знешнасці выглядаць?

Бо таксама ж не дзяўчынка яна, не папрыгажэла і не памаладзела, вядома… Ды і хваляванне, хоць з усяе моцы намагалася яго падчас сустрэчы прыхоўваць, прывабнасці ёй, канешне ж, не дадавала. Голас вунь двойчы на пачатку размовы як не сарваўся.

Праўда, цікава было б даведацца, што ён падумаў, як убачыў яе. Лішняга слова не прамовіў, ды чорт ведае, што пры гэтым раілася ў ягонай прыкрытай капялюшыкам галаве.

Тэлевізар сціх. Шырокі Валянцінін цень хіснуўся па сцяне насупраць акна, пагайдаўся сюды-туды, зліўся з прыцемкам слаба асветленага экранам пакоя. Ці то мыш, ці то птушка пранізліва піскнула ў зарасніку парэчак за рогам хаты, і вось ужо зноў, быццам не жадаючы цярпець ніякіх старонніх гукаў, загрымеў у хаце тэлевізар.

“Ці не серыял пачынаецца”, — падумала Ніна Іванаўна і з асалодаю выпрастала ногі ў прадчуванні мажлівасці яшчэ колькі часу пабыць у адзіноце ды аддацца ўражанням дня ўперамешку са згадкамі гэтак нечакана ўскалыхнутых дзякуючы спатканню з прывідам у ка-

---

* Шырынка (дыял.).

пелюшы дзён прамінулых. Можа, упершыню ад часоў тых даўніх аддацца без перасцярогі, дарэшты, напоўніцу — не дзяўчо ж яна, сапраўды, каб не даць рады ўласным эмоцыям.

Так, не дзяўчо яна. Цяпер і пагатоў не дзяўчо, але і замуж выходзячы ім не была. Не ў сэнсе, што, можа, дзявоцкасці да замужжа пазбавілася, не, баронь бог. А не была дзяўчом у тым разуменні, што нямала мела на той момант за плячыма гадкоў. Як кажуць, амаль што сталаю ўжо жанчынаю паспела скочыць у апошні вагон. І хоць даволі позні яе, на дваццаць дзявятым годзе, шлюб спадзеву на незямное, падгледжанае ў модных на той час індыйскіх фільмах каханне не апраўдаў, лічыць яго няўдалым (такім, што дзень пры дні толькі і дадае жанчыне цяжкога одуму і зморшчынаў) не выпадае.

Праўда, шлюб быў як шлюб, не лепшы, можа, але ж і не горшы за іншыя. Бо чалавек ёй, Яні Лаўцэвіч, трапіўся ўсё-такі неблагі. Не п'яніца, не валацуга, не лайдак. Прынамсі грошы, у адрозненне ад іншых мужчын, ад самага пачатку сумеснага жыцця прыносіў дадому і аддаваў жонцы спраўна. І не як-небудзь там дзеля прыліку, каб толькі пыл у вочы пусціць ды мазгі запудрыць, а даастатку, да капейчыны ўсё заробленае аддаваў. Ды і пасаду ягоную загадчыка склада пры хлебазаводзе, дзе ён, Фрэдак Сузень, рабіў па сканчэнні тэхнікума, да няўежных прылічыць было нельга. Мука, дрожджы, нават такія дробязі, як сода, ці соль, ці воцат або тыя ж разынкі для печыва — усё ў ягоных руках, будзь толькі ўвішным, не варонь.

Другое яе шанцаванне ў познім замужжы — тое, што падчас родаў абышлося без кесарава сячэння.

Узяло ды і, насуперак прадказанням разумнікаў-дактароў ды розных цётак-варажбітак, абышлося. Хлопчык-мацачок вылузнуўся з улоння на свет лёгка і зусім здаровенькі — чым не ўдача?

Прабыўшы належны тэрмін у адпачынку па доглядзе за дзіцем, настаўніца Ніна Іванаўна Сузень у школу не вярнулася, а ўладкавалася на хлебазавод лабаранткай. А праз сем год, калі сыну споўнілася акурат дзесяць, і здарылася сумнае. Падчас фінансавай праверкі на заводзе выявіліся немалыя злоўжыванні. Дырэктара неўзабаве пасадзілі, на Фрэдака, які на той час ужо рабіў галоўным інжынерам, таксама завялі справу. Не вытрымаўшы гэткага выпрабавання, мужчына захварэў на сэрца і праз два месяцы памёр.

Так Ніна засталася адна. Рабіць на заводзе пасля гэткіх падзей не хацелася, трэба было ўладкоўвацца кудысьці яшчэ. На гарантаваны, ды ўсё ж нялёгкі заробак у школе вяртацца пасля адноснае заводска-лабаранцкае, пад крылом мужа-начальніка, вольніцы не хацелася, і яна пачала шукаць варыянтаў уладкавацца куды-небудзь у іншае месца. Дзе і зарабляць можна было б больш, і праца была б не такая беспамерна-нервовая ды мітуслівая, як у школе.

Была сярэдзіна так званых нулявых. Якраз пусціліся тады ўсюды расці, бы грыбы пасля спорных дажджоў, розныя грамадскія няўрадавыя арганізацыі. У адну з іх, што спецыялізавалася на прасоўванні ў свядомасць грамадзян постсавецкае прасторы гендарных пытанняў, Ніна Іванаўна і паткнулася неяк у надзеі зачапіцца за магчымасць сталага занятку. Кіраўнічка арганізацыі, таксама былая настаўніца, акурат падшуквала сабе рэферэнта, і тут Нініны веды нямецкай мовы і прыдаліся.

Праз паўгода пасля пачатку працы ў арганізацыі Ніна пазнаёмілася з Цітмарам. Саракавасьмігадовы нежанаты немец са Штутгарта прыехаў у горад упершыню, мовы не ведаў, і кіраўнічка прыставіла да яго Ніну ў якасці адначасова і гіда, і перакладчыцы.

Ніна ўзялася памагаць замежніку ахвотна. І, вядома ж, у адрозненне ад некаторых іншых жанчын, што спалі і бачылі сябе ў абдымках самавітых нетутэйшых кавалераў, без якога-кольвечы разліку. Хаця занурысты, не надта гаманкі (спытаеш — адкажа, але сам першы ніколі не зачэпіць) Цітмар, папраўдзе, ёй і падабаўся, разлічваць на што-небудзь большае за дзелавую супрацу з мужчынам ёй у голаў не прыходзіла. Да таго часу, пакуль гэткае не прыйшло аднойчы ў голаў самому Цітмару і яна не мусіла на такі паварот справаў адрэагаваць.

Усё, што адбылося потым, здарылася так хутка, што Ніна вокам плюснуць не паспела. І ўжо праз некалькі месяцаў, акурат у ноч вігіліі Божага Нараджэння, пакінуўшы сына ў Дзерваедах на апеку маці, упершыню выправілася за мяжу. Выправілася быццам бы з намерам пераймання досведу працы жаночае арганізацыі, а насамрэч найперш — у адведзіны да Цітмара.

Сям'я Цітмара выбар сына ў асобе развядзёнкі з незразумелага замежжа калі і не ўхваліла, дык выгляду пра тое не падала. Жанатаму брату і яго жонцы, відаць па ўсім, уласных клопатаў хапала. Маці ж, жанчына даволі флегматычная і нават часам, як падалося Ніне, празмерна да ўсяго абыякавая, вырашыла, мусіць, за лепшае ў адносіны сына і ягонае іншаземнае каханкі не ўмешвацца, то-бок пусціць усё на волю лёсу.

Лёс жа так распарадзіўся, што неўзабаве Нінін сын Максім, на той час пятнаццацігадовы хлопец, даволі

сур'ёзна захварэў, і яна мусіла тэрмінова вяртацца на радзіму. Прыкрую перашкоду справе мацавання адносінаў, праўда, падсаладзіў Цітмар: падараваў ці то ў знак падзякі за прыхільнасць, ці то з намёкам на працяг яе ў будучыні, значную суму грошай. На якія Ніна, даклаўшы крыху наашчаджаных сваіх, вось гэтую машыну, у якой па сёння калясіць па лецішчах у пошуку пакупнікоў, тады і набыла.

Падлячыўшы сына, Ніна зноў зазбіралася ў Штутгарт. Але тут, як на злосць, арганізацыю, з ласкі якой мясцовыя жанчыны да пары да часу бясплатна калясілі па Еўропе, залічылі да апазіцыйных і ўвадначас зачынілі. Стасункі з замежжам перайшлі ў сферу тэлефанаванняў. І Ніна, якая, у адрозненне ад Цітмаравай маткі, пакідаць уласныя справы на волю лёсу не любіла, быццам каб знарок пацвердзіць выслоўе, што апетыт падчас яды прыходзіць, вырашыла скарыстацца магчымасцю працягваць адносіны з Цітмарам напоўніцу.

Яе палкія, поўныя намёкаў на сур'ёзнасць пачуццяў тэлефанаванні, здаецца, далі-такі плён. Цітмар не толькі напісаў ёй электронны ліст, але і паабяцаў прыехаць. Гэтым разам, праўда, не па справах арганізацыі, а прыватным чынам, адмыслова да яе — пагасціць колькі дзён.

Узрушаная перспектываю хуткага спаткання, Ніна ўзялася даводзіць да ладу жытло. Пафарбавала ў кватэры падваконнікі ды дзверы, падклеіла шпалеры, набыла сякія-такія дробязі для дэкору. Хацела яшчэ абкласці пліткаю сцены ў ванным пакоі, але не паспела, бо майстар паабяцаў зрабіць хутка, а потым так доўга ўсё нешта цягнуў з пачаткам працы, што і засталася справа нязробленая.

Быццам адчуваючы яе нявыкрутку з рамонтам, Цітмар раптам прыслаў ліст, у якім даводзіў немагчымасць

спаткання цяпер, а абяцаў яго праз нейкі час, можа, наступным летам. Спаслаўся пры гэтым на кепскі стан здароўя і нават, прабачаючыся, даслаў нейкую ці то выпіску з гісторыі хваробы, ці то даведку. Затым пайшлі чарадою эсэмэскі — то быццам бы з лякарні, то яшчэ аднекуль.

— Мама, ну не хоча ён цябе, не хоча, як ты не разумееш! — пераняўшыся яе дэпрэсіўным настроем з нагоды няпэўнасці ў адносінах з мужчынам, сказаў неяк дапалы не па ўзросце Максім. — Хвароба, кепскае самаадчуванне — адгаворкі ўсё гэта. Ад-га-вор-кі…

— Чаму гэта адгаворкі? Гэткі ўжо ты знаўца-псіхолаг! — успыхнула яна, абражаная. Але да сынавых словаў мусіла ўсё ж такі прыслухацца. Балазе і сама ўжо час ад часу ўпотай падумвала, ці не гуляе дзяцюк з ёю ў нейкую гульню, ці не водзіць за нос.

Канчаткова высветліць сітуацыю памагла адна інтэрнэт-фрэндэса, вялікая аматарка займацца чужымі справамі. Неяк яна даслала Ніне адрасы мужчын-замежнікаў з сайта знаёмстваў, і адным з тых адрасоў якраз аказаўся адрас Цітмара.

Ніна даслала з сынавай скрыні каханку ананімны ліст з анкетаю (што веру ў Бога — сказаць не магу, бо агностык, піць — шмат не п'ю, але крыху, маўляў, — тонкі намёк на жаданне быць запрошанай у рэстаран — ужываю), на які ён, валацуга, тут жа, не марудзячы ні хвіліны, і адказаў.

Такіх двурушных дзеянняў па-за ўласнаю спінаю Ніна і не чакала, і дараваць не магла. Можа, з увагі на адыходлівасць сваю і даравала б, калі б быў Цітмар хаця б крыху бліжэй. Але ён быў далёка, і градус яе кахання да мужчыны пасля такое здрады міжволі пайшоў на спад. А праз колькі часу стасункі між імі і нао-

гул спыніліся. Без асаблівай крыві, затое з пацверджаннем агульнавядомага, што, сапраўды, усе мужчыны сволачы і што ў любой справе рабіць у гэтым сэнсе выключэнне з правіла для дзецюка толькі таму, што ён, бач, замежнік, — вялікая аблуда.

***

Тэлефон сціхае, але праз хвіліну зноў заходзіцца мелодыяй. Тадэвуш Піліпавіч цягнецца рукою да пуфіка, каб намацаць мабільнік, ды спрасоння не дае рады. Пакуль ягоная сонная далонь ліхаманкава мітусіцца па краі пуфіка і натыкаецца ўрэшце на тэлефон, мінае колькі хвілін.

— Алё! Прывітанне, бацька! — Генадзеў голас гучыць неяк нязвыкла злавесна і разам з тым быццам знарок адстаронена. Так сын размаўляе вельмі рэдка, толькі тады, калі зусім не ў гуморы. — Спіш, мабыць? Адпачываеш?

— Ты, Генусь? — Тадэвуш Піліпавіч уключае вольнаю рукою святло, глядзіць на гадзіннік . — Ого… Дванаццатая… Так позна? Дзе ты?

— Дома, дзе яшчэ мне быць… Дзве гадзіны таму ўкуліліся ўсім кагалам у хату, вось сядзім, бядуем пад гарбату…

— Што значыць — бядуем? Чаму?

— А вось таму, — сярдзіта выгуквае Генадзь. — Абакралі нас, Тадэвуш Піліпавіч, вось што…

— Як — абакралі? Дзе? Бач ты, як яно ў дарозе здараецца…

— Ды не ў дарозе — дома абакралі. Вярнуліся, а тут, ведаеш, дзверы насцеж… Замок на месцы, спраўны, а ўсё расчынена. Заходзь і бяры што хочаш.

Тадэвуш Піліпавіч падхопліваецца з канапы, торкае вобмацкам ногі ў тапкі.

— Відаць, улезлі з даху праз балкон у кухню, — працягвае Генадзь. — З кухні далей, па ўсёй кватэры пайшлі шпацыраваць… Футра Юліна, гэнае, што летась у Польшчы набыла, звалаклі. Сёе-тое з тэхнікі. Грошы, што Анітцы планавалі аддаць, таксама ляснулі.

— Сем тысяч даляраў! — ахае Тадэвуш Піліпавіч, адчуваючы, як раптоўна цяплее ў грудзях ды пачынае ўзбуджана лекацець сэрца. Грошы яму, канешне ж, абыходзяць вельмі. Бо гэта якраз траціна сумы, што засталася ім з Карольцяю ад абмену трохпакаёўкі на аднапакаёўку. Міронава доля, якую ён меўся неўзабаве, паводле дамовы з Міронам, аддаць ягонай Аніце, а пакуль што пазычыў Генадзю на справы бізнесу. — Божа літасцівы! Ну, а што міліцыя? Выклікалі ж пэўна?

— А што міліцыя? Прымчаліся, абгледзелі ўсё. Шукалі адбіткі пальцаў, аж, прабач, херачка што знайшлі! Каб хоць след дзе застаўся… Прафесійна злодзеі папрацавалі. Трэба было, бацька, табе перціся на тое чужое далёкае лецішча… Быццам у нас горш табе было б. Воўкам табе наша кватэра смярдзіць, ці што…

— Дык каб жа я ведаў, што гэтак яно атрымаецца…

— Каб жа ведаў! Ну, але… Што карысці цяпер скавытаць ды пасыпаць галаву попелам. Казаў той, не мы першыя, не мы апошнія. Сем тысяч шкада, канешне, ды што папішаш. Дзякуй, на дыван, як вунь летась у знаёмых маіх, не апаражніліся зладзяюгі. Уяўляеш: вяртаешся з адпачынку дахаты ўвесь такі з сябе, у выдатным такім, мажорным настроі, а пасярод пакоя куча гаўна на дыване цябе падчэквае. А ведаеш, што за ўсё цікавей?

— Што?

— Тое, што пярсцёнка з брыльянтамі дурні не ўзялі. Памятаеш, я Юлі да дня народзінаў даражэзны пярсцёнак купіў? Дык вось акурат жа яго і не ўзялі. Хаця

і схаваны не быў, навідавоку, у спальні на пальцы гіпсавага манекена вісеў. Мабыць, падумалі, што біжутэрыя, і пагрэбавалі ўзяць. Ламачча рознае хуценька схапілі, а брыльянт пакінулі.

— Ну, то хоць за гэта ім дзякуй.

— Ага, ёсць за што дзякаваць… Што дазвання не распранулі ды па свеце голымі не пусцілі… Так, патвойму?

— Што я? Прыкра мне, вось што.

— Ай, не пераймайся ўжо так. Прыкра! Што зрабілася, таго не вернеш, — неяк увадначас палагаднелым голасам кажа Генадзь. — Аніта тэлефанавала, казала, хоча днямі са сваім хлопцам да цябе наведацца. Дык ты там ужо надта не распавядай ім пра гэтае нашае брыдкае. Яна — адно, свая дзеўка, але ж хлопец яе… Як-ніяк старонні чалавек, што ў вушы ўводзіць… А то пойдзе па людзях пагалоска, дык і ведаць не будзеш, куды ад жартачкаў-пацвельванняў хавацца. Хтосьці і парадуецца яшчэ такому здарэнню, а то і анекдот прыдумае…

— Добра, не буду нічога казаць.

— Галоўнае — пра скрадзеныя грошы не кажы, каб лішніх размоваў не правакаваць. Я і Мірону з Алёшкам таксама казаць пра даляры не буду. Скажу, канешне, што ўлезлі бандзюкі ў кватэру ды сёе-тое з рэчаў узялі, а пра даляры — маўчок… Дык і ты маўчы, не кажы. А то атрымаецца, быццам знарок мы ўсё прыдумалі, каб не аддаваць Аніце бацькавай долі. Розныя здагадкі пачнуцца… Радня раднёю, а часам і ад яе трэба заставацца на адлегласці. Зразумеў?

— Зразумеў. Яшчэ б не зразумець, — пагаджаецца Тадэвуш Піліпавіч і перакладае слухаўку да другога вуха. — Твае як?

— Добра, што ім зробіцца. За добрым гаспадаром — усе як за сцяною каменнай. Мірон жа ці адгукаецца? — У голасе Генадзя прамільгвае характэрная, якая заўсёды ў ім з'яўляецца, варта загаварыць пра малодшага брата, нотка паблажлівасці.

— Адгукаецца, — не жадаючы чапаць балючага, адказвае Тадэвуш Піліпавіч і хуценька пераводзіць размову на тэму аб пераразліку пенсіі, які яму маюцца неўзабаве зрабіць у бок падвышэння з улікам адпрацаваных пасля выхаду на пенсію год.

Аднак Генадзю, мяркуючы па ўсім, гэта не надта цікава. І ён, спаслаўшыся на тое, што хтосьці, маўляў, звоніць (дай ты рады — апоўначы!) у дзверы, спыняе размову.

V

Дзень толькі пачаўся, а гукаў наўкола так шмат, быццам тут не лецішчы ўсюды побач, а якое-небудзь прамысловае прадпрыемства. Асабліва даймае, рэжа вушы несупынны гул аўто ад гравійкі. Машыны на вялікай хуткасці раз-пораз праносяцца па ёй, шоргаючы коламі па гравіі, паволі аддаляюцца, цішэюць і нарэшце зусім патанаюць у чэраве ўхутанага шэранню прыдарожнага гайка.

Тадэвуш Піліпавіч перакульваецца на другі бок, слізгае паглядам па экране мабільніка. Без чвэрці сем, роўна дзесяць хвілін да сігналу. Каторы дзень запар ён прачынаецца сам у адзін і той жа час. І гэта яму, чалавеку, які звычайна без гадзінніка і кроку не ступіць, нават і дзіўна. Зрэшты, дзівіцца няма чаго, бо такое заўсёды з ім здараецца ў хай сабе і не непасрэднай, але ж прысутнасці старонняга чалавека.

Старонні чалавек зараз тут для яго — гандлярка Ніна Іванаўна, у дзявоцтве Яня Лаўцэвіч. Якая штораніцы пад'язджае да лецішча акурат а восьмай, ні хвілінаю раней ці пазней, і да прыезду якой ён кожны раз выходзіць загадзя падрыхтаваны, наструнены, не раўнуючы бы маладзён у храм за хвіліну да ўзяцця шлюбу. Прынамсі да сённяшняга дня так было, а як яно складзецца ад хвіліны размовы, дзеля якой ён тут, на гэтым лецішчы, другі тыдзень, бы той Рабінзон на сваёй выспе, кантуецца і якую менавіта сёння плануе распачаць, — Богу толькі вядома.

Так, каля дзясятка дзён маркоціцца Тадэвуш Пілі-павіч пустэльнікам у чужым доме, аж самому не верыцца, што гэтак надоўга хапіла ў яго цярпення ды вытрымкі трываць такую побытавую неўладкаванасць. Каб не стос скарыстанай бялізны на зэдлі ў куце пакоя, дык і сам не паверыў бы, што аказаўся на такі подзвіг здатны. Дарэчы, не забыцца папрасіць па тэлефоне Аніту, каб што-небудзь заўтра, прасціну там якую, наўлечку, можа, прывезла. Раптам давядзецца яшчэ на колькі часу тут застацца, то хай будзе чысцейшае на ўсялякі выпадак.

Думкі пераскокваюць на прыезд унучкі, робяцца штохвіліны ўсё больш дакладнымі, канкрэтнымі. Прыедзе дзяўчына не адна, з хлопцам, то трэба ж яму — як-ніяк родны дзед — хоць збольшага да прыёму гасцей падрыхтавацца. Тым больш што хлопца ён дагэтуль не бачыў. То, можа, Яню папрасіць, каб падкінула чаго-небудзь вясковага для пачосткі гасцей? Тых жа абяцаных клубніц, напрыклад. Але толькі, канешне, не рыбы. Якой ён і сам вось ужо колькі дзясяткаў год не есць, і глядзець, як робяць гэта іншыя, без прыступаў млоснасці не можа.

Будзільнік тэлефона абзываецца з пуфа: час падымацца.

Ён спускае далоў ногі, ідзе ў кухню мыцца. І толькі паспявае наліць у рукамыйнік вады ды збольшага апаласнуць рукі і твар, як з двара даносіцца сігнал клаксана.

— Іду-у! — крычыць ён у акно і ідзе на двор.

Ніна Іванаўна сядзіць у аўто з прыглушаным маторам і вылазіць з яго, бачна па ўсім, гэтым разам не збіраецца.

— Малако, — кажа і высоўвае з салона бутэльку. — Хадзі, сам вазьмі. Мне тэрмінова трэба ў суседні пасёлак з'ездзіць, дык вельмі ж спяшаюся.

— А клубніцы? — расчараваны тым, што, мабыць, пагаварыць, як ён планаваў, зноў не атрымаецца, кажа ён і сунецца да машыны.

— Непярэліўкі з клубніцамі, вось што, — кажа яна і совае бутэльку яму ў далонь. — Трасца нейкая раптам на лехах аб'явілася, нейкія брыдкія слімакі ледзь не ў палец таўшчынёю… І жаруць лісце, і жаруць, халеры… Ягад, праўда, няшмат яшчэ зжэрлі, але што будзе далей, як адно бадылле застанецца, хто ведае? Дык паеду да знаёмага агранома, каб падказаў, што рабіць. Так што цяпер ні да чаго мне… Пазней, калі што якое, сюды па цябе прыеду і завязу на месца… Сам і набярэш ягад, колькі табе трэба, не вялікі пан. Калі застанецца што набіраць…

— Я яшчэ пагаварыць з табою хацеў, — кажа ён і як мага лагодней, быццам ад гэтага залежыць, пагодзіцца яна на размову або не, усміхаецца.

— Пагаварыць? Пра што гэта?

— Пра сёе-тое, — адказвае ён і прастуе да дома.

— Ну, добра. Пагаворым… Канешне, як жа, пагаворым, абавязкова, не чужаніцы ж мы якія-небудзь

адзін аднаму. Але ж пошасць гэтая, гэтыя слімакі… І вось адкуль што ўзялося, каб хто сказаў.

Ніна Іванаўна запускае матор, ад'язджае колькі метраў, высоўвае галаву з салона.

— А памятаеш, як у Дзерваедах на Шаршатачкавым гародзе з дапамогаю індыкоў ад слімакоў пазбаўляліся? — кажа і слізгае какетлівым паглядам па ўласнай выяве ў люстэрку. — Ты тут, пры доме, птаства якога часам не загадаваў? Во запусцілі б у гарод, і ніякія парады былі б непатрэбныя. Ха-ха!

— Не загадаваў, на жаль, — кажа Тадэвуш Пілі-павіч і абарочваецца, каб паглядзець, як яна зрэагуе на ягоныя словы. Але дарэмна: аўто ўжо далекавата.

Бліжэй к абеду прыязджае Аніта. Адна, бо яе Іллю, праграміста з куртаценькім стажам працы ў нейкай фірме па продажы бог ведама чаго, надоечы пакусалі падчас карпаратыву пры пасецы прыгараднага дэндрарыя пчолы, дык ехаць у людзі з апухлым тварам ці то пасаромеўся, ці то, можа, і наогул не захацеў, а толькі тым, што, маўляў, саромеецца, дзеля выгляду прыкрыўся.

— Сарамлівы наш Іллюк, як дзевачка, — каментуе паводзіны каханка Аніта і моршчыць лоб. Бачна, што такое далікатнасці ў мужчынах яна за належнае не ўспрымае і, мяркуючы па інтанацыі голасу, не ўспрымае даволі ваяўніча.

Аніце дваццаць два. Не падлетак, але апранаецца, як пятнаццацігадовае дзяўчо. Край спаднічкі — у пары міліметраў ад сярэдзіны азадка, грудзі паўголыя. На фоне гэткае манеры апранацца ў сукупнасці з прыроджанай рэзкасцю паводзінаў яе праніцаныя тэзамі высокай маралі развагі аб жыцці-быцці выглядаюць часам даволі дзіўна і неяк, папраўдзе, штучна. Пагаманіць жа Аніта (нягледзячы, што дзяўчына не такая ўжо сталая

і бабскага ў разважаннях яшчэ, здаецца, набрацца к гэткаму веку была б не павінна) і любіць, і нагоды не прамінае. Вось і зараз, відаць па ўсім, мае намер скарыстацца магчымасцю нагрузіць суразмоўцу сабою ды сваімі бзікамі напоўніцу.

— Што ў цябе, дзядуля, новага? — пытаецца і пачынае няспешна (рабіць любую справу з рэзкімі пераходамі, спачатку павольна, як скрозь сон, затым нечакана ўспыхліва — яшчэ адна асаблівасць яе характару) даставаць з валізы прысмакі. — Дзядзька Генадзь вярнуўся з адпачынку — ведаеш?

— Ведаю. Увечары сюды тэлефанаваў.

— Увечары ці, можа, уначы ўсё-такі? Нам дзесьці ці не а дванаццатай, здаецца, патэлефоніў. Тату пабудзіў, дык той надта ж незадаволены быў. Бурчэў: чаму гэтак позна?

— І што казаў?

— Тата? А што ён скажа? Я ж кажу: бурчэў, лаяўся. Быццам сына свайго ты не ведаеш…

— Не бацька. Я пра Генадзя… Прычым тут твой тата…

— А-а, дзядзька Генадзь? Ды я не ведаю дакладна, не чула ўсяго, што яны там гаварылі. Адно здагадалася па татавых паводзінах, што нейкая даволі нервовая была іхняя гамана. Што абакралі яго быццам бы, пакуль быў у Балгарыі. Тата, як даведаўся пра гэта, усю ноч потым не мог заснуць.

— З-за таго, што Генадзя абакралі?

— Ну так. А што дзіўнага? Браты ж яны як-ніяк, — кажа з выклікам у голасе Аніта і свідруе Тадэвуша Пілі-павіча праніклівымі сваімі, рудаватымі, як у нябожчыка Міхалкі, вочкамі.

— Вядома, браты… Але ж супакоіўся, напэўна, пасля?

— Супакоіўся, хоць і не зусім. Паспакайнеў, як даведаўся, што не ўсё ўзялі. Нейкі дарагі-раздарагі пярсцёнак з брыльянтам, аказваецца, пакінулі злодзеі… Ці то не заўважылі, ці то не ацанілі як след… А што там за пярсцёнак — не ведаю. Дзіўна: у дзядзькі Генадзя — гэткі скарб. Адкуль такая нясветная раскоша?

— Адкуль? Купіў… Юлі ў падарунак.

— Купіў? Ого. Каштуе, відаць, нямала гэткі падаруначак. Дурні…

— Чаму гэта — дурні? Мелі грошы на той момант — вось і набылі каштоўнасць. Уклалі, так бы мовіць, у вартую справу… Усе так робяць.

— Я не пра дзядзьку з цёткаю, а пра тых… пра злодзеяў-недарэкаў.

— А-а… Ну, канешне, твая праўда — недарэкі. Драбязу згрэбці, а вартае пакінуць — хіба не дурасць?

— І я тое ж кажу. На футра паквапіцца, а на брыльянт увагі не звярнуць — што можа быць дурней? А з грашыма што? Сцібрылі? Не?

— Ой, не ведаю… Хваляваўся, мабыць, Генусь, дык блытана неяк распавядаў. То я і не зразумеў як след, што там да чаго. Але, здаецца, пра грошы нічога ён не казаў.

— Значыць, не скралі. То і дзякуй богу. — Аніта змаўкае, вытрымлівае невялікую паўзу. — І няма чаго надта перажываць. Згуба футра для такога крутога, вёрткага мужчыны, як дзядзька Генадзь, справа несмяртэльная, — кажа і ўключае электрагарбатнік. — Набудзе новае. Во пакуль мы гарбаты з табою, дзядулік, пап'ем, глядзіш, ужо і набудзе.

Аніта ад'язджае а шостай. Ад'язджае раптоўна, неяк надта ж эмацыйна пагаварыўшы перад тым з кімсьці

па мабільніку. Запэўнівае дзеда, што пойдзе пешкі на прыпынак маршруткі, але да прыпынку не даходзіць. Тадэвуш Піліпавіч вызірае ў акно акурат у тую хвіліну, як яна садзіцца ў запыленае аўто бурачковага колеру.

Відавочны, нават калі ён і не планаваны загадзя, падман дзяўчыны, як і тое, што яна быццам бы ведаць дагэтуль не ведала пра падораны Генадзем жонцы брыльянт, яго непрыемна ўражвае. Тым больш што такі момант няшчырасці здараецца між ім і Анітаю не ўпершыню. Вось адкуль, напэўна, і халадок між імі падчас кожнае размовы, і нейкая часам адчужанасць. Быццам і прычыны для яе, той адчужанасці, няма, а разам з тым і не адчуць яе нельга, і не пераймацца ёю, вядома, не выпадае.

На шчасце, горыч ад няшчырых паводзінаў унучкі разліцца раўчукамі жоўці па целе Тадэвуша Піліпавіча не паспявае. Бо літаральна праз колькі хвілін па яе ад'ездзе вяртаецца да лецішча Ніна Іванаўна. І не ўлегцы вяртаецца, не з пустымі рукамі, а з вялікім пакункам чырвоных, налітых сокам клубніц.

— Прабач, абяцала самога цябе завезці па ягады, аж во як яно ўсё раптам перамянілася, — кажа, вылазячы з аўто. — Праўду кажуць: дзе коратка, там і рвецца. Паехала да таго агранома, а ён і параіў апрацаваць гародчык растворам. Думаю: раствор жа, "Слімакс" гэты, напэўна, атрутны, дык што з ягадамі будзе? То перад тым, як распырскваць яго па лехах, абабрала хоць збольшага чырванейшыя клубніцы. Бяры, частуйся. Бяры, не бойся, грошай не запатрабую.

— Чаму не, можна і за грошы, — кажа Тадэвуш Піліпавіч і дастае з пакунка навобмацак клубнічыну. Падносіць яе да рота, але тут жа хуценька і адымае: ягадзіна з аднаго боку, заўважае краем вока, як быццам кімсьці падзяўбаная.

— Ой, прабач, — бянтэжыцца Ніна Іванаўна. — Вось пачаставала дык пачаставала… Але гэта не слімакоў работа, а, мабыць, птушка якая залётная паласавалася… Можа, шпачок увішны ці верабей пастараўся… Сам ведаеш, яны любяць дармовым, без нагляду пакінутым пакарыстацца. А памятаеш, як Шаршатачка нас, дзятву смаркатую, акурат во такімі падзяўбанымі ягадамі частаваў? Як набярэ, бывала, ні з таго ні з сяго раздобрыўшыся, пушчэйшых*, недаспелых ці падзяўбаных ягадзін у шапку і нясе праз усю вёску, каб бачылі ды ацанілі суседзі дабрыню ягоную, да месца, дзе мы бавімся. Падзеліць тыя ягады на ўсіх, паўсміхаецца і сунецца назад. А мы – лепшыя ў рот, а падзяўбанымі — адзін у аднаго кідацца. А то і наўслед Шаршатачку, у знак падзякі, значыцца, гэткія-разгэткія няўдзячныя гарэзы, шпурнем адну-другую…

— Цацы яшчэ тыя мы былі, — кажа Тадэвуш Пілі-павіч.

— Ага, не кажы, фальшывае за вярсту адчувалі, дарма што малыя зусім, кату па пяту… І адчувалі, і ад сапраўднага ўвобміг беспамылкова адрознівалі.

— Праўда твая. Але ж памяць у цябе, аднак, Яня: такія дробязі памятаеш.

— А ты не памятаеш хіба нічога?

— Цьмяна, як скрозь сон. Штосьці лепш, штосьці горш, а штосьці і зусім блага. А так, каб усё памятаць — не, такога і блізка няма. Ды і хіба такое магчыма?

— А гэта як паглядзець. Калі нешта вартае, дык і праз сорак, і праз пяцьдзясят год пра яго не забудзешся. Калі нават і захочаш забыцца — не атрымаецца. Зноў жа, ад чалавека, ад асаблівасцяў памяці яго шмат зале-

---

* Горшымі (дыял.).

жыць. Мне, сапраўды, як ты кажаш, Бог даў памяці — лепшай не трэба. Ды і табе, думаю, таксама. Быццам я не памятаю, як ты хутка ўсё, што патрабавала памяці, у школе схопліваў. Хутчэй за ўсіх у класе… Вока-мгненна! А вось штосьці ці то сціплічаеш цяпер, ці то духамі круціш, наўмысна няпраўду кажаш…

— Ну, калі так, калі такая ты ўжо памятлівая ды праўдзівая, то вось і скажы тады… — адчуваючы скурай, як абдалі гарачынёю твар апошнія словы суразмоўніцы, але робячы выгляд, што даволі фамільярны гэты, як для размовы людзей, што гэтулькі год не бачыліся, слоўны выпад яго зусім не зачапіў, кажа Тадэвуш Піліпавіч і на хвіліну змаўкае, быццам падшуквае і не можа падшукаць належных словаў.

— Што?

— Што? А вось тое… Вось што падчас пераправы ў той дзень, як Міхалка з Броняю патанулі, здарылася на рацэ такое, пра што ніхто, апроч вас, цябе і Карольці, не ведае? Намякала штосьці мне Карольця за хвіліну да скону, а сказаць — так і не сказала. Сілілася-сілілася, ды на тым усё і скончылася. То вось і скажы ты, можа… Скажаш? Ці таксама… духамі пачнеш круціць?

Ніна Іванаўна колькі часу сядзіць моўчкі, як спаралізаваная, толькі часценька-часценька, быццам не хапае ёй паветра, дыхае, ды цярэбіць залаты свой кулон на шыі, ды варушыць бязгучна, быццам і хоча штосьці сказаць, і не наважваецца, вуснамі. Бачна, што пытанне заспела яе знянацку і што чакаць ад яе цяпер талковага, нават калі і захоча сама гэта зрабіць, адказу — марная надзея.

— Ого, як глыбока закідваеш ты сваю вуду! — кажа яна нарэшце і хуценька, быццам даючы знак, што спадзеў ягоны на праўдзівы адказ сапраўды марны, міту-

сліва прыкрывае клубніцы кавалкам тканіны. — А вудзільна не баішся аб вылаўленае паламаць? Пацягнеш на сябе, а там, на зазубе, — шкілет? Ды такі страхавіты, што, каб чапаць яго, добрым рызыкантам трэба быць.

— Якая там рызыка! — кажа ён і махае рукой. — Калі і вымкнецца нешта і зусім мулкае на свет Божы — што цяпер, па часе, за бяда? Усё адно людзей тых даўно ўжо няма на свеце… Ды і мы…

Ён хоча сказаць "не маладзёны", але не пэўны, як успрыме яна гэткі выраз, ці не зазлуе, спыняецца на паўслове.

— Ну дык тым больш тады адказна, як няма, — не зважаючы на гэтае ягонае "ды і мы", кажа жанчына. — Вось раптам возьмеш і награшыш супраць чалавека нагаворам? Раптам зусім і не было нічога такога, а толькі здалося табе ўсё з упуду? Ачарніць нябожчыка, які здачы даць не можа, — гэта ўжо неяк зусім жа не па-людску. Вось не думала, што пра гэта ты будзеш пытацца… Ды пачакай, пачакай…А што, як вось я ў цябе запытаюся? Пра гэта не падумаў?

— Пра што запытаешся?

— Пра сёе-тое… Ці мала пра што можна? Пра які-небудзь твой прыхаваны шкілецік… Пра які-небудзь востранькі цяслярскі інструменцік у кішэні, напрыклад… Як? Згода?

— Ну, вось, завяла катрынку, — жартаўліва, каб не так відавочны быў для суразмоўніцы ягоны сполах, кажа Тадэвуш Піліпавіч і зноў торкае руку ў пакунак з ягадамі.

— Глядзі, зноў жа абдзяўбаную не выцягні, — перасцерагае Ніна Іванаўна, але марна: дзіравая будзе тая клубнічына, не дзіравая — яму ўжо без розніцы. Кроў б'е Тадэвушу Піліпавічу ў голаў, адзываецца нудотным тупым болем у скронях, гарачаю хваляю расплываецца

па целе. Ніна Іванаўна, мабыць, гэта адчувае, бо тут жа спрабуе неяк выправіць становішча.

— Не пераймайся гэтак, не адзін ты такі… — кажа і глядзіць яму прама ў вочы. — Мяне вунь колькі мітрэнжыў дазнаўца падчас допытаў, што ды як было падчас тае віхуры. А я занатурылася, казаў той, уперлася рогам і нічога яму не сказала. Ні сло-ва! Як сказаць? Сёння па пазычкі ідзеш да чалавека, кланяешся яму нізенька, у самыя ножкі, а заўтра пад суд яго падвесці? Гэта ж якою гадзінай трэба быць, каб гэткае зрабіць…

— Пачакай, якія пазычкі? Пра што ты?

— А пра тое… Як думаеш: старую карову-перадойку, пакуль не здохла няўрокам, на маладзейшую трэба нам з маткаю было ўрэшце памяняць? Вядома, трэба. А дзе грошы, каб дакласці да таго, што ад здачы старой займееш, узяць? Вось Карольцечка твая, дзякуй ёй, і выручыла. Выдзеліла з тых, што ў шафе, Шаршатачкам ці то Броняй прыхаваныя, знайшла. Не пахвалілася хіба табе, не сказала нічога пра знойдзеныя пад наўлечкамі чырвоненькія савецкія дзясяткі? Ой, ці можа быць такое? Пэўна ж, сказала… Нябось, і расшукаў ты мяне цяпер толькі дзеля таго, каб іх, дзясяткі тыя, спагнаць?

— Грошы, значыцца… дзясяткі, — дарэшты агаломшаны пачутым, прамаўляе Тадэвуш Піліпавіч і глядзіць разгублена на мабільнік. Што размова набудзе вось гэткі нечаканы кірунак, ён не чакаў і цяпер і рады ўжо быў бы яе спыніць, але не ведае як.

На ягонае шчасце, суразмоўніца гэта ведае, здаецца, добра.

— Бяда з вамі, гарадскімі, — кажа і дакорліва, акурат гэтак, як заўсёды гэта рабіла, не жадаючы працягваць якой-небудзь сямейнай спрэчкі, Карольця, ківае галавою. — Што ні прапануй — усё вам не так. Клубніцы

конча каб цалюткія былі, без дзіравінкі. Рыбы не ясце… І дагадзі тут вам, дамарослым гідліўцам… А ўжо ў голаў што як возьмеце, дык, як адна мая даўнейшая сяброўка любіла казаць, ніякім долатам адтуль гэнага ўзятага не выпхнеш. Пакутуеце, а яно, можа, зусім і не вартае пакутаў. Бо, можа, і без вашага ўдзелу гэтак, як ёсць, усё адно калі-небудзь сталася б. Калі не яшчэ горш…

— Вось скажаш — толькі каб спагнаць! — вяртаючыся да ранейшага, неўпапад кажа Тадэвуш Піліпавіч і з задавальненнем адзначае, як твар жанчыны ўспыхвае пры гэтым плямамі ўдзячнасці.

Не паспела сонца распачаць ранішнюю сваю прагулянку па-над гаем ды птушкі як след не папрачыналіся навокал, а Тадэвуш Піліпавіч ужо на нагах. Як наструнены соваецца па пакоі: то на край канапы прысядзе, то да акна хіснецца паглядзець, што там на дварэ дзеецца, то ў сенцы вызірне.

Да прыезду Генадзя, які, паводле дамовы, павінен пад'ехаць па бацьку на лецішча а дзясятай, застаецца яшчэ каля дзвюх гадзін. Але Тадэвушу ўжо не толькі не спіцца, але і наогул — ні да чаго душа не ляжыць. Паганы настрой як апанаваў яго падчас учарашняе размовы з Нінай Іванаўнай, так і не пакінуў аж во да якое пары.

Ён куляецца на канапу, намагаецца калі ўжо не заснуць, дык хаця б больш-менш давесці нервы да ладу. На шчасце, гэта яму нарэшце сяк-так зрабіць удаецца…

Прачынаецца ён ад чыіхсьці крокаў. Расплюшчвае вочы і бачыць перад сабою Генадзя. Той стаіць побач, усклаўшы правую нагу на пуфік, масіруе даланёю лытку.

— Даймае? — пытаецца Тадэвуш Піліпавіч і моршчыць твар ва ўсмешцы. — Схадзіў бы ты, можа, Генусь, усё-такі да доктара? На месцы, не за сем мораў сунуцца, як нам колісь было ў нашых Дзерваедах.

У Генадзя, нягледзячы на ўзрост далёка не старэчы, праблема з суставамі. Але наведацца ў паліклініку яму ўсё з-за розных бізнес-справаў не выпадае. І Тадэвуша Піліпавіча такая сынава абыякавасць да ўласнага здароўя і непакоіць, і, папраўдзе, раздражняе. Хоць ён і ўсяляк стараецца гэтага не дэманстраваць, а толькі, кіруючыся агульнавядомаю ісцінай, што са сваім статутам у госці не ходзяць, абмяжоўваецца калі-нікалі кароткімі, ненавязлівымі павучаннямі.

— Нічога, не век жа будзе даймаць. Падаймае і перастане, — кажа Генадзь.

— Ну, дай-то Бог. Але ж штосьці доўга не перастае. Глядзі, каб на што горшае не перарабілася.

— Не пераробіцца, не бойся. Анітка не тэлефанавала?

— Што тэлефанаваць, калі толькі ўчора тут собскаю персонай была? Толькі лішнія выдаткі з гэтых частых тэлефанаванняў. Вунь, кажуць, зноў днямі тарыфы на перамовы ў эмтээсе падскочылі… А чаму раптам пытаешся пра яе?

— Ды так, — кажа Генадзь і пачынае масіраваць другую нагу. Па тым, як ён глыбока раз-пораз уздыхае, бачна, што размову пра пляменніцу ён пачаў не выпадкова і аднымі ўздыхамі справа не абмяжуецца.

— Кажы ўжо, што муляешся, — падбухторвае сына Тадэвуш Піліпавіч. Ён ужо добра адышоў ад сну і адчувае сябе даволі бадзёра не толькі каб гаварыць ці задаваць пытанні, але і ўважліва слухаць, і пачутае належным чынам успрымаць.

Генадзь колькі хвілін маўчыць, затым адкасвае калашыну, пачынае імкліва хадзіць па пакоі.

— Ёсць размова, бацька, — кажа з загадкавым выглядам. — Толькі ж глядзі — між намі…

— Наконт хлопца гэнага, Іллі, ці як яго там?

— І наконт хлопца таксама. Толькі, мабыць, не тое, што ты падумаў. Думаеш, з Аніткаю што-небудзь здарылася? Што, можа, зацяжарыла яна? Дык не хвалюйся дарэмна, не такая Аніта дурніца, каб па дробязі заляцець… Дзеўка не промах, дарма што з выгляду быццам кулёма. Ды і не дзіва пры такой матцы, як Ілона.

— А што Ілона?

— Нічога… проста ўзгадаў да слова. А ты вось нешта заўсёды, Піліпавіч, як толькі зойдзе пра яе размова, перапытваеш, быццам намякаеш на што…

— Я намякаю? На што?

— Ну, не ведаю, ці мала на што можна… Адкуль мне ведаць.

Тадэвуш Піліпавіч на хвіліну адварочваецца, быццам прыслухоўваючыся да чыіхсьці крокаў, а насамрэч — толькі каб не спатыкацца з сынам паглядам.

Пра тое, як заспеў ён Генадзя з Ілонаю на тады яшчэ цалкам сваім лецішчы ў абдоймах адно аднаго год шэсць таму, сын, хутчэй за ўсё, і па сёння не ведае. Хаця, мяркуючы па гэткіх вось выразах, што толькі што зляцеў з ягоных вуснаў, магчыма, смутна і здагадваецца.

Тадэвушу ж Піліпавічу распачынаць з Генадзем размовы на гэтую тэму зусім не хочацца. Калісьці — што было, тое было — меў такі намер. Але з часам усё яно, тое непрывабнае падгледжанае на лецішчы неяк само сабою адышло на дзясяты план, зрабілася нецікавым. Як любяць казаць прасунутыя Генадзевы сыны — перастала чапляць.

І, напэўна, дзякуй богу, што перастала. Бо што казаць даросламу чалавеку, такую размову пачаўшы? Ушчуваць яго? Выхоўваць? Лаяць? Тым больш рабіць гэта цяпер, калі гэтулькі і свайго непрывабнага на свет Божы панавыплывала… Якому хаця б збольшага неяк даць рады, прывесці да суладдзя з сумленнем…

— Дык што ты мне сказаць хацеў?

— Што? Вось не паверыш, калі скажу. Але слухай… Словам… такія, бацька, пірагі: стаўся да гэтага, як хочаш, хочаш — смейся, хочаш — асуджай, але ў нас з Юляю склалася ўражанне, што гэта яны ўдваіх з Іллёй скралі грошы.

— Анітка з Іллёй? Ого, сыне… Ну ж навіна! Ад такой навіны і вобзем можна грымнуцца. Ого! Ну… а доказ хоць які маеце?

— Ды што той доказ. Логіка падказвае. Сам падумай… Нічога ў кватэры не перакулена, не зрушана з месца, быццам ведаў чалавек, дзе што ляжыць, і праменька туды і ішоў. Зноў жа, уваходныя дзверы так спрытна адамкнёныя, як ключом усё адно… І пры гэтым каб шнарык дзе на замку застаўся, каб драпінка. Хіба не дзіўна ўсё гэта? Потым — паводзіны Аніціны… Ведаеш, што яна сказала мне па тэлефоне? Што прэтэнзій да мяне з-за нясплаты бацькавай часткі ад продажу тваёй кватэры мець не будзе. Разумееш: пра грошы загаварыла, а я ж нікому пра іх не казаў. Хіба ты, можа, прагаварыўся?

— Не, я таксама нічога не казаў. Але калі так, то чаму яна гэтак зрабіла? Навошта ёй было красці тыя тысячы, калі ўсё адно яны ёй належалі?

— А вось і не ўсё адно… Ты не ўсё ведаеш. Не ведаеш, што мы з ёю напярэдадні майго ад'езду ў Балгарыю пасварыліся. Не ведаеш? Ці, можа, сказала?

— Не, нічога не казала.

— Дык вось — пасварыліся. Надта ж мне падчас размовы ў той дзень адно яе з'едлівае выказванне на Юлін адрас не спадабалася… І я ў дурным запале і плявузгнуў, што, маўляў, вось вазьму ды і не аддам таго, што ты мне з Міронавае згоды пазычыў, тых клятых даляраў. Маўляў, дакументальна пазыка не афармленая, папер ніякіх няма, дык і праз суд нічога не спагоніш. Словам, шантажнуў… Бачыў бы ты, як з твару дзеўка перамянілася. Літаральна спалатнела. Так, здалося мне, перанялася тою смешнаю пагрозаю, што я ўжо і пашкадаваў нават, што гэтак сказаў.

Тадэвуш Піліпавіч колькі часу неўразуменна глядзіць на сына.

— Ну, мала што перанялася, — кажа і паціскае плячыма. — Хіба гэта доказ, што яны скралі? Ды і пра пярсцёнак ваш не магла дзяўчына не ведаць. Усе сваякі, у тым ліку бацька з маткаю, ведалі, а яна — не? Быць такога не можа.

— А можа, яны якраз знарок пярсцёнак не ўзялі, каб падазрэння пазбегнуць? Можа, гэта ход такі іхні хітры? — не пагаджаецца Генадзь і ідзе на двор заводзіць аўто. — Хіба так не можа быць?

— Напэўна, можа, — не маючы больш ахвоты спрачацца, адказвае Тадэвуш Піліпавіч і ідзе следам за сынам. — Быць шмат што можа, ды не абавязкова ж бывае. Як-ніяк сваякі…

— Ага, сваякі… Толькі чамусьці крымінальную хроніку як ні паглядзіш па тэлевізары, дык дзевяноста адсоткаў забойцаў, рабаўнікоў і злодзеяў — усё яны, сваякі, — кажа Генадзь і акуратна — трымаць сябе ў руках нават падчас самых бурных спрэчак ён умее — вырульвае на гравійку.

— А я? — роспачліва гукае Тадэвуш Піліпавіч і кідаецца наўслед аўто.

Машына даязджае да першага дрэва, спыняецца.

— Ну, бацька, нервы ў цябе — ні к чорту! Спрасоння ты гэткі, ці што? — Генадзь высоўвае галаву з салона, але вылазіць не спяшаецца. — Ад'ехаўся дзесяць метраў — і ўжо гэтулькі панікі… Збірайся паціху, а я ў пасёлак па цыгарэты пакуль што з'езджу. Браў пачак з дому, ды, мабыць, дзесьці пасеяў, як заязджаўся на запраўку.

У доме даволі прахалодна, і гэта неяк адразу Тадэвуша Піліпавіча супакойвае, настройвае на філасофскі лад. Што пасля непрыемнай размовы з Генадзем пра ўнучку і яе хлопца вельмі нават дарэчы. Тым больш дарэчы, што, папраўдзе, як бы ні было яму тут, на гэтым чужым, закінутым лецішчы, часам непамысна і самотна, з'язджаць у горад таксама не хочацца.

Зрэшты, так у яго, невыпраўнага дамаседа Тадэвуша Дзерваеда, заўсёды: варта хаця б пару дзён у нейкім, нават калі яно і зусім яму чужое, месцы прабавіць, як ужо пры расстанні з ім няведама адкуль і з чаго з'яўляецца маркота. Што і дзіўнавата, бо празмерна чуллівым ён ніколі, колькі сябе памятае, здаецца, не быў. Апроч, бадай, таго вар'яцкага лета, калі загінулі на рацэ Міхалка і Броня. Але там было, канешне, іншае. Ад згадкі пра якое не толькі даць волю ўласнай чуллівасці, а і па шыю горкімі слязамі заліцца было б не толькі тады, а і сёння, далібог, не грэх.

Не грэх было б, ды вось жа штосьці не заліваецца. Ды, больш за тое, яшчэ так адстаронена, так абыякава тое рачное страхоцце шматгадовае даўніны ўзгадваецца, быццам зусім ён да яго не мае дачынення. Пера-

малолася, перагарэла — час не толькі лекар, але і магільшчык яшчэ той, аказваецца.

Гудзенне даносіцца да вушэй Тадэвуша Піліпавіча, аддаецца ў вушах ледзь улоўнымі перападамі тонаў. Суцішыцца на імгненне, і вось зноў трымціць-гудзе, бы туга напятая, патрывожаная дотыкам пальцаў драціна.

Такім надакучлівым, працяўным гудзеннем звычайна нагадвае пра сябе ў гарадской кватэры няспраўнасць водаправоднага змяшальніка. Але ж тут, на гэтым лецішчы, водаправода няма. Ды і дроту, калі не лічыць вусікаў на коміне па-над дахам дома пасля таго, як пашчыравалі там гора-рамонтнікі, — таксама. Быццам зумер недзе спрацоўвае, а дзе — нізавошта не здагадаешся.

Гудзенне, здаецца, зыходзіць з-пад ложка, і ён нахіляецца долу, каб туды зазірнуць. Але нічога там, апроч пылу і бруднай пластыкавай скрынкі для захоўвання анучак, ваксы і іншых прычындалаў для догляду за абуткам, не бачыць.

Раптам гудзенне сціхае, змяняецца дрогкім шубуршэннем, што зыходзіць, без сумневу, акурат з нетраў скрынкі.

Тадэвуш Піліпавіч выцягвае скрынку на святло, рэзкім рухам рукі здымае з яе накрыўку.

Пухнаты чмель з кароткімі паўсцінкамі на таўсматым, як у па-зімоваму апранутага калгаснага вартаўніка ў старых савецкіх фільмах, тулаве з незадаволеным гудзеннем падпаўзае да краю яе, колькі часу няўклюдна мітусіцца сюды-туды ў пошуку шляху да волі. Затым нечакана порстка здымаецца з месца, пакружляўшы хвіліну-другую пад столлю, заціхае пры люстры.

Тадэвуш Піліпавіч думае, што няблага, напэўна, было б расчыніць акно ды выпусціць жамярыну на двор, але гэта зрабіць немагчыма. Бо форткі ва ўсіх вокнах

шчыльна заканапачаныя, а рамаў з шыбамі на кожным — па дзве. Другія ён самаруч прывалок сёння ўранні з падпола і ўставіў, атрымаўшы напярэдадні па тэлефоне, падчас размовы наконт сканчэння тэрміну кватаранства, гэткую просьбу ад гаспадыні лецішча. Дурніца, відаць, усур'ёз думае, што падвойныя вокны ў доме памогуць засцерагчыся ад злодзеяў. І ён адгаворваць кабеціну не стаў, зрабіў, як прасіла. Балазе паабяцала налета, калі раптам ён пажадае, пусціць у дом пажыць і, можа, нават не так, як цяпер, — за грошы, а зусім без усялякай платы.

Тым часам чмель выпаўзае з-пад споду люстры на столь, распачынае нанова працяглае сваё, манатоннае, як покліч муэдзіна на ранішнюю малітву, гудзенне. Цяпер, калі ён вісіць дагары нагамі на адлегласці выпрастанай рукі ад галавы Тадэвуша Піліпавіча, паквітацца з ім за ўсе ягоныя (ці кагосьці з ягоных суродзічаў) начныя выкрутасы было б зусім няцяжка. Нават мухабойкі не трэба, дастаткова пстрыкнуць пальцам ці прыціснуць гэты таўсматы жывы камяк з дапамогаю шматка паперы або якой анучкі да калянай паверхні столі так моцна, каб аж хруснуў ён, каб аж пырснуў ва ўсе бакі нагулянымі за нядоўгі свой век сокамі.

Шматок паперы ён заўважае на падваконніку. Хапае яго пальцамі, падносіць угору, да таго месца на столі, дзе корпаецца чмель. Спрытна падторквае яго пад брушка і ножкі чмяля, але, замест таго, каб тут жа не марудзячы ажыццявіць тое, пра што думаў хвілінаю раней, пачынае моўчкі назіраць за жамярынай. Чмель хвіліну-другую сядзіць нерухома, затым, страпянуўшыся ўсім целам, жвава ўспаўзае на паперчыну. І потым увесь час, што патрабуецца Тадэвушу Піліпавічу, каб дайсці з паперкаю перад сабою да дзвярэй у калідор і далей з калі-

дора на двор, паслухмяна, быццам упэўнены, што кепскага яму не зробяць, сядзіць на ёй. Сядзіць да часу без руху, праўда, з растапыранымі крыламі.І, як толькі Тадэвушава нага ступае на маснічыну ганка, усхопліваецца з месца і знікае за рогам дома так хутка, што Тадэвуш Піліпавіч і вокам не паспявае міргнуць.

Генадзева аўто зноў уязджае на панадворак. Збіты з панталыку хітрымі чмялёвымі паводзінамі Тадэвуш Піліпавіч колькі хвілін неўразуменна глядзіць на сына.

— Ну, дык што там усё-такі з Анітаю? — пытаецца, вяртаючыся, нарэшце, у яву. — Што-небудзь збіраешся высвятляць?

Генадзь акуратна, як ён і ўсё робіць, што датычыць аўто, адчыняе багажнік.

— Ну, скажаш — высвятляць, — зазначае порстка і заводзіць матор. — Такія рэчы, бацька, добра, калі праз дзясятак год высвятляюцца. Выпадкова як-небудзь, бы між іншым, як няўрокам прагаворыцца, можа, каторая з дзейных асобаў… А бывае, што і ніколі не высветляцца, так і застаюцца пад сямю замкамі. Вунь колькі ўсяго навокал страшнага ды нялюдскага адбываецца — і што мы пра тое ведаем? Эх… Калі Анітка з Іллёй гэта зрабілі, дык адно тады добра ўсё-такі — што не чужыя тваім кроўным скарыстаюцца. Праўда? Як думаеш? Добра гэта?

Апошняга Тадэвуш Піліпавіч якраз і не ведае, і Генадзева пытанне, так і не атрымаўшы адказу, патанае ў працяжным, як нядаўняе гудзенне чмяля ў скрыні з рызцём, гуле легкавіка.

А пятай ён дома. Кватэра сустракае яго пахам нежылога памяшкання і воблакам пылу, што, асветленае сонцам, вольна, бы рухлівы шарык з драбінак смецця

ў нерухомай вадзе става, гайдаецца ў паветры. Разпораз буркатліва нагадваюць пра сябе батарэі ацяплення, ды чутно, як мітусіцца, грукае абцасамі па падлозе ў кватэры вышэй няўрымслівая суседка. Дом даволі стары, дзірававаты, вось і даводзіцца цярпець усе яго — ад перагуку батарэй да шуму вады ў чужой прыбіральні — нязручнасці. Асабліва даймаюць яны Тадэвуша Піліпавіча цяпер, калі застаўся адзін, без жонкі. Папраўдзе, гэткага надакучлівага побытавага непамысноцця хапала і раней, пры Карольці. Але ўдваіх пераадольваць яго было куды лягчэй. Нават тады, калі злосць між імі (і такое, вядома, здаралася) з-за рознасці поглядаў на нейкую справу зашкальвала і ні аднаму, ні другому давесці сваёй праўды не ўяўлялася магчымым, захоўваць філасофскі падыход да ўсяго на свеце было значна, значна прасцей. Словам-другім старэчы перакінуліся, пажартавалі, паперастарэкваліся — і ўжо, глядзіш, весялей, і ўжо нават самае гідкае ды паганае і ўспрымаецца не так востра, і, галоўнае, забываецца нашмат хутчэй.

Як ні дзіўна, але згадка пра жонку вяртае Тадэвуша Піліпавіча не да часоў прамінулых, а да нядаўняга колькідзённага побыту на чужым лецішчы. Што даведаўся ён новага падчас яго пра далёкія гады ўласнае маладосці? Пра тыя яе дэталі, пра якія варта было б распавесці ў якасці прыкладу ці, наадварот, перасцярогі маладым наступнікам, што з дня ў дзень, хто адносна паважліва, з пашанотаю (ці хаця б удаваннем яе) да досведу прашчураў, хто, наадварот, з поўным ігнараваннем, а то і непрыманнем яго чакае свае чаргі на галоўную ролю на авансцэне жыцця? Усіх гэтым самаўпэўненым, скептычна-іранічным Іллям, Анітам, Максімам ды Ілонам, якія, нягледзячы на сваю прасуну-

тасць, паўтарэння памылак продкаў, як бы ні стараліся, пазбегнуць не здолеюць. Дай жа Бог, каб усё-такі здолелі, ды штосьці не надта ў тое верыцца. Зрабіць грунтам уласных учынкаў чужы досвед мала каму дадзена. Бо ён — бы тое рэха: чуцён, а не схопіш, не прысабечыш. І тым больш — не перайначыш, не пераробіш на ўласны густ.

Канешне, на большае спадзяваўся ён, ад'язджаючы на гэнае недагледжанае чужое лецішча. Што, можа, сякія-такія старыя вузлы ўрэшце разблытаюцца і ўсё, як цяпер модна казаць, пазламі ў адзінае, ладненькае цэлае складзецца.

Не надта, аднак жа, як бачна, склалася. Бо некаторыя з вузлоў не толькі не разблыталіся, а, наадварот, яшчэ ці не тужэй пазавязваліся. Зрэшты, яшчэ не вечар, і Бог ведае, якімі яшчэ вузламі-шкілетамі лёс у дадатак да тых, што выявіліся, пацешыць.

Хатні тэлефон адзываецца з калідора. Ускалыхнутае крокамі Тадэвуша Піліпавіча воблака пылу разбэрсваецца ўбакі, павольна асядае на знэнджаныя доўгаю адсутнасцю гаспадара прадметы і рэчы.

Яму чамусьці здаецца, што гэта тэлефануе Ніна Іванаўна. Але згадка пра тое, што хатнімі ж нумарамі яны не абменьваліся, а толькі мабільнымі, падказвае: не, мабыць, хтосьці іншы.

— Ну, дзядуля, ты даеш, аднак, — голас Аніты гучыць дакорліва, але разам з тым неяк быццам лянiва. Быццам і абыходзіць дзяўчыне штосьці, і разам з тым і сказаць пра гэта яна не хоча. — Вярнуўся з лецішча і сядзіш сабе дома ціхутка, усё адно як і няма цябе. Хоць бы азваўся… Няйначай, па кабеціне той, што наведвала цябе там, у тым страхавітым дачным доме, сумуеш. Сумуеш, праўда ж, прызнайся? Дарэчы, тут мама побач, хоча штосьці таксама табе сказаць.

У адрозненне ад дачкі, Ілона гаворыць хутка-хутка, задыхана, быццам яна толькі што бегла праз перашкоды немаведама колькі вёрстаў. Так звычайна ў яе бывае, калі яна хвалюецца ці калі нешта надта ёй абыходзіць. Гэтым разам абыходзіць нявестцы, як становіцца зразумела далей, крадзеж у кватэры Генадзя.

— Вы, тата, думайце сабе, як хочаце, але мы, я і Мірон, лічым, што, калі кража і была, дык здзейсніў яе не хто іншы, як… сам Генадзь. Гэта, вядома ж, усяго толькі прыпушчанне, таму і ў вушы, зразумела, нікому ўводзіць не трэба. Барані бог! А то скажаце — і пачнецца вэрхал, і застанемся мы з вамі без віны вінаватыя. Так атрымаецца, быццам мы такія ўжо нелюдзі, што толькі пра грошы і думаем. Дык і не будзем наогул больш пра гэта гаварыць. А дарэчы, тата, Аніта праўду кажа: што гэта вы нас неяк зусім быццам ігнаруеце? Прыехалі і маўчыце, як вады ў рот набраўшы. Патэлефанавалі б ужо хоць, ці што… А то думай-варажы, ці жывы вы там, ці, можа, памерлі ўжо…

Тадэвуш Піліпавіч шчытней, як заўсёды робіць гэта падчас размоваў з Ілонаю, каб не бачыць нервовага лекацення ўласных рук, прыціскае да вуха слухаўку. Хоча выгукнуць у адказ “не дачакаецеся”, але, ацвярэзены думкаю, што жарт, бадай, занадта ж будзе зацяганы, толькі ляніва — ці не халерная апатыя чарговы раз нагадвае пра сябе — пазяхае. Хоць успрымаць усур’ёз балбатню жанчыны яму не хочацца, але і нажываць ворага праз няўвагу да таго, што нараджаецца ў яе разгарачаных дзікім падазрэннем глуздах, — таксама. На шчасце, размова з Ілонаю працягваецца нядоўга.

Тым часам стук абцасаў наверсе з кожнаю хвілінаю робіцца ўсё больш гучным: у суседкі, відаць па ўсім, на падыходзе момант найбольшае актыўнасці. “І трэба ж гэтак грукаць… Гарцуе па памяшканні,

непапушчы конь па пожні, ад аваднёў ратуючыся”, — думае Тадэвуш Піліпавіч і куляецца ніцма на ложак.

А праз колькі хвілін ён ужо так моцна спіць, што ні грукату ўгары, ні перагуку клаксанаў аўто ў двары не чуе. І прачынаецца на момант толькі тады, калі падае ў сне на дах індычатніка з самае высокае ў Дзерваедах таполі, што хінулася калісьці кронаю акурат да страхі іхняе пуні. І тут жа зноў, заспакоены, што гэта ўсяго толькі сон, а не дурная ява, засынае. Толькі гэтым разам яшчэ больш моцна, з такою колькасцю каляровых ды чорна-белых відзежаў засынае, што, калі, прачнуўшыся пад ранне ад холаду ў нагах (увечары не парупіўся як след накрыцца), спрабуе дэталі першага, з таполяю і індычатнікам, сну хоць збольшага ўзгадаць, — усё дарэмна.

ЦЫМАНТ

Аповесць

1

Тэлефон Клімовічаў адазваўся за трэцім разам — натужліва, перарывіста і разам з тым неяк надта глуха, як з падмосця. «Ну, нарэшце… Каб жа толькі не Павел», — падумала Нана і шчытней, быццам ад гэтага магло залежаць, хто на тым канцы проваду падасць голас, сястра або швагер, прыціснула слухаўку да вуха.

Паўла Клімовіча, мужа сястры Алы, яна недалюблівала даўно — не ў апошнюю чаргу з-за пацвельванняў з яе нетутэйшага, грузінскага імя і тутэйшай мовы, якую ён, сам найтутэйшы з тутэйшых, чамусьці цярпець не можа, а апошнім часам, пасля крывавых падзей ва Украіне, дзе Нана з сястрою і маці калісьці, год трыццаць таму, аселі пасля Зугдзідзі перад вяртаннем на радзіму, і наогул іначай як бандэраўскай не называе. І хаця пасля некалькіх даволі жорсткіх перапалак на гэты конт дамовіліся рызыкоўнай тэмы больш не кранаць, яна ўсё адно ў гамане на хвалі эмоцый не-не ды і вытыркнецца, джгне ў глузды асцюком узаемнага неразумення.

Але асабліва ўзмацнілася непрыязнасць Наны да швагра пасля таго, як ён паспрабаваў чапляцца да яе падчас другой цяжарнасці жонкі. Нана па-сваяцку ўзахвоцілася тады памагчы яму па гаспадарцы, пакуль Ала знаходзілася ў бальніцы, а ён, не доўга думаючы, і распусціў рукі. Меркаваў, напэўна, што калі яна афіцыйна незамужняя, жыве з Раманам у грамадзянскім шлюбе, дык і на ягоныя дурныя заляцанкі-дамаганкі паквапіцца. Аж пакуль не зарабіў аднаго разу каленам у пахвіну, увайшоўшы да яе позна ўвечары ў пакой пасля ванны амаль што голы, з вузкім пасам ручніка вакол цяглістых, зарослых валоссем сцёгнаў. Назаляць, праўда, ад тае пары перастаў, але прыкры асадак у яе ў душы, хоць сястры пра гэны выпадак ні словам не абмовілася, застаўся.

Можа, і дарэмна яна тады нічога Але не сказала. Ды Бог ведае, як яно насамрэч лепш. Яны пасварацца, пару з ратоў выпусцяць, пасля ўвадначас паміраццa, а ты ў дурнях, без віны вінаватая авечка, застанешся — вядомая гісторыя. А што да Алы, дык не сляпая, дзякуй богу, і без яе сястрынскае падказкі пра мужыковы шуры-муры неяк дала рады дазнацца. І чым усё скончылася? А нічым асаблівым. Пабілася колькі дзён маладзіца ў істэрыцы, падзьмулася, палямантавала, паенчыла, узняла сабе ды ўсім наўкола нервы, а потым і даравала любаму здрайцу, быццам нічога і не здарылася. А можа, толькі выгляд зрабіла, што даравала: жанчыне адной з дваімі дзецьмі застацца, вядома ж, не мёд. Тым больш калі мужык не п'яніца і не абібок, наадварот, спраўны гаспадар: усё дзеля сям'і, усё ў хату.

Зрэшты, гэтае *ў хату ўсё* — таксама як на чый густ. Добра, як абое сужэнцы аднае пожні зёлкі, падобныя. Тады — канешне, добра. А, напрыклад, ёй, Нане, на гас-

падарчых клопатах надта не зацыкленай, які б увішны ды цвярозы ні быў заўсёды Павел, аддаць яму перавагу перад легкадумным прыхільнікам чаркі Раманам і ў голаў бы ніколі не прыйшло.

Голас на провадзе, да радасці яе, аказаўся не Паўлаў.

— Відаць, на лініі нейкая няспраўнасць. Званок чую, а здыму слухаўку — каб табе гук у адказ. — Акуратыстка Ала, аднадумца мужа ў стаўленні да мовы — ці не адзінае, у чым яны з Паўлам хоць збольшага заўжды салідарныя, — гаварыла ціха, але выразна, старанна вымаўляючы кожнае слова, як школьніца, што чытае па паперцы падрыхтаванае да ўрока хатняе заданне.— Дык датэлефанавалася таму дзядзьку, Станіславу Міхайлавічу? Не?

— Мікалаевічу, — паправіла сястру Нана. — Станіслаў Мікалаевіч ён, а не Міхайлавіч… Так, датэлефанавалася.

— І што ён сказаў?

— Нічога. Неяк дзіўна ўсё… Жанчына адказала. Мяркуючы па голасе, зусім маладая. Дачка, можа, ягоная ці ўнучка. Спачатку сказала, што пакліча яго. Затым, праз пару хвілін, — што няма яго дома і што яна не ведае нават, калі ён вернецца. А потым і наогул пачала штосьці заікацца ды блытацца ў словах, неўпапад адказваць. Такое ўражанне было ў мяне падчас размовы, быццам хтосьці побач з ёю стаіць і нашэптвае, *што* адказваць, а яна ніяк не дасць рады дачуцца ды як след у тых падказках сарыентавацца…

— А можа, ты сама памылілася нумарам? Не? Паглядзі яшчэ ўважліва.

— Ды не. Калі б памылілася, то навошта б тады было ёй, той дзеўцы, казаць напачатку, што пакліча яго? Я ж імя назвала — Станіслаў Мікалаевіч… Была б па-

мылка — яна сказала б, што няма такога. Не-не, штосьці там не так. Сама падумай: напрасіўся ні з таго ні з сяго на знаёмства, а цяпер пачынае круціць духамі. Быццам і хочацца яму, бач, пагаманіць, і колецца…

— Заінтрыгаваў, аднак, гэты старэча… Ну дык што, яшчэ патэлефануеш, можа, яму?

— Мабыць, патэлефаную. — Нана хвіліну памаўчала. — Але не сёння ўжо. Хіба што з раніцы заўтра паспрабую. А дзясятай, можа, ці крыху пазней. Трэба ж давесці справу да канца, каб потым, як раптам што, не муляла. А не захоча зноў гаварыць — няхай, яго справа, не мы першыя да яго звярнуліся…

— Добра. А я табе неўзабаве пасля таго, як з ім стыкуешся, прыкладна а адзінаццатай, бомкну. Раскажаш, што ды як. Цікава ж усё-такі… Калі раптам зноў, як сёння, якія непярэліўкі з тэлефонам здарацца, сама мяне набяры. Чуеш? Абавязкова. Буду чакаць. Ад Паўла і хлопцаў табе прывітанне.

— Дзякуй, як яны?

— Добра, што ім зробіцца… Паелі ды сядзяць вунь пры тэлевізары, фільм нейкі пра серыйныя забойствы глядзяць. За вушы, што бацьку, што сыноў, ад скрыні не адцягнуць. Аж млеюць усе трое ад задавальнення, на тыя жахі гледзячы. Папрасіла суцішыць гук — нават не схамянуўся ніводзін. Ну, дабранач!

— Дабранач! — Нана паклала слухаўку, змахнула мімаходзь даланёю з ісподу апарата павуцініну, якую заўважыла яшчэ надоечы, але ўсё забывалася, растузаная хатнімі клопатамі ды думкамі пра таемнага Станіслава Мікалаевіча, прыбраць, пайшла ў залу.

У зале было прахалодна і неяк няўтульна. «Мабыць з-за гардзінаў гэтых новых… Шэры колер ёсць шэры,

дарэмна не паслухала прадавачкі і тыя весялейшыя бэжавыя фіранкі понізу яшчэ прычапіць не купіла», — падумала Нана і схілілася ў задуменні перад камп'ютарам. Адкрыла паштовую скрыню, прабегла збольшага вачыма па тэксце першага ліста ад Станіслава Мікалаевіча.

Вось з яго, уласна, з гэтага ліста, усё і пачалося. Хаця не — пачалося раней, у той вечар месяц таму, калі патэлефанавала ёй прыяцелька з працы, сказала, быццам праз сацыяльныя сеткі яе або Алы адрас расшуквае нейкі мужчына — ці то сваяк, ці то знаёмы іх маці.

Гэта было дзіўна, бо ні пра якіх сваякоў, ні пра знаёмых нябожчыца маці, Ксеня, жанчына даволі лагодная і разам з тым валявая, а то нават часам і вунь як спарудліва-непрыступная, пакуль была жывая, ім з Алаю ніколі нічога не казала. Больш за тое, наогул не любіла пра іх згадваць і злавалася, калі гэта рабіў хто іншы. Варта было каторай з дачок хоць бы і незнарок зачапіць у размове тэму сваяцтва, як яна тут жа замыкалася ў сабе ды змаўкала так надоўга, што, здавалася, да скону ўжо так і будзе хадзіць маўчком. Канешне, з часам мякчэла, адпускалася, але колькі перажыванняў, колькі непрыемных хвілін ім, сёстрам-падлеткам, усё тое матчына зацятае, незразумелае маўчанне каштавала!

Што яна ад іх хавала? Якую таямніцу гэтак зацята аберагала, што нават дочкам, якіх, безумоўна, любіла, хоць надта, праўда, і не песціла, не палічыла мажлівым яе даверыць? Даходзіла ж часам і да кур'ёзаў. Неяк аднаго разу ў школе абвесцілі для вучняў конкурс на лепшы радавод. Дык рэакцыя маці на іх з Алаю намер скласці свой аказалася такою непрыязнаю, што і вокам яны не паспелі міргнуць, як падрыхтаваны для запісаў

яе меркаванага расповеду пра продкаў нататнік куляю паляцеў у сметніцу.

Гэтаксама нервова ставілася яна і да іх роспытаў пра бацьку. «Яго няма», — адказвала шторазу і, даючы знаць, што размова скончана і працягваць яе не мае сэнсу, строга падцінала тонкія свае, у нітачку, вусны.

Такі адказ іх, канешне ж, не задавальняў. Аднак гучаў ён так няўмольна і разам з тым так пераканаўча, што іншага выйсця, як хаця б дзеля выгляду даць веры, што ўсё сказанае Ксеняй — праўда, ды змірыцца з тою праўдай, у іх не заставалася. І што цікава, між іншым, — змірыцца без уласцівага гэткага кшталту сітуацыям пачуцця крыўды ці пратэсту, а наадварот — з інтуітыўным, падсвядомым адчуваннем таго, што калі маці гэтак робіць, то гэтак і след, бо робіць яна тое не з нейкае там дурное прыхамаці, а адзіна дзеля іх жа, дачок, дабра.

Калі праз нейкі час, значна пазней ужо, па сканчэнні школы, яны ўсё-такі паманулiся ўзнавіць размову, яна абарвала іх імпэт яшчэ больш рашуча. І ад таго часу яны ўжо да тэмы пра бацьку пры ёй наогул не вярталіся. Пагаманіць міжсобку, ціха, употай ад Ксені — гэта колькі душа пажадае, але толькі не ў яе прысутнасці. Гэтак яны і рабілі, міжволі прыходзячы з узростам да высновы, што, мабыць, не слаба ж ён, бацька іх, чымсьці жанчыну пакрыўдзіў, калі нават і слухаць пра яго не жадае. Ці, наадварот, можа, яна яго пакрыўдзіла. І так здараецца. Мужчыны — стварэнні крыўдлівыя. Не ўсе, вядома, але ж многія, многія… Не дагадзіла жонка, той жа чаркі, скажам, не наліла дзеля пахмелля ці яшчэ чым абдзяліла — і адыходзіць чалавек у прочкі, і прачкаванне тое часам на ўсё жыццё зацягваецца. Так і сканае бядак дзе-небудзь наводшыбе ад сям'і.

І вось — іх з сястрою расшукваюць. Першае, што прыйшло ў той вечар Нане ў голаў, — ці не бацька гэта іх шукае? Між іншым, і пра Рамана таксама яна тады мімаходзь узгадала: ці не пажартаваў гэта ён з бадуна, папрасіўшы каго-небудзь падаць запыт на росшук? Тры гады, як разышліся-разбегліся з ім, а колькі нерваў за гэты час выцягнуў, не даючы праходу, даймаючы просьбамі пачаць усё нанова. Урэшце, збітая з тропу нечаканасцю, яна надыктавала-такі прыяцельцы свой электронны адрас, і тая даслала яго незнаёмцу. І зусім хутка, літаральна на наступны дзень, Нана і атрымала ад яго вось гэты допіс.

Адстаронена-ветлівы — ні намёку на эмоцыю — ліст, бездакорна ўважны, сухаваты і крыху быццам нясмелы, як першы роспіс Дзеда Мароза на не аб'інелай дарэшты на пачатку зімы шыбіне. Яго прозвішча Парфянок, зваць Станіслаў Мікалаевіч. Ён добра ведаў іх маці, шмат год з ёю ліставаўся і цяпер, калі яе ўжо няма, хацеў бы наладзіць хаця б якую-ніякую сувязь з яе дочкамі. Калі яны, вядома, не супраць. Яму сёмы дзясятак, у такім узросце спадзявацца ў стасунках з людзьмі на *ўзаемную* (гэтае слова так і было ў лісце пададзена — курсівам) зацікаўленасць — справа марная, але гэта для яго не галоўнае. Адпішуць яны яму — будзе рады, а не пажадаюць адпісаць — іх воля. Ні хто ён ды адкуль, ні пра акалічнасці знаёмства з маці ў лісце не было ні слова. Некалькі фраз, пажаданне добрага здароўя напрыканцы — і ўсё.

Параіўшыся па тэлефоне з сястрой, Нана ў той жа дзень Станіславу Мікалаевічу на ягоны электронны адрас адпісала. Папрасіла распавесці больш падрабязна пра сябе і пра тое, што лучыла яго з маці. З'яўлялася хоць нейкая мажлівасць натрапіць на след у мінулае

нябожчыцы Ксені, а праз тое — і ва ўласнае, і не скарыстацца ёю, адзінадушна вырашылі яны з Алаю, было б неразумна.

А рэшту таго дня Нана прабавіла ў пошуках згаданых старым лістоў да маці. Перагартала ўсе сямейныя альбомы, перашнарыла ва ўсіх шафачках ды шуфлядках і паліцах, але так нічога і не знайшла. Розных допісаў, тэлеграм, паштовак было ўсюды ў доме аж зашмат, а вось хоць бы маленечкай цыдулы ад чалавека па прозвішчы Парфянок — ані блізка.

Станіслаў Мікалаевіч зноў напісаў ёй праз тыдзень. Але яшчэ больш коратка і суха, чым мінулы раз, неяк нават быццам нехаця, праз сілу. Пытанне пра абставіны знаёмства з маці дыпламатычна абмінуў, пра сябе паведаміў тое, што і з папярэдняга ліста вынікала, толькі іншымі словамі.

Адзінае, што новага было ў допісе, дык гэта намёк аб спадзеве на сустрэчу ў будучыні. І яшчэ — просьба даслаць нумар хатняга тэлефона. Свайго ці Алінага — яму без розніцы, галоўнае правільна напісаць код горада, бо з кодамі заўсёды ў яго, маўляў, непаразуменні. Мабільнікам ён таксама, канешне ж, карыстаецца, але гаманіць з хатняга — і ўтульней неяк, і больш для яго, старога чалавека, звыкла.

2

Станіслаў Мікалаевіч расплюшчыў вочы, прыслухаўся. На дварэ было зусім ціха і, відаць па ўсім, і бязветрана. Гэта яго ўзрадавала: нарэшце можна будзе на колькі хвілін, а то і на якую гадзіну выйсці з дому, зрабіць, як кажа Зіна, кватарантка, ранішні праменад. Толькі б не зблытала картаў, не разгулялася, як учора надвячоркам, калена і не даў аб сабе знаць, не схібіў

недарэчы матор — сэрца. Шнарамі яно там ужо, халера, дарэшты пабілася, што гэткім болем раз-пораз у грудзях абзываецца і, як на злосць, у самы ж нязручны момант? Варта чаму іншаму, прастаце гэтай мярзотнай, да прыкладу, ці калену, ці яшчэ чаму хоць крыху абвастрыцца, як і яно, аслабленае леташнім інфарктам, адразу ж пра сябе нагадвае.

З Зінінага пакоя не даносілася ні гуку — відаць, дзяўчына яшчэ спала. А можа, толькі выгляд рабіла, што спіць: у драбку далікатнасці ёй, рудавалосай гэтай, хуткай на нагу і вострай на язык, грубаватай гаварунні Зіне ўсё-такі, як ні круці, не адмовіш. Хоць з выгляду пра тое і не скажаш. Дзеўка відавочна не з ліку тых, што, трапіўшы неўспадзеў у глухі, поўны ваўкоў лес, разрумзаецца, сядзе ў роспачы пад хвояй і будзе пакорліва чакаць выраку лёсу. Такая хутчэй усю поўсць на тых ваўках павыдзірае, чым свой хоць адзін волас дазволіць ім з галавы выскубнуць. Ды ён, Станіслаў Мікалаевіч Парфянок, дастаткова пажыў на свеце, дастаткова наглядзеўся і на распусных людцаў, і на ўспыхлівых, і на рахманых, каб не ведаць, што меркаваць аб характары чалавека толькі паводле нейкіх знешніх яго праяваў — справа ненадзейная.

Ён падняўся з ложка, чапляючыся рукой за сцяну, пасунуўся да прыбіральні. Ішоў як мага цішэй: спраўляць раніцой малую патрэбу апошнім часам стала надта балюча, а хоць які сведка *такой* старэчай нямогласці для мужчыны, які ўсё жыццё пражыў адзінотнікам і пускаць старонніх у свае асабістыя, інтымныя справы не прывык, — пакута яшчэ тая. Тым больш калі гэты сведка — дзяўчына дваццаці год, як Зіна. Не дзіва, што з усіх нязручнасцяў, якія ўзнікаюць у абставінах сумеснага жыцця чужых, да таго ж мала знаёмых і роз-

нага ўзросту, як яны з Зінай, людзей, цяпер, калі вось так усур'ёз занямог, менавіта гэтая — неабходнасць карыстацца адною прыбіральняй з кімсьці, — сталася для яго ці не самай вялікай. Быў бы то мужчына, а не Зіна гэтая, усё нашмат прасцей, канешне, вырашалася б. Бо з чым да мужыка звярнуцца не пасаромеешся, перад дзяўчынаю і не заікнешся нават.

То, можа, і не варта было яму ўсё-такі паддавацца Зіне, адмаўляць таму выпівоху, што месяца паўтара таму прыязджаў на ровары, набіваўся ў кватаранты-памочнікі. Сам бы ён, напэўна, не адмовіўся, але ж Зіна… Вочы дзеўка гэтак вырачыла, бровы так пагрозліва да пераносся ссунула, пачуўшы іхнюю размову пра кватаранства, што бядак той і развітацца нават, збягаючы, забыўся. Так хуценька знік на сваім ровары ў суседнім завулку, што ён, Станіслаў Мікалаевіч, і імя спытаць у дзецюка не паспеў.

Але, што праўда, і на Зініну прысутнасць яму асабліва наракаць не выпадае, якраз наадварот. Тым больш што дзяўчына з'явілася ў гэтым доме куды раней за яго самога. Перайшла, так бы мовіць, яму ў спадчыну ад ранейшай гаспадыні, у якой кватаравала, прыехаўшы пасля вучобы ў медвучэльні працаваць па размеркаванні ў раённую бальніцу. Гаспадыня памерла, сын яе і нявестка выставілі будынак на продаж, пакінуўшы Зіну да часу за ім наглядаць, пакуль хто не купіць. Дамок неўзабаве трапіў на вочы Станіславу Мікалаевічу, і калі ён на пачатку лета ў яго пераехаў, дзеўка так пры ім і засталася.

Заставалася быццам на пару дзён, пакуль не падшукае сталае кватэры, а ў выніку аж во на колькі месяцаў затрымалася. І, хутчэй за ўсё, затрымаецца ўжо і надалей. Ва ўсялякім разе апошнім часам размовы

пра пошук іншага, больш выгоднага жытла не распачынае. Яму ж, відаць, сам Бог пасобіў, паслаўшы ў кватаранткі гэтую няўрымслівую, дасціпную, часам аж занадта, Зіну: і весялей удваіх, і сняданак ды абед калінікалі пад настрой згатуе. І калі раптам што якое ў плане здароўя з ім здарыцца — медык заўсёды побач. А калі яшчэ ўлічыць, што характар ягоны таксама далёка не мёд, бомба, а не характар, дык і слова благое яму супраць дзяўчыны, якая б ні была яна, грэх казаць.

Новае месца жыхарства ён выбраў не выпадкова. Але не таму, што тут найбольш яму, ураджэнцу сярэдзінных памяркоўных шыротаў, падыходзіў клімат ці так пасавалі ўжо, цешылі вока тутэйшыя краявіды. За некароткі працоўны век якіх толькі краявідаў ён ні наглядзеўся, у якія толькі закуткі, часам і вунь як ад звыклых жыццёвых стандартаў далёкія, ні даводзілася яму трапляць. І ўсюды ж неяк прыжываўся, прыстасоўваўся, даваў сабе рады фізічна ды духоўна не апусціцца, не стаць бездапаможным закладнікам лёсу.

Цяслярыць не ўмеў па маладосці — навучыўся. Мыць бялізну не меў уяўлення — налаўчыўся. Каніны змалку на смак не ведаў, кумысу не піў — прымусіў сябе падчас працы ў стэпах, куды трапіў па размеркаванні пасля тэхнікума, адно і другое есці-піць, і спраўна так, што пару разоў толькі ад ежы той і пітва зайшоўся з непрывычкі млосцю ды ледзь не званітаваў. Словам, шмат што адолеў. А галоўнае — да высновы, што як бы кепска ні было, якія б пасткі чалавека дзе ні падчэквалі, усё трэба неяк змагчы, уласным розумам, а не праз трактаты якія вучоныя ці чужы досвед, дапаў.

Не, не спрыяльнага, прыдатнага клімату і не адметных краявідаў ён, канешне, тут, у гэтым гарадку, шукаў. Іншы інтарэс пераследаваў. І быў ён, той інтарэс, зусім на першы погляд будзённы і празаічны: дажыць у пэўнасці, што не давядзецца ляжаць па сконе ў адзіноце, не ператварыцца ў мумію да радасці асмялелага пацучча, не зрабіцца аб'ектам плётак для аматараў папаласкаць чужую бялізну.

Ахвотнікі пра чужое гаварыць заўсёды адшукаюцца, і хоць наракаць на іх — пустое, бо такая прырода чалавечая, яму цяпер, напрыканцы жыцця, такая ўвага да сябе менш за ўсё была б дарэчы. Зрэшты, то адзін з інтарэсаў, быў і ёсць і другі, не менш істотны ды паважны. Калі наогул не галоўны.

Праўда, клімат тут неблагі. І гарадок нішто сабе, хоць і зусім невялічкі, за пару гадзін лёгка ўвесь наўкола пехатою абыдзеш. Хутчэй нават пасёлак гэта, чым горад. З выгляду, аднак, даволі прыстойны. З паўдзясятка крамаў, царква, касцёл, пошта, банк, лазня, іншыя не менш вартыя ўвагі даброты цывілізацыі. Як і паўсюль — мэр, рухлівы, абыходлівы, асабліва, калі датычыць справы ўладкавання ўласнага дабрабыту, дзядзька з неабдымнаю кронаю сваяцтва ў радаводзе. Як і ў большасці невялікіх населеных пунктаў гэткага кшталту — пара прадпрымальнікаў мясцовае гадоўлі ў асобах мэравага ж сына і ягонай жонкі, чэпкай, не без прэтэнзіі на элегантнасць, дарма што правінцыялка, бізнес-вумэн, уладальніцы прыватнай аптэкі і шапіка па продажы напояў. Але не гэта галоўнае.

Галоўнае для Станіслава Мікалаевіча — за сто вёрстаў адсюль, у гэткім жа заштатным, як і гэты вось, гарадку, з гэткімі ж, мабыць, кліматам, краявідам, лазняю і мэрам ды параю бізнесоўцаў, куды і наважыўся

ён урэшце днямі напісаць. І не толькі напісаць, а нават, пераадолеўшы заўсёдную сваю, узрослую на грунце шматгадовага добраахвотнага адзінотніцтва і наўмыснае адстароненасці ад людзей перасцярогу быць кімсьці пазнаным, напрасіцца на тэлефонныя стасункі.

У прыбіральні ён прабыў хвілін дваццаць. А калі, збольшага прыбраўшы ўсё за сабою ды сяк-так прыладзіўшы ў роце цеснаваты новы зубны пратэз, вярнуўся ў калідор, Зіна ўжо ваўсю шчыравала ў кухні, гатавала штосьці на сняданак.

— Не збягайце, зараз есці будзем, — сказала порстка і нават крыху быццам з выклікам, дастаючы з шафкі і ставячы на стол талеркі ды раскладваючы абапал іх ножыкі і відэльцы. Сама яна карыстацца ўсім гэтым інтэлігенцкім сталовым начыннем не любіла і, відаць, не вельмі і ўмела, але парушаць завядзёнку гаспадара не адважвалася: Станіслаў Мікалаевіч ставіўся да такіх рэчаў вельмі строга. Як на яе, Зіны, інтэлігенткі ў першым калене, погляд, дык і занадта ўжо строга, можа, так і не варта было б. — Вось… Сядайце. Сёння яечня ў нас. З кропам і цыбуляй.

— Ну, не штодня ж трусяцінай ды чырванарыбіцай нам ласавацца, — весела намякаючы на святочны абед тыднёвае даўніны з нагоды шумнага Зінінага дня народзінаў, сказаў Станіслаў Мікалаевіч і паслухмяна сеў да стала. Цыбулі ён наогул, а тым больш зранку, не любіў, але псаваць сабе і дзяўчыне настрой з-за такой дробязі не палічыў патрэбным: цыбуля дык цыбуля, такой бяды…

— Чаму ты Зіна? — спытаў нечакана для самога сябе і, быццам агаломшаны раптоўным прыступам уласнае цікаўнасці ды заклапочаны тым, як будзе яна ўспры-

нята кватаранткай, хуценька дадаў: — Усе Дар'і наўкола, Настассі, Каці, Хрысціны, а ты — Зіна. У гонар якой-небудзь стаханаўкі мінулага стагоддзя, ці што, так цябе назвалі? Неяк жа зусім нямодна па сённяшнім часе.

— Якой яшчэ ста… стаханаўкі? — пырснула ў кулак дзяўчына. — Ну, скажаце вось, аж не даразумецца вас… Такое імя, бо бацькі яго далі. Не сама ж я сабе выбірала. Падумаеш — нямодна! А па-вашаму, якая-небудзь Капа ці Ліпа мадней было б?

Станіслаў Мікалаевіч пакратаў рукою шчаку, нягучна, быццам перасцерагаючыся, каб раптам не вываліўся з рота падчас гаманы пратэз, сказаў:

— Ну, хай бы сабе і Капа была. Або Ліпа. Капіталіна, Алімпіяда — як гучыць… Грунтоўна, манументальна. А во Ала яшчэ — чым благое імя? Праўда? Падабаецца? А то — Зіна… Зі-на… Аж холадна ад яго…

— Ну, вось, і скрытыкавалі мяне… Імя як імя, — сказала Зіна і спрытна перавяла размову на іншае: — Ліст сёння будзеце той жанчыне адпісваць? А то надта ж няёмка ўчора атрымалася падчас яе тэлефанавання. Непрыгожа нават. Зусім, да вашага ведама, пане гаспадару, непрыгожа. Мяне падманваць змусілі. Не хацелі гаварыць з кабецінай — так бы адразу і сказалі. Ну ж, Станіслаў Мікалаевіч! І што гэта з вамі? Што за паводзіны?

— Не, сёння не буду, — сумысля ігнаруючы другую частку запытання, нечакана зласліва, быццам гэта зусім не яму, а менавіта ёй, Зіне, павінен абыходзіць той меркаваны ліст, выгукнуў ён з раздражненнем у голасе.

— Чаму?

Станіслаў Мікалаевіч з хвіліну памаўчаў.

— А таму, што не зразумею, мабыць, нічога з таго, што яна напіша зноў у адказ па-свойму, па-тутэйшаму, вось чаму, — сказаў як мага больш катэгарычна і падчапіў відэльцам шматок яечні.

— Вы? Не зразумееце? — не дала веры Зіна. — Трусяціну трусяцінай называеце — ад зубоў слова адскоквае, а ўжо ліст на мове зразумець рады не дасце? Смех дый годзе! Такі прасунуты, сучасны мужчына, а такое на сябе нагаворваеце!

Праменад скончыўся вельмі хутка, бо неба раптам схмылілася і пайшоў дождж. Станіслаў Мікалаевіч так недалёка паспеў адысціся ад дома, што амаль не змок пад ім і хвілін праз пяць па вяртанні з прагулянкі ўжо сядзеў, сухі і бадзёры, на верандзе. Гартаў газету ды слухаў, як Зіна гамоніць з некім па тэлефоне. Па таропкасці яе мовы і па тым, як суцішвае яна час ад часу амаль да шэпту голас ды раз-пораз вызірае з заклапочаным, загадкавым выглядам у калідор, няцяжка было здагадацца, што гамоніць дзеўка з кімсьці стороннім і сведкаў размовы мець відавочна не жадае. Двойчы, падалося Станіславу Мікалаевічу, праслізнула ў размове і ягонае імя, але прамаўлялася яно пры гэтым так перасцярожліва-прытоена, што ніякай пэўнасці, ці так гэта насамрэч, ці толькі яму здалося, што пра яго згадвалі, быць не магло.

Зіна скончыла размову, ускінула на плечы плашч, неяк похапкам, няўважна, у адрозненне ад мінулых разоў, развітаўшыся з Станіславам Мікалаевічам, пабегла з хаты. Сёння ёй дзяжурыць у аддзяленні ў начную змену, а гэта значыць, што вернецца яна дадому толькі

назаўтра ўранні, не раней восьмай. А яшчэ тое, што бавіць рэшту дня і вечар яму, Станіславу Мікалаевічу, на жаль, зноў давядзецца ў самоце.

Ён адсунуў убок газету, пайшоў у калідор. Успомніў, што ўчора звечара планаваў памыць сёе-тое з бялізны, памкнуўся да прыбіральні, але тут жа і перадумаў. Звыклы да завядзёнкі ніколі, ні пры якіх, нават самых форс-мажорных абставінах не блытаць уласных планаў, апошнім часам ён усё часцей лавіў сябе чамусьці менавіта на такім жаданні — рабіць насуперак планам. І гэта, на дзіва, зусім яго і не бянтэжыла, і не засмучала, і не выбівала, як раней, з каляіны. Наадварот, нават быццам дадавала дзелавітасці і ўпэўненасці. Ён пастаяў у задуменні колькі хвілін перад дзвярыма пакоя, пасунуўся да стала з камп'ютарам. Машынальна, звыклым жэстам торкнуў штэкер у разетку, застыў у чаканні, пакуль засвеціцца экран манітора.

Камп'ютарам ён, не ў прыклад большасці старых, авалодаў і даволі хутка, і без асаблівай напругі. Хоць і вучыўся нязвыклай, новай справе галоўным чынам самастойна, похапкам, у вольны ад працы (тады яшчэ падпрацоўваў крыху тэхнолагам на цэментным заводзе) час, засвоіў усю гэтую лічбава-літарную прамудрасць досыць прыстойна. Апроч рамонту і наладкі апарата, канешне, бо гэта ўжо, так бы мовіць, вышэйшы пілатаж, для ягоных старэчых, паточаных шашалем часу і жыццёвых непамыснотаў ды сюрпрызаў лёсу мазгоў недасягальны. Але і засвоенага яму дастаткова. Прынамсі, каб напісаць ды адправіць ліст ці пачытаць навіны, звяртацца да кагосьці па дапамогу не трэба. А калі надарыцца які збой у сістэме, то цяпер вось кватарантка Зіна, дзеўка адукаваная, дасведчаная, паможа даць рады.

То, можа, і дасылаць Нане нумар тэлефона было не варта? Дурасць, канешне, учыніў, як след не падумаўшы. Бо адна справа пісаць ліст, дзе заўсёды застаецца магчымасць абысці тое, што пісаць не жадаеш, і зусім іншая — тэлефонная размова. Там ужо не схітруеш, бо калі пытанне ставіцца, на яго, хочаш таго ці не хочаш, трэба наўпрост адказваць. Не будзеш жа віцца вужакай, вачавідзь хлусіць, як учора вунь давялося падчас Нанінага тэлефанавання. Такі манеўр адразу будзе суразмоўцам заўважаны і, канешне ж, належным чынам ацэнены.

Дык, можа, напісаць Нане зноў? Але што? Што ён сочыць за імі амаль ад іх нараджэння і ведае пра ўсе іх з маткаю вандроўкі па свеце не горш за іх саміх? Што імя Нана яго ані не здзіўляе, бо такія імёны акурат і даюць у Грузіі, дзе яна нарадзілася і дзе дзяўчаты жылі з Ксеняй аж ці не дзесяць год? І што імя старэйшай сястры — Ала — зусім не даніна тадышняй модзе, як, напэўна, некаторыя думаюць, а ўсяго толькі наіўнае жаданне маці дзяўчынкі пакінуць для сябе пры сэрцы хоць кавалачак, хоць драбок мінулага, бо менавіта так звалі яе, Ксені, дачасна спачылую маці?

І вось што яшчэ не варта яму, бадай, ніколі рабіць, дык гэта тое мінулае прылюдна кранаць, як зрабіў гэта неабачліва падчас сняданку, паддаўшыся эмоцыі ды прамовіўшы ў прысутнасці Зіны імя старэйшай з пляменніц. Ці мала як яно ў будучыні павернецца, якім бокам, і ці не прынясе дзеўкам толькі лішні клопат. Гэтулькі год прамаўчаўшы, рызыкаваць на схіле дзён усім, чым таму мусоваму маўчанню абавязаны — і неразумна ў ягоным узросце, і недаравальна. Што да далейшых стасункаў з дзяўчатамі, то, безумоўна, як ні круці, ліст напісаць — лепш за тэлефанаванне.

Ён падключыў камп'ютар, націснуў кнопку ўваходу ў сеціва. Але толькі паспеў увайсці на хатнюю старонку, як азваўся тэлефон. «Мабыць, Зіна», — падумаў, пераадольваючы боль у суставе, падняўся з месца, каб адказаць.

Голас быў не вельмі выразны, але яму і адной кароткай рэплікі жанчыны было дастаткова, каб узнавіць у памяці характэрны, з лёгкім, ледзь улоўным прыдыхам тэмбр голаса Ксені.

— Станіслаў Мікалаевіч? Вы? Я Нана Шчарбіцкая… Вы пісалі мне… А ўчора я вам тэлефанавала ды не заспела вас дома…

— Нана, — паўтарыў ён і на хвіліну замоўк у няўцямным здранцвенні. — Нана Шчарбіцкая… Канешне. А я, ці паверыце, якраз збіраўся вам зноў напісаць. Калі вы не супраць, вядома…

— Не супраць. Але ж мы маглі б і вось так, па тэлефоне, пагаварыць. Прабачце, я не зусім разумею, што вы хочаце. Усё гэта неяк… неспадзеўна і… незразумела. Я ўжо і з сястрою раілася, што б гэта магло значыць…

— Раіліся з Алаю? — перапытаў ён і, не даючы Нане часу ачомацца ад здзіўлення, што ён не толькі яе, але і сястры імя ведае, хуценька дадаў: — Нічога не бойцеся.

— Я не баюся, але ўсё гэта так дзіўна, згадзіцеся…

— Дзівосаў шмат на свеце, — сказаў ён і глуха паўтарыў толькі што сказанае: — Шмат, аж часам занадта…

І раптам, нечакана нават для сябе самога, паклаў слухаўку. Усё адбылося вокамгненна, неспадзявана, быццам і не з уласнае волі тое зрабіў, а нячысцік тоўхнуў не ў добры час пад руку. І непрыгожа. Куды нават больш непрыгожа, чым мінулы раз, калі наўмысна пераклаў цяжар перамоваў з пляменніцай на Зіну.

Амаль дзве гадзіны мінула пасля размовы з Нанаю, а ён усё сядзеў, бы здранцвелы, пры ўключаным камп'ютары, тупа глядзеў на спярэшчаны бляклымі знакамі файлаў ды тэчак манітор. Сядзеў і млява, як праз сон, думаў, што няблага было б, бадай, замяніць на экране фонавы малюнак, бо надта ж усё на ім невыразна, ды пра тое, як бы не забыцца папрасіць Зіну аплаціць на пошце падпіску на інтэрнэт на наступны месяц. І толькі калі зноў падаў голас з калідора тэлефон, на хвіліну ажыў, страпянуўся. Але адзывацца не стаў: трэба каму — патэлефануюць пазней, яму ж цяпер не да размоваў.

Тэлефон енкнуў колькі разоў, захлынуўшыся ўласным расчараваннем-абурэннем, рэзка аціх.

Рука Станіслава Мікалаевіча міжволі пацягнулася да мышкі, скіравала курсор да тэчкі са здымкамі.

Усе фоткі ў тэчках на ягоным працоўным стале — са зробленых апошнім часам. І толькі адна даўнейшая. Яе прыслала год дваццаць таму Ксеня з Закарпацця, калі перабралася туды з дочкамі пасля Грузіі. Дзве дзяўчынкі-пагодкі ў тубыльскіх сукенках з арнаментамі на фоне акаймаванае стажкамі сена гары, са стужкамі ў туга сплеценых косах. А вось дзе каторая — невядома, бо нічога братава пра тое не напісала.

І не напісала, і зладзіць сустрэчу з дзяўчатамі, колькі ні прасіў, не пажадала. І не толькі на сустрэчу не пагадзілася, а яшчэ ж і слова ўзяла, што ён ніколі ў абыход яе, Ксені, дзяўчатам пра сябе не нагадае.

Цікава, як то цяпер яны, Нана і Ала, выглядаюць? А дзеці Аліны да каго падобныя? Сыну, здаецца, два гады было, як Ксеня памерла. Пэўна ж, і яшчэ Ала потым, хоць і наогул пазнавата, дзесьці год пад трыццаць, выйшла замуж, нарадзіла… Дзяўчыну ці хлопца зноў? Ксеня вельмі баялася і не хацела, каб хлопцы былі — кепскіх генаў, мабыць, асцерагалася. Так асцерагалася,

што нават, даведаўшыся, што першынец сын будзе ў Алы, надта ж тым пераймалася, перажывала.

Ён падумаў, што няблага было б папрасіць Нану, каб прыслала які-небудзь здымак, свой ці сумесны з сястрой і яе дзецьмі, але тут жа прагнаў думку прэч. Ліставанне — куды яшчэ не ішло, а прасіць здымкі — гэта ўжо, безумоўна, будзе з ягонага боку перабор.

Так, на думцы пра здымкі, ён у крэсле пры камп'ютары і заснуў. Ды заснуў, аддаўшыся відзежам мінулага, так моцна, што, калі нейкае аўто спынілася ля хаты насупраць і асвяціла яго праз акно фарамі, ён не толькі не прачнуўся, а нават не зварухнуўся.

3

Гарачыня, спёка — мабыць, у пекле, калі ёсць яно, пры катлах з грэшнікамі менавіта вось гэтак задушліва. Нябожчык Адам, Стасікаў і Віцюнеў бацька, чалавек у выказваннях трапны і вынаходлівы, дарма што быў ледзь збольшага адукаваны, такое надвор'е заўсёды называў не іначай як скварам. Сапраўды, сквар, адно што не зімовы, калі цела аж пячэцца на марозе, а летні. Бо такога шчодрага на сонца пачатку лета, як сёлета, і самыя старыя жыхары Лучая, бадай, не памятаюць. Куды ні кінь вокам — усюды яго аранжавы дыск, дакучлівы, навязліва-неадчэпны, бы распалены любоўнаю жарсцю певень Здорка, што ўсё кружляе і кружляе напышлівым шляхцюком вакол чародкі курыц і ніяк не спатоліць, распуснік, неўтаймоўнага свайго юру.

Спякота пануе на дварэ ад самай раніцы. І адзіным месцам, дзе можна хоць крыху ад яе ў гэтыя атручаныя флюідамі падазронасці і страху дні ўратавацца, — клуня на ўскрайку Лучая, побач з будын-

кам санаторыя цэментнага завода, адзінага калгаснага прамысловага прадпрыемства, ад нядаўняе пары — вотчыны ўвішных армянскіх перасяленцаў братоў Асакянаў. Там, у пахілай, пачарнелай ад часу, на траціну ўрослай у глебу дзедаўскай будыніне, у міжсценні з грудаю прапахлых цэментам, які ў пасёлку ўсе называюць паводле старой завядзёнкі цымантам, бацькавых рэчаў, загародкаю для куранят і клеткаю для трусоў ды месцам, дзе мачыха трымае свае прычындалы для прыбірання, і туліцца Стасік Тарасевіч каторыя суткі ў марнай надзеі, што вось жа зараз якраз і надарыцца целу палёгка ды з'явіцца ўрэшце імпэт засяродзіць глузды на падрыхтоўцы да ўступных іспытаў у інстытут.

Вечар. Сонечны дыск хіліцца долу, спакваля перарабляецца з аранжавага на агніста-чырвоны, павісеўшы колькі часу нерухомаю патэльняй над аточанай кустоўем рысаю небасхілу, імкліва куляецца ў бездань няпэўнага, але з кожным імгненнем усё больш выяўнага прамежку сутак, хвіліны кароткага — адзін блік, адзін росчырк апошняга промня на небе — спаткання святла і цемры. Дзень прамінуў, як і не было яго, ноч наперадзе, а ахвоты да навукі ў Стасіка так, на жаль, і не дадалося.

«Ну, то заўтра, можа, дасць Бог, зоркі паспрыяюць», — думае хлопец і бяжыць у хату па цяплейшую коўдру. Чэрвеньскае надвор'е, што ні кажы, падманлівае, няпэўнае. Удзень і не заўважыш, забавіўшыся дзе-небудзь на сугрэве, як сонца запячэ скуру да пухіроў. А ўначы так неўспадзеў, спадцішка, па-зладзейску абдасць вераломны вятрыска ўсё цела холадам, што не толькі коўдра, а і спраўны дзедаўскі кажух паверх яе не будзе лішнім. Адно добра: камароў пакуль

што ўсюды няшмат — не іх пара. Заблукае ў клуню які-небудзь залётны няўдаліца, пакружляе, паенчыць пазнібіць над вухам пранізлівым галодным дыскантам ды і знікне, гнаны самотаю, у густым прадзіве павуціння пад дахам.

Лучай — заняпалае старасвецкае паселішча на ўскрайку балотнага заказніка, вядомае ў акрузе сваімі азяркамі, а найперш мохам. Як апошнім часам цымант, так здавён, спаконвеку мох — неафіцыйная візітоўка Лучая. Не толькі з наваколля, але і з болей аддаленых мясцін па-ранейшаму прыязджаюць сюды людзі, каб надзерці яго для імшэння зрубаў ці ўцяплення хат ды надворных пабудоваў, цягнуць дадому падводамі, тачкамі, прычэпамі. Канешне, менш, як, напрыклад, у даваенныя часы, здабываюць, але ўсё адно лучаеўскі мох усё яшчэ карыстаецца попытам, і не абы-якім.

Яшчэ адна адметнасць Лучая — яго перасечаны, спярэшчаны пукатымі пагуркамі рэльеф. Ледзь-ледзь балота мінулася — і вось ужо вырастае перад вачыма вясёлы, бы стромая выспа сярод мора, парослы з усіх бакоў чаромхаю, ды рабіннікам, ды арэшнікам вежападобны пагурак пад назовам Касцяніца. Такі нязвыкла для тутэйшых абшараў высачэзны, што, каб убачыць, якія там дзівосы месцяцца ўгары, на яго пляскатай суглініста-пясчанай вяршыні, добра трэба напружыць цягліцы шыі ды ўзняць як след голаў.

А там, угары, — шырокі, абгароджаны з усіх бакоў рэдкім тынам ды абкладзены понізу тыну шыхтам прыхопленага цымантам камення пляц, пасярэдзіне якога туляцца тры хаты. Адна ўжо пустая, страхавіта зырыць на свет нежывымі аканіцамі пасля нядаўняе смерці гаспадара, вяплаватага маладога старавера-адзінотніка Модзі, і дзве жылыя.

Большую, тую, што прыткнулася да агароджы на схіле пагурка, займае гаманкі майстра спанталычыць суразмоўцу то — у залежнасці ад настрою — спецыфічным сваім, грубаватым гумарам, то, наадварот, суворасцю абыходжання дзед Антук па мянушцы Чабан. Гэтак, на цюркскі капыл, ён назваў сябе сам, калі, кінуўшы трунарства ў лучаеўскай канторы пахавальных паслуг, наняўся пасля выхаду ў адпачынак дзеля прыварку да пенсіі пасвіць калгасных авечак. Суворасць так натуральна ўжываецца ў старым Антуку з жартаўлівасцю, што часам і зразумець, ці праўду ён кажа, ці брэша, зусім, зусім няпроста.

У другой, меншай хаце жыве ўдава Алена, ціхмяная блізарукая кабеціна з заўжды сумным, быццам адмыслова арыентаваным на горшае выразам твару. Гуляе пагалоска, што Алена з Антуком у маладосці любіліся, але ці праўда тое, ці плётка, ніхто дакладна не ведае. І не дзіва: пасёлак з пагурка бачны як на далоні, з пасёлка ж, з нізіны, каб і вельмі хацеў, нічога ў Касцяніцы, апроч стрэх ды комінаў хат, не ўгледзіш.

Так што адзіная крыніца інфармацыі пра касцяніцкія норавы і падзеі, колішнія ды цяперашнія, — даўгаваты Антукоў язык. І пра ўласныя шуры-муры з гадоў маладосці не праміне дзядуля пры нагодзе пахваліцца, і пра тое, як падчас працы ў пахавальнай канторы быццам бы ўмудрыўся аднойчы па п'янцы памілавацца з нейкаю кабецінай на веку парожняе труны ці то нават у самой труне, распавесці за саромнае не палічыць.

Касцяніца — месца маляўнічае, прывабнае, але і даволі вусцішнае. Асабліва ўначы, калі пачынаюць прывідна гайдацца ўдалечыні на тле зорак сілуэты дрэваў ды адзывацца з балота адна за адной згаладнелыя за дзень совы. Пасля ж трагічнага здарэння

з Модзем і наогул ператварылася ціхамірная Касцяніца ў вачах насельнікаў Лучая ды навакольных вёсак у амаль што мясціну д'ябальскую, нялюдскую. І нават пара буслоў, што неўзабаве па адыходзе нябожчыка ўзялася абжываць комін ягонае хаты, прывабнасці хутару ў вачах як тубыльцаў, так і люду прышлага, тых жа братоў Асакянаў, не дадае.

На наступны дзень Стасік прачынаецца раней, як звычайна, а сёмай. Але ўсё адно ўжо, аказваецца, — запозна. Меркаваў уранні заспець брата Віцюню да ягонага ад'езду на працу, каб пра сёе-тое пагаманіць, але вось жа — зноў праспаў шанец, не скарыстаўся момантам. Віцюні і след астыў, а ягоны тапчан у дальнім куце клуні выглядае так, быццам на ім і наогул не спалі: раўнюткі, без адзінае зморшчыны валік-сеннічок замест падушкі, неруш чысцюткае, каб каліва бруду, прасціны, акуратны, як пад лінейку зладаваны, стосік з наўлечкі і ручнікоў. Брат — чысцёха, такой схільнасцю да чысціні і парадку і жанчына не кожная можа пахваліцца.

На дварэ, па ўсім відаць, лютуе звыклая спёка. У клуні — ціша, нават мышэй, на дзіва, не чутно, мабыць, пазашываліся небаракі ў норы пасля несупыннай начной валтузні, ратуючыся ад гарачыні.

Зазірае ў будынак мачыха, бразгае вядром, крышыць куранятам яйка, знікае зноў у зыбкім мроіве па той бок дзвярэй. Праз хвіліну Ксеня, братава жонка, расчыняе дзверы, пастаяўшы моўчкі, немым ценем у праёме, быццам штосьці хочучы сказаць ці запытацца, ды, так і не наважыўшыся тое зрабіць, сумна ўздыхае, гладзіць далонямі заўважна пакруглелы апошнім часам жывот і ідзе далей па сваіх справах.

Стасік разгортвае падручнік, спрабуе заглыбіцца ў чытанне. Можа, удасца ўсё-такі да сняданку нарэшце засяродзіцца на вучобе? І, глядзіш, і потым пойдзе справа з навукаю лацвей, і дзень хутчэй прабяжыць, бы вецер прасвішча легкадумным скразняком ля вуха, а не так нудотна і марудна будзе ліпець, як учора ды заўчора.

Мітрэнгу з паступленнем у інстытут ініцыяваў Віцюня. З разлікам, што вучобу сам жа ён, старэйшы і адзіны Стасікаў брат, і будзе памагаць матэрыяльна асільваць. Бо болей няма каму. Бацька, ажаніўшыся з жанчынай з вёскі паблізу Лучая праз два гады пасля смерці маці, і сам летась раптоўна неяк, амаль увадначас, наглытаўшыся, няйначай, на заводзе цымантовага пылу, памёр. У мачыхі, якая, як калісьці і Віцюнева і Стасікава маці, робіць за мізэрную плату прыбіральшчыцай у санаторыі, двое сваіх, хоць, праўда, і дарослых ужо, дзяцей, і, як бы добра яна да пасынкаў ні ставілася, дапамагаць Стасіку вучыцца наўрад зможа.

Навошта так высільвацца Віцюню з братавай вучобай — загадка. Тым больш што ў самога дзіцяці год толькі-толькі споўніўся, і ўжо другое, мяркуючы па Ксеніным жываце, на падыходзе. Але вось жа ўдумаў адно: вучыся ды вучыся, і слухаць нічога не жадае. Можа, таму, што ўласную мару яму ў свой час — паступіць пасля тэхнікума ў інстытут — так і не ўдалася ажыццявіць з-за недабору балу падчас уступных экзаменаў. А хутчэй за ўсё проста такая ўжо, відаць, натура ў чалавека — усё для іншых. Нездарма ж вунь і ў раённай газеце днямі ледзь не на паўстаронкі артыкул пра зычлівасць яго ў стаўленні да людзей ды сціпласць і працавітасць змясцілі. Пра абы-каго такое

не напішуць, гэта ж зразумела. Што ні кажы, а гэткага брата, як Віцюня, мець — вялікая ўдача і шчасце, далёка не кожнаму такое выпадае.

Адзінае, што час ад часу Стасіка ў танкатварым, шэравокім прыгажуне браце крыху бянтэжыць, дык гэта ягоная няўсмешлівасць, зануранасць. Усё ўсур'ёз, усё з маркоцінкай у паглядзе. А калі зрэдку і прабіваецца на Віцюневым твары праз маску скрушлівае, загадкавае задуменнасці ўсмешка, то заўсёды нейкая яна няўсцешная, быццам з-пад прымусу — не ўсмешка, а праўдзівая грымаса. Быццам які ўнутраны боль абыходзіць чалавеку, а што то за боль і скуль ён узяўся, нізавошта не дазнацца.

Ціха ў клуні, як у склепе, і яснее ад цішы той ды прахалоды Стасікава галава, і святлеюць глузды. Можа, і няблага гэта — вучоба-адукацыя, ды не гэткаю ж вось цаной, чыімсьці, хай і не чужога чалавека, коштам. Вернецца Віцюня ўвечары з працы — і набярэцца Стасік рызыкі-смеласці, і скажа брату ўрэшце ўсё тое сто разоў думанае-перадуманае.

Віцюня працуе загадчыкам майстэрні па рамонце тэхнікі і вяртаецца дахаты не раней сёмай. Але гэта ўзімку, цяпер жа, у пару нарыхтоўкі кармоў, — значна пазней, часам і зусім позна, ледзь не апоўначы. А то і далёка за поўнач, пад ранне. Ставіць абкарэлы за дзень, дазвання збіты па каляінах «Запарожац» ля весніц, забягае на хвіліну ў хату, каб перахапіць штоніштo з ежы ды па бачыцца з Ксеняй і дачкою Алай, і ідзе класціся ў клуню. Разгоніць збольшага цемру ліхтарыкам, похапкам распранецца і валіцца кулем на зладаваны з дошак, засланы сенніком тапчан.

Бывае, што і загаворыць Віцюня з братам пад настрой, і пажартуе, і анекдотам павесяліць. А то і ў гульню згуляе — у перакручванкі словаў, якую яны са Стасікам самі ж і прыдумалі колькі год таму, перарабляючы на ўзор найбольш характэрных прозвішчаў розных народаў назовы прадметаў, прадуктаў харчавання або раслін: капусцінскі, цыбулеску, сырыдзэ, бульбінзон, гуркявічус. З прыездам у Лучай Асакянаў армянскае ў той пералік адмысловых перараблянак натуральна ўпісалася: малакян, кілбасян, аграсцян… Доўга меркавалі наконт таго, якое больш за ўсё тутэйшаму люду падыходзіць паводле характару, і вырашылі, што, мабыць, на -еня ці -эня: гарбузеня, гусеня, кумпячэня — няспешна, запаволена, мякка, бы самі рухі і мова знячэўку, ды не дарэшты абуджанага ад глыбокага сну тубыльца.

Такая немудрагелістая гульня. Праўда, апошнім часам чамусьці ўсё радзей і радзей яна здараецца, прынамсі не так часта, як раней. Зусім, на жаль, не так. Віцюня моўчкі куляецца на тапчан і тут жа засынае, як забіты, быццам пасля немаведама якой цяжкой працы. А ўранні, прачнуўшыся ды быццам жадаючы кампенсаваць перад Стасікам хвіліны вечарова-начнога маўчання, доўга ўзбуджана гамоніць пра ўсё на свеце ды ні пра што ды трэ апантана, да пачырванення вяхоткаю пад рукамыйнікам прапахлыя тэхнікай, але заўсёды наўздзіў чыстыя, каб пляміна, як тыя прасціны на сенніку, далоні. Трэ ды пазірае скоса на брата, быццам ладзіць іспыт на вытрымку ці хоча штосьці запытацца або, наадварот, сказаць.

Стасіку такія няўцямнасці братавых паводзінаў не тое што надта ўжо абыходзяць, проста здаюцца

незразумелымі. Як незразумелыя і перапады настрою ды маркота Ксені, якую ўсё часцей заспявае ён у самоце, з мокрымі ад слёз вачыма. З чаго б такое? І па гаспадарцы ж Віцюня ёй, нягледзячы, што гэтак часам бывае моцна заняты на працы, памагае, і гарэлкаю, як іншыя, не злоўжывае, з п'янымі хаўрусамі сяброўства не водзіць, і падарункамі зрэдчас песціць. Як і мачыху, дарэчы, дарма што чужая кабеціна. Вунь два месяцы таму абедзвюм па пярсцёнку залатым да дзён народзінаў прэзентаваў. Не новыя, перакупіў, кажа, у кагосьці на кірмашы, ды ці гэта галоўнае? Рэч не такая ўжо выбітная той пярсцёнак, а, глядзіш, на каронку мачысе, як зубы паехала ў райцэнтр рамантаваць, і прыдаўся.

Ну, але што там Ксеня: дзіця насіць, вядома, — няпростая справа. Таму і вось пра гэта — пра тое, што, мабыць, усім ім, і тым больш Віцюню як мужу след было б быць больш уважлівымі да сіраты (Ксеня засталася без бацькоў у пятнаццаць год), таксама мае Стасік намер з братам пагаварыць. Канешне, як мага больш далікатна: Віцюня, хоць дзяцюк зазвычай і рахманы, разам з тым часам і даволі непрадказальны, успыхлівы, і хто ведае, як на такое ўмяшальніцтва ў свае сямейныя справы адрэагуе.

Але ўсё адно ён пагаворыць. Калі, канешне, Віцюня не засне раней, чым паспее ён адкрыць рот. Або калі самога яго сон не зморыць да таго, як брат вернецца. Кроў з носа пагаворыць, калі толькі зямля не перакуліцца, ці метэарыт не ўпадзе няўрокам на панадворак, ці чарговае чэпэ, душагубства шатанскае, не здарыцца ў наваколлі ды не заслоніць сабою, не адсуне ўбок, як колькі разоў вунь ужо тое здаралася,

дробныя ягоныя, мабыць, яйка выедзенага нявартыя хлапечыя клопаты і сумненні.

Пяць забойстваў цягам трох месяцаў і для вялікага горада, напэўна, не абы-якім сталіся б узрухам, а пра невялікае паселішча і казаць няма чаго. Ад пачатку вясны толькі і гамонкі паўсюль у ваколіцах санаторыя, што пра тыя страхавітыя здарэнні, ды здагадак, як яно ды што. Усе пяць ахвяраў — маладыя жанчыны. Згвалтаваныя, задушаныя шалікамі ці хусткамі з собскіх шыяў і галоваў ды прыхаваныя ў хмызе быццам знарок літаральна за колькі метраў ад старога гасцінца паблізу Касцяніцы.

Ужо і супакоіліся крыху людзі пасля таго, як выцягнулі месяц таму падчас рыбалкі з ракі за пяць вёрстаў ад Лучая, каля штучнага вадаспада на месцы колішняга млына, зашыты ў мех труп адзінадушна западозранага ў нялюдскасці юрлівага касцяніцкага недарэкі Модзі. Аж не, дарэмна: праз тыдзень зноў скалануліся ад гэткага самага падвойнага — згвалтаванне — забойства — злачынства.

З Модзем, які пару год таму спрабаваў схіліць да сужыцельства непаўналетку ды дня не мог прабыць без таго, каб не зачапіць, не скубнуць за клуб якую маладзіцу, за старое і недаказанае новае быццам бы самасудам паквіталіся, але ж вось як было ўсё да самасуду, так і засталося. Усё, апроч аднаго: прыток у санаторый адпачывальнікаў, напалоханых розгаласам ад дзікіх серыйных забойстваў, удвая, калі не на больш, зменшыўся, і міжволі паўстала пытанне скарачэння штату ўстановы. Дзелавітыя Асакяны ўжо двойчы збіралі сход абслугі, папярэджвалі пра тое.

Для занятых абслугоўваннем будынкаў санаторыя лучаеўцаў удар асабліва адчувальны. Вось чаму, мабыць, і мачыха ходзіць задуменная, і Ксеня, якая яшчэ да першае цяжарнасці паспела паўгода папрацаваць раздатчыцай у санаторнаўскай сталоўцы, нервуецца, і Віцюню, як бы ён ні ўдаваў то абыякавасць, то весялосць, бачна, не па сабе.

Сняданак прамінае хутка, неяк похапкам. Ксені ад пачатку дня нездаровіцца, у мачыхі ж — свой гаспадарскі клопат. Адзін з загадаваных мінулым летам трусоў моцна, да косткі развярэдзіў дзесьці нагу, кульгае, то трэба яго тэрмінова зарэзаць.

Трус вялікі, тлусты, крый бог, здохне — шкада будзе. Марнаваць гэтулькі далікатэснага харчу гаспадыні не хочацца, а вось хто мог бы зарэзаць жывёліну ды зняць з яе скуру, — не даўмецца. Стасік, канешне, рады не дасць. Віцюню ж прасіць — таксама пустое, той ледзь кроў дзе ўбачыць — белым робіцца з твару, бы крэйда. Такі ўжо далікатны ад маленства да праяваў гвалту і жорсткасці, уразлівы чалавек.

— Дзеда Антука папрасіць, ці што? Схадзіў бы ты, можа, Стасік, да яго ў Касцяніцу, бухнуўся старому ў ногі…

Дзед Антук — чалавек з характарам няпростым, непрадказальны, і да яго ісці з нейкаю просьбай — што па мінным полі ступаць. Але ж ён адзіны, хто можа даць рады ў такой пільнай справе, і Стасіку нічога не застаецца, як адгукнуцца на просьбу мачыхі.

— Стары любіць чытаць газеты, дык вазьмі з сабою раёнку, пакажы яму допіс пра Віцюню, — раіць Ксеня. — А тады, глядзіш, слова за слова — і лацвей яно ўсё пойдзе пры мужчынскай гамане.

— І праўда, — падтаквае мачыха. — Пакажы пісаніну дзеду. Яго ж хлебам не кармі — дай штонебудзь пачытаць. Валя, бібліятэкарка, кажа, дня не мінае, каб да іх у чытальню па свежыя навіны не завітаў. Газетамі ды часопісамі абкладзецца і чытае-гартае ўсё запар, што ні трапіць на вочы.

Парада падаецца Стасіку слушнай. Дзед Антук, сапраўды, хоць адвеку нідзе, здаецца, не вучыўся, руку на пульсе часу, нягледзячы на ўзрост ды нізкі, як сам пра сябе кажа, сацыяльны статус, трымае спраўна і быць у курсе ўсяго, дзе што ні дзеецца, любіць да самазабыцця.

Мачыха садзіць зраненага труса ў кошык, Ксеня накрывае кошык газетай з допісам пра Віцюню, і праз колькі хвілін Стасік выходзіць з хаты.

— Кладзі газеціну за пазуху, раптам дождж нахопіцца, — крычыць наўздагон мачыха. — Шкада будзе, як змокне. А во яшчэ… Кажуць унучка прыехала да Антука з горада, ладная Чабанішка. Дык не губляйся там надта, чуеш?

— Вось яшчэ мне не хапала клопату з дзеўкай, — кажа Стасік і адчувае, як твар пакрываецца чырванню. Але гэта не так ад прапановы мачыхі, як ад самога факту яе выказвання: звычайна гэткіх вольнасцяў у стасунках з пасынкамі жанчына сабе не дазваляе. Павучыць, палаяцца нават, як заробіш, — так, канешне, як жа іначай, справа будзённая. Лезці ж жывасілам, слатою ў асабістыя, інтымныя справы хлопцаў — не, такое ў сямі Тарасевічаў і не практыкуецца, і не ўхваляецца.

На дварэ яшчэ гарачэй, як у хаце. Таму прадзіраецца праз густое, праніцанае цымантовым пылам паветра

да не так ужо блізкае Касцяніцы Стасіку даводзіцца ледзь не вобмацкам, унікаючы адкрытых месцаў ды трымаючыся засені. Але і засень сёння ратуе слаба: тэмпература пад трыццаць, палахлівец жа вецер калі і не сканаў, то схаваўся ад задухі ў нейкім сваім таемным спраце так надзейна, што яго не дагукацца.

У Касцяніцы ціша такая, што ад яе вушы закладвае. Адзінае, што час ад часу гэтую тугую, бы напятая рыбінай лёса, цішыню парушае, — шоргат птушыных крылаў па-над хмызам і дрэвамі. Чаго-чаго, а птушак на вышынным касцяніцкім хутары хапае, аж зашмат, асабліва шпакоў.

Дзед Антук кожную вясну развешвае на ліпах усцяж тыну новыя шпакоўні, і шпакі тут ужо распладзіліся ў такой колькасці, што баба Алена каму-небудзь на ягоную неабачлівую прыязнасць да птаства пры нагодзе ўпотай, дарма што жанчына пабожная і да плётак-нараканак быццам не ахвочая, і паскардзіцца. І мае рацыю: галодных птушыных іртоў у выніку Антуковае дабраслівасці штогод у Касцяніцы более, вішняку ж ды іншых дрэваў і кустоўя для іх пракорму — наадварот, усё менш і менш. Тое ўлетку, глядзіш, ссохла, гэта ўзімку змерзла — радзеюць касцяніцкія сады, чэзнуць на вачах.

І дзеду Антуку, і бабе Алене добра за семдзесят, займацца ў гэткім узросце садаводствам — што пра нязбыўнае дарэмна марыць. Дай бог насаджанае хоць збольшага дагледзець, а ўжо пра будучыню няхай іншыя, маладзейшыя, клапоцяцца. На прыход жа маладзейшых ды іхнюю руплівасць якраз разлічваць старым і не выпадае. Касцяніца — месца глухое, пустэльнае, хто сюды пойдзе бедаваць? Кожны, вядома, ціснецца бліжэй да выгодаў, кожны імкнецца як з меншымі турботамі ды выдаткамі ў жыцці ўладкавацца.

Вунь месяц таму прыязджала пажыць у братавай хаце Модзева сястра з дзецьмі, але зусім нядоўга пабыла: страшна. І праўда, страшна. Асабліва як штосьці там схібіць увечары ў пасёлку трансфарматар і на некалькі гадзін застаецца Касцяніца без святла, сам-насам з тутэйшымі зданкамі ды прывідамі. Вось і запусценне ля хаты, бо нікому сталася не патрэбная. І не дзіва, што лабаззё амаль у рост чалавека скрозь ля падмурка і сценаў выструнілася і ўжо зазірае ў вокны, а да ганка з-за зарасніку з крапівы і дзядоўніку не прабіцца. І нават пара буслоў, што таўкуцца ў любоўным танцы на пожні збоч пуні, весялосці пейзажу не дадае.

Таксама загадка з гэтымі цыбатымі чырвананогімі каханкамі ў пёрах. Кахацца кахаюцца, а гнязда на коміне так да ладу ніяк і не давядуць. Быццам прыглядаюцца да месца і ўсё ніяк не наважацца канчаткова зрабіць яго сваім домам. Няйначай, часовасць, хісткасць усяго тут, у Касцяніцы, нутром сваім птушыным адчуваюць. А можа, гэтаксама, як і людзей, Модзева здань іх адпужвае? Хто ведае.

Адзіная, здаецца, бясспрэчная перавага Касцяніцы перад пасёлкам — чыстае паветра. Завод далёка, пыл сюды не далятае, дык і дыхаць тут куды лягчэй, і расліннасць больш сакавітай выглядае, і вада ў калодзежы пры спуску з пагурка больш празрыстая. Але гэта таксама як на чый погляд. Баба Алена, напрыклад, лічыць, што ані тут нішто не лепшае. Маўляў, раней венікам ці вяхоткаю, бывала, раз-другі махель гаспадыня падчас прыбірання — і дастаткова таго, і вось табе чыста ў хаце. А цяпер прыбіраеш-прыбіраеш паўдня, стаіш-стаіш крукам, а зірнеш пасля наўкола — быццам і не рабіў нічога, як было да прыбірання, так і засталося.

Ад Модзевай хаты да котлішча дзеда Антука недалёка, метраў трыста, але каб іх адолець, не абыякія спраўныя трэба мець ногі. Дзед з восені разараў пожню пад жыта, а прыйшла пара сеяць — увадначас занямог і не даў полю рады. Толькі з хваробы выкараскаўся — тут, як на тое, конь, якога заўсёды пазычаў дагэтуль у аднаго свайго старога лучаеўскага прыяцеля, здох.

Так і засталася зямля ўзаранай, ды не засеянай, пабілася глыжамі. Глыжы запякліся па вясне на сонцы, скамянелі і цяпер, прымаскаваныя густою лебядой і тлустым, кусцістым пырнікам, нямала ствараюць перашкодаў таму, хто іх не заўважыць ды няўрокам аб каторы спатыкнецца.

На прызбе дзедавай хаты сядзіць дзяўчо ў стракатай паркалёвай сукенцы і вылушчвае са струкоў гарох, прынесены, мусіць, з поля ў нізіне на ўскрайку балота. Дзяўчына, відаць па ўсім, гарадская, хоць і трымаецца прыязна, нават ускоквае з месца насустрач неспадзяванаму наведніку.

— Да дзеда, напэўна? — кажа, расцягваючы злёгку словы, і ідзе да хаты. — Хадзі…

«Ветлівая, аднак», — збянтэжаны такою нязвыклаю ўвагай да сваёй персоны, думае Стасік і сунецца праз панадворак да ганка.

Дзеўка з выгляду, папраўдзе, як хлопцы аднагодкі ў кампаніі падчас гульні ў футбол кажуць, хвалячыся адзін перад адным сваімі прыдуманымі перамогамі, — нішто сабе. Быццам і звычайная, а ўсё адно прыцягвае. А вось чым прыцягвае — і не зразумець. Напэўна, вачыма, светлымі, як просінь неба ўвесну, і ад таго крыху журботнымі, крыху задуменнымі. Стасікаў

досвед узаемаадносінаў з дзяўчатамі такі куртаты, што калі якое пачуццё спатканне з незнаёмкай у яго і выклікае, дык гэта адзіна разгубленасць.

— Марута, хто там? — абзываецца, на шчасце, з хаты гаспадар і, не чакаючы адказу, выходзіць на лядашчы рыплівы ганак.

— О, гэта што! Гэта — семкі! — Дзед Антук хвіліну трымае газету перад вачыма, кладзе на застаўлены парожнімі бляшанкамі з-пад кветак падваконнік. Кветак ён ад часу паховінаў жонкі не трымае, выкінуць жа бляшанкі, відаць, старому шкада, вось і прыстасаваў іх для захоўвання нітак, голак, дратвы ды рознай іншай гаспадарскай драбязы. Бачна, што артыкульчык пра Віцюню ён ужо чытаў, а вось чым гэтак ці то расчараваны, ці то незадаволены — невядома. — Падумаеш: працаўнік, дбаліца... От паказаць бы вам, што пра мяне колісь напісалі ў газеціне — ото цымус!

— Пра вас? І што ж? — робіць выгляд зацікаўленасці Стасік.

Гісторыю пра тое, як перакруцілі калісьці, у даваенныя яшчэ часы, Антукову біяграфію журналісты падчас ягонае службы ў войску, зрабіўшы бацьку, простага жывёлавода, партыйным босам сельсаветаўскага значэння, а маці, даярку, лепшай ільнаводкай раёна, бадай, толькі зусім лянівы ў паселішчы не ведае. Ды стары заўсёды распавядае яе так ахвотна, што не выкарыстаць ягонага энтузіязму дзеля справы здаецца Стасіку недаравальным.

— Дык што, дзед?

Але дзеда Антука падсекчы на зазубшчы расці і даверлівасці не так проста.

— Што? Сам ведаеш. Быў русавалосым — зрабілі чарнявым, ды і кучаравым яшчэ ў дадатак. Вось што. Напісаць, пане браце, можна што заўгодна. Усё, што ў голаў узбрыдзе, можна накрэмзаць…

— Вы гэта на Віцюню намякаеце, ці як? — збянтэжаны апошняю фразай старога, перапытвае Стасік.

— Можа, на яго, а можа, на каго іншага, — кажа дзед Антук і рэзкім рухам выхоплівае з кошыка за вушы труса. — Прыйшоў па справе, дык і кажы, што трэба, а не круці тут духамі. Кру-цель…

— Дык я гэта… вас жа слухаю.

Стары выцірае рукавом сліну, што асела на вуснах ды барадзе, калі хвіліну таму зайшоўся кашлем, сунецца ў сенцы рыхтаваць месца і начынне для забіцця жывёліны.

К поўдню справа зроблена, і дзед Антук падае ўнучцы каманду наконт абеду: папрацавалі — след падсілкавацца.

Стравы простыя, звыклыя, свае: шчаўе, салата з цыбулі і радыскі з кропам, бульба. Затое яечня не абыякая, а з варанай кілбасой. Кілбасу прывезла з Літвы, дзе жыве з бацькамі-настаўнікамі, Марута, і тут, у Касцяніцы, як і ва ўсім Лучаі, дзе і на смак яе даўно забыліся, бо дэфіцыт, такі пачастунак выглядае ледзь не княскім. Адзінае, што замінае Стасіку адчуць асалоду ад яго напоўніцу, — няўменне карыстацца відэльцам і ножыкам. У іх дома гэткімі дробязямі не пераймаюцца: галоўнае — пад'есці, а розным там гарадскім выбрыкам, кшталту сталовага начыння, увагі ніхто не надае. Нават Віцюня, які, здаецца, няблага-такі абцёрся ў горадзе за гады вучобы, на правілы этыкету за сталом надта не зважае.

Хлопец бачыць, як спраўна дае рады прыборам, быццам нарадзілася з імі ў руках, Марута, і яму ўпершыню ў жыцці няёмка за сябе. Ён спрабуе рабіць так, як робіць дзяўчына, і сёе-тое ў яго, праўда, атрымліваецца. Але коштам такое напругі, што, здаецца, ускочыў бы з-за стала і пабег куды вочы глядзяць.

Ды — нельга, так што міжволі даводзіцца трываць. І не проста трываць, а яшчэ і на дасціпныя Маруціны пытанні ў перапынках між тымі трыванкамі адказваць. Добра, дзед Антук жуе памалу, дык хоць збольшага сарыентавацца ва ўласных рухах застаецца Стасіку хвіліна. І ён упарта працягвае капіраваць рухі і жэсты дзяўчыны. Ён — упарты ад нараджэння і, нягледзячы на не такі ўжо і значны жыццёвы досвед, дакладна ведае: кінуць у роспачы пачатае — апошняя справа, наступствы якой калі каму і могуць абыходзіць, дык найперш сабе самому.

Праз паўгадзіны абед заканчваецца, час Стасіку адыходзіць дадому. Марута мкнецца ў кухню мыць посуд, але дзед Антук распараджаецца па-свойму: калі ўжо госць у хаце, дык госць, калі ўжо прынялі яго, то і праводзіць трэба як след.

Ці то гэтак пацвельваецца стары, ці то гаворыць усур'ёз, не зразумець. Хутчэй за ўсё жартуе, ды Марута ўспрымае дзедавы жартачкі за святую праўду і выходзіць следам за Стасікам на двор.

Колькі часу абое крочаць моўчкі. І толькі параўняўшыся з Модзевай хатай, смялеюць, распачынаюць гаману. Дакладней, Марута распачынае. Зачэпка для гамонкі — спусцелае Модзева жытло. Дзяўчыне карціць зазірнуць у акно хаты, дагэтуль яна гэта рабіць

баялася, а вось цяпер, маючы добрага хаўрусніка, магла б, маўляў, і рызыкнуць.

Ды ўгледзець што-небудзь праз запарушаную пылам шыбіну адзінага не запятага знутры фіранкамі акна не так проста. Апроч печы, што няўклюдна прыхінулася да сцяны праваруч ад уваходa і страхавіта зеўрае ў акно разнасцежаным чорным прыпекам, нічога не бачна, і дзяўчыну гэта расчароўвае.

— Невясёлае відовішча, — кажа яна і хукае вуснамі на пласт пылу. — А дзед, уяві сабе, зусім не баіцца. Ссыпаў тут зерне ў сенцах і штодня ходзіць па яго для курэй. Набярэ ў гарнец, а потым сядзе яшчэ на парозе ды папаліць у самоце. Нервы ў чалавека! Мяне ўчора пасылаў па тое зерне, але я не магу адна адважыцца пайсці, страшна.

— Марута — літоўскае імя? — знарок, каб перавесці размову на што-небудзь весялейшае, пытаецца Стасік і першы адыходзіць воддаль ад акна.

— Канешне. Бацькі наўмысна далі такое, каб з літоўцаў не вылучацца. Тыя вельмі любяць сваё, вось і даводзіцца міжволі падрабляцца.

Над студняй ля ўзножжа пагурка нейкая дробная жамяра таўчэ мак, і яе так шмат, быццам зляцелася сюды з усяе акругі. Гэта дзіўна, бо побач балота і іншага, больш вольнага месца разгуляцца крылатаму кузюрству зусім не бракуе.

Хочацца піць. Стасік адчыняе века студні, набірае конаўкай з вядра вады, робіць колькі глыткоў. Спахапіўшыся, што, мабыць, трэба было спачатку прапанаваць дзяўчыне, падае ёй конаўку. Але яна адмаўляецца.

— Я не магу з калодзежа піць, — кажа і, дэманструючы гіду, прыкрывае рот тонкімі, з вузенькімі

карункамі манікюру, пальцамі. — Наш сусед па лецішчы ў студні ў сябе на ўчастку летась утапіўся, дык як згадаю пра тое — аж млосна робіцца. Артыст, званнем нейкім не ўганаравалі, то абкруціў сябе ланцугом і сіганўў у прадонне. Толькі праз месяц знайшлі, рука з вады вытыркнулася. А датуль ваду пілі… Жах…

— Сапраўды, — кажа Стасік і міжволі дзівіцца, як увадначас перамяніліся пры згадцы пра страшнае вочы дзяўчыны, перарабіліся з светла-блакітных на цёмна-сінія. Як надвор'е ўвосень: толькі што сонца свяціла, і вось табе — аблачына, ды такая, што да вусцішу адзін крок.

— Ну, мабыць, далей я не пайду. — Марута спыняецца, падае хлопцу руку. — Прыходзь да нас. Дзед як дзед, а я радая буду. Па гарох, можа, разам сходзім, а то адной сумна. І страшна, папраўдзе, такія тут у вас жарсці наўкола… — кажа і, быццам спахапіўшыся ды засаромеўшыся, што вось жа гэтак зляцела з вуснаў двухсэнсоўнае пра сумесную выправу па гарох, адводзіць убок пагляд зноў светлых-светлых сваіх, пад колер кветак на сукенцы, вачэй.

— Доўга ж штосьці ты бавіўся ў Чабана. — Мачыха вымае з кошыка асвежаваную тушу труса, кладзе на стол. — Ого! Здавалася, такі вялікі звяруга, а во — колькі тут таго мяса, хіба што раз сям'ёю пад'есці. Але ж будзе вячэра, — кажа ды, узброіўшыся нажом, пачынае рэзаць труса на кавалкі.

Мачыха рэжа тушку, а Стасік ідзе ў клуню. Але гэтым разам без падручніка: іншае ў галаве. Іншае мільгаціць у глуздах, адбірае раўнавагу, ды толькі нават самому сабе ў тым прызнацца — хіба адважышся?

Пражаніна дыхтоўная, духмяная: гатаваць абедзве Тарасевічыхі, што мачыха, што Ксеня, умеюць. Ксеня адкладае трусіную лытку на патэльню, ставіць на прыпек — для Віцюні. Ён сёння даводзіць да ладу адзін з камбайнаў і вернецца дахаты добра калі апоўначы.

— А ты што не сядаеш, Стасік? — Мачыха здзіўлена глядзіць на яго, штурхае да стала. — Еш, пакуль цёплае.

— Я, мабыць, крыху пазней, — кажа ён і паказвае разгорнуты падручнік. — Дачытаю раздзел і тады ўжо сяду.

— Відаць, добра накармілі ў дзеда. Ну, глядзі, як хочаш.

Жанчыны пачынаюць есці, а Стасік ідзе на веранду — быццам дачытваць распачатае. Сядзіць на зэдлі пры сходах, робячы выгляд, што чытае, чакае, калі жанчыны пойдуць з кухні.

Першая адыходзіць, саступіўшы Ксені па хвіліне спрэчкі месца пры мыйцы, мачыха. Праз колькі часу і Ксеня ідзе прэч.

— А як жа дзеўка, Стасік? — пытаецца наастатак і гарэзліва ўсміхаецца. — Спадабалася?

— Дзеўка як дзеўка, — адказвае Стасік і, ледзь зачыняюцца за братавай дзверы, ляціць у кухню.

Есці пасля шчодрага пачастунку ў дзеда Антука яму яшчэ не хочацца, ды ахвота патрэніравацца ў карыстанні прыборамі, ды навучыцца валодаць імі так, як умее Марута, такая вялікая, што і аднаго імгнення патрываць няўсцерп.

Нож і відэлец капрызяць, слухацца не жадаюць, быццам толькі і мараць пра тое, каб не дацца ў рукі, выслізнуць з пальцаў ды паляцець на дол. «Жах», —

узгадваецца сказанае Марутаю ля студні пра чужое страхавітае.

І тое — жах, і свайго, уласнае гадоўлі жахлівага, — з каптуром. Ды толькі думаць пра яго штохвіліны, як наўме зусім іншае, зусім у Стасіка гэтым разам няма жадання.

Ён усхопліваецца з месца і адразу ж, яшчэ як след не прачнуўшыся, пачынае шукаць вачыма брата. Шнарыць паглядам па цемнаватай клуні і ўсё ніяк не можа спрасоння даўмецца, ці то вечар гэта яшчэ, ці то ўжо раніца. Так неўпрыцям змарыў яго сон, што ўсё дарэшты ў галаве зблыталася.

Прыкрытая сурвэткаю талерка з некранутаю порцыяй братавай пражаніны на зэдлі збоч тапчана — відаць, Ксеня прынесла, не дачакаўшыся мужа ў хаце, — прыцягвае на хвіліну ягоны пагляд, збольшага вяртае да явы. Канешне, раніца ўжо, вось толькі не так штосьці навокал, як заўсёды.

Здорка коратка, быццам нехаця, абзываецца з куросадняў, але тут жа і заціхае, улагоджаны даверліва-прыязным шалясценнем крылаў дзясятка курыц і ціўканнем куранят у загончыку пры перагародцы.

Віцюні на месцы няма, а з хаты даносяцца праз панадворак трывожныя, нязвыклыя для гэткае пары — на дварэ яшчэ шаравата — сцішаныя адлегласцю гукі: ні то шэпт, ні то ўсхліпы.

Стасік ускідвае на плечы саколку, сунецца да выхаду.

Мачыха мітусіцца па пакоі з кута ў кут, падыходзіць раз-пораз да Ксені. А тая сядзіць на канапе, утаропіўшыся нежывым, мутным паглядам у адну кропку, зыбаецца ўбакі шырокім, распухлым ад цяжару ў жываце целам. Затым усхопліваецца з месца, дастае з пу-

дэлка Віцюнеў дарунак, пярсцёнак, кідае на дол і пачынае таптаць яго нагамі. Топча так апантана, што, здаецца, на шчэпкі патрушчыць ім лядашчую, паточаную грыбком падлогу.

Не так у хаце, як было дагэтуль, але што ажно гэтак не так — і не адразу да Стасіка даходзіць. І толькі калі спыняецца ля весніц чужое аўто і трое мужчын уваходзяць, грукаючы чаравікамі, у пакой, ды адчайна пачынае галасіць Ксеня, ды кідаецца вопрамеццю на двор, трымаючыся даланёй за шчаку, быццам хоча пазбавіцца зуба, мачыха, робіцца зразумелым: нешта здарылася з Віцюнем.

4

— Прачніцеся! Ды прачніцеся ж вы! Станіслаў Мікалаевіч! Прачніцеся…

Ён расплюшчыў вочы, хіснуўся наперад амярцвелым пасля доўгага нерухомага трызнення ў крэсле целам.

Зіна сядзела перад ім на кукішках, энергічна шкуматала пальцамі за рукаў джэмпера. За ёю, загароджваючы постаццю дзверы ў калідор і азіраючы спадылба пакой, пераступаў з нагі на нагу атлетычнага складу маладзён год трыццаці з вострымі, як у тхара, вачыма і кірпатым, крыху прыплюснутым, збітым набок, як у баксёра, носам.

— Раніца ўжо? — прамовіў Станіслаў Мікалаевіч і памкнуўся падняцца. — Раніца?

— Дзе ж раніца! Палова дванаццатай, уся ноч наперадзе. Я на хвілінку з дзяжурства прыбегла, уваходжу — а вы тут у крэсле седзіце… Камп'ютар падключаны… непарадак, — лапатала Зіна. — Кладзіцеся ў ложак, а то зноў неўпрыцям седзячы засняце…

— Як-небудзь ужо дам сабе рады, — сказаў ён неахвотна і падняўся з крэсла. І толькі раскрыў рот, каб

спытаць, што гэта, маўляў, за старонні чалавек у доме, як Зіна апярэдзіла яго:

— Гэта Валерка, сваяк мой, адведаць мяне прыехаў, — сказала і ўзяла маладзёна за руку. — Калі вы не супраць, хай бы пераначаваў у маім пакоі. Ужо прабачце, што так неспадзявана, без папярэджання, атрымалася, што ж рабіць… Дазволіце?

І, не дачакаўшыся згоды, хуценька павяла госця ў свой пакой.

— Хай сабе, — не жадаючы пакідаць сітуацыю ў стане двухсэнсоўнай няпэўнасці, хто ж тут у хаце гаспадар, прамовіў ён наўздагон пары і пайшоў да ложка.

— Усё, я адыходжу, — гукнула праз колькі хвілін з калідора Зіна. — Не забудзьцеся зашчапіцца, Станіслаў Мікалаевіч, а то ўлезе хто паначы ў хату, пакуль спаць будзеце.

Зініна заўвага раззлавала яго.

— І што тады? — сярдзіта азваўся ён і ўзяўся рассцілаць ложак.

Кульнуўся не распранаючыся на прасціну, выцягнуў з асалодаю ўздоўж сцяны ногі. Уявіў, як уранні задасць Зіне прачухонца за тое, што прывяла без дазволу ўнаначкі незнаёмага дзецюка, але тут жа і супакоіўся.

Што Зіна побач, што незнаёмец гэты, што яшчэ хто — якая яму розніца? Гэтулькі людзі не жывуць, колькі год ён ужо нічога і нікога не баіцца. Быў калісьці страх, і не абы-які, ды сплыў… Адбаяўся сваё, час і якую-ніякую харобрасць, хаця б і дзеля выгляду, хаця б і перад самім сабою, урэшце прадэманстраваць…

Зрэшты, можа, нават і не страх то быў тады, у бацькоўскай лучаеўскай хаце, а хутчэй — помарак. Быццам хто знячэўку ледзяною вадой абліў ці ўшчыкнуў спрасоння так моцна, што ажно ў глуздах ды ва ўсім

целе тое ўшчыканне натужліва-спружыністым болем азвалася. Такі страх, што не ад натуры ідзе, як звычайна, а ад свядомасці, ад жадання хаця б збольшага даўмецца, як яно, такое вось нялюдскае страхоцце, магло з табою ды з тваімі блізкімі ўчыніцца.

Ягоны брат Віцюня, пра чалавекалюбства якога ды працавітасць у газеце нават пісалі, — забойца, ды яшчэ і серыйны? Той самы душагуб, пра якога ў наваколлі на сотню вёрстаў адно і размоваў было і якому якіх толькі пастак не стаўлялі, каб злавіць ды абясшкодзіць, пінкертоны мясцовага і нават сталічнага разліву? Не бадзяжка які-небудзь бяздомны з-пад моста, а зычлівы брат ягоны адзінакроўны? З-за якога невінаватага небараку Модзю ў меху ў раку скінулі?

А сапраўдны забойца ўвесь гэты час у клуні на тапчанчыку, на чысцюткай прасціне спакойна сабе спаў і гора не ведаў. Прыцемкам высочваў дзе-небудзь у ціхім месцы адзінокую маладзіцу, садзіў у аўто, адвозіў у глухое месца паблізу Касцяніцы, гвалтаваў, накідваў на шыю пельку, душыў, а потым вяртаўся дадому, мыў рукі, падносіў жонцы ці мачысе пярсцёнак з рукі няшчаснай, перакідваўся са Стасікам словам-другім і засынаў як забіты. І ўсё гэта брат-апякун ягоны, Віцюня?

Ды, як ні хацелася верыць, што ўсё гэта няпраўда, лухта, веры даць давялося. Шостая ахвяра, жанчына не баязлівага, відаць, дзясятка, дала рады вырвацца з рук забойцы. Дзеду Антуку закарцела сярэдначы папіць сцюдзёнай вады са студні, пайшоў да яе, а маладзіца тая, ахвяра, убачыўшы святло ад ягонага ліхтарыка, і паклікала ўпомачкі, закрычала штомоцы. Гвалтаўнік збег, а яе паказанні і сталі потым нітачкай, што прывяла ўрэшце да астатніх братавых злачынстваў.

Віцюня паводзіў сябе падчас следства спакойна, ва ўсім прызнаўся. І нават, як казаў пасля галоўны дазнаўца, зрабіў гэта даволі ахвотна. Распавёў пра першую, яшчэ часоў вучобы ў тэхнікуме, няўдалую спробу нападу на жанчыну, дэталёва апісаў уласны стан прадчування чагосьці значнага напярэдадні ажыццяўлення кожнага чарговага забойства. На пытанне, ці адчуваў калі-небудзь жаданне задушыць жонку, адказаў станоўча, дадаўшы, што стрымлівала ад фатальнага кроку думка пра дзяцей. Таму, маўляў, каб не спакусіцца, і спаць клаўся ўлетку ад Ксені асобна — у клуні з братам. Адзінае, што выклікала ягоную нечакана эмацыйную нязгоду, — тое, што ўсіх забітых ім жанчын ён быццам бы гвалціў. «Толькі траіх, а не ўсіх пяцярых, як вы кажаце», — выгукнуў з выглядам абражанае нявіннасці і пасля гэтага ўжо не прамовіў больш ані слова.

Віцюню прыгаварылі да пакарання смерцю. Гэта і быў той момант, ад якога Стасік і перастаў чаго б то ні было баяцца. Раз і назаўсёды пазбыўся страху. Апроч аднаго і, мабыць, самага невыноснага, які толькі можна ўявіць, — заўсёднага, неадчэпнага страху быць пазнаным. Штодня ўдаваць з сябе кагосьці іншага, быць не тым, хто ты ёсць насамрэч паводле сутнасці сваёй і нараджэння, — што можа быць горай?

Першая знікла тады з поля зроку Ксеня, неўзабаве па дазнанні. З'ехала з дзіцем на руках і другім ва ўлонні ў Грузію, дзе жыла на той час ці то нябожчыка бацькі яе, ці то сканалай падчас позніх родаў маці нейкая далёкая сваячка, ды і растварылася ў людской масе на дзесяць гадоў. З'ехала б, пэўна, і раней, як толькі ўсё раскрылася, але нельга было, бо мусіла даваць пака-

занні. І ўсё ў атмасферы падазронасці, касых паглядаў людзей. А то і непрыхаванай нянавісці. Штодня быць з чалавекам упобачкі і не здагадвацца, чым ён жыве, чым дыхае, — як гэта? Хто дасць веры, што такое магчыма?

Дасталося людскога асуджэння і мачысе: залатых каронак, бач ты, наставіла ў роце з нарабаванага, а спытаць, адкуль тое золата ўзялося, не парупілася — ці можа такое быць? Няўжо не здагадвалася, што да чаго? Жанчына пажыла ў хаце разам са Стасікам да суда над Віцюнем і, як толькі стаў вядомы вырак, пераехала дажываць век у горад да сына з нявесткаю.

А неўзабаве і Стасік з'ехаў з бацькоўскага дому. Не развітаўшыся ні з кім, ні слова нікому, нават самым блізкім сябрам, нават Маруце, якая акурат зноў заявілася ў адведзіны да дзеда Антука, не сказаўшы, згроб у пляцак самае неабходнае з рэчаў і падаўся куды вочы глядзяць. Тады ўпершыню за ўвесь час, што доўжыліся допыты і суд ды месяцы невыказна пакутлівага існавання ў атмасферы цікаўнасці ды перашэптвання знаёмых і старонніх людзей, і парадаваўся ўпотай за бацькоў — што няма іх ужо сярод жывых, што паспелі сысці, не ўведаўшы ўсяго гэтага жаху, гэтае нялюдскасці.

Невядомасць бянтэжыла яго, але, папраўдзе, палохала не надта. І зразумела: як ні круці, з усіх адведзеных чалавеку лёсам наканаванасцяў гэтая — няпэўнасці будучыні — у сямнаццаць не самая страшная. Ва ўсялякім разе так яму, Стасіку, тады яшчэ Тарасевічу (прозвішча ён пад заяву аб гарантыі неразгалошвання памяняў пазней ужо, па дэмбелі з войска, у год паступлення на завочнае аддзяленне тэхнікума) думалася.

Што цяпер раніца, а не вечар яшчэ, здагадацца было лёгка па паску сонечнага святла, што прабівалася ў па-

кой понізу гардзіны. Ды яшчэ па галасах з кухні — нягучных, знарочыста сцішаных, быццам суразмоўцы, што там гаманілі, адно толькі і мелі наўме, каб яго, нямоглую старую саву, няўрокам дачасна не пабудзіць. Адзін з галасоў быў Зінін, другі, мужчынскі, мяркуючы па ўсім, належаў доктару Мядзюту, мясцоваму медыцынскаму святілу. Голасу начнога візіцёра кватаранткі чутно не было.

Ён варухнуўся, звыклым жэстам рукі паманувся дастаць з пуфіка адзенне. Адзення, аднак, там не было, і яшчэ не адна хвіліна спатрэбілася яму, каб уцяміць, што спаў ён, аказваецца, не распранаючыся. Але гэта, на дзіва, не толькі не засмуціла яго, наадварот, чамусьці развесяліла ды дадало гумору.

— Вы прачнуліся, Станіслаў Мікалаевіч? — пачуўшы, мусіць, ягонае шавяленне, гукнула праз сцяну Зіна. — Тут Васіль Дарафеевіч да вас. Устанеце, ці яму ўвайсці?

— Падымуся сам, — адказаў ён і паспрабаваў перакуліцца на бок, каб ямчэй было потым спускаць ногі на дол. Перакуліцца, аднак, ніяк не ўдавалася: цела быццам скавала абручам, а рукі так спруцянелі, што і з выгляду нагадвалі прыхопленыя прымаразкам капусныя качарэжкі.

— Памагчы вам, можа? — западозрыўшы, мусіць, нешта не тое, зноў гукнула Зіна. — Дык жа кажыце.

— Дарафеевіч… — ціха паклікаў ён і ледзь-ледзь пасунуўся неслухмяным целам да сцяны.

Яны ўжо размаўлялі з доктарам каля паўгадзіны, а да сутнасці справы, да таго, што найбольш цікавіла Станіслава Мікалаевіча і найбольш яму цяпер абыходзіла, так усё яшчэ ніяк і не дайшлі. Дарафеевіч ветліва ўсміхаўся, распавядаў пра нейкія новыя метады

лячэння, пра цуды выздараўлення, торкаў пад нос сігнатуры з апісаннямі лекаў, а як толькі даходзіла да галоўнага, адразу пачынаў муляцца, ды штосьці круціць-муціць, ды пераключацца на стороннія тэмы. Урэшце Станіслаў Мікалаевіч не вытрымаў і задаў пытанне наўпрост:

— І колькі, па-вашаму, мне засталося ліпець?

Пытанне, хоць і прагучала неяк, як здалося яму самому, занадта ўжо па-кіношнаму, просталінейна, доктара, аднак, калі і збянтэжыла, дык ненадоўга, на адно імгненне, не болей. Наадварот, ён быццам даўно ўжо чакаў яго і цяпер мог, да радасці сваёй, скінуць з сэрца цяжар змушаных недагаворак і непрыемнага кружлянння наўкола слізкай тэмы.

— Ох, майстар жа вы змушаць, Станіслаў Мікалаевіч, — сказаў і хутка, быццам, з боязі, што пацыент перадумае ведаць праўду, дадаў: — Ох, майстар! Ну, калі меркаваць па выніках ультрагукавога даследавання, то — з месяц. Плюс — мінус… Самі разумееце.

— Месяца мне дастаткова, — сказаў Станіслаў Мікалаевіч. — Упаўне. Упаўне дастаткова.

Лекар, збянтэжаны, мусіць, такою нязвыкла абыякавай рэакцыяй хворага на ягоныя словы, падняўся з месца, зазбіраўся адыходзіць.

— Калі што спатрэбіцца яшчэ — падайце знак.

— Абавязкова. — Станіслаў Мікалаевіч прыўзняў голаў, варухнуў на развітанне рукою.

— Дзякуй вам.

Сказаў тое і ўсміхнуўся: усё, што мела для яго значэнне, ён цяпер ведаў, астатняе, быў упэўнены, — справа характару. Характарам жа ды ўсім, што спрыяе яго гартаванню, як добрым, так і благім, Бог яго не абдзяліў. Галоўнае ж на гэтую вось хвіліну — падняцца.

Праз гадзіну ён быў на нагах. Калені і рукі няўзнак выпрасталіся, і ў галаве пасвятлела, і цела неяк увадначас наспружынілася — быццам сам Усявышні вёў яго ў патрэбным кірунку, надаючы моцы для здзяйснення задуманага.

Першае, што ён зрабіў, адчуўшы якую-ніякую палёгку, — выправіў Зіну ў краму ды аптэку, хоць пільнай патрэбы ні ў харчы, ні ў леках не было. І, як толькі зачыніліся за кватаранткаю дзверы, адразу пасунуўся да ложка.

Рахунак быў на месцы, ціхамірна ляжаў у выдзяўбанай, відаць, ранейшымі гаспадарамі дома ды прыкрытай шпалерамі нішцы ў сцяне пры самым ложку. Там, дзе паклаў яго год таму, калі пасяліўся ў гэтым лядашчым, не ў прыклад не так ужо і шыкоўнай, але больш-менш дагледжанай сваёй кватэры за паўтысячы вёрстаў адсюль, якую прадаў неўзабаве пасля інфаркту ды выхаду на пенсію па інваліднасці, дамку. У дамку, які і набыў, уласна кажучы, не так дзеля даху над галавой, як не ў апошнюю чаргу і з намеру займець перад сыходам у лепшы свет хоць якую капейчыну з розніцы між прададзеным і набытым. Розніца ж аказалася, зрэшты, не такой ужо малой, на гэтакую ён, папраўдзе, нават і не разлічваў. І цяпер трэба было ёю як след распарадзіцца.

Распараджацца грашыма ён умеў заўсёды. Нават у найгоршыя часы, у разгар так званае перабудовы і пасля яе, калі ўсё наўкола кулялася-грымела і людзі ўвадначас гублялі гадамі наашчаджанае падчас чарговых дэвальвацый, у яго неяк атрымлівалася так, што заставаўся ён калі і не ў выйгрышы, дык і стратаў асаблівых не цярпеў. Можа, таму, што абавязак Ксені

памагаць адчуваў, што і рабіў рэгулярна, пераводзячы на яе рахунак раз у пару месяцаў, а то і часцей, нягледзячы на слабыя пратэсты жанчыны, сякія-такія сумы. Ды і сябе крыўдзіць не было жадання на радасць розным ліхварам-прайдзісветам. Жыць больш-менш прыстойна захочаш — чаму толькі не навучышся.

Што спадкаеміцамі будуць пляменніцы, ён вырашыў даўно і беззваротна. Заўсёды гэта ведаў і, нават калі б яны ягонага дарунка з нейкіх прычын прыняць не захацелі, рашэння свайго нізавошта не памяняў бы. І не толькі з-за неабходнасці хоць да каго прыхінуцца душой у шарую, як зараз во, калі зусім занямог, гадзіну, не.

Патрэба прыхінуцца — так, канешне, але ж не адна яна ім зараз кіруе. Хутчэй, можа, найболей ім, сем'янінам паводле складу характару ды адзінотнікам па волі лёсу, покліч сваяцтва кіруе, доўг крэўнай повязі, жаданне сплаціць блізкім людзям недададзенае (ці аднятае) іншымі блізкімі, тым жа братам. А яшчэ, мабыць, прыроджаная, што дасталася ў спадчыну, відаць, ад маці, схільнасць да парадку, педантычнае, на мяжы самаедства імкненне ўсё даводзіць да ладу, рабіць так, каб ніякіх прагалаў у любой справе не заставалася. Што, між іншым, у асяроддзі, дзе ўсё неяк збольшага, абы-як, прыблізна, рабіць і не так ужо проста. А зрэшты, як яго, такое імкненне, ні назаві, усё будзе, напэўна, недакладна. Адно дакладна: дробязным ён не быў ніколі, і калі гэтак дазвання апанавала ім цяпер думка пра грошы, то гэта наўрад дробязнасць дэманструе рожкі.

Адзінае, чаго б хацелася яму пазбегнуць у выніку, дык гэта таго, каб даць падставу для роспытаў-росшукаў і здагадак старонніх людзей. Бо зусім не дзеля таго што Ксеня, што ён, адмовіўшыся ад уласнага мінулага, гэтулькі год жылі, не здымаючы ні на хвіліну

масак. Так жылі, што калі дзе што і вытыркнецца з непажаданага — не іх будзе віна.

Час прыспеў, і трэба цяпер зрабіць апошні, рашучы крок. Галоўнае — перадаць спадкі. Не з рук у рукі, вядома, перадаць, а аформіць як след рахунак. Перааформіць або прыпісаць завяшчанне, а пасля ўжо паведаміць дзеўкам пра яго наяўнасць. І зрабіць усё як мага хутчэй. У такой справе — як з тым цымантам на заводзе. Прамарудзіш хвіліну, глядзь — а замес загуснуў ужо дарэшты, і ўсе старанні тады, усе намаганні — кату пад хвост.

Ён падумаў, што вось жа схібіў, не аформіўшы завяшчання пры адкрыцці рахунка, але тут жа супакоіў сябе тым, што не збіраўся ж ён во гэтак хутка, усяго толькі год пажыўшы ў гэтым глухім гарадку, паміраць.

Дзяўчаты, відаць па ўсім, дружныя, таму ён аформіць рахунак на адну Нану. А там ужо яны самі неяк дадуць рады міжсобку разабрацца, родныя сёстры якніяк. Толькі вось як гэта зрабіць, каб не навесці, як абяцаў гэта Ксені, на бацькаў след ды не ўцягнуць праз тое няўрокам у злыбяду? Жылі дзеўкі бязроднымі гэтулькі год, пражывуць і далей. Часам яно і лепш таго роду не ведаць, чым штодня сцінацца пад цяжарам ведання.

Завяшчанне — гэта дробязь, напісаць яго — раз плюнуць. Але як пісаць, калі ён і імя Нанінага па бацьку не ведае? Можа, Віктараўнай Ксеня яе запісала, а можа, як-небудзь іначай… Дату нараджэння ён памятае, неаднойчы падарункі да яе дасылаў. А пра імя ды імя па бацьку не парупіўся ў свой час спытаць у Ксені, і цяпер лішняя загвоздка. Зноў жа, з адрасам праблема…

Зіна ўвайшла ў хату, кінула на стол пакунак з хлебам і лекамі, адкрыла лядоўню, стрэльнула ў ягоны бок няўхвальным позіркам.

— Во, па хлеб паслалі, а тут цэлы бохан амаль некрануты ляжыць, — сказала дакорліва і ўзялася распакоўваць пакупку. — Ну, Станіслаў Мікалаевіч, ну ж жартаўнік вы, аднак.

— А ты не жартаўніца з гэтым сваім Валеркам! — знарок падпускаючы ў голас як больш непрыязнасці, выгукнуў ён і нават тэпнуў сярдзіта, чаго даўно з ім ужо не здаралася, нагою. — Сваяк! Адведаць прыехаў! А як вярнулася на дасвецці з працы, дык з пакоя такія охі-ахі, такія стогны даносіліся, што хоць з дому ўцякай. Ну, Зінаіда…

— І здоба во яшчэ, і баранкі, і пернікі, усяго паўнютка, — ці то знарок не зважаючы на ягоныя словы, ці то прысаромленая пачутым, працягвала Зіна. — Якое марнатраўства, Станіслаў Мікалаевіч…

— Прабач, не здагадаўся паглядзець, — гэтаксама імгненна адыходзячы ад злосці, як і дазволіў ёй аваладаць сабою, адказаў ён і, вось ужо зноў заняты выключна думкамі аб рахунку, націснуў кнопку запуску сістэмы.

5

Неўпрыкмет і надвячорак нахапіўся, а Нана ўсё сядзела пры тэлефоне і ніяк не асмельвалася набраць нумар Станіслава Мікалаевіча.

Двойчы ўжо тэлефанавала ёй сястра, пыталася, як ды што там са старым, угаворвала не камплексаваць, і ўсё дарэмна. Быццам няведамая нейкая, нябачная сіла спалярушыла Наніны глузды, не давала зрабіць тое, што і Але надоечы абяцала, і самой, адчувала, магло б дадаць унутранае раўнавагі. «Адкуль гэтая нерашучасць?» — круцілася ў галаве неадчэпная думка, і цяжка вызначыць было, чаго насамрэч было больш у той

нерашучасці — боязі ці зацятага нейкага, незразумелага нежадання прадэманстраваць перад чужым чалавекам зацікаўленасць ва ўсёй дзіўнай гэтай, неспадзяванай, як снег на голаў сярод лета, гісторыі.

Але сядзець вось так, склаўшы рукі, таксама не выпадала, і яна, так і не наважыўшыся зняць слухаўку, вырашыла Станіславу Мікалаевічу напісаць. Адкрыла скрыню і ўздыхнула з палёгкаю: пакуль яна мучылася пры тэлефоне, стары, не дачакаўшыся, мусіць, ад яе весткі, сам ёй напісаў.

Як і папярэднія ягоныя допісы, гэты быў такі ж самы сухі і ветліва-стрыманы: ні эмоцыі, ні намёку на імкненне да хаця б якой-кольвечы большай, чым дагэтуль, ступені шчырасці. Вось толькі аб'ём ліста куды большы — амаль удвая.

Ягоныя справы нішто, але мае ён і сякія-такія клопаты. Па-першае, хоча даслаць ёй і Але невялікі прэзент, а вось поўнага імя ды імя па бацьку і адраса, на жаль, не ведае, то ці можна было б гэтую справу хуценька праз электронны допіс уладзіць? Адрас і імя яму патрэбныя тэрмінова, бо заўтра з раніцы ён пойдзе па справах у горад, то вось і зручнасць была б разам і на пошту зайсці, адправіць падарунак, каб потым адмыслова нягнуткія свае старэчыя ногі лішні раз аб асфальт не біць. Па-другое, вельмі б яму хацелася займець здымак сваёй камп'ютарнай суразмоўніцы, дык ці не магла б яна што-небудзь на ўсцеху яму прыслаць?

Колькі часу Нана сядзела ў задуменні. Але нядоўга. Напісала поўнае сваё імя, адрас, далучыла адзін з апошніх, зробленых сёлета падчас святкавання Новага года, здымкаў, не адсылаючы ліста, пайшла тэлефанаваць сястры.

Ала была ці то чымсьці вельмі занятая, ці то проста засмучаная: і слухала неяк наўздзіў няўважліва, і адказвала раздражнёна, быццам нехаця.

«Штосьці зноў з Паўлам, няйначай», — падумала Нана. І не памылілася: памаўчаўшы хвіліну, сястра гучна ўсхліпнула, агаломшыла знаёмаю, колькі разоў дагэтуль выдаванаю тырадай:

— Усё, буду разводзіцца, не магу больш трываць. Зноў з бухгалтаркай сваёй скруціўся, зноў штодня апоўначы вяртаецца… Як жыць? Ну як, скажы? Гэта ж немагчыма! І яшчэ ўвагі нейкай асаблівай, паскуднік, патрабуе… Ой, прабач, штосьці я зусім расклеілася, і гаварыць нават не хочацца… Ты вось адна, і добра табе… Шчаслівая! І заставайся адна, не купляйся ні на якія мужчынскія абяцанкі.

І толькі калі Нана сказала пра намер Станіслава Мікалаевіча даслаць прэзент, крыху супакоілася, нават быццам павесялела.

— Прэзент? Ну, хай шле, хто ж ад прэзентаў адмаўляецца? А можа, там такі прэзент, што да скону нам яго на пражыццё хопіць… Ці, наадварот, можа, і зірнуць не будзе на што. Старыя — тыя яшчэ дзівакі, ты ж ведаеш… Падорыць на рубель, а думаць і казаць будзе ўсім пасля, што азалаціў.

Штосьці бурчэў, чутно было, шубуршыўся побач пры тэлефоне Павел, але слухаўкі ў Алы, каб, як заўсёды, скарыстаўшыся паўзай, уставіць у размову важкі свой, з'едлівы мядзяк, не выхапіў. Наадварот, неўзабаве, што зусім было на яго не падобна, сціх, быццам вады ў рот набраў — ці не загладжваў гэткім чынам перад жонкай правіну.

— Дык не адмаўляйся, няхай шле, — падсумавала Ала. — Можа, праўда, вартае там што… Не самім жа нам ехаць па той прэзент. Ага… Ад'ехацца не паспе-

еш, як тут, глядзіш, прафураў розных, сучак юрлівых у хату навядуць…

Зноў штосьці жэкнуў, чутно было, Павел, зноў усхліпнула сястра, але Нана на тое ўжо ўвагі не звяртала.

— Добра, зараз жа адпраўлю яму адказ, — сказала і падсела зноў да камп'ютара. Шчоўкнула мышкаю, дачакалася сігналу «Ліст адпраўлены» і тут толькі спахапілася, што за размоваю з сястрой і забылася дадаць да допісу тое, што перад гэтым хацела: папрасіць Станіслава Мікалаевіча, каб прыслаў свой здымак.

Паспрабавала ўявіць, як ён выглядае, ды неўзабаве, дарэмна патужыўшыся глуздамі колькі хвілін, і махнула на справу рукой. Можа, таму, што ба́цькі свайго ані дзеда ніколі не бачыла, знешнасці незнаёмых старэйшых мужчын намаляваць уяўленнем ніколі толкам не магла. Зморшчыны, вусы, магчыма, барада, скроні сівыя, пукі валосся ў вушах, як у дзядоў вунь на дварэ ў альтанцы або ў фільмах — усё быццам правільна, ды разам з тым і не, бо на адзін капыл, трафарэтна, ненатуральна.

6

Допіс ад Наны з яе адрасам і поўным імем ды імем па бацьку Станіслаў Мікалаевіч атрымаў акурат дарэчы, так, як і спадзяваўся — дзесьці за паўгадзіны да адкрыцця банка. Перапісаўшы дадзеныя на асобную цыдулу, памкнуўся адчыніць файл са здымкам, але тут жа і адклаў справу: гэта не да спеху, можна будзе паглядзець і пасля, іншае цяпер галоўнае.

— Можа, і мне з вамі пайсці? — падазрона нецярплівым, быццам толькі таго моманту і чакала, калі ж ён урэшце пойдзе з хаты, голасам спытала, ледзь

толькі ён падняўся з-за камп'ютара, Зіна і лісліва ўсміхнулася. — Раптам што якое на дварэ з вамі здарыцца? Вось прыхопіць вас неспадзеўна вашае сэрца — што тады, Станіслаў Мікалаевіч?

— А што, як чужаніцаў мне ў хату без ведама майго ды ў маю адсутнасць навядуць? — сказаў ён і перасмыкнуў знарок як мага больш пагрозліва плячыма. — Нічога мне не зробіцца. Калі што якое — Дарафеевічу з мабільнага патэлефаную. А ці табе…

— Ну, глядзіце самі, як вам лепш. Нейкі… нейкі незразумелы вы сёння, — дадала пад самы ягоны адыход Зіна і пайшла да сябе ў пакой, дзе ўжо колькі часу займалася, чутно было, прыбіраннем.

«Мабыць, зноў крыванасага свайго чакае. І добра, менш на мяне ўвагі», — падумаў ён і пайшоў на двор. Сышоў з ганка, акінуў паглядам лядашчую, аблепленую тонкім пластам тынку сцяну дома. Узгадаў, як, толькі толькі перасяліўшыся ў яго, хацеў адразу ж заняцца рамонтам і ўжо сёе-тое пачаў перарабляць у верандзе, і міжволі парадаваўся цяпер, што далей гэтага не дайшлі рукі. Выдаткі немалыя, а дзеля чаго яно, усё тое кешканне з рамонтам, з увагі на сённяшні ягоны стан, было б? І галоўнае — дзеля каго? А так во калі і старонняму пяройдзе халупіна ў спадкі, той жа Зіне, напрыклад, бо яна адна тут, апроч яго, прапісаная, — і не шкада.

Канешне, на добры лад, і каторай з тройцы жанчын, з якімі больш-менш сур'ёзна зводзіў у жыцці лёс, можна было б што-нішто пакінуць, але дзе іх цяпер, жанчын тых, шукаць? І што патрэбы шукаць — адно толькі клопату сабе ды людзям наробіш. Быццам годнае пачнеш рабіць, а яно, глядзіш, у рэшце рэшт возьме ды кепскім, як яно найчасцей і здараецца, неўпрыцям

абернецца. Для яго яшчэ — як бы ні было, а вось для пляменніц…

І што яму тыя колішнія жанчыны — так, забава быццам, часовая прыхамаць. Ні да адной душою пасапраўднаму і не прыкіпеў. І хацеў, можа, прыкіпець да каторай — а не атрымалася. Страху свайго, сябе самога здолець перамагчы — не атрымалася. А яно ж так заўсёды: чаго баішся, чаго найбольш асцерагаешся, тое і плішчыцца ў глузды, і шкрабе, і не дае спакою.

З каханкаю ўпобачкі ляжаць, кахацца-мілавацца, захлынаючыся радасцю, і адначасна кожнае хвіліны баяцца, што вось возьме ды і перавернецца штосьці раптам у галаве, і пасунецца рука зладзейкаю да шыі сяброўкі — што за пакута… І такое, між іншым, здарылася з ім аднаго разу. Год сорак пяць было яму тады, можа, крыху болей. Добра, тэлефон зазваніў у прыхожай, а то невядома чым неспадзеўнае нялюдскае насланнё і скончылася б.

Так вось і сталася, што з усіх ягоных каханняў найбольш вартым тое, бадай, нявіннае з юнацтва — да Маруты — у памяці засталося. Такім помным, наўздзіў трывалым аказалася яно, што аднойчы нават, гадоў дзесьці праз сем-восем па ад'ездзе з Лучая, надумаўшыся пасля доўгіх ваганняў наведаць употай магілкі бацькоў, вырашыў разам і слядоў дзяўчыны пашукаць.

Якраз жа на кладах і натыкнуўся на іх, ды запозна: дзед Антук, мяркуючы па надпісе на помніку акурат побач з магіламі Тарасевічаў, тры гады як памёр. Магіла старога з пастаментам ва ўзгалоўі, з купкамі кветак наўкола бардзюраў, папраўдзе, не так тады здзівіла яго сваёй просценькай густоўнасцю, як прыемна здзівілі і ўразілі дагледжанасцю магілы бацькоў.

Так выглядалі, быццам учора хтосьці іх прыбраў: ні травінкі нідзе, ні апалага лісціка, ні следу занядбання. Хто б мог іх тут, дзе сваякоў нікога не засталося, даглядаць? Хто яшчэ, апроч Маруты, калі кветкі, што пры магіле Антука, што абапал помнікаў ягоных маці і бацькі, аднолькавыя?

Узрушаны ўбачаным на могілках, ён рызыкнуў тады заскочыць на зваротным шляху да станцыі ў Касцяніцу ў надзеі хоць што-небудзь пра яе даведацца. Але дарэмна: усе тры касцяніцкія хаты ды подступы да іх так густа зараслі з усіх бакоў здзічэлым вішняком і арэшнікам, што і здалёк стала яму зразумела: хутару кранты.

Больш ад тае пары ён Маруты не шукаў. Хоць і ўзгадваў часта — так, як узгадваюць тое, што і асаблівых высілкаў, каб узгадаць, не патрабуе, што само міжволі ў голаў прыходзіць.

Зрэшты, і вартым апроч Маруты, аднак жа, лёс яго не абдзяліў. Было, было аднойчы. Лічаныя дні заставаліся ўжо тады да шлюбу, як вырашыў, паддаўшыся настрою, распавесці абранніцы сваёй пра Віцюню. Не ўсё, вядома, а так, збольшага, каб настрой яе намацаць ды паглядзець, як жа адрэагуе на гісторыю. Сёння распавёў, а назаўтра ўбачыў, як замітусілася ў клопаце абыходнымі шляхамі што-небудзь яшчэ ў дадатак да таго, што сам ёй сказаў, даведацца. На тым і скончылася любоўная ідылія, змізарнела пад ціскам жаночае перасцярожлівасці ды ўласнае ягонае (што ёсць, тое ёсць, з песні слова не выкінеш) маладушнасці.

Ад таго часу быццам прывід які тоўхаў яго праз усё жыццё ў цемя, не дазваляў нават перад самім сабою, а не тое што перад кім стороннім, расчыніць дарэшты шлюзы даверу. І ні кніжкі ніякія не памаглі, ні псіхатэрапеўты вучоныя ды самадзейныя, колькі ні

звяртаўся. Такі ён, той прывід, аказаўся на лекаванне няўразлівы.

Што за прывід — вядома, але што пра яго ўзгадваць. Такое ўзгадваць — толькі лішні раз сябе квяліць. Пачнеш занадта квяліць і не заўважыш, як на прысак перагарыш. Ці ў спаруду ператворышся, захрасшы нагамі, бы тая жамярына ў загуслым цыманце, у лабірынце пакутлівых згадак. І не з такімі камянямі на душы, і не з чужымі, а собскімі, людзі жывуць і надта іх наяўнасцю не пераймаюцца. З такімі камянямі, што ягоны ў параўнанні з імі — нявінны камяк снегу. То што пакутаваць? Тым больш што наогул цяпер іншы клопат для яго найгалоўнейшы.

З афармленнем завяшчання ўсё вырашылася хутка, за колькі хвілін. Дзяўчына ў банку па той бок перагародкі з цікаўнасцю зірнула на яго, штосьці ўсміхнулася, падала чысты аркуш і паперку з узорам запаўнення дакумента. Аркуш быў такі белы, што адбірала тая бель вочы, і Станіславу Мікалаевічу не адна хвіліна спатрэбілася, каб да яе прывыкнуць. Затое астатняе ўсё прайшло, як па масле, і неўзабаве тэкст завяшчання быў гатовы.

— А калі што якое са мной, паперчыны гэтай хопіць? — спытаў ён напрыканцы, перадаючы дзяўчыне аркуш.

— Дастаткова, — адказала тая. — Галоўнае, каб дадзеныя скрозь, у завяшчанні і ў пашпарце, супадалі. Прозвішча, імя, імя па бацьку… Дакладны адрас, дата нараджэння. Ну, і, прабачце, пасведчанне аб… смерці, канешне…

— Ага, вось як… Дзякуй, — сказаў ён і пайшоў з памяшкання. Было яшчэ не позна, але адчуваў сябе

кепска: у грудзях трымцела, дыханне раз-пораз збівалася з рытму, рукі лекацелі і так раптам узмакрэлі, быццам хтосьці знячэўку абліў іх вадой.

На дварэ было прахалодна. Ён нават сцепануўся ад холаду, выходзячы з брамы на ходнік. Безуважна, усё яшчэ заняты ў думках справаю з завяшчаннем, абмінуў шыхт матацыклаў збоч павароту, наблізіўся да постаці мужчыны з нацягнутай на вочы бейсболкай, што стаяў з роварам пры дзвярах у краму напояў і зацята, быццам толькі гэткага клопату праз дзень і меў, курыў.

— А, вось дык сустрэча! — Мужчына бліснуў вачамі з-пад бейсболкі, шпурнуў недакурак у сметніцу, хіснуўся Станіславу Мікалаевічу напярэймы з відавочным намерам падаць руку. — Як пачуваецеся?

— Як відаць, — адказаў ён і, робячы выгляд, быццам не дае рады пазнаць суразмоўцу, зморшчыў лоб ва ўдавана-неўразуменнай напрузе. — Ты…

— Ромак, — не выказваючы ані здзіўлення, ані намёку на крыўду ад забыўлівасці старога чалавека ці панібрацкага ягонага, знарочыста грубаватага — на «ты» — звароту, буркнуў той. — Прыходзіў да вас у кватаранты прасіцца, а вы адмовіліся. Не памятаеце хіба?

— Адмовіўся, бо не меў, мабыць, у тым патрэбы, — знарок як мага больш холадна, нават сувора прамовіў ён і падаў маладзёну руку.

— Можа, і так, але ж не самі адмовіліся, дзеўка вас падсуклеціла… Я ж не сляпы, бачыў, як пяяла вам штосьці ў вушы. Дачка яна вам, ці хто?

— Хто б ні была, — сказаў ён першае, што ўзбрыло ў голаў, але тут жа, адчуваючы, што іншага выпадку задобрыць гэтага захмялелага, ачмуранага танным пітвом дзецюка можа не надарыцца, прымірэнча дадаў: — Вядома, жанчыны…

— Ну, не скажыце, — не пагадзіўся той. — Жанчына жанчыне розніца. Мая былая, напрыклад, зусім неблагая… Адно што выпівох не любіць, а так кабеціна — хоць куды.

Маладзён палез у кішэню пінжака, дастаў фотку, з навязлівасцю чалавека, якому ўсё адно, што казаць ці рабіць, абы толькі яго слухалі, падаў Станіславу Мікалаевічу.

— Ну, з выгляду, сапраўды, нішто… Але ж чаму тады, калі гэткая яна ў цябе добрая, дахаты не ляціш, а тут, пры краме, аціраешся?

— А таму, што разбегліся мы… Вось чаму…

— Шкадуеш?

— Каго? Яе?

— Што разышліся — шкадуеш?

— Ёсць крыху. Такія жанчыны, таварыш дарагі, як мая, на дарозе не валяюцца. Не тое што вашая гэтая маладая… крыкса.

— Гэта кватарантка, — неяк крыху катэгарычна, быццам падсумоўваючы прамінулую частку размовы, зазначыў Станіслаў Мікалаевіч і тут жа загаманіў пра іншае: — Робіш дзе-небудзь?

— Ды так, выпадковымі заробкамі перабіваюся. Разгрузіць што-небудзь пры той жа краме або перанесці ці яшчэ што… Пару разоў капачом на могілкі таксама наймаўся — даволі выгодная справа. І грошы дадуць, і накормяць напояць замоўнікі, прабачце за выраз, да ўсрачкі. Ды мне ўсё адно, чым займацца, абы плацілі. То калі што якое, патрэба якая — клічце, пад'еду. Клічце…

— Добра. Можа, калі і давядзецца, хто ведае, — сказаў Станіслаў Мікалаевіч і пайшоў прэч. І ўвесь час, што шкандыбаў, адпачываючы раз-пораз, да свайго дома, думаў пра тое, як дзіўна паводзяць сябе часам

людзі. Вось жа амаль што бомж, як Зіна кажа, амаль што жабрак гэты Ромак, а глядзі ты — і пагаманіць пачалавечы са староннім дасць рады, і жончыну фотку, дарма што разышліся, з такім понтам паднясе пад вочы, што хоць ты ў лорды яго запісвай.

Зіна была дома, гэта ён адразу зразумеў, ледзь толькі расчыніў дзверы сянец. З пакоя даносілася нягучная музыка, пацягвала тытунём. Ён падумаў, што, мабыць, няблага было б хаця б стукам падаць кватарантцы знак аб сваім прыходзе, каб не надта ўжо ён стаўся для яе неспадзеўным, і памкнуўся ўжо да яе дзвярэй, як дзяўчына сама выйшла ў калідор.

— А пра вас мужык, той, што раней неяк прыходзіў, пытаўся, — сказала і, быццам хочучы апярэдзіць яго рэакцыю на навіну ды пазбегнуць тым самым роспытаў, дадала: — Сказаў, што бачыў вас у горадзе ля крамы, нават размаўляў, ды нумар тэлефона свайго забыўся вам даць… Вось ён, нумар, вазьміце… Ого, з такім форсам тармазнуў ды рыпнуў коламі ля ганка, што за вярсту, мабыць, было тое рыпенне чутно. Я раіла пачакаць вас, але ён не паслухаў. Сеў на свой віхлясты дапатопны ровар ды і адваліў. Я не стала ўгаворваць, вельмі мне трэба! Што, зноў не так штосьці зрабіла?

— Чаму не так? Не, якраз усё так. На дзіва…

— Што значыць — на дзіва? Так кажаце, быццам я толькі пра тое і мару, каб вам насуперак што-небудзь учыніць… Намякаеце? Ну, дык вось, сказаць вам хачу… Не пра мужыка гэтага, п’янага валацужку, — пра сваё. Вось Валеркам, што начаваў тут, папікаеце мяне, а праўды ўсяе, сутнасці справы і не ведаеце.

— Ну?

— Вось вам і ну… Бацька майго дзіцяці Валерка, вось якое «ну». Замуж кліча, але я не хачу за яго выходзіць. Бо гультай і яшчэ і лыга ў дадатак, дарма што неблагі спартсмен, па трох відах разрады мае. Несамавіты, бесхарактарны чалавек, куды вецер падзьме, туды і пахіліцца.

— А дзе ж дзіця?

— У маці да часу пакінула, дзе яшчэ. Уладкуецца неяк надзейней з жытлом — забяру да сябе. А можа, і замуж яшчэ пайду, будзе бачна. Вось якія справы. От вам і дзіва…

— Дрэнь, аднак жа, справы. Тое гляджу — нейкія ўсё сакрэты ў маёй кватаранткі. Аж во яно што…

— А то ў вас іх быццам няма, сакрэтаў… Ужо хто тут больш за ўсіх, у гэтым доме, засакрэчаны, дык гэта вы. Хаця б гэтае вось, наконт сваякоў, узяць… Няма нікога, кажаце? Як гэта? Сваякі ў кожнага ёсць. Зноў жа, наконт мовы ўзяць — быццам не разумееце мясцовай гаворкі… Хлусня! Выдатна ж, выдатна разумееце. Кажаце, ні дня тут ад нараджэння не жылі, а то адно, то другое па-тутэйшаму называеце. І іншае рознае… Ці я не бачу нічога, думаеце? Не адчуваю?

— Што ты бачыш? Што адчуваеш? Што раздваенне асобы ў мяне? Ну, дзякуй за такі камплімент.

— Што сакрэтнічаеце вы ўвесь час, вось што. Ужо і самі, відаць, не заўважаеце, як штохвіліны тоіцеся-хітруеце. Таму, пэўна, і… быццам два ў адным вы нейкі… Быццам і добры, і… зласнаваты крыху адначасова.

— Кепскі — лепшага пашукай… Зласнаваты ёй… Добра яшчэ — «дарэшты злы» не сказала.

— Не чапляйцеся да слова: я сказала — быццам. А наконт шукаць іншага… Што мне шукаць? Мне і тут

няблага, бо сама гэткая, як і вы… два ў адным, калі не тры наогул.

— Во-во… На хаціну, мабыць, разлічваеш?

— А і не без таго, ведаеце, калі ўжо на тое пайшло…. Пакінеце ў спадкі — адмаўляцца не буду. У маці аднапакаёўка, куды я там з дзіцем? Ды яшчэ брат з дня на дзень павінен з турмы вярнуцца, сваё права на плошчу, канешне ж, заявіць. Што тады? Зноў жа, з Валеркам як ладзіць? Прывалачэцца — і перапіхнуцца, прабачце за праўду, няма як. А вы адзін… Але што тое даводзіць, што і без мяне вам добра зразумела? Вось пагаманілі, і дзякаваць богу. Не падыходзіць вам такі мой расклад, дык і сысці магу, толькі скажыце. Сысці?

— Ну, навошта ж так… рэзка? Жыві сабе. Трэба ж, каб і фарціла часам людзям на халяву, не ўсё ж нябогам бедаваць. Жыві, пакуль іншы хто не заявіцца…

— Заявіцца — з чаго гэта? Не пужайце дарэмна — не заявіцца ніхто. А заявіцца — так сама пужну, што ў гэты бок і глянуць, напужаны, пабаіцца.

— Брат твой у турме, значыцца? Так?

— Ага. А што, боязна стала? Спужаліся? Вось, адразу бачна, што ніколі не сутыкаліся з такім. Страшна? Не бойцеся, сюды не прыйдзе. Мы не ў дружбе з ім.

— І за што сядзіць, калі не сакрэт?

— За забойства. Нажом пырнуў аднаго па п'янцы. Быццам папалохаць толькі хацеў, а замест гэтага ў самае сэрца лязом, дурань, патрапіў. І загрымеў… Мне не яго так шкада, як мамы, так яна, бедная перажывала. І дагэтуль яшчэ, здаецца, як след не ачуняла. А як ачуняеш, калі дня не мінае, каб тое жудаснае не ўзгадалася. Ці каб пальцам хто, хоць сабе і незнарок, не торкнуў пад нос… Ды і торкаць нават не трэба, само тор-

каецца. На чалавека, кажа, гляджу, а ў вачах ягоных і чытаю… Як у люстэрку… Цікава, а вы шкадавалі б?

— Каго?

— Каго! Сваяка-забойцу, вядома. Блізкага чалавека.

— Напэўна, шкадаваў бы.

— А калі б яго, напрыклад, на смерць за штосьці страшнае выраклі — тады шкадавалі б? Некаторыя шкадуюць, некаторыя, наадварот, падтрымліваюць смяротны прысуд. Таму, напэўна, падтрымліваюць, што занадта ж мулка такога сваяка мець. Як кажуць, абы з воч далоў… А вось вы як?

— Я? А што я? — Станіслаў Мікалаевіч цепануў плячом, удаючы холад, пасунуўся да свайго пакоя. Настойлівасць Зіны пачынала яго раздражняць. Такое пытанне ён і сам сабе неаднойчы задаваў, ды адказу на яго дагэтуль не меў і мець, папраўдзе, надта не жадаў.

— А не пахвалілася, бач, ніколі! Не сказала праўды пра брата… Не сказала ж….

— Дык вы ж не пыталіся! І не папікайце дарэмна. Праўда такая рэч, што лепш часам і не ведаць яе. Ну, сказала б я вам пра брата — і што наедку вам з таго было б? А мне — толькі нязручнасць лішняя ды турботы. Навошта? Адсекчы на карані мінулае — і ўсяго клопату. Хіба не так?

— Адсекчы? Лёгка сказаць… А як не адсякаецца, тады што? Хм… Хаваць мяне будзеш?

— Што? Хаваць? Хаваць… Вось дык размова… Але што ж — не дзеці мы… Хаваць! А даверыце? Скажыце — даверыце? Як бы вы хацелі быць пахаваным?

— А хоць як. Напрыклад, у крэматорыі спаліць. Выгода: у печ торкнуў труну, папялок развеяў пасля дзе-небудзь, і ніякага клопату з уносам-вынасам цела,

з месцам на кладах ды хаўтурамі. Вось толькі дзе яго тут возьмеш, у гэтай глухмені, той крэматорый. Давядзецца нехаця ў зямлю тачыцца…

— Ну, вось, дагаварыліся… Ой, Станіслаў Мікалаевіч… Пра халяву нейкую, затым пра пахаванне заводзіце гамонку. Есці будзеце? Бульбы насмажыла, дык магу падзяліцца. З цыбуляю, дарэчы, бульба.

— Канешне, з цыбуляю, як жа без цыбулі, — буркнуў ён незадаволена і пайшоў следам за Зінаю ў кухню. Іншым разам, можа, і абурыўся б, але цяпер было не да таго: карцела як хутчэй улезці ў пошту, паглядзець дасланы Нанаю здымак.

Дзве кабеціны сярэдніх год, абняўшыся, стаялі перад прыбранаю навагодняю ёлкай, засяроджана, як малыя дзеці ў чаканні абяцанай дарослымі птушкі, глядзелі ў аб'ектыў апарата. Выгляд танкавусных светлавалосых маладзіц з засяроджанымі, уважлівымі вачыма сумненняў не пакідаў: Ксеніны дочкі. Толькі крыху, падалося Станіславу Мікалаевічу, больш мяккія абедзве за матку з абрысаў ды больш падобныя асобнымі фрагментамі твару да ніколі не бачанай імі бабулі, ягонай і Віцюневай маці.

Дзе на здымку каторая з пляменніц, пазначана не было, але гэтага Станіславу Мікалаевічу і не патрабавалася: здагадаўся, ледзь адчыніўшы файл ды ўзгадаўшы фотку, прадэманстраваную пару гадзін таму Ромакам.

Ён прачнуўся пад ранне — ад болю ў грудзіне. Паспрабаваў прыўзняцца і не змог: цела быццам скалянела. Праглынуў, сяк-так дацягнуўшыся рукою да пудэлка, пару капсул з лекамі. Хацеў запіць глытком вады, але шклянка была пустая. Пастукаў кійком у пера-

гародку, каб паклікаць упомачкі Зіну, ды, успомніўшы, як яна збіралася звечара ў начную змену, зноў адкінуўся галавою на падушку. «Канец?» — падумаў і склаў на жываце рукі. Ні роспачы, ні страху не было, толькі нейкі няўцямны, незразумелы сверб у галаве. Усё адно як штосьці там муляла ды, разбітае на дробныя фрагменты, зыбалася-знібела між звілінаў і ніяк не давала рады аформіцца ў адзінае цэлае. Як з парваным ланцужком мітрэнга: звяно выпала, а вось чым замяніць яго — і не даўмецца.

Ні з таго ні з сяго ўзгадалася раптам учарашняя размова з Зінаю наконт сваякоў-забойцаў. Пагайдалася ў глуздах урыўкамі фразаў ды і саступіла паволі месца іншаму, куды больш далёкаму па часе прыпаміну. Амаль пятнаццацігадовае даўніны прыпаміну пра тое, як, трапіўшы падчас адной з апошніх сваіх працоўных камандзіровак у аўтааварыю, адзіны з чатырох пасажыраў мікрааўтобуса застаўся жывы і пачуваўся потым у лякарні з-за шматлікіх верадаў так кепска, што і смерць гатовы быў ужо прыняць як адзіна надзейнае збаўленне ад пакутаў. Як зусім не змрочным ды не жахлівым уяўлялася яму тады такое збаўленне і як надавала яму арэолу святла і ўтульнасці думка пра хуткую сустрэчу з нябожчыкамі маці і бацькам. І як ажно сцепанулася, напружылася ўвадначас ягонае скаванае болем цела, калі раптам нахіліўся над ім, штосьці шэпчучы і абдаючы холадам нямых зрэнак, твар Віцюні ды працяла глузды згадка аб безвыходнай наканаванасці будучыні — непазбежнасці спаткання ў лепшым свеце не толькі з бацькамі, але і з ім, братам-забойцам. З чалавекам, якому, як бы ні любіў ды не абагаўляў яго калісьці, паглядзець у вочы зусім не хацелася б.

А з іншага боку — ці хацеў бы ён, каб Віцюня застаўся тады жывы? Пытанне, на якое калі і маеш большменш праўдзівы адказ, наўрад яго асмелішся агучыць. Бо ўсё, што ні скажы, будзе і праўдаю, і няпраўдаю адначасова. Паўпраўдаю, якой, можа, лепей, як Зіна кажа, і не кранаць, бо невядома, якім бокам яна ў наступную хвіліну выявіцца.

Тым часам боль у грудзях пачаў пакрысе адпускаць. І неўзабаве, прыглушаны, відаць, лекамі, ужо адно ледзь-ледзь нагадваў пра сябе лёгкім паколваннем у спіне і плячах.

Першы сонечны прамень выбіўся з-пад гардзіны, пазыбаўся ў марыве з пылу і кволага ранішняга святла па-над падлогаю, упёрся ў прастакутнік шпалераў з гадзіннікам на сутыку сценаў.

Палова сёмай, да сканчэння Зінінай змены паўтары гадзіны. Значыць, дахаты дзеўка вернецца не раней дзясятай. А можа, і пазней: штосьці ўчора намякала мімаходзь на прыезд Валеркі, дык, мабыць, адразу з працы паляціць на станцыю яго сустракаць. Дзіўная: ганіць каханка, а варта таму пальцам павабіць — і ляціць да яго як не на злом галавы, бы тая жамярына па нектар да кветкі, быццам нікога лепшага за яго і ва ўсім свеце для яе няма. І зразумей ты гэтых жанчын.

Гэтак во акурат, без жаночых дзівацтваў, і з Віцюнем у тое лета не абышлося. Невядома, чым ён іх там браў, тых маладзіц, але тры з шасці ягоных ахвяраў, як высветлілася, самі, без прынукі селі да незнаёмца ў аўто, зрабілі крок насустрач уласнай смерці. А падчас суда, сведкі пасля казалі, некаторыя жанчыны ў зале, магнезу ды абаяльнасці асобы забойцы,

няйначай, паддаўшыся, нават і спачувалі яму, і слязіну, зычлівіцы, пускалі. А адна, з каханак ягоных быццам бы колішніх, тэхнікумаўскіх яшчэ, дык і наогул як звар'яцела, паўгода па агалашэнні выраку скаргі на дзеянні следства ў высокія інстанцыі дасылала.

Ён перакуліўся на бок, набраўшы ў рот паболей паветра, у тупым здранцвенні ўпетрыўся паглядам у сцяну. Колькі дзесяцігоддзяў прамінула, колькі забылася ўсяго, быльнягом зарасло, а зацята-неўразуменная ўсмешка братава, быццам учора тое ўсё здарылася, так і засталася перад вачыма. Змушаны, як праз сілу, усмех хворага чалавека, калі даваць веры высновам навукоўцаў, — прыкмета душэўнай неадэкватнасці асобы, так званай некрафіліі. Цікава толькі, як яны, некрафілы, пры іх любові да смерці, да пагрозы ўласнаму жыццю пры гэтым ставяцца? Мяркуючы па паводзінах Віцюні падчас суда, піетэту не выказваюць. Але ж каб і надта баяліся — таксама не скажаш.

Але пра што гэта ён? Ці не час ужо і насамрэч вартым, а не ўспамінамі тымі прадаўнімі, заняцца?

Стрэлка гадзінніка нервова тарганулася на цыферблаце, памарудзіла, бы ў одуме, на лічбе 7, пасунулася далей у адвечным сваім марным клопаце пагоні за часам. Дапяла да прыпарушанай пылам мінулага адзнакі гульні з Віцюнем у перайначванне словаў, хіснулася сюды-туды і спынілася, быццам чымсьці заварожаная.

«Ну, вось, і ўсё, мабыць… І быва… бываленя, — адчуваючы, як слабее ды пачынае новым прыступам болю адзывацца сэрца, падумаў ён і падняўся з ложка. Дастаў з кішэні цыдулу з Ромакавай паспешлівай крамзанінай, набраў нумар.

7

— Усё, заўтра еду па Цёму. — Зіна імкліва паднялася з канапы, прайшлася сюды-туды па пакоі. — Адзін заставацца тут не пабаішся? Раптам гаспадар заявіцца ці яшчэ які прывід…

— Яшчэ чаго! — ускіпеў Валерка. — Знайшла баязліўца! Вось абы ўкалоць… Характар твой: тыдзень усяго разам пабылі, а ўжо колькі чаго ад цябе ні наслухаўся. І што ні слова, то знявага. І прайдзісвет я, аказваецца, і няздара, а цяпер во — і баязлівец яшчэ да ўсяго…

— Цябе зняважыш, ага. Паеду — клункі тыя з шафаў з вопраткай Мікалаевіча, што ўчора напакавалі, не забудзься павыносіць на двор, можа, прыдадуцца каму з суседзяў. Толькі абы-як не кідай, пакладзі акуратна. Не пакваціцца ніхто — пасля, як вярнуся, у інтэрнат для састарэлых аддамо. На могілкі схадзі. Вецер штоночы, каб вянкі не разбэрсаў… І наогул, падправіць што, можа, там трэба, дык пастарайся ўжо, не палічы за цяжар…

— Схаджу.

— Глядзі. Першае, што спытаю, вярнуўшыся, — ці зрабіў тое, што прасіла? — сказала Зіна і пайшла да камп'ютара. Пасля пахавання Станіслава Мікалаевіча мінулі чатыры дні, а дагэтуль ніякай весткі ад жанчыны з нейкім дзіўным, нетутэйшым імем Нана, перадсмяротны ліст да якой знайшла яна ў паштовай скрыні нябожчыка, усё не было, і гэта яе нервавала. Хто яна, тая жанчына? Якіх неспадзевак можна ад яе чакаць?

— Хакерка! У чужой пошце корпаешся? — не вытрываў, падкузьміў Валерка. — Пабачыў бы стары, што тут з ягонаю скрыняй вырабляеш…

— Супакойся, ён сам мне пароль даў. Свярбела б мне пахакерыць, і без дазволу магла б. Толькі звычкі

такой, у адрозненне ад некаторых, не маю, не займела. Зайздросціш, што не табе, а мне даверыў гаспадарнічаць?

Яна адчыніла скрыню і адразу ж натыкнулася паглядам на паведамленне аб новым лісце.

Пісала Нана, пыталася, што гэта яму, Станіславу Мікалаевічу, прыйшло раптам у голаў развітвацца, быццам ён паміраць сабраўся. То зухам трымаўся, а то во — усё гэтак неўспадзеў, увадначас перамянілася.

Але больш уразіла Зіну іншае.

— Ты раварыста таго, Рамана, што ўсё тут круціўся ля дома, даўно сустракаў? — гукнула яна ў кухню, дзе чутно было, Валерка раз-пораз ляпаў ужо дзвярыма лядоўні. Ён заўчора чарговы раз кінуў курыць і цяпер нервова шукаў хоць чым заняць рот замест цыгарэціны.

— Не, не бачыў. А што?

— А хадзі сюды, зірні…

Валерка, жуючы на хаду кавалак кілбасы, увайшоў у пакой.

— Бачыш — дзякуе за прэзент. А хто яго, той прэзент, перадаў? Раман. Што за ён? Няўжо гэты самы, што прыязджаў сюды? Пэўна ж ён, хто яшчэ. І калі паспеў? От жа хітраваны!

— Хто?

— Хто! Галава твая… Гэтыя двое: Станіслаў Мікалаевіч і Раман. І калі ўжо дарэшты схаўрусавацца паспелі? Тое лагодны гэткі быў апошнім часам наш Мікалаевіч, да сябе не падобны. Што ні зрабі — усё яму ўпанараў, усё добра. Нават на цыбулю ды адсутнасць ножыка пры талерцы перастаў наракаць. Аж во яно што, во дзе прычына… Ну, але… Што рабіць будзем?

Валерка пракаўтнуў кілбасу, з выразам маральнае перавагі на твары — ага, маўляў, і я вось прыдаўся —

няспешна, быццам жадаючы прадоўжыць хвіліну ўласнага, дарма што ў собскіх толькі вачах, узвелічэння, прамовіў:

— Як што? Скасаваць скрыню, і канец справе. Што яшчэ? Ліха будзіць?

— А з адказам што? Напісаць ёй, гэтай Нане, што ды як? Што памёр, што пахавалі? Пэўна ж, цікава ёй будзе…

— Канешне, напісаць. Каб не чапіліся потым. Адно што Раман гэты… Яшчэ надумаецца знаёміць сюды прывезці… Бачыш жа, запрашаў іх стары…

— Не надумаецца. Я яго пару разоў так пужнула, што не насмеліцца больш назаляць. Ды ў мяне такое ўражанне, што Станіслаў Мікалаевіч і сам пазбягаў з тымі цёткамі спаткання. Спачатку прапанаваў быццам сустрэцца, а потым у хамут ударыў. І не рады ўжо быў, відаць, што напрасіўся…

— Чаму?

— А хто там ведае, у чужую душу не ўлезеш. Не такі быў чалавек наш Мікалаевіч, каб перад кожным стрэчным спавядацца. Меў, мабыць, нейкія важкія прычыны для гэтага. Але нам што да таго?

— І праўда.

— Дык што — адпісаць жанчыне?

— Рабі, як лічыш патрэбным. Каб потым, калі што якое, мяне не папікала. Не я тут гаспадар…

— Ну, ужо ж, канешне, не ты, — не стрывала, каб чарговы раз не сыранізаваць, Зіна і рашуча націснула курсорам на пазнаку «адказаць».

Не сумнявалася: менавіта вось гэткае развязкі нябожчык гаспадар больш за ўсё жадаў і ўсё магчымае дзеля таго, каб акурат гэтак, як ёсць, сталася, сам жа і парупіўся зрабіць.

8

— А вы сумняваліся, казалі — падман. Грошы немалыя, ажно падумаць боязна. — Нана разгарнула рахунак з прыпіскаю «завяшчана Нане для Наны і Алы», перадала сястры. — Містыка нейкая, дэтэктыў дый годзе.

— Немалыя, праўда, — азвалася Ала. — А во будзе, як заявяцца ягоныя сваякі ды пачнуць яшчэ судзіцца. Клопату тады не абярэшся. І грошай тых не захочаш, як пачнуць па судах цягаць.

— Не ўводзьце староннім у вушы, што гэтак падфарціла, то ніхто і не заявіцца, — падаў голас з калідора Павел. — Падумаеш, сваякі. Былі б тыя сваякі нармалёвыя — чужым не завяшчаў бы майно. Падзеліце даруначак — і ўся містыка, і ўвесь вам дэтэктыў. Прасцей трэба быць, жанкі, прасцей…

— Як ты, напрыклад, са сваімі гэтымі… Ага… Ну, а што дзеўка гэная, Зоя, ці як там яе? Патлумачыла яна табе што-небудзь у лісце? — не сунімалася Ала.

— Зіна? Не, нічагуткі. Толькі тое, што пра помнік на могілках турбавацца не трэба, паведаміла. Яна, маўляў, сама ўсё замовіць і зробіць, бо ёй ён таксама сёетое пакінуў. А болей — нічога. Ды няхай робіць, як хоча. Дзяўчына, відаць, увішная, гэткая міма рук нішто не прапусціць…

— Няблага ж, ён, відаць, ёй пакінуў, калі гэтулькі на сябе бярэ, — зазначыў Павел.

— Ну, а Раман што? Можа, ён што ведае?

— Раман? Скажаш! Быццам Рамана не ведаеш… Калі ён нават канверта не даўмеўся распакаваць ды паглядзець, што там у ім. Пагаварыць з ім, распытаць, ці што, пра таго чалавека? Мабыць, пасля крыху, як уляжацца ўсё…

— А можа, і не варта, — зазначыла задуменна Ала.

— Можа…

Колькі хвілін тройца сядзела моўчкі.

— А памятаеш, як аднаго разу, калі ў Закарпацці мы жылі, нейкі дзядзька падарункі нам да Новага года прыслаў? — парушыла маўчанне Нана. — Мама яшчэ ледзьве прынесла іх з пошты, такі велізарны быў клунак. Лялькі, цукеркі, яшчэ нешта з ласункаў, абутак, вопратка… Памятаеш? То, можа, гэта ён і быў тады, гэты Станіслаў Мікалаевіч?

— Падарункі памятаю, як жа… А вось ці казала яна, ад каго — хоць застрэль, не ўзгадаю. Ды наўрад казала.

— А я памятаю: *ад дзядзькі аднаго*, сказала і тут жа змоўкла ды рот даланёй прыкрыла. Быццам і не хацела нічога казаць, а прагаварылася міжволі. То, можа, сапраўды гэты Станіслаў Мікалаевіч нам які сваяк?

— Быў бы сваяк — так бы яна і сказала: *ад дзядзькі*, маўляў. Канкрэтна б сказала: *ад вашага дзядзькі*. А то ж — ад дзядзькі *аднаго*! Улоўліваеш розніцу? — зноў вымкнуўся, цяпер ужо з кухні, Павел. — *Аднаго* — значыць нейкага чужога, старонняга. Хіба не так?

— А потым — з імем тваім ды па бацьку імем яшчэ гэтая мітрэнга, — падтрымала мужа Ала.

— Ці мог бы ён, каб быў нам сваяк, не ведаць нашых імёнаў па бацьку? Нават калі б і не родны быў дзядзька, а стрыечны, да прыкладу, і то ведаў бы… Канешне, ведаў бы. Не, тут не тое, не тое… Зусім не тое.

— Ну, можа і так, — пагадзілася неахвотна Нана. Мулкае адчуванне, што выслізгвае з жыцця штосьці значнае, як выслізгвае з рук ды сплывае прэч няўдала схопленая лаўцом за хвост, але не ўтрыманая рыбіна, пазыбалася імгненне ў яе растузанай няпэўнасцю пад-

свядомасці і, заслоненае думкай, што нічога іншага, як пагадзіцца з жалезнай логікай сястры і швагра, не застаецца, патанула ў бясконцай чарадзе цяперашніх і імаверных наступных клопатаў.

9

Была сярэдзіна жніўня. Ала і Павел Клімовічы ехалі на аўто паглядзець слынны на ўсю вобласць штучны вадаспад на месцы разбуранага старасвецкага млына за паўтары сотні вёрстаў ад іх гарадка. Колькі год ужо збіраліся да яго наведацца, ды, хоць і знаходзілася запаветная мясціна не так і далёка ад дома, ніяк не маглі вымеркаваць на тое часу. То адзін на працы, то другому з нейкае прычыны не да вандровак. Сыны, Данька і Лёша, ці не па тры разы ўжо ўмудрыліся з'ездзіць да таго вадаспада з экскурсіямі ад школы, а ім, бацькам, усё не выпадала. І вось, нарэшце, супалі ў абаіх тэрміны адпачынкаў, і магчымасць такая з'явілася.

Зіхоткая стужка дарогі вілася паміж маляўнічых узгоркаў ды ўзлескаў, то падымалася ўгору, то зноў, залюляная кашлатымі вершалінамі дрэваў абапал шляху, спускалася на дол. У салоне было гарачавата, але фортак не адчынялі: Ала змалку баялася скразнякоў.

Гаварылі пра імаверныя выдаткі, звязаныя з набыццём ранцаў, кніжак, абутку ды вопраткі для хлопцаў да школы. Неўпрыкмет, але лагічна ўзбіліся на тэму грошай, завяшчаных сёстрам Станіславам Мікалаевічам, але ўсё яшчэ Нанаю не атрыманых, бо ёй раптам узбрыло ў голаў заняцца лячэннем Рамана ад алкагольнай залежнасці і яна, баючыся пакідаць выпівоху самнасам з хваробаю ў такі адказны момант, паехала з ім на месяц у нейкую сталічную спецыялізаваную клініку і вярнуцца дахаты мелася толькі праз тыдзень.

— Замыліць твая сястрыца капейкі, і канец будзе справе, — казаў каторы раз Павел, закатваючы вочы ледзь не пад дах салона і нервова шчоўкаючы раз-пораз дзверкаю бардачка. — Бандэраўцы гэтыя — у-у, ведаем іх…

— Кінь ты енчыць, — не стрывала, абурылася ўрэшце Ала. — Вярзеш абы-што. Замыліць… Быццам я сястру сваю не ведаю. І колькі ўжо разоў прасіла не называць яе бандэраўкай — як аб сцяну гарох. А потым наракаеш, што недалюблівае… На сябе паглядзеў бы…

— А што — не так, не бандэраўка? — ці не знарок прапускаючы міма вушэй апошнія словы жонкі, млявым голасам працягваў Павел. — Не бачыш хіба, як Лёшку з дня ў дзень апрацоўвае? Кніжкі нейкія ўвесь час падсоўвае, размаўляць на мове прымушае з сабой па тэлефоне… Мне вунь днямі эсэмэску прыслаў: «Тата, у мяне ўсё клёва!» Тата! Што гэта такое? Хто ў наш час бацьку татам кліча? Смех дый годзе!

— Ну, тата… І што табе так не падабаецца? Хочаш папам, няйначай, быць? Можа, і рымскім яшчэ? Дык дарасці трэба… Ты ж свайго бацьку як зваў? Памятаеш, ці нагадаць, можа? І ніхто яго не прымушае, сам так хоча. Не хацеў бы — не размаўляў бы на мове і не пісаў. Як-ніяк сямнаццаты год хлопцу — забыўся?

— Хоць і трыццаты! Мне яшчэ ва ўласнай хаце халеры рознай не хапала… Не, каб сваіх нараджаць — чужых выхоўвае. Нараджай і тады і выхоўвай, як лічыш патрэбным. Выхавацелька! Вось грошы аддасць твая Нанка-незачэпа, і займуся гэтаю справай.

— Зоймецца ён… Сабою лепш займіся. Яшчэ раз пабачу з тою цыбатай прафурай з клуба — трываць не буду. Далібог, не буду… Дарогу глядзі, а то віхля-

емся, бы дупа бабіна ў грыбах між елак. Вунь, бачыш, чалавек галасуе, вазьмі.

На перакрыжаванні з указальнікам «Санаторый “Лучай”» субтыльны маладзён год трыццаці ў рудых пакамечаных шортах і з плецаком за спінаю, сапраўды, адчайна сігналіў рукамі ў просьбе спыніцца.

— Вазьмі, — ціха, але настойліва, памятаючы заўсёдную звычку мужа саступаць перад рашучасцю, паўтарыла Ала і кранула дзверку з цвёрдым намерам адчыніць.

— Вельмі трэба — абы-каго падбіраць! Возьмеш, а ён табе па галаве гваздане чым-небудзь каляным замест падзякі, і каюк, — незадаволена зморшчыўся Павел, але не паслухаць жонкі не наважыўся, спыніўся.

— Гваздане! Менш бы серыялаў глядзеў, менш бы і дурное мроілася. Сярод дарогі, у ясны дзень — гваздане, — сказала Ала і расчыніла дзверку. Вылезла з салона ды, скарыстаўшыся момантам, хуценька перасела на задняе сядзенне, даючы маладзёну месца побач з мужам. Быццам бы з перасцярогі тое зрабіла, паддаўшыся навеянаму словамі Паўла страху, а насамрэч адзіна таму, што ўначы, не даўшы рады супрацьстаяць ягоным настойліва пажадлівым угаворам злітасцівіцца, выканаць хоць збольшага сужэнскі абавязак, недаспала і цяпер хоць на якіх пару хвілін хацела акунуцца ў забыццё.

Ды як ні хацела — заснуць, аднак, не атрымалася. Мужчыны ўвобміг знайшлі агульную мову, загаманілі спачатку пра назоў санаторыя, пра нейкіх армянаў, што колісь, паводле расповедаў тубыльцаў, тым санаторыем апекаваліся, пра нейкі здзічэлы, абязлюдзелы касцяніцкі хутар, пра забойствы ды згвалтаванні жанчын ці не саракагадовае даўніны, якія пры тым хутары

адбыліся, пра дыскусіі ў прэсе наконт смяротных прысудаў забойцам, затым пра нейкі фільм жудасцяў, потым пра футбол, яшчэ пра штосьці… Неўпрыкмет пераключыліся на праблемы экалогіі, загаварылі пра тое, як псуе мясцовую прыроду стары, нерэнтабельны цэментны завод, ад якога адно толькі і наедку, бадай, што кепскае паветра ды пыл слупам.

«Як цёткі, вось абы мянціць языкамі», — падумала Ала і, задаволеная, што хоць яе не ўцягваюць у нудотную сваю, бясконцую, як нітка з прасліцы ў нядаўняй тэлеперадачы пра народныя промыслы, балбатню, адхінулася плячыма на спінку сядзення. Узгадала ўчарашнюю тэлефонную размову з Нанай пра тое, што няблага было б разам, удзвюх наведацца ў дзень высвятлення наконт грошай на магілу да Станіслава Мікалаевіча ды паспрабаваць усё-такі пра яго сёе-тое ў дзеўкі той, Зіны, даведацца, уявіла, як будзе ўлагоджваць мужа, угаворваючы на вандроўку, і, закалыханая галасамі мужчын ды вокамгненнай зменаю краявіду за акном аўто, праваліласа ў кароткі — да месца заставалася, мабыць, не болей дзясятка хвілін язды — сон.

Вадаспад — невысокі, метры з два з паловаю паток — Алу не тое што расчараваў, хутчэй падаўся нейкім несур'ёзным, быццам цацачным. А вось ваколіцы яго дык і насамрэч расчаравалі: усюды неўладкаванасць, параскіданыя па кустоўі галавешкі ад вогнішчаў, горы смецця, россыпы недакуркаў пад нагамі. Хоць сам сціснуты з абодвух бакоў узгоркамі дыснейлэндаўскі гэты тутэйшы відарысік, канешне, уражваў.

Зрабіўшы зводдалеку мабільнікам некалькі здымкаў вадаспада, Ала спусцілася з пагурка на бераг, дзе

Павел са сваім спадарожнікам-суразмоўцам у кампаніі іншых вандроўнікаў ужо кулогаліся ў кудзелі з пены ды пырскаў ля зарослай аерам і багавіннем плаціны. Толькі пачала распранацца, каб далучыцца да купальшчыкаў, як зазваніў мабільнік, і яна зноў паднялася на пагурак, далей ад шуму.

Тэлефанавала Нана. Размова, як і ўчарашняя, ад першае ж хвіліны закруцілася вакол вераемнае паездкі ў аддзяленне банка ды на магілу Станіслава Мікалаевіча. Сястра неўзабаве павінна была разам з Раманам вярнуцца дадому, таму прапаноўвала, каб не марнаваць дарэмна часу, адразу ж і выправіцца ў ягоны гарадок.

І зноў, як і напярэдадні, узгадала пра Зіну.

— А калі не пажадае тая дзеўка з намі сустракацца, што тады? — не жадаючы акунацца нанова ў справу і разам з тым і не маючы ахвоты дарэшты адпрэчваць ініцыятыву сястры, слаба запратэставала Ала.

— Ну, не думаю, што так будзе. Быццам мы ворагі ёй якія… А не пажадае, сапраўды, — з суседзямі можна пагаманіць. Ці афіцыйна ў той жа тамтэйшы пашпартны стол, у рэшце рэшт, звярнуцца. Тым больш што па пасведчанне аб смерці ўсё адно дзеля атрымання грошай трэба будзе кудысьці звяртацца. Вось разам і якія-ніякія ягоныя дакументы, магчыма, адшукаюцца. Быць такога не можа, каб нічога ад чалавека не засталося…

Па настойлівасці, з якою гаварыла Нана, было зразумела: клопат жанчына ўзяла да галавы грунтоўна і ад намеру свайго ўжо наўрад адступіцца.

«Вось і ў каго такая ўдалася ўпірыстая? Як надумаецца што — кроў з носа, а да канца задуманае давядзе», — падумала Ала і сказала няўпэўнена ўслых:

— Хлопцам хутка ў школу, турботаў так шмат, што і хвіліны вольнай, ведаеш, не выпадае. Сюды во, да вадаспада, выбрацца ледзь-ледзь часу вымеркавалі…

— Ну, глядзі сама, як хочаш. І адна магу з'ездзіць, не такая ўжо праблема… Адно, што аўтобусамі круціцца не хочацца, на сваім аўто — зусім іншы быў бы, канешне, цымус… І ямчэй яно было б, і хутчэй, і весялей у добрай кампаніі.

— Канешне, весялей… Ну, дык паглядзім, можа, яшчэ што і атрымаецца ў мяне, — пераймаючы юрлівую ўсмешку Паўла, які ўсё больш настойліва завіхаўся ў вадзе ля адной з маладзіц, сказала Ала і пачала асцярожна — бераг быў гэтым месцам занадта стромы — спускацца з пагурка да ўзножжа вадаспада.

Змест

Шула — мегаполіс 3
Тыдзень вялікай коткі 71
Раз — шкілет, і два — шкілет 161
Цымант 261

КНІГАРНЯ
ГАЛІЯФЫ

Інтэрнэт-кнігарня

halijafy.by

гэта больш за 700 кніг
на беларускай мове
з дастаўкай па Беларусі
і ўсім свеце

дзіцячыя кнігі

гістарычныя кнігі

мастацкая літаратура

кнігі сучасных беларускіх аўтараў

перакладная літаратура

Літаратурна-мастацкае выданне

Сіўко Франц

Раз — шкілет, і два — шкілет

Аповесці

Адказны за выпуск *Зміцер Вішнёў*
Рэдактар *Ліда Наліўка*
Вокладка *Уладзіслава Юрчанка*
Вёрстка *Дар'я Пушкар*
Карэктар *Марыя Гілевіч*

Падпісана да друку 21.03.2019. Фармат 84×108/32.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 18,06. Ул.-выд. арк. 12,56.
Наклад 300 асоб. Замова 1160.

18+

ПВУП "Галіяфы".
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/48 ад 03.10.2013.
Пр. Партызанскі, 77А, 220107, Мінск.
E-mail: vish@bk.ru
www.halijafy.by

ТАА "Полікрафт".
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/14 ад 21.11.2013.
Вул. Кнорына, 50, 220103, Мінск.

Ён выскачыў з лодкі, хуценька падцягнуў яе на сухое. Торкнуў руку ў чэрава кармы, дзе стары складваў звычайна налоўленую рыбу і дзе цяпер, пасля рамонту судна, знайшло да часу прыстанак рознае цяслярскае прычындалле. Пальцы ягоныя хвіліну прамарудзілі ў нерашучасці, затым павольна, быццам усё яшчэ не пэўныя, ці варта тое рабіць, ці не, намацалі малаток і долата.

РАЗ – ШКІЛЕТ, І ДВА – ШКІЛЕТ

Я гляджу яму наўздагон, і ўражанне, што час спыніўся, захрас на мяжы двух светаў, ахоплівае мяне. Як неўпрыцям усё зрабілася неістотным з прамінулага жыцця; як незаўважна аддалілася, стала абыякавым тое, што некалі гарачыла кроў, казытала глузды спадзевам на новыя далягляды! Жаночы твар з няпэўнымі абрысамі (...) мільгае перад вачыма, і я правальваюся ў хісткую, як марыва над полем пасля дажджу, дрэму.

ШУЛА – МЕГАПОЛІС

ВЫДАВЕЦТВА
ГАЛІЯФЫ

ISBN 978-985-7209-23-1
9 789857 209231

Франц Сіўко | РАЗ — ШКІЛЕТ, І ДВА — ШКІЛЕТ